Пяты год выданьня

НАША НІВА

ЛІТАРАТУРНАЯ ГАЗЭТА

№7-8, 1995

СЭЗОН ПАВЕТРАНЫХ ШАРОЎ

***

Цокатам, грукатам,
крыкам нянаскім
хрыпатым
сёньня апоўначы
поўніцца горад ізноў:
гэта чужая, бяссонная
конная варта
горад вартуе ад гораду
гаспадароў —
верных сыноў і дачок
спадкаемнага дому,
тых, што у войнах
міжсобку
ня ведаюць стомы,
тых, што начамі
падлічваюць
дзённыя страты
і не зьвяртаюць увагі
на страшную варту.

Т.С.

... словы "незразумелая сьмерць" і "паветраны шар" сталіся знакамі мінулага сэзону. Яны ўвесь час спалучаюцца між сабою, надаючы ўсяму, што адбываецца, нейкі камічна-трагічны зьмест. Бо што можа быць лепшаю антытэзаю сьмерці, чым паветраны шар?..

Эсэ на старонцы **16**

Нобэль-1995

5 кастрычніка Швэдзкая Акадэмія Навук прысудзіла Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры ірляндзкаму паэту й эсэісту Шэймасу Хіні. ● 56-гадовы творца атрымаў прэмію за "творы лірычнае прыгажосьці й этычнае глыбіні, якія ўсхваляюць штодзённыя цуды й жывую мінуўшчыну". Ён – трэці ірляндзец, Нобэлеўскі ляўрэат за літаратуру, пасьля Уільяма Ейтса (1923) і Сэмюэла Бэкета (1969). Хіні прызнае сваю духовую блізкасьць да У.Б.Ейтса, чыя творчасьць таксама глыбока каранiцца ў неад'емным адчуваньні ірляндзкае этнічнае прыналежнасьці. ● "Хіні, ірляндзец-каталік, займаўся аналізам гвалту ў Паўночнай Ірляндыі – з выразнай агаворкай, што ён хоча пазьбегнуць традыцыйнае фразэалёгіі", – адзначыла Швэдзкая Акадэмія. ● Народжаны ў каталіцкай сям'і на захад ад Бэлфаста, Хіні быў старэйшым зь дзевяці дзяцей. Рос і гадаваўся на гаспадарцы, акружанай вёскамі й балотамі, у краі, багатым легендамі й паданьнямі, якімі насычаная ягоная паэзія. ● Хіні скончыў Каралеўскі Універсытэт у Бэлфасьце, атрымаўшы дыплём у ангельскай мове й літаратуры ў 1961 годзе. Удасканальваючы сваё паэтычнае ўмельства, ён зарабляў сабе на хлеб выкладаньнем ангельскае мовы. ● Яго раньнія вершы выйшлі асобным зборнікам «Адзінацыаль вершаў» у 1965 годзе і адразу атрымалі ўхвальную ацэнку, крытыкі адзначалі яго шчырасьць і сьмеласьць, непасрэднасьць і матэрыяльнасьць. Наступныя творы ўвайшлі ў зборнік «Поўнач» (1975), які лічыцца ягоным шэдэўрам. ● У сваіх эсэ, такіх як «Валадарства Мовы» (1988) і «Месца Пісаньня» (1989), Хіні разважае над роляй паэта й паэзіі – тэма, да якой ён часта зьвяртаецца. Досьвед жыцьця Осіпа Мандэльштама й іншых пісьменьнікаў XX ст. прывялі яго да высновы, што задача паэта – забясьпечыць выжываньне прыгажосьці, асабліва ў часы, калі тыранічныя рэжымы пагражаюць яе зьнішчыць. ● Адным з зыходных пунктаў для Хіні было тое, што ў вершы «Поўнач» (1975) ён называе "паўночнай стрыманасьцю". Ён зь цеплынёю гаворыць пра багаты досьвед, перададзены яму бацькамі, але разам з тым выказвае неярплівасьць да іхнае стрыманасьці. ● Сябра Ірляндзкай Літаратурнай Акадэміі, ён надрукаваў свае першыя творы пад псэўданімам "Incertus", Няпэўны. ● "Беспарадкі" паміж пратэстантамі, якія падтрымваюць брытанскае панаваньне ў Паўночнай Ірляндыі і каталікамі, якія выступаюць супраць яго, змусілі Хіні ў 1972 годзе пераехаць у Дублін, дзе ён на нейкі час перастаў выкладаць і цалкам аддаўся паэтычнай творчасьці. Аднак у 1975 годзе ён вярнуўся на прафэсарскую катэдру. Ён выкладае як запрошаны лектар у амэрыканскіх універсытэтах, а таксама ў Брытаніі, дзе ад 1989 году займае прэстыжную пасаду прафэсара паэзіі Оксфардзкага Універсытэта. ● Нобэлеўскую прэмію і чэк на 7,2 млн. швэдзкіх кронаў (1,03 млн. даляраў) Шэймас Хіні атрымае падчас афіцыйнай цырымоніі ў Стакгольме 10 сьнежня, у гадавіну сьмерці Альфрэда Нобэля ў 1896 годзе.

Верш Шэймаса Хіні зьмешчаны ў гэтым нумары на старонцы **17**

Ірляндзец Хіні піша па-ангельску. Але ёсьць у Ірляндыі паэты, што пішуць на роднай мове.

Эсэ на старонцы **22**

АПАВЯДАНЬНЕ

Адбіткі пальцаў

Сяргей Астраўцоў

1.

Сьпякотны жнівеньскі дзень. Захад лета. Горад пацее, мружыцца ад сонца, хавае вочы за шкельцамі цёмных акуляраў, бесьперапынна п'е аранжаду. Ты частуесься каля кожнага шапіка з бананамі й лёдамі, пад кожным парасонам з напоямі, цябе абкурваюць, глушаць музыкай у "кнайпе". Усё спрабуеш улесьціць уласны арганізм, здаволіць, нібы якога прожара. Ён – твая адмысловая машына, мэханічная галава, ад якой ты чакаеш аднаго: тэкстаў.

Прыкры панядзелак. Быццам папярэдне змовіўшыся, агенцтвы, рэдакцыі газэт і радыёстанцыі чакаюць навінаў на першую старонку менавіта адсюль. Дзе вонкава нічога не адбываецца. Ты зьнядужаны гарачынёй, твой віжунскі нюх зьнянацку самахоць узяў сабе выхадны, нікога не папярэдзіўшы. Пульс амаль не намацваецца. Лагодна-бяззбройны настрой. У галаве – ані яскаркі. Нуль па фазе. Твой рабак – пачуцьцё абавязку, адказнасьці і г.д. Носьбіт усіх дабрадзейнасьцяў адразу. Але ён таксама лянотны ад летняга паветра. Ягоныя сямейнікі, сваякі, сябры й проста суайчыньнікі песьцяцца ў салодкім ліпкім рэчыве, прасьвідраваўшы калідорыкі ў бэбахах садавіны, якая высыпвае ў межах каменнага гораду. Яны напаўсілы працуюць сківіцамі, а не кулакамі ды локцямі. Яму ж выпала разварушваць здранцьвелыя думкі, якія згарнуліся, сьпятрэлі, запаволіўшы дыханьне, нібы палоўкі валоскага гарэха, які нарыхтаваўся зазімаваць у сваёй надзейнай касьцёвай шкарлупіне.

Вось бы й самому заснуць у гарэху! Ты бадзяесься ад аднае вулічнае "кнайпы" да наступнае, быццам вандруеш паміж астраўцамі пляжнага архіпэлягу, прымхліва спрабуючы адрозьніць пры гэтым *Coca* ад *Pepsi*. Здаецца, усе варыянты не пасуюць. Люстра шчыруе: недарэчныя бакенбарды, неўласьцівыя вусы, пачварны нос і сьмешная барада. Цябе заносіць зусім не Гальфстрымам, а потна-парфумнай плынню амаль пад зялёны жалезны танк. На п'едэстале, зь бяззубым тэкстам бяз часткі літараў. Хаваесься пад парасонам, які агортвае цябе аранжавым ценем, нібы лябараторны фоталіхтар. Некранутыя аркушы, асадка, бляшанка аранжады. Газаванай, з дробнымі бурбалкамі і нават толькі зь лядоўні, але даволі прыкрай. Ты пачуваеш сябе ледзьве ня Хэмам у вулічнай кавярні на якой-небудзь авэню. "Не адцягвай увагу", – загадваеш сам сабе нібы некаму іншаму і замест празаічнага ўступу пачынаеш шрайбаваць пра жніво.

За тваёю сьпінай, ускінуўшы крылы, памкнуўся ў нябёсы вялізны мэталёвы Пэгас. Ён намёртва прымацаваны да тэатральнага гмаху жалезным слупом, які гэтак пяцэліў у чэрава крылатага каня, што міжволі выклікае думкі пра фалас.

2.

Мажная кабеціна анарэ-дэ-бальзакаўскіх гадоў прышпільвае да дзьвярэй афішку. Кароткастрыжаная, з заціснутай у роце папяросай. Нагадвае фільмы пра бальшавіцкую рэвалюцыю.

Канцэрт джазавай піяністкі. Непрызнаная, яна аднойчы купіла ў чыгуначнай касе дзевяцідаляровы квіток на варшаўскі цягнік. У Варшаве, паназіраўшы танцоўную мітусьню ейных пальцаў на клявішах, ёй прапанавалі граць па вечарох у кавярні-клюбе. Трыццаць дэ за гадзіну. Затым зацікавілі пісаць музыку для тэатру. Яна прыехала дамоў як замежная зорка. На невялічкія гастролі. Яе лічылі дзівачкай, не прыстасаванай да жыцьця.

Цябе просяць дапамагчы ўсьцягнуць на подыюм раяль. Неіматлікія слухачы. Сьціплыя букецікі. На білетах чамусьці па-вайсковаму сьцісла паведамлена: "Министерство обороны СССР. 3 руб. 30 коп." Перад уваходам кантралёрка бесцырымонна парушае іхнюю музэйную каштоўнасьць.

3.

Навокал паснулі, згасіўшы люлькі комінаў, заводы й фабрыкі. Але каго гэта можа абыходзіць? Там усё адно не плацілі й даўно не было працы. Цэлы горад гандлюе й перапрадае з рук у рукі замест таго каб страйкаваць. Няма пораху, а запалкі спачатку адсырэлі, а потым зрабіліся дэфіцытам. Нічога, апроч нябачных кайданаў. Усе гандляры, а пакупнікоў няма. Працяг гульні ў ілюзіі, мыльная опэра. *Żydzi wojnę, polacy handlinę...* Каб заехаць з польскай тэрыторыі на машыне, тры дні трэба чакаць у чарзе, паведамляе табе гандлярка. Так-так, раней было наадварот, згаджаесься ты і купляеш у яе пачак кавы з малюнкам: у вулічнай кавярні элеганцкая публіка смакуе з паркіх філіжанак чорную каву – "моцную й духмяную". Вулічная кавярня на пачку з кавай. Пачак кавы з вулічнай кавярняй. Тэлерэкляма

Працяг на старонцы 7

Уводзіны ў «НН»

Мы спрабуем зьмяніць «НН». Усё ў газэце павінна быць зразумелае для ўсіх. Вось сутнасьць зьмены.

Умовы нашага йснаваньня, мякка кажучы, не зусім звычайныя. Усё як бы адбываецца само. Мы нібы дазваляем часу рабіць з намі ўсё, што заўтодна, спакушаць нас, уваходзіць да нас у любым выглядзе і зь любым выразам твару, – такім, які ён ёсьць. Усё, што мы маем "ад сябе" – імкненьне рабіць прафэсійна. І наколькі нам гэта ўдаецца, настолькі «НН» – жывое люстэрка часу, якое дазваляе бачыць як вонкавыя, так і ўнутраныя ягоныя праявы.

Мы друкуем самыя сьвежыя творы. І гэтыя творы, як правіла, самі ўступаюць на старонках у дзіўныя ўзаемасувязі, ствараючы кантэкст кожнага новага нумару. Гэта й ёсьць кантэкст часу, які не заўсёды можна вытлумачыць наўмысна.

Усё гэта ёсьць і застанецца, але кожная жывая справа патрабуе разьвіцьця.

Тры месяцы «НН» не выходзіла. Гэта таму, што з паловы году газэта пастаўленая ва ўмовы самаакупнасьці. Такая была адна зь першапачатковых мэтаў рэдакцыі. Усё ж газэта мусіць выжываць сама, калі яе стваральнікі не залічваюць сябе (сваю мову й культурную традыцыю) у льготныя катэгорыі інвалідаў ці састарэлых. А тое, чаго мы хочам – гэта якраз сьцьвердзіць сталасьць і здароўе нашае мовы й традыцыі, а таксама – здольнасьць нашых аўтараў.

Мы ня маем намеру зьмяняць «НН» ва ўгоду грашам. Між тым, сродкаў ад усёй нашай кварталнай падпіскі хапае толькі на трэць затратаў аднаго нумару. Вось чаму мы маем намер правесьці наступныя зьмены.

«НН» будзе каштаваць дорага – столькі, у колькі яна абыходзіцца. Будзе або ня будзе яна выходзіць да новага году – залежыць ад таго, ці будзе яна на сябе зарабляць. Нумар, які вы трымаеце ў руках, трапіць толькі да падпішчыкаў. Магчыма сёлета выйдзе яшчэ адзін здвоены нумар. Далей падпішчыкі будуць атрымліваць газэту «Свабода», у якую будзе ўкладзены анонс «Нашай Нівы» 1996 году. (Калі такі парадак не задаволіць нашага падпішчыка, рэдакцыя верне яму затрачаныя грошы.) З наступнага году «НН» будзе выходзіць штотыднёва.

Сталы чытач заўсёды будзе знаходзіць у газэце тое, да чаго ён прызвычаіўся: пашыраны літаратурна-кніжны разьдзел, важнейшая культурная інфармацыя з-за мяжы й прафэсійныя пераклады найноўшых твораў, тэматычныя нумары, культурна-палітычныя агляды, матэрыялы па гісторыі і ўжо традыцыйны для «НН» суб'ектывізм.

Да гэтага кроку мы йшлі пяць гадоў. Мы ўсё яшчэ залежым ад абставінаў, але нямала перадумоваў ужо створана й намі самімі.

Мы можам памыляцца, але мы ніколі ня будзем хлусіць, рабіць выгляд, пазіраваць. Бо ўрэшце тое, што мы ўсе робім – гэта ня столькі наша праца ці ваш адпачынак, колькі наша й ваша адзінае жыцьцё.

Рэдактар

ТЭНДЭНЦЫІ

у літаратуры

Леанід Галубовіч друкуе «Зацемкі зь левай кішэні». Ад Галубовіча заўсёды чакаеш меншага. Так было зь вершамі, так цяпер з гэтымі зацемкамі. Наймацней гэта адчуваецца ў параўнаньні з новымі публікацыямі "клясыкаў мініятурызму", ад якіх чакаеш якраз большага. Рэч, мабыць, у тым, што Галубовіч як бы на ўсе сто не належыць літаратуры, а ягоныя творы не належаць імю "Галубовіч", ён гуляе сам па сабе. І таму рэдкія выключэньні – красівасьці, пафасы, піетэт – у зацемках асабліва рэжуць слых. Праўда, сама "канструкцыя" – зборная, і гэта выратоўвае.

"Піша як дыша". "Я пішу рэдка, а трэба было б гусьцей..." Каму "трэба"? Не-не ды загаворыць усё ж "кваліфікаваны пісьменьнік". Згадваецца іншы афарызм: "рэдка ды метка"...

У «Зацемках» прадчуваецца іншая, новая якасьць літаратуры і мовы. Мова ачышчаецца ад "літаратуры", каб пасьля стаць іншай літаратурай. Магчыма таму Галубовіч цяпер рэдка друкуе вершы. Мова павінна вылузацца з папярэдняй эпохі, ажыць, стаць на пісьме такой, якою мы сёньня думаем і гаворым, каб на ёй хацелася пісаць мастацкія творы. Зразумела, каб гаварыць пра гэта як пра тэндэнцыю, трэба мець шмат прыкладаў.

Вось яшчэ адзін. Усевалад Гарачка ў «Культуры». «Замарыў паэт Марылю». Тут ужо вершы, але кірунак той самы. Паэтычны тэкст, які ня мае патрэбы апраўдваць сябе тым, што ён паэтычны.

у палітыцы

Міністар працы Сасноў у Беларускім радыё адказвае на пытаньне слухачкі (настаўніцы, аклад 400 тысяч): "Навошта абкладаюць забаронамі тых людзей, якія ганяюць з захаду машыны? Няхай яны зарабляюць шмат, але яны ня робяць нічога крымінальнага. Яны самі знайшлі сабе прымяненьне, яны працуюць, у іх ёсьць попыт. Дык чаму дзяржава ставіць іх у такія ўмовы, каб яны або ўвогуле страцілі занятак, або падаліся ў крымінал?" Адказ міністра: па-першае, дзяржава ўлічвае думку масаў (хай лепш у суседа карова здохне, чым я завяду сабе другую), па-другое, у нас ёсьць абавязкі перад Расеяй – бараніць яе аўтамабільны рынак.

У гэтым адказе, як у фокусе – уся "лёгіка" цяперашніх уладаў у Беларусі. На першым месцы – "думка масаў" (прычым, гэта, як правіла, дэструктная думка: хачу СССР, хачу, каб было як раней, хачу стары сьцяг...). На другім – інтарэсы Расеі. І толькі на трэцім месцы – на апошнім – Беларусь, яе людзі, іх намаганьні самім выбірацца з крызысу, знаходзіць сабе занятак. У выніку такое іерархіі псыхалёгія натоўпу і дагаджэньне расейскаму рынку фактычна паралізуюць усё жыцьцё ў Беларусі.

у гісторыі

Расейская рэдакцыя радыё «Свабода». Гутарка зь пецярбурскім акадэмікам Панчанкам. Ці была рэвалюцыя 1917 г. пралетарскай? Акадэмік сьцьвердзіў, што гэта была "лакейская" рэвалюцыя. Лёкаяў у Пецярбурзе на той час было болей, чым пралетарыяту. Гэта ад іх пайшлі камунальныя кватэры, гэта яны жадалі паразы Расеі ў вайне зь немцамі, бо лёкаі паводле псыхалёгіі сваёй заўсёды жадаюць паразы сваёй краіне. Гэта яны пасьля апрануліся рэвалюцыйнымі матросамі. Пралетарыят на той час меў яшчэ вясковую, г.зн. патрыятычную сьведамасьць. Выходзіць, усе гэтыя 70 гадоў імпэрыя жыла паводле лёкаяў у масцы пралетарыяту.

Калі ўсё гэта праўда, то шмат чаго становіцца зразумелым у невытлумачальнай гісторыі XX ст., перастаюць блытацца праўда й зло, норма й анамалія, здароўе й хвароба, а сам гэты перыяд не выскоквае з гісторыі як Піліп з канапель (не трасуць сьвет ані 10 менскіх эрэсдээрпістаў, не трасуць 10 дзён, "которые потрясли" і г.д.), а лягічна лягае ў падрыхтаванае XIX стагодзьдзем расейскага быту ложа.

у друку

«ТАСИС в Беларуси. Ежемесячный бюллетень по сельскому хозяйству и продовольствию». Новае выданьне адразу нясе ў сабе стары парадокс. Наша вёска – жывая традыцыйная культура і мова, база беларушчыны, якая неадрыўна зьвязаная зь сялянскай вытворчасьцю... А ўсе выданьні для вёскі ў нас – па-расейску. Чаму? Адкрывае сыпіс афіцыйная «Белорусская нива» – рупар кіраўніцтва, які ўжо толькі па мове дэманстратыўна чужы беларускаму селяніну. Такая мэтода, выпрацаваная ў сталінскія часы (калі, напрыклад, газэты ў новадалучаных заходнебеларускіх раёнах і абласьцях выходзілі падкрэсьлена па-расейску) добра ўелася ў кроў аграрыям. І ўжо ня толькі афіцыёз, але й самыя незалежныя выданьні гэтай тэматыкі выходзяць па-расейску.

У дасталінскі перыяд да беларускіх сялянаў было прынята зьвяртацца ўсё ж на іхняй мове. І ў XIX ст., і ў часы нашаніўства, і ў першыя савецкія гады была створана цэлая спэцыяльная літаратура па с/г па-беларуску. І гэта было натуральна, пакуль плуг ня стаў інструмэнтам палітыкі, пакуль не пачалося закалгашваньне.

Што такое «ТАСИС»? "Новое издание послужит европеизации белорусского села". Забаўна гучыць і адразу паказвае, што Эўропа ня ў тым баку, дзе вы думаеце. Праўда, грошы на "новое издание" бяруцца усё ж ад Эўрасаюзу, а не з Расеі. Калі справа пра грошы – тады жарты ўбок.

Цяжка сказаць, ці дапаможа Эўрасаюз беларускім сялянам у гаспадарцы, але першую сваю лепту ў русіфікацыю беларускай вёскі – сіламі мясцовых старацеляў – ён ужо ўнёс. (брат)

РЭДАКЦЫЙНАЯ ПОШТА

Мірольд Камінскі

... Гэта было гадоў 10-15 таму. У Менску, у пустым двары паміж домам Ваньковіча і домам Масонаў шараю гадзінай мы, студэнты, праводзілі свой першы сьпірытычны сэанс. Ведаеце, прага пазнаньня, цікавасьць да патаемнага, вострыя ўражаньні і ўсё такое. Здавалася, яшчэ трохі, і паміж старых муроў пазьяўляюцца сапраўдныя прывіды. У той вечар мы выклікалі дух Янкі Купалы. Зразумела, што першае наша пытаньне было: назавеце вашых забойцаў, Іван Дамінікавіч.

У двары павісла мёртвая цішыня, мы стаілі дыханьне, захвалявалася самое паветра. Сподак скрануўся пад нашымі пальцамі і пачаў соўгацца па кругу, усё хутчэй і хутчэй. Мы ледзь пасьпявалі складаць літары: *Мірольд Камінскі...*

Пазьней у нас шмат пісалі пра гібель Купалы. У 1942-м годзе паэт упаў у лесьвічны пралёт маскоўскага гатэлю й разьбіўся. Было выказана мноства вэрсіяў: энкавэдэ, немцы, выпадковасьць, самагубства... Адно з раньніх і ўжо забытых меркаваньняў: сьмерць Купалы – на сумленьні беларускіх нацыяналістаў. Прозьвішча, якое мы даведаліся на сьпірытычным сэансе, ніколі й нідзе больш ня згадвалася.

Паступова жарсьці вакол гібелі паэта ўлегліся. Адыйшлі ў лепшы сьвет два найбольш кампэтэнтныя дасьледнікі гэтага таемнага эпізоду нацыянальнай гісторыі – Георгі Колас і Барыс Сачанка. Але загадка так і засталася загадкаю.

І вось сёлета, у пачатку верасьня, у рэдакцыю «НН» прыйшоў ліст. Без зваротнага адрасу і бяз даты. На нашую думку, гэты допіс не патрабуе камэнтароў, і таму мы зьмяшчаем яго цалкам. Тэкст надрукаваны на беларускай машынцы і толькі подпіс акуратна выведзены асадкай: *Мірольд Камінскі.*

"Паважаны Спадар Рэдактар,

Самы паганы, самы хлусьлівы й самаедзкі беларускі верш перакладзены на 80 моваў сьвету.

Гэты верш – ключ, якім у XX ст. была знутры замкнутая беларуская ідэя. Вось чаму ў 94-м яна ўжо не магла даць нікога іншага, апроч Лукашэнкі, у 95-м – ніякага іншага адказу на рэфэрэндум, вось чаму ў 96-м Беларусь ня здолее НЕ ДАЛУЧЫЦЦА да Расеі.

Усё іншае ў ёй памірае, забітае, заткнутае, затрамбаванае гэтай крыўдай з лапцямі. Салодкі мазахізм эстэцкага паэта, які ніколі (!) не насіў лапці і быў заўсёднікам установаў, куды й блізка не падпускалі тых, хто "людзьмі ня зваўся".

Ён быў болей геній, чым чалавек. Монстар у бязвольным абліччы. У яго ёсьць боскія вершы, але на 80 моваў сьвету перакладзены верш сатанінскі, вусьціпна-гульлівы, "швэйцарскі". Так ён выставіў свой народ за дзьверы «Штраля»...

За Шушкевічам гэты верш ня быў выключаны з нашых школьных праграмаў. І таму нашы школьныя праграмы цяпер выключаюць са школаў.

Гэты верш быў вірусам, які выглядаў на жывую клетку, але таіў пры гэтым сваю сьмертаносную атруту, выклікаў імунадэфіцыт у нашым нацыянальным арганізме. Пакуль паралізаваў усё. Ягоная геніяльнасьць – гэта геніяльнасьць разбурэньня. Урэшце гэты верш матэрыялізаваўся ў першай асобе доўгачаканай беларускай дзяржавы.

Ён сьпявае бяз нотаў, але побач зь ім глохне кансэрваторская прафэсура. Ён грае ў свой паляўнічы ражок, і бязвольныя казулі статкамі ідуць на ягонае гранье. Але ні ён, ні яны ня робяць гэта ўсьвядомлена.

Трэба сказаць сабе праўду: Беларусь будзе далучаная да Расеі. Няма такой волі, якая б перашкодзіла гэтаму. Дый не было такой волі ніколі. Можа, таму, што воля – гэта заўсёды неўсьвядомленая сіла? Яна нараджаецца як музыка. І ўзьдзейнічае, як музыка. А мы занадта рацыяналістычны народ. Мы ня ўмеем верыць у бога.

Трэба сказаць сабе праўду: беларуская мова памрэ. Ніхто сур'ёзна ня стане размаўляць на ёй. Яна памрэ, як толькі пакіне вёску. У горадзе ніхто – самыя заўзятыя моўнікі (паглядзіце сабе ў вочы) не размаўляюць на ёй сур'ёзна. Сур'ёзна па-беларуску магла гаварыць толькі вёска. Пакуль не навучылася па-іншаму.

Трэба сказаць сабе праўду: беларуская ідэя – фікцыя, якая так і ня стала рэальнасьцю. Наш спэктакаль зацягнуўся. Нашы жарты даўно сталі хлусьнёю.

Гэта – канец "рацыянальнага нацыяналізму".

Гэта – канец рацыяналістычнай нацыі.

Гэта было найвялікшае глупства, на якое толькі можна было патраціць час.

Нацыя нараджаецца зь любові й сьмерці. Яна – ня тая ідэя, якая дазваляе спазнаць сьвет.

Нацыянальная ідэя – не для пазнаньня, а дзеля шчасьця.

Трэба сказаць сабе праўду... Калі нас далучаць да Расеі, калі памрэ мова, і беларуская ідэя разьвеецца як ранішні туман, – тады мы будзем са скураю зьдзіраць зь сябе гэтую маску бязвольнага генія і крывёю змываць таўро "людзьмі звацца".

Калі толькі маска не ўрасла ў касыцяк".

Культурная палітыка ў прэзыдэнцкай Беларусі

РАЗВОД БЕЛАРУШЧЫНЫ ЗЬ ДЗЯРЖАВАЙ

Ігар Бабкоў

Апошні год для беларускай культуры стаўся надзіва невыразным. Усё працягвалася як бы па інэрцыі, без асаблівых набыткаў, перспэктываў, і, можна сказаць, без асаблівага сэнсу. І ўсё ж такі, я думаю, менавіта 1995 год назавуць паваротным пунктам будучыя культуролягі.

Сымптомы гэтага павароту зьбіраліся паступова. То прыкрыюць на пару месяцаў дзяржаўныя газэты культурнага кірунку, – і ніхто гэтага як бы й не заўважыць. То пасьля прагляду ў вузкім коле далёкай ад народу грамадзкасьці забароняць фільм на творах народнага пісьменьніка Васіля Быкава. То гэты самы народ прагаласуе на рэфэрэндуме такім чынам, што інтэлігенцыя, якая паўтары стагодзьдзі шчыра імкнулася гэтаму народу служыць, з гэткай жа апантанасьцю пачне набываць квіткі на самалёты й параходы, каб ад такога народу ўцячы – і пажадана вельмі далёка – у Аўстралію або Аргентыну. То спыніцца ў Беларусі *Европейское время*, пахаваўшы пад амбіцыямі галоўнага рэдактара магчымасьць для мясцовае расейскамоўнае публікі мець культурную газэту нешавіністычнага кшталту. То ўсе раптам усьвядомяць, што Саюз Пісьменьнікаў, былы штаб і цытадэль беларушчыны, вось ужо ня першы год як спачыў і ціха ляжыць у сваёй дамавіне па Фрунзэ 5 у асяродзьдзі разнастайных фірмаў, фірмачак, фондаў, цэнтраў і фундацыяў.

Усё гэта можа значыць толькі адно: у 1995 годзе наступіў праўдзівы канец беларускай савецкай культуры. Скончыўся раман беларушчыны й дзяржавы, які быў распачаты нацыянал-камуністамі, працягваўся савецкай элітай, і які так імкнулася працягваць пасьля 91 году эліта дэмакратычная. Раптам стала відавочна, што адбылася глябальная перамена ў калядзяржаўнай культурнай гіерархіі. Калі раней на вяршыні гэтае гіерархіі знаходзілася літаратура, недзе побач – тэатар і кінематограф, а ўжо там унізе, далей, масавыя формы, усе гэтыя народныя хары, сьпевакі й танцоры, дык цяпер усё наадварот.

Культурны герой сёньняшняе афіцыёзнае Беларусі – які-небудзь А.Саладуха – дзецючок, які сыпявае свае песенькі на БТ і Астанкіна, бразгае ланцужкамі і бесьперапынна звоніць па сотавым тэлефоне.

Такім чынам увесь гэты нібыта невыразны пэрыяд мае сваю лёгіку й сваю пасьлядоўнасьць. Культурная палітыка Лукашэнкавага рэжыму ня ёсьць нейкім настальгічным вяртаньнем у савецкія часы. Савецкая культура была надзвычай элітарная і па-свойму прэстыжная. Лукашэнка ж заняўся – зьніжэньнем статусу культуры, татальнай плебеізацыяй культурнага жыцьця ў Беларусі. Ня дзіва, што культура пачынае помсьціць. Лукашэнка зьяўляецца на старонках не ў якасьці героя *à la* Маркес, дыктатара-патрыярха, па-свойму глыбокага і інтэлектуальна рэспэктабельнага, а ў вобразе Лукі Мудзішчава, героя тупавата-парнаграфічнай расейскай, а цяпер і ананімнай беларускай паэмы. Лукашэнка зьніжае плянку культуры, культура "апускае" Лукашэнку.

І ўсё ж такі, нягледзячы на такую лякальную помсту, нізкі жанр і плебейства – тэрыторыя, на якой культура задыхаецца й памірае. У якія далі й выслі, у якія жанры й дыскурсы памкнецца культура, уцякаючы ад небясьпечнага суседзтва, пакуль невядома. Але ўжо цяпер можна зрабіць пэўныя высновы, пазначыць новыя правілы гульні, у якіх знаходзіць сябе культура пасьля года Лукашэнкавага патопу.

Па-першае, беларуская культура раптам усьвядоміла, што яна засталася на самоце: безь дзяржавы, без прэстыжу і амаль што без народу. З аднаго боку, ёсьць пачуцьцё паразы й дэмаралізацыі, зь іншага – паўстае спадзеў, што мусіць абудзіцца інстынкт самавыжываньня, – галоўны набытак нашаніўскага часу, так бяздарна пахаваны ў часы савецкія. Да таго ж пачуцьцё пакінутасьці для культуры, як зрэшты і для чалавека, часам бывае больш плённае, чым пачуцьцё самазадаволенага служэньня агульнай справе.

Па-другое, і гэта – працяг першага, культура мусіць засвойваць гэтак званы трэці сэктар, – сэктар недзяржаўных і няўрадавых арганізацыяў. А гэта вядзе да глыбокіх псыхалягічных зьменаў, да канчатковае адмовы ад бяздумнага канфармізму й калябарацыянізму – што было сапраўдным жахам беларускай культуры дваццатага стагодзьдзя.

Па-трэцяе, і магчыма гэта самае аптымістычнае, – мы жывыя.

КАНФАРМІЗМ – ШЛЮБ АД СТРАХУ

Сяргей Паўлоўскі

У Беларусі людзі зноў адчуваюць страх перад уладамі.

У канцы 80-х спатрэбілася сапраўды рэвалюцыйнае намаганьне (Курапаты, страйкі і г. д.), каб паўстаць і вырвацца з гэтых ліпучых абдымкаў. Чалавек ачысьціўся, адрадзіўся, намаладзеў. Ён зрабіў высілак над сабою і перастаў баяцца. Ён адчуў нікчэмнасьць рэжыму ў абліччы яго апошніх прадстаўнікоў. Дземянцея ўжо не баяліся. Тым больш не баяліся Шушкевіча. Так пачыналі фармавацца зусім іншыя адносіны чалавека і ўлады. Улада стала "зямная", без шаманства і ўсемагутнасьці. І цяпер трэба было навучыцца паважаць яе не ад страху, а таму, што яна – законная ўлада.

Але на такую ўнутраную рэвалюцыю ў нашых людзей духу ўжо не хапіла. Якая ж гэта ўлада, калі яна не пасяляе ў сэрцах вусьцішны страх? І вось – Лукашэнку баяцца. Падтрымваюць, ухваляюць, любяць, таму што страшна. Пяць гадоў рэвалюцыі духу скончыліся пэрыядам рэакцыі. Чалавек зноў увагнуў галаву ў плечы. Ужо ніхто не выступае з выкрывальніцкімі прамовамі, ніхто не высьмейвае прэзыдэнцкія выбрыкі, як гэта было наўскюль яшчэ ўчора. Зрэшты, і выступаць ужо няма дзе. Усе развагі і ўчынкі людзей як бы "по умолчанию" тлумачацца татальнай пагрозай, якая сыходзіць ад уладаў. Гэтак зь дзікім зьверам, які, ты ведаеш, ня спыніцца ні перад чым. Ні перад чалавечай годнасьцю, ні перад законамі...

За год свайго прэзыдэнцтва Лукашэнка зь нягеглага саўгаснага гаваруна без каманды й праграмы ператварыўся ў маналіт. І ў душах людзей зноў паднялася з дна панічная каламуць.

Страх узьнікае ад вераломства ўладаў. Калі ўнутраную палітыку ў краіне ажыцьцяўляе амон, калі народных дэпутатаў б'юць гумовымі палкамі, калі страйкоўцаў садзяць у турму – тады паэты пачынаюць славіць прэзыдэнта.

У савецкія часы ў нас быў самы афіцыёзны з усіх рэспублікаў нацыянальны культурны афіцыёз. Беларуская савецкая культура ў найменшай ступені зьведала салідарнасьць сваіх дзеячоў і сама стала сыноніма канфармізму, вернай спадарожніцай таталітарнага рэжыму.

З развалам гэтага рэжыму рухнуў і наш афіцыёз. Пасьля абраньня Лукашэнкі канфармізм неяк адразу стаў у нас агульнапрызнаным сьвінствам. Інтэлігенцыя дыстанцыявалася ад прэзыдэнта і замест КПСС і сацыялізму стала славіць бел-чырвона-белы сьцяг і незалежнасьць. Але так было, пакуль з Лукашэнкі сьмяяліся. Сёньня, калі гэты сьмех стаў як бы недарэчны, калі пачалося адраджэньне новага таталітарызму, мусіць вярнуцца і канфармізм.

Дзеячам культуры проста ня будзе куды дзявацца. Можна, вядома, эміграваць, але ў нас гэта, па-першае, не прынята, а па-другое – калі ты проста ўцёк, а ня вытураны – гэта таксама свайго роду канфармізм і яшчэ не вядома, каторы зь іх большае сьвінства. І потым, каб быць вытураным, трэба ўчыніць нешта моцнае і валявое. І тут высьвятляецца, што непрыняцьце інтэлігенцыяй Лукашэнкі было толькі яркаю позай, але так і ня стала прынцыповай пазыцыяй. Бо ён жа, як паглядзець, сапраўды народам падтрыманы, і наогул – невядома, што зь яго будзе. І потым, не пратэставаць жа з-за таго, што прэзыдэнт – малакультурны чалавек! А ва ўсім астатнім... Ёсьць незалежная Беларусь. Адкат да расейшчыны й савецкай сымболікі можна разглядаць як вяртаньне з "высокага неба ідэалу" на рэальную зямлю. "Рынкавы сацыялізм" не будуюць ані ў Расеі, ані ў Польшчы... Словам, як ні круці, усё, што ні робіцца, – толькі падкрэсьлівае спэцыфіку Беларусі. Іншая рэч, што гэтая адметнасьць – зусім ня тая, якую хацелася б падрэсьліваць чалавеку культурнаму. Але выбару няма.

Гэта страх не пакідае выбару, прымушае зноў упрагацца ў лямку і над жорсткім наглядам далёкіх ад культуры ўладаў будаваць пампезны палац новага беларускага афіцыёзу.

Сёньняшняя беларуская культура яшчэ прыйдзе на гэтую будоўлю, бо была народжаная ад канфармізму й безь яго ня здолее выжыць. Гэта пакуль яна яшчэ крывіцца ад таго, што маральнае ўбоства й часовы выгляд новых уладаў ня йдуць ні ў якое параўнаньне з 70-гадовай савецкай дыктатурай, якой яна так верна служыла.

Але выбару няма. Ён зьявіцца хіба што ў пакаленьняў, якія ня ведалі сталінскага страху, якіх не адсочвала й не палохала КГБ, якія выхад з сацыялізму зразумелі як уласнае нараджэньне. Яны ня ўмеюць будаваць афіцыёз, каб нават і прымушалі, яны ня ўмеюць быць рабамі, яны пішуць вершы пра восень...

... І ДЗЕНЬ СТАЎ ЯК НОЧ

Сяргей Харэўскі

За савецкім часам культура, якой была дадзена пахабная дэфініцыя "невытворчая сфэра" (г.зн. тое, чаго ня можна зьесьці) стаяла на дзяржаўным забесьпячэньні цалкам. Інтэлігенцыю непакоіла тое, што культура й мастацтва фінансуюцца паводле рэшткавага прынцыпу ў самым канцы дзяржбюджэту, такім чынам грошай бракавала заўсёды.

Але нікому не магло й прымроіцца, што дзяржава, на станаўленьне якое тая ж інтэлігенцыя паклала столькі сілаў, выкіне за борт нават традыцыйныя для савецкіх часоў этнічныя дэкарацыі, груба й цынічна будзе заганяць інтэлігента, нібыта мыша, у кут. Не зважаючы на Канстытуцыю й Закон аб культуры сёньняшні рэжым звужае матэрыяльную базу культуры да крытычнага стану, у той жа час несупынна нарошчваючы так званыя сілавыя структуры.

... Сонца ўзыходзіла, сядала, каб ізноў узыйсьці й сесьці, і нікому нат не прыходзіла ў галаву, што нешта можа зламацца ў гэтай завядзёнцы. Але аднойчы сонца ня ўстала. Яно стамілася. І дзень стаў як ноч...

Сьпіньеньне дзяржаўнага фінансаваньня засьпела сыстэму нашае культуры, што склалася яшчэ за Сталінам, зьнянацку. Дзесяцігодзьдзямі ціхія скаргі інтэлігенцыі на свой лёс і на лёс нацыянальнае культуры, якія друкаваліся ў інтэлігенцкіх дзяржаўных выданьнях, заставаліся па-за ўвагаю нацыі. Скаргі на дзяржаву ў яе ж структуры. Калі ж дзяржава цалкам кінула інтэлігенцыю зь ейнымі прэтэнзіямі, адбыўся абвал. Раней было кепска, але ніхто не ўяўляў што можа наогул нічога ня быць. Змагары за незалежную Беларусь не ўяўлялі сабе такога нават тэарэтычна.

Занепад базы культуры адбыўся імкліва на працягу апошніх пяці гадоў. З прыходам да ўлады рэжыму Лукашэнкі, фінансаваньне культуры зьменшылася на 20-25% і складае сёньня менш аднаго працэнту дзяржаўнага бюджэту. Гэта, вядома, ніжэй за вызначаную Законам аб культуры лічбу ў 3%. Але што *ім* да Закону? Таму сёлета, да прыкладу, музэі Беларусі атрымаюць ледзьве 40-50% ад запрошаных імі сьціплых сумаў на гэты год. Раней частку бюджэту культуры бралі на сябе прафсаюзы. Але цяпер прафсаюзы ня ў стане ўтрымліваць нават свае дамы культуры, якія сёньня здаюць у арэнду пад крамы, бары і г.д.

На ўвесь 1995 год Міністэрствам фінансаў выдаткавана (на паперы) на культуру й СМІ дакладна 265,7 млрд. рублёў, альбо разам блізу 1,78% дзяржбюджэту. Але пры тым на Міністэрства культуры й друку разам з упраўленьнем па рэстаўрацыі прыпадае толькі 101,6 млрд. рублёў (зноў жа на паперы) супраць 385,9 млрд., якія былі імі запрошаныя толькі дзеля падтрыманьня наяўнага стану. Такім чынам, нават фармальна патрэбы Міністэрства былі задаволеныя толькі на 26,3%.

На асобных пазыцыях забясьпечанасьць фінансавых патрэбаў на 1995 год выглядае наступным чынам: кінавідэавытворчасьць – 36,6%, нацыянальны друк – 26,0%, капітальныя ўкладаньні – толькі 14,6%. Пры такой сытуацыі немагчыма нават захаваць традыцыйную структуру ўстановаў культуры. А таму толькі за апошнія тры гады было зьліквідавана пяць музэяў, звыш 300 клюбных установаў, 409 бібліятэк. У катастрафічным стане знаходзяцца паркі, якія ўжо даўно пакінутыя бяз сродкаў.

Ня дзіва, што колькасьць работнікаў дзяржаўнай сфэры культуры за тры гады скарацілася на чвэрць. Няцяжка падлічыць, калі іх ня будзе наогул. Тым часам сёньняшні рэжым выяўляе фэнамэнальную пагарду да культуры, дзманстратыўна пакідаючы за яе носьбітамі самыя малыя заробкі ў краіне: ў галіне мастацтваў яны складаюць 64%, а ў культуры 63% ад нацыянальнага сярэдняга заробку, альбо каля сарака даляраў у месяц.

Дзяржава пры сёньняшнім прэзыдэнце карміць салаўёў і не падумае, бо рэжа нават курэй. Ня ў стане падтрымліваць культуру й мастацтва прафсаюзы. Прыдушаная падаткамі буржуазія тым больш імкнецца ашчаджаць капейку, пакуль не пачаліся экспрапрыяцыі. Зрэшты, нашае буржуазіі яшчэ шмат чаго бракуе. Для некаторых творцаў выйсьце ўсё ж знойдзецца – эміграцыя, каапэрацыя. Аднак ня можна патрабаваць ад творчае й навуковае інтэлігенцыі большага, да-прыкладу, стварацъ свой бізнэс. Бо, па-першае, бізнэс у сфэры культуры – гэта толькі бізнэс, па-другое, ня ўся культура паддаецца капіталізацыі, бо яе плён часам заўважны толькі празь вялікі тэрмін. Дзеля таго ва ўсім разумным сьвеце існуе акадэмічная нацыянальная культура й навука. Без магутнае дзяржаўнае рукі сёньня ня ўявіш сабе ні ангельскага тэатру, ні французскага кіно...

Тым часам пануючыя колы дзяржавы вызначыліся ў прыярытэтах: калі ў 1990 г. на праваахоўныя органы траціліся 1,1% бюджэту, то ў 1993 ужо 5,2%, а сёньня блізу сямі... У 1990 колькасьць злачынстваў склала 75,5 тыс., ў 1993 – 103,3 тыс., а сёньня ўжо на трэць болей. На што йдуць грошы? Як завецца дзяржава, якая на карныя сілы траціць ў пяць (!) разоў большыя сродкі, чым на культуру, мастацтва, СМІ ды рэстаўрацыю разам?..

Ігар Бабкоў

адсутнасьць
што прырастае да твару
набрынялая цішынёю
далёкай, забытай
нібы начныя прысады
дзе вецер
вядзе перамовы
зь цемрай
бясконцай
як успамін аб дзяцінстве

о, гэтыя сны на руінах
сьвету!
ён прыйдзе:
дрымучы, цёмны
герой вайны за праз**ы**стасьць

Андрэй Антонаў

З гулам крыгі пад
Нагамі плывуць. Хто мяне
За крысо затрымае?

Спыніся будзік.
Мая мама хоча
Спаць.

Зялёная рунь,
Шэрае неба. Якога
Колеру былі ў яе вочы?

Закінутая хата
У павуціньні –
Матыль засохлы.

Дождж. Спаць іду з
Надзеяй, што заўтра
Горад патоне.

Над дохлай коткай
Дзяўчо ўкленчыўшы плача.
Ужо вечарэе.



БЭСТСЭЛЕРЫ

(другі й трэці кварталы 1995 г.)

на падставе дадзеных буйнейшых менскіх кнігарняў. Улічваліся толькі кнігі беларускіх выдавецтваў і колькасьць прададзеных асобнікаў

МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Караткевіч Уладзімер. Зямля пад белымі крыламі. Дзікае паляваньне караля Стаха.
2. Гарэцкі Максім. Творы: Апавяданьні, аповесьці.
3. Разанаў Алесь. Паляваньне ў райскай даліне: Вэрсэты. Паэмы. Пункціры. Вершаказы. Зь Веліміра Хлебнікава. Зномы.
4. Багдановіч Максім. Поўны збор твораў: У 3 т. Т. 3. Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцьця і творчасьці.
5. Шэрман Карлас. Таямніцы почырку: Літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ.

Тое, што з жывых у нас найболей чытаюць пэн-цэнтрыстаў, *заходнікаў*, а зь мёртвых – эўрапейцаў, якіх ніяк не назавеш панславістамі ці "почвенниками" – гэта знак. Гэта значыць, што спажывец беларускай культуры пазірае сёньня зусім ня ў той бок, куды пазірае "электарат" і куды скіраваная афіцыйная ідэалёгія. Імёны большасьці пераможцаў – наша сымболіка Захаду. Магчыма, гэта сьведчыць і пра тое, у якім кірунку беларуская культура мае найбольшы й найбольш адпаведны сваёй сутнасьці посьпех.

Яшчэ адзін знак сьпісу – гэта сьпіс выключэньняў. Тут няма "тыповых" прадстаўнікоў беларускай прозы. Гэта значыць, што "тыповых" або не чытаюць або не выдаюць. Тут няма і маладых літаратараў. Напэўна, таму, што яны яшчэ не перайшлі ў катэгорыю аўтараў з катэгорыі чытачоў. Але мы ведаем, *што* яны чытаюць.

Цікава, што пры ўсёй выключнасьці пералічаных аўтараў, яны прадстаўляюць ці ня ўсе галоўныя этапы разьвіцьця нацыянальнае літаратуры ў XX ст. І гэта таксама паказвае, куды ідзе самая наша літаратура. І яе кірунак – адваротны афіцыйнаму.

Нарэшце, апошняе, што кідаецца ў вочы. У параўнаньні з папярэднім сьпісам бэстсэлераў, дзе тры зь пяці кніг былі перакладныя, у гэтым – усе арыгінальныя. Наўзамен перакладным мы маем кнігі *перакладабельныя*. Усе аўтары тут, у адрозьненьне ад "почвенников", былі й ёсьць адкрытыя сьвету, мовам, іншым культурам: ці то іх найбольш актыўна перакладалі, ці то шмат і плённа перакладалі яны.

Крыт.

ЛІТАРАТУРА ФАКТУ

1. Бутрамееў Уладзімір. Вялікія і славутыя старажытнага сьвету: Энцыкляпэдыя для дзяцей.
2. Віцьбіч Юрка. Плыве з-пад Сьвятое Гары Нёман.
3. Богданович А.Е. Пережитки древняго миросозерцания у белоруссов: Этнографический очерк.
4. Сагановіч Генадзь. Невядомая вайна: 1654-1667.
5. Нясьвіж. Nyasvizh. Nieśwież: Альбом.

Кніжка Уладзімера Бутрамеева «Вялікія й славутыя старажытнага сьвету» займае першую пазыцыю ня толькі дзякуючы свайму саліднаму накладу – 10 000 асобнікаў. Гэта рэдкая беларуская кніжка на сусьветнай гісторыі й культуры, напісаная, апроч іншага, з разьлікам на дзіцячае ўспрыманьне. Таварны знак выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя» таксама гарантуе камэрцыйны посьпех.

Выразная асаблівасьць кнігі – індаэўрапейскі фон. Кожнага разу, калі ёсьць падстава, аўтар апэлюе да індаэўрапейскай агульнасьці, да сваяцтва *гістарычных* народаў. Яшчэ адна адметнасьць – сынхранізацыя. Пэрсаналіі пададзеныя не па альфабэту, а паводле храналягічна-геаграфічнага прынцыпу, г.зн. прынцыпу гістарычных эпох. Гістарычныя асобы супастаўляюцца ў тэксьце; акрамя таго, сынхронныя табліцы пэрсаналій пададзены на фарзацах. Такім чынам дасягаецца максымальны дыдактычны эфэкт.

Посьпеху кнігі спрыялі таксама ілюстрацыі. Іх шмат, яны рэпрэзэнтатыўныя ў дачыненьні да тэмаў. Але застаецца ўражаньне, можа да канца не апраўданае, што некаторыя ілюстрацыі падлягалі цэнзуры – шырока вядомым выявам Апалёна й Афрадыты, да прыкладу, пакідаюць толькі верхнія часткі цела.

Часам спатыкаесься аб некаторыя русізмы. Усе гэтыя "управляць", "правіцель", "прадвадзіцель" значна парушаюць структуру тэксту. Прабраліся таксама памылкі набору – пазначана, што Аларых жыў у 370-410 г. да н.э., а Атыла памёр у 453 г. да н.э. (с. 169). Насамрэч, гэтыя лідэры жылі ўжо пасьля Нараджэньня Хрыстовага.

Ня ведаю, ці можна лічыць недахопам кніжкі тое, што ў ёй адсутнічае апэляцыя да беларускага матэрыялу. Усё ж кніжка выглядае досыць цэльна. Але каб падобную энцыкляпэдыю пісаў я, дык у разьдзеле аб Аляксандры Македонскім узгадаў бы аб старабеларускіх перакладах «Александрыі»; у разьдзеле аб хрысьціянстве не задаволіўся б толькі канстатацыяй таго, што "хрысьціянская рэлігія распаўсюдзілася па ўсёй зямлі", але ўзгадаў канфэсійную сытуацыю ў Беларусі й тое, што беларусы маюць тысячагадовую традыцыю хрысьціянства. Дарэчы, некаторы ілюстрацыйны матэрыял таксама мог быць беларускім – у мастацтве эпохі клясыцызму выкарыстоўваліся антычныя сюжэты.

Уладзімер Бутрамееў заканчвае энцыкляпэдыю «Вялікія й славутыя старажытнага сьвету» абяцаньнем выпусьціць падобную кнігу пра сярэднявечча.

□□□

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» працягнула сваю традыцыю і выдала яшчэ адзін рэпрынт – кнігу Юркі Віцьбіча «Плыве з-пад Сьвятое Гары Нёман». Нарыс прысьвечаны паходжаньню й лёсу геаграфічных назоваў Беларусі "паводле навуковых дадзеных і народных паданьняў". Гэтая кніга акумулюе вялізную колькасьць фактуры – уласна тапонімы, даты, падзеі, асобы... Але дзіва – пры такой інфармацыйнай насычанасьці кніжка чытаецца зусім лёгка і вартая аднаго вечару нашага жыцьця. Эфэкт такой чытабельнасьці спачатку незразумелы. Потым ужо заўважаеш, як аўтар працаваў над фарматам тэматычных блёкаў – апісаньне гісторыі паходжаньня аднаго тапоніму рэдка калі займае больш за паўстаронкі, і пры ўсёй сваёй сьцісласьці яно не перагружанае інфармацыяй. А вось гэтая апошняя рыса тлумачыцца яшчэ адным аўтарскім прыёмам, па сутнасьці

БЕЛАРУСІ

няхітрым, – здольнасьцю ўбачыць незвычайнае ў звычайным. "Мы Беларусы пагэтулькі прызвычаіліся да дарагіх нашаму сэрцу геаграфічных назоваў свае краіны, што часам проста не заўважаем іхняе свасасаблівасьці і прыгажосьці". Праз гэтае сіта своеасаблівасьці і прыгажосьці ідзе адбор фактуры, трапляе яна на старонкі кніжкі ня ўся, але самая характэрная й цікавая. Адметнасьць почырку кнігі Віцьбіча – паэтычныя цытаты да канкрэтных назоваў, датаў, падзеяў. Па-свойму нарыс зьяўляецца паэтычнаю анталёгіяй беларускіх гістарычных назоваў.

Такім чынам, паўстае інтэграцыйны праект Віцьбіча: розныя жанры літаратуры, розныя гістарычныя эпохі, розныя вэрсіі – ўсё пад адною вокладкай. Гэты нарыс будзе блізкі для ўсіх жыхароў краіны: "Мы Беларусы незалежна ад таго, скуль мы – ці з-над Дзьвіны, ці з-пад Прыпяці, ці з-над Дняпра, ці з-пад Бугу, ведаем, як цячэ Нёман праз Налібокі і Дакудаўскія дубовыя лясы, перахапіўшы ў дарозе Бярэзань і Шчару".

У сваіх аповедах аўтар апэлюе да таго, што было і ўсё адно не адпусьціць – да досьведу "нашае Прамаці – старое й мудрае Эўропы".

□□□

Яшчэ адзін прыклад папулярнасьці рэпрынтаў – кніга Адама Багдановіча «Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов». Гэта грандыёзны праект, як і сама ідэя рэпрынтаў, як выдавецкі тытул на кніжцы: "Да 100-годзьдзя выхаду кнігі". Фраза з адваротнага боку тытула арыгіналу набывае сымболіку: "Дозволено цензурою 3-го Іюля 1895 г. – Г. Вильна". Засталася Вільня, аднаўляецца цэнзура.

Сама кніжка геніяльная. Гэта больш маштабнае выданьне, чым канкрэтны аналіз паданьняў і забабонаў. Ці, дакладней, праз паданьні й забабоны Адам Багдановіч ідзе да разуменьня тых канстантаў этнічнага характару, якія ў розныя пэрыяды могуць рабіцца дамінантамі народнага жыцьця. Беларускі кансэрватызм прачытваецца А.Багдановічам як негістарычнасьць, беларускі чалавек пражывае дзень, "забывая то из своего прошлого, что не имело непосредственного отношения к текущей действительности, не заглядывая далеко в будущее, словом – не выходя из узкаго круга чувствований и идей, которые давала повседневная жизнь, бедная событиями". "Среди белоруссов почти не сохранилось исторических сказаний, так как этот народ несколько веков не жил исторической жизнью". У такіх умовах для стабілізацыі этнічнага арганізму асабліве значэньне набываюць "окаменелости прошлой действительности" – абрады, што суправаджаюць "жыцьцё беларуса ад калыскі да магілы", і якія могуць падацца аўтару «Пережитков...» "крайне дикими с точки зрения цивилизованного человека". Алесь Бяляцкі ў камэнтары да кніжкі спрабуе спрачацца з Адамам Багдановічам: "Тое, што аўтар называе "акамянеласьцю мінулай рэчаіснасьці", на самой справе зьяўляецца пацьвярджэньнем багатага... духоўнага сьвету беларускага народу, якому можа пазайздросьціць любая эўрапейская нацыя".

Але й сам А. Багдановіч ня ніша, што гэтыя абрады – прычына адсталасьці беларусаў. Магчыма, разгадка ў тым, што антыгістарызм мог стаць штодзённым прагматызмам, мог стаць у рэшце рэшт гістарычным рухавіком беларусаў. Тут патрэбна элемэнтарная заможнасьць. "А для этого необходимы известные условия, как например – некоторая материальная обеспеченность, дающая досуг для наблюдений, исследований и обобщений... К ней-то мы теперь и обратимся".

Расейская акупацыя ў XX ст. была, апроч іншага, савецкаю па форме, люмпэнаўскаю. Акупацыя абудзіла самыя пачварныя рысы характару беларусаў, якія ў іншых умовах маглі й не праявіцца. Калі ўжо няма старажытных абрадаў і забабонаў, што зьнішчаныя ўрбанізмам, дык "акамянеласьці мінулай рэчаіснасьці" пераўтвараюцца ў жахлівыя ўчынкі.

Адам Багдановіч пісаў пра такую магчымасьць.

□□□

Кніга «Невядомая вайна» была напісаная колькі гадоў таму. Спачатку яна мелася выйсьці ў выдавецтве «Беларусь», калі там яшчэ працаваў Аляксандар Лукашук. Кастусь Тарасаў прапанаваў выдаць яе большым накладам, і кніга была перададзеная яму. Арганізацыйна-фінансавыя праблемы не дазволілі рэалізаваць гэты праект. «Невядомая вайна» перайшла ў выдавецтва «Навука й тэхніка». Недзе на адным з этапаў гэтай эпапеі рукапіс быў здадзены ў часопіс «Спадчына», дзе на працягу гадоў 1993 (№3-6) – 1994 (№1) друкаваўся часопісны варыянт. Такім чынам, публікацыя кнігі зацягнулася, але яшчэ да выхаду з друку кніга атрымала пэўную вядомасьць. Прыгоды пасьля выхаду кнігі ня скончыліся. 10 000-ы наклад дазваляў «Невядомай вайне» падняцца вышэй у сьпісе бэстсэлераў, спрыяў гэтаму таксама назоў. Але кнігу, падобна, заблякавалі. «Белкніга» адразу ўзяла толькі 1500 асобнікаў, і ў выніку была прададзена нязначная частка агульнага накладу. Цяпер кніга зноў зьявілася ў кнігарнях.

«Невядомая вайна» стваралася на падставе апублікаваных крыніц, фактаў, якія здавалася б былі схаваныя ня надта глыбока. Але да гэтай кнігі беларуская гісторыяграфія падыходзіла толькі да некаторых аспэктаў гаспадарча-дэмаграфічнай катастрофы ў Беларусі ў сяр. XVII ст. Аўтар «Невядомай вайны» зьвязаў і зьвёў пад адну вокладку розныя раней сюжэты: вайна паміж Маскоўскаю дзяржаваю і Рэччу Паспалітай 1654-1667 г., перасяленьні (рэальна – прымусовы вываз) беларусаў у Расею, гаспадарчы заняпад беларускіх земляў у сяр.-др.пал. XVII ст., дэмаграфічная катастрофа сяр. XVII ст. Да таго ж, аўтарскі аповед публіцыстычны, псыхалягічна напружаны.

Яшчэ адна выразная рыса кнігі – выверанасьць тэрмінаў і гістарычных назоваў. Аўтар найбольш пасьлядоўна з усіх беларускіх гісторыкаў працуе ў гэтай галіне. Вылучаецца гэтая кніга і сваім дадаткам: няма яшчэ індэксу, але ёсьць біяграфічныя зьвесткі.

«Невядомая вайна» служыць паўнаце гістарычнай карціны. Тым больш, што падзеі, якім прысьвечана кніга, раней альбо абміналіся, альбо фальсыфікаваліся. Але можна паспрачацца з адною з асноўных ідэй кнігі, імплікаванаю практычна ва ўсім тэксьце, а найбольш – у заключнай частцы: ідэяй жорсткага дэтэрмінізму. Разьвіцьцё тых думак, што выказвае аўтар, вядзе да прызнаньня заканамернасьці гісторыі Беларусі – катастрофа сяр. XVII ст. вызначыла далейшы шлях краіны. Гэткая думка сапраўды апраўдваецца, калі бярэцца гісторыя як дадзенасьць, калі падзеі сяр. XVII – кан. XVIII ст. і далей разглядаць як адную плынь. Тут, безумоўна, працуюць законы фармальнае лёгікі. На нашую думку, шмат якія сюжэты беларускай гісторыі мелі альтэрнатыўныя варыянты рэалізацыі. Падзеі сяр. XVII ст. стварылі базу для аднаго з напрамкаў разьвіцьця.

Зрэшты, мая заўвага ня носіць крытычнага характару ў дачыненьні да таго канкрэтна-гістарычнага матэрыялу, зь якога складаецца кніга. Гэта рэфлексія хутчэй агульнакультурнага характару, чым разьвіцьцё гістарычнага дыскурсу. Гэта прызнаньне йснаваньня дзвюх ісьцін – непасроднай (інтуітыўнай) і апасродкаванай (што прымаецца на падставе доказаў).

Кніга Генадзя Сагановіча была разьлічаная на посьпех – фактураю, назовам, ілюстрацыямі. «Невядомая вайна» – прыклад прадуманага кніжнага праекту.

□□□

Альбом «Нясьвіж» папросту прыгожая кніжка. Фотаілюстрацыі ў большыні сваёй падаюцца выверанымі, адабранымі. Таму што фотамастак Валянцін Ждановіч рабіў свае здымкі ў Нясьвіжы на працягу дзесяцігодзьдзяў. Ілюстрацыі для альбому адбіраліся з шматлікіх здымкаў, а не былі вынікам аднае экспэдыцыі. Сам Валянцін Ждановіч альбом ужо не пабачыў.

Ва ўступным тэксьце Валерыя Дранчука ключавыя словы – "эўрапейскі час". У далейшых камэнтарах да ілюстрацый частае вызначэньне "Усходняя Эўропа".

Але ў тых жа камэнтарах прысутнічае занадта вольнае абыходжаньне з фразамі кшталту "адзін зь першых". Да прыкладу: "Сымон Будны... заснаваў друкарню й выдаў у 1562 г. «Катэхізіс» – першую кнігу на беларускай мове... У ёй Будны выступаў супраць каталіцызму". За што ён выступаў, да якой канфэсіі належаў – у камэнтарах не пазначана. Сучасны чытач можа падумаць што заўгодна, пра арыянства ўзгадаюць нямногія.

Адзін зь нясьвіскіх слайдаў Валянціна Ждановіча быў выдадзены асобнай паштоўкаю.

□□□

Сьпіс бэстсэлераў фіксуе цікавасьць пакупнікоў кніг да гісторыі Беларусі. Таксама заўважна, што выдавецтвы ўжо могуць прапаноўваць літаратуру на сусьветнай гісторыі. Прачытаньне ўсёй гэтай фактуры зь беларускага гледзішча будзе спрыяць, падобна, камэрцыйнаму посьпеху падобных выданьняў.

Ян Грэчыц

НОВЫЯ КНІГІ

мастацкая літаратура, крытыка, эсэістыка

Багдановіч Максім. Поўны збор твораў: У 3 т. Т. 3. Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцьця і творчасьці. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. - 461 с. 7000 ас.

Гарэцкі Максім. Творы: Апавяданьні, аповесьці / Укладаньне Т.Голуб. – Менск: Мастацкая літаратура, 1995 – 446 с. (Сэрыя «Бібліятэка беларускай класыкі») 8000 ас.

Залоска Юрась. Вэрсіі. Шлях да Храма "idea sui": дзёньнік, дыялёгі, эсэ / Мастак У.Бойка. – Менск: Незалежная выдавецкая кампанія «Тэхналёгія», 1995. - 463 с. 2500 ас. ISBN 985-6234-01-8

Караткевіч Уладзімер. Зямля пад белымі крыламі. Дзікае паляваньне караля Стаха. – Менск: Юнацтва, 1995. (Сэрыя «Школьная бібліятэка») 20 000 ас.

Розанаў Алесь. Паляваньне ў райскай даліне: Вэрсты. Паэмы. Пункціры. Вершаказы. Зь Веліміра Хлебнікава. Зномы / Мастак С.Чарнавіч. – Менск: Мастацкая літаратура, 1995. – 287 с. 2000 ас.

Шэрман Карлас. Таямніцы почырку: Літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ. – Менск: Мастацкая літаратура, 1995. - 255 с. 1000 ас. ISBN 985-02-0059-6

літаратура факту

Адраджэньне: Гістарычны альманах. Вып. 1 / Складальнік і навуковы рэдактар А.Грыцкевіч. - Менск: Універсытэцкае, 1995. – 259 с. 8000 ас. ISBN 985-09-0088-1

Без-Корнилович М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / Факсімільнае выданьне. – Менск: Алфавіт, 1995. - 358 с. 5000 ас. ISBN 5-87264-028-5

«Беларускі кнігазбор». Плян-каталёг: Шматтомнае выданьне беларускай літаратуры і літаратуры пра Беларусь ад старажытнасьці да нашых дзён / Складальнік Кастусь Цьвірка. – Менск: Міжнародны фонд «Беларускі кнігазбор», 1995. – 32 с. 1000 ас. ISBN 985-431-012-4

Богдонович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов. Этнографический очерк / Рэпрынт паводле выданьня: Гродно: Губернская Типография, 1895. – Менск: Беларусь, 1995. – 186 с. 6000 ас. ISBN 985-01-0057-5

Бутрамееў Уладзімір. Вялікія і славутыя старажытнага сьвету: Энцыкляпэдыя для дзяцей. – Менск: БелЭн, 1995. – 175 с. 10 000 ас. ISBN 985-11-008-0

Васілеўская Н.У. Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме (пра наркома асьветы Беларусі А.В.Баліцкага) / Пад рэд. У.А.Палуяна. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. – 78 с. (Сэрыя «Вернутыя імёны») 840 ас. ISBN 5-343-01240-X

Віцьбіч Юрка. Плывe з-пад Сьвятое Гары Нёман: Мастацкі нарыс. Частка 1 / Рэпрынт паводле выданьня: Мюнхэн: Бацькаўшчына, 1956. – Менск: Мастацкая літаратура, 1995. - 96 с. 9000 ас. ISBN 985-02-0155-x

Ганецкая І.У. Маёлiка на Беларусі ў XIII-XVIII ст. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. – 120 с. 1760 ас. ISBN 5-343-01566-2

Гануш А.Г., Кручок П.С. Мітрафан Доўнар-Запольскі. – Менск: Агенцтва «Геронт-А», 1995. – 31 с. 1000 ас.

Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: Новыя канцэпцыі і падыходы: У 2 ч. Ч. 2. Сусьветная гісторыя / Навук. рэд. У.С.Кошалеў. – Менск: Універсытэцкае, 1995. – 232 с. 1190 ас. ISBN 985-09-0062-8

Гісторыя Беларусі: Даведачна-інфармацыйнае выданьне / Пад навук. рэдагаваньнем А.Г.Каханоўскага і А.А.Яноўскага. – Менск: НПЧ «Фінансы, улік, аўдыт», 1995. – 240 с. 5000 ас.

Дучыц Л.У. Касьцюм жыхароў Беларусі X-XIII ст. (паводле археалягічных зьвестак) / Пад рэд. Г.В.Штыхава. – Менск: Навука і тэхніка, 1995 с. 2660 ас. ISBN 5-343-01525-5

Зайкоўскі Эдвард, Тычка Галіна. Старадаўняя беларуская кухня. – Менск: Ураджай, 1995. – 287 с. 2000 ас. ISBN 5-7860-0742-1

Левін Лія. Правы чалавека: Пытаньні і адказы / Мастак Планту – Менск: Беларусь / ЮНЕСКО, 1995. – 88 с. 2000 ас. ISBN 985-01-0074-5

Лёсік Язэп. Граматыка беларускае мовы. Фонэтыка / Рэпрынт паводле выданьня: Менск: Выдадзена коштам аўтара, 1926. – Менск: Народная асьвета, 1995. - 132 с. (Сэрыя «Беларуская мова: гісторыя і сучаснасьць») 6150 ас. ISBN 985-03-0249-6

Лоўзі Джон. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі / Пер. з анг. А.Карцеля; Пад рэд. У.Бяркова, Ю.Залоскі. – Менск: Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 328 с. (Сэрыя «Адкрытае грамадзтва») 5000 ас. ISBN 985-6022-10-X

Макеева Г.П., Цэдрык М.С. Фізычныя парадоксы і займальныя пытаньні. – Кн. для вучняў. – Менск: Народная асьвета, 1995. – 223 с. 16 300 ас. ISBN 985-03-0225-9

Мысьліцелі і асьветнікі Беларусі: Энцыкляпэдычны даведнік. – Менск: БелЭн, 1995. – 671 с. 6000 ас. ISBN 985-11-0016-1

Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска: Воспоминания старожила. – Менск: Полымя, 1995. – 149 с. (Сэрыя «Літаратурныя помнікі Беларусі») 1000 ас. ISBN 985-07-0015-7

Нясьвіж. Nyasvizh. Nieśwież: Альбом. На беларускай, ангельскай, польскай мовах / Укладальнік М.Дзелянкоўскі. Аўтар тэксту В.Дранчук. Фота В.Ждановіча. Мастак А.Жданоўская. – Менск: Беларусь, 1995. – 128 с. 5000 ас. ISBN 985-01-0086-9

«Погоня» ў сэрцы – тваім і маім: Зборнік / Складальнік і навуковы рэдактар Анатоль Цітоў. – Менск: Беларускае выдавецкае таварыства «Хата», 1995. – 124 с. 2000 ас. ISBN 985-6007-22-4

Сагановіч Генадзь. Невядомая вайна: 1654-1667. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. – 144 с. 10 000 ас. ISBN 5-343-01637-5

Снапкоўская С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. – Менск: Народная асьвета, 1995. – 128 с. 5000 ас. ISBN 985-03-0232-01

Сысоў Уладзімір. Беларуская пахавальная абраднасьць: Структура абраду, галашэньні, функцыі слова і дзеяньня. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. – 182 с. 500 ас. ISBN 5-343-01489-5

Эрме П. Культура і дэмакратыя. – Менск: Беларусь / ЮНЕСКО, 1995. – 144 с. 2000 ас. ISBN 985-01-0070-2

Ярмоленка Валеры. За далягляда Айкумэны: Іван Чэрскі. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. – 59 с. (Сэрыя «Нашы славутыя землякі») 3000 ас. ISBN 5-343-01564-6

Яскевіч А.А. Творы Ф.Скарыны: Жанравая структура, філязофскія погляды, мастацтва слова / Навук. рэд. У.В.Гніламёдаў. – Менск: Навука і тэхніка, 1995. – 144 с. 1390 ас. ISBN 5-343-01503-4

паштоўкі

Беларуская кафля. Камплект паштовак (33). На беларускай і ангельскай мовах / Складаньне і тэкст А.Трусава – Менск: Беларусь, 1995. 5000 ас.

Менск: камплект паштовак (12) / На беларускай, ангельскай, нямецкай мовах. Аўтар-складальнік А.Дзярновіч. Выданьне 3. – Менск: Беларусь, 1995. 15 000 ас.

Нясьвіскі замак. Помнік архітэктуры XVI-XVIII ст. / Фота В.Ждановіча. – Менск: Беларусь, 1995. 18 200 ас.



Проза па-пластунску

Вашко Л. Эўрапейскія гісторыі: Апавяданьні. – Менск: Мастацкая літаратура, 1995.

Ёсьць гульня. У яе ёсьць правілы. Неістотна, ці ты гуляеш у шахматы, клясыкі альбо ў чу. Ты прытрымліваесься правілаў. Інакш не бывае. Літаратар жа стварае *свае* правілы гульні або ён не літаратар, а трывіяльны эпігон. Калі б ня гэтая аксіёма, то чытачу было б усё адно, каго чытаць: Караткевіча ці Адамчыка, Брыля ці Гарэцкага. Толькі таму ў Васі на паліцы стаіць Гамэр, а ў мяне Гарэцкі. Яшчэ на маёй кніжнай паліцы ёсьць пакуль што першая кніжка Лявона Вашко «Эўрапейскія гісторыі».

Лявон Вашко дэбютаваў у рэспубліканскім друку яшчэ ў старой «Крыніцы», зь якой напачатку хацелі зрабіць беларускі «Огонек», пасьля часопіс для пэтэвэшнікаў, а пасьля – тое, што зрабілі. Аповед называўся «Кызючка». Тады я ня мог зразумець, што мяне падкупіла ў гэтым творы. Праз добрых паўдзясятка гадоў, калі маёй другой мовай стала музыка Эрыка Саці ды Філіпа Гласа, магу дакладна сказаць, што ў гэтым апавяданьні было маё. Мінімалізм.

Кніга не падманула спадзяваньняў. Адчутая некалі аўтарам прыгажосьць і самадасканаласьць простай формы, адсутнасьць уласнага стылю як такога, сумневы ва ўсемагутнасьці псыхалягізму. Тое, што было пасаджана, вырасла. У беларускай літаратуры зьявіўся першы прынцыповы й высокаклясны пісьменьнік-мінімаліст. Мае віншаваньні.

Сюжэты аповедаў гэтай кнігі маглі б стаць падставай для значных па сваім аб'ёме раманаў, але аўтар лёгка, спакойна ды найкарацейшым шляхам ідзе празь лябірынт. Яго нічога не зьбівае з панталыку. Там, дзе трэба рваць сабе кішкі ды намагацца ўзяць высокі бар'ер, Вашко папросту пралазіць пад ім па-пластунску, спакойна страсае бруд з каленяў і йдзе далей, нясьпешным разьмераным крокам. За ім не заўважыш пыхі. Менавіта такія людзі шукаюць ня выйсьце з пабудаванага імі ж лябірынту. Яны йдуць да сваёй Арыядны. У кнізе няма аўтарскага стаўленьня да таго ці іншага героя. Хай сабе, здарылася сьмешная сьмерць. Яна сьмешная для герояў і, можа быць, для чытачоў. Для Вашко гэта толькі факт. Цікавы факт для ягонага ўласнага летапісу. Нехта-нейкі памёр, а людзі сьмяяліся. Ня добра гэта і ня дрэнна. Няма ацэнкі, няма пошуку па прынцыпу "а можа.. а калі б...". Гэтыя пытаньні пакідаюцца героям. Ёсьць канстатацыя, у якой цікавы сюжэт і сродкі яго рэалізацыі. Кніга – гэта крыжаванка, запоўненая словамі-амонімамі. Няхай чытач сам дапісвае непатрэбныя аўтару пытаньні.

Займеньнік "Я" зь вялікай літары тут адсутнічае, аўтар хавае яго для Сябе. Лявон Вашко зайшоў у цягнік і сеў у абсалютна пусты вагон, у той час, калі ў суседніх проста не прадыхнуць. Добра езьдзіць у цягніках пры адсутнасьці суседзяў па купэ, якія любяць выпытваць, адкуль ты і што. Ты едзеш сам па сабе. Чалавек у капелюшы. Проста чалавек. Проста аўтар. Так лягчэй і прасьцей за ўсё застацца сабою.

Такую кнігу мог бы напісаць ці ня кожны з нас. Але не напісаў. Гнаны мітусьнёю, істэрыкай, жыцьцёвымі абставінамі, прабег вагон, у якім можна класьці ногі на лаўку, паліць ці проста глядзець у вакно.

Андранік

Сонца за вакном і каравяк на дарозе

Андрэй Федарэнка. Вёска. Аповесьць // Полымя, 5'1995.

Новая аповесьць А.Федарэнкі «Вёска» сьведчыць пра тое, што яе аўтар пасьля некалькіх сумбурных кніжак "прымачыў віхры" – навучыўся пісаць роўна, гладка і шмат. Нішто не выпыркаецца ў «Вёсцы», нішто ня рвецца, нішто ня кліча. А.Федарэнка ўтаймаваў свой "саксафон" і акуратна па нотах выканаў "джазавы стандарт" беларускай савецкай прозы.

... Студэнта выгналі з універсытэту. Ён паехаў у свой Мазырскі раён, пакалыхаўся паміж "вобразамі мілымі роднага краю" і "ідыятызмам вясковага жыцьця", адчуў непрыкаянасьць і толькі пачаў быў сьпіваць, як яго аднавілі на вучобе...

Такога кшталту аповесьці ёсьць у добрай сотні беларускіх празаікаў і складаюцца ў роўны фон нацыянальнай прозы: ад «На ростанях» – да «На простынях» (як жартуюць калегі героя «Вёскі» па філфаку). Розьніца ў тым, што калі іншым празаікам такая аповесьць даецца сходу – як абавязковы нумар у дэбютнай праграме «Першай кніжкі празаіка», – то Федарэнка ўжо дагэтуль пасьпеў наламаць дроў і засьвяціцца, як асоба неардынарная. Іншымі словамі, зьяўленьне гэтага зусім абыклага твору – з знарочыста бляклым тэкстам, дзе няма ніводнай сваёй мэтафары (праўда, няма і "ляпаў", акрамя, хіба, выразу "пабітае шкло валялася на падлозе", – неадчуваньне матэрыялу) – было абстаўленае напружанымі пошукамі сэнсу літаратуры і сябе ў ёй.

Вынікам пошуку стала нешта накшталт крэда – тэкст мусіць быць максымальна звычайны й просты (пра сонца за вакном і каравяк на дарозе), а ўжо сама арыгінальная "душа" і чалавечая прырода аўтара выявіцца ў кантэксьце й зробіць твор непаўторным. Ня мае рацыі Борхес, – ускрыквае А.Федарэнка, – калі кажа пра ўсяго чатыры гісторыі. Іх, гісторый, – мільярды, як людзкіх жыцьцяў.

Не бяруся сьцьвярджаць, што Борхес усё ж меў рацыю, але дапускаю, што ня меў рацыі Федарэнка. Літаратура – ня "праўда", а праўдападабенства. У гэтым моц мастацкага ўзьдзеяньня, эстэтычная вартасьць і бясконцыя магчымасьці тыпізацыі, кантэксту. У "праўдзе" – мастацкая слабасьць літаратуры.

Паводле "бесьцялеснасьці" такая проза нагадвае кінасцэнар. Кінасцэнары, як правіла, "нетэкстуальныя". Але ж і арыгінальнага фільма зь «Вёскі» ня зробіш.

Захоплены сваім адкрыцьцём, аўтар "звычайным і простым" зрабіў ня толькі тэкст. Атрымалася пасрэднае апісаньне пасрэднага жыцьця: што героі, што ўчынкі, што матывацыі ўчынкаў. У такіх выпадках звычайна гавораць: аўтар не разгледзеў за будзённым – чалавечую камэдыю, за вёскай – сусьвет, за тыповым – экстраардынарнае. Справа ў тым, што кантэксту, на які ўсклаў такія спадзяваньні А.Федарэнка, у «Вёсцы» няма.

Крыт.

Разьвітальны сьпеў

Арон Скир. Еврейская духовная культура в Беларуси. Историко-литературный очерк. – Менск: Мастацкая літаратура, 1995.

Гэтая кніга – бадай першая за апошнія дзесяцігодзьдзі праца па гісторыі беларускага гэбрайства, калі не лічыць выкрывальных опусаў барацьбітоў супраць сіянізму. Горыч і пачуцьцё жалю за страчаную культуру, якая стагодзьдзямі прысутнічала на беларускіх землях, будзе блізкая кожнаму, хто ня лічыць сьмерць моваў і культураў натуральнай зьявай.

Дарэчы, напрошваецца шмат паралеляў у лёсах беларускай і гэбрайскай культураў на нашай зямлі. Заняпад традыцый, заняпад моваў, зьнішчэньне нацыянальнай інтэлігенцыі, асыміляцыя.

Аўтар не прэтэндуе на паўнату і ўсеахопнасьць тэмы. Кніга ўяўляе сабою пераважна агляд гістарычных падзей, літаратурных твораў з дадаткам уласных успамінаў, а таксама вызначэньнем сэнсу "духоўнасьці". Асноўным стрыжнем апісаньня зьяўляецца двухтомная праца з сэрыі "ізкер-біхер" (кнігі памяці) пра Менск. На жаль, пэўна з аб'ектыўных прычынаў, аўтар не скарыстаў іншыя кнігі памяці пра беларускія гарады й мястэчкі. Такіх кніг больш за 50, і напісаныя яны пераважна ў 40-я, 50-я, 60-я гады ў Ізраілі й Амэрыцы. У час, калі на месцах расстрэлаў і масавых забойстваў гэбраяў ня ставілі помнікаў, а там дзе ставілі, то пісалі на іх эўфэмізмы кшталту "3000 советских граждан", – дык вось, кнігі гэтыя зрабіліся помнікамі. Успаміны, артыкулы пра сваё роднае мястэчка, родны кут, сьпісы палеглых – амаль як у кнігах памяці выдавецтва БелЭН. З тым адрозьненьнем, што рабілася ўсё паводле іншых законаў – утвараліся зямляцтвы, шукалі грошы; маленькія зямляцтвы выміралі, не пасьпеўшы выпусьціць кніжку. У цэнтральнай і ўсходняй Беларусі зусім мала гарадоў і мястэчак, пра якія выйшлі "ізкер-біхер". Слуцак, Койданава, Віцебск, Бабруйск, разьдзел пра Гомель у зборніку і нарэшце двухтомнік пра Менск – вось і ўсё ў параўнаньні зь пяцьюдзясяткамі кніг аб заходняй Беларусі – ад Моўчадзі й Беліцы да чатырохтомніка пра Слонім.

А.Скір піша пераважна пра савецкую Беларусь. Гэбрайская культура зьнікала там хутчэй і саветызавалася таксама хутка. У 30-я людзі насілі заявы, каб гэбрайскую школу перарабілі на расейскую. Сёньня маем тое самае, толькі ў дачыненьні да сьвежарэанімаванай школы беларускай. Камуністы зь евсекцыі шчыра радаваліся, топчучы традыцыі свайго народу, зачыняючы сынагогі, перарабляючы гэбрайскі альфабэт. Думалі, што жыць будзе лепей, шчасьней. Так не атрымалася. Дзядзькі, што топчуць цяпер кволыя парасткі беларускага адраджэньня, таксама кажуць, што жыць будзе лепей, шчасьней. Так не атрымаецца. Евсекі, што насілі транспарантны "Могила Ленина – колыбель человечества", спачываюць у магілах без імёнаў, на Калыме або ў Трасьцянцы. Так пэўна будзе і з тымі, хто сёньня марыць легчы ў маўзалей побач зь Ленінам (а мо й замест яго).

Варта адзначыць, што менавіта беларускія землі далі сьвету сыянізм і яўрэйскі сацыялізм Бунду, гэтаксама як рэлігійныя рухі рацыянальнага хасыдызму – Хабад і маральна-этычны – Мусар. "Яўрэйскія буржуазныя нацыяналісты" Лэйзар Пэрлман, Хаім Вэйцман, Мэнахэм Усышкін, Нахум Гольдман, што далі свайму народу адроджаную мову й адроджаную дзяржаву – таксама былі духоўным плёнам беларускай зямлі. Айцамі гэбрайскага адраджэньня, згаданымі аўтарам, былі рабін Хаім Салавейчык і Хофец-Хаім, а таксама Аўром Карэліцэр (Хазон Іш), Аўром-Айзік Кук, Хацкель Абрамскі і шматлікія іншыя рэлігійныя дзеячы.

Цікава таксама ўзгадаць, што мянчук Лэйзар Маер спрычыніўся да стварэньня галівудзкай фабрыкі мараў (Мэтро-Голдвін-Маер студыя), а другі мянчук Довід Сарноў стварыў Радыёкарпарацыю Амэрыкі (RCA).

Лагодная беларуская зямля, акрамя геніяльных адраджэнцаў і духоўных лідэраў, нараджала таксама й геніяльных злодзеяў, як Мэер Сукаўлянскі з Горадні, што стаў Мэерам Ланскім, завадатарам арганізаванай злачыннасьці ў ЗША.

Былі й сьветлыя галовы, што шукалі для народаў шляхі да сумленных заробкаў – пінчук Шымон Кузьнец стаў Нобэлеўскім ляўрэатам у эканоміцы.

Паэма Іцхака Кацэпельсана з Карэлічаў «Сьпеў аб забітым гэбрайскім народзе» сталася адным з найбольш узрушвальных твораў пра Катастрофу.

Калі я гартаў гэтую кніжку пра гэбрайскую духоўную культуру, узіраўся ў фотаздымкі, у мяне ў вушах стаяла цішыня. Ціха, і ўсё. Сьціхла культура, цэлы духоўны кантынэнт сьціх. Я баюся гэтай цішыні, я не хачу гэткай цішыні.

Віталь Зайка

Супольны праект выдавецтваў «Наша Ніва» і «Мастацкая літаратура»

БАЛЯСЛАЎ ЛЕСЬМЯН

«Што да Лесьмяна,
то ён даказаў:
калі ўжо мае быць сон,
дык сон да самага дна».

Чэслаў Мілаш

- Фантастычная паэзія
- Сэцэсія
- Каханьне і сьмерць
- Неверагодныя здарэньні
- Замагільнае жыцьцё
- Баляды
- Антычныя матывы
- Прыгожая мова
- Клясычны правапіс

У КНІГАРНЯХ!

ГУЛЬНЯ

Зьміцер Бартосік

Зь якім бы вялікім задавальненьнем пазбавіўся я выпадковых сустрэчаў, ці то ў цягніку, ці яшчэ дзе, з сымпатычнымі мне людзьмі зь мінулага. Аднаклясьнікамі, аднакурсьнікамі ды іншымі баявымі таварышамі. Дакладна ведаю, што пасьля першых хвілінаў шчырай радасьці ды руканьняў павісьне ідыёцкае маўчаньне, пачнуцца марныя пошукі хоць нейкай узаемна цікавай тэмы. Аднак яе ўжо няма, і ўсё зьвядзецца да банальных "А памятаеш?" ці "Як справы?" Альбо – з адценьнем скрайняй зацікаўленасьці – "Ну як там Гомель?" Праз пару хвілінаў гэтая далікатна-абыякавая гульня пачынае мяне раздражняць. Бо й суразмоўцу відавочна не цікавы мой адказ, і мне сказаць асабліва няма чаго. Хоць бы й самому сабе.

– Ды ўсё я памятаю. І справы справяцца. А Гомель увогуле дзівосны. Як і жыцьцё ягонае... Канкрэтна?

Ну, нейкія мужныя хлопцы адламалі руку нейкаму невядомаму мне Ільічу на ўскраіне, чым прысьпешылі даўно чаканы ўсімі сумленнымі грамадзянамі дэмантаж. Насупраць маіх вокнаў падымаецца касыцёл, прыўносячы крыху забытай цывілізаванасьці ў бэтонна-панылы ляндшафт. Адвечны боль і надзея гомельскіх футбольных заўзятараў – «Гомсельмаш» нарэшце вылецеў зь першай лігі, чаго, зрэшты, усе заўзятары ад яго й чакалі. А незалежны тэлеканал «Нірэя» пачаў штодзённую трансьляцыю незалежных ад БТ ды ГТБ сэрыялаў.

Што да мяне, то я выкалочваю пэрфаратарам рублі з кішэняў родных месьцічаў, выціскаю эмоцыі сваімі срэбнымі струнамі з душаў сяброў-бяседнікаў ды чакаю бацьку, запрошанага сюды «Независимым» тэатрам на пастаноўку. Далібог, для мяне гэта падзея нашмат больш цікавая ды значная, чым усе футболы з касьцёламі. Але ж я забыўся сказаць пару словаў пра «Независимый». І гэта гаворачы пра Гомель!

Напэўна гомельскія будаўнікі вырашылі згуляць у супэрсучаснасьць, калі паставілі на рагу Замкавай і Кузьнечнай нейкую інстытуцкую будыніну, што складалася з 12-павярховага небасягу, шкляна-бэтоннай сьцяны ўздоўж вуліцы ды выпнутага зь яе кубу зь незразумелымі барэльефамі на фасадзе ў стылі Фэрнана Лежэ, які глыбаю навісае над уваходам. Удзень – у звычайную краму, а ўвечары – у рэстарацыю зь неафіцыйнаю назваю «Тры прыступкі» (дарэчы, чым ня назва для тэатра?). Тое, што ў гіганцкім кубе знаходзіцца глядзельная заля, мне асабіста і ў галаву не прыходзіла. Пакуль пару гадоў таму не зьявіліся над бэтонным брылём афішы «Независимого». У такі галодны час! У такім нетэатральным горадзе! Але, напэўна, зьявы жывыя не нараджаюцца без парадоксаў.

Каму ж дзякаваць за тое, што ў "другім горадзе рэспублікі" за колькі там стагодзьдзяў зьявіўся другі тэатар? Рэжысэру Натапаву, які пакінуў «Абласны драматычны» з купкаю лепшых актораў і распачаў сваю гульню? Ці містэру Фігліну, расейскаму мільянэру, на чые гроны зроблены гэткі вытанчаны падарунак роднаму месту? Так. У першую чаргу дзякуючы ім у Гомелі ўпершыню нарадзіўся тэатар па ўсіх правілах мастацтва. За свае тры гады, працуючы без правалаў, запрашаючы іншым разам маскоўскіх знакамітасьцяў, гуляючы на сваіх камэрных, невысокіх падмостках зусім неправінцыйна, «Независимый» зрабіўся нашмат больш цікаваю зьявай у нашым несталічным жыцьці, чым «Гомсельмаш» зь «Нірэяй».

Зь першых хвілінаў сустрэчы й да самага ад'езду баця не пераставаў уражвацца ды зьдзіўляцца, як тут "усё гэта" робіцца. Пачынаючы з аплочанай тэатрам бялізны ў беларускім цягніку й да адсутнасьці праблемаў ці то з рэквізытам, ці то з рэпэтыцыйным працэсам. Я ж даўно ўжо засумаваў па гульні ў "дарослага сына" й гасьціннага гаспадара. "Да, да. Уже другой страны". Таму з асалодаю прыняўся за ролю мясцовага гіда. Каб прыемныя эмоцыі не выветрываліся, я трымаў маршрут бліжэй да паадчыняных апошнім часам карчомак ды забягалавак і як мага далей ад усякіх БТ і СМІ, зірнуўшы куды, можна хутка працьверазець, патраніўшы над шалёнае "конскае" вока Бацькі некалькіх мільёнаў "гарамычных" сыноў.

Помніцца, Віктар Някрасаў красамоўна даказваў, што піць гарэлку лепш за ўсё ўдвох. Безьліч разоў я ўпэўніваўся ў слушнасьці гэтай аксіёмы. Але нашмат больш тонкая рэч – піць з тым, на каго яшчэ ўчора глядзеў зьнізу ўверх, рухі й інтанацыі каго пераймаліся нязмушана й трохі ганарліва і з кім паразмаўляць нароўных карцела ад нараджэньня й не надакучыць, спадзяюся, ніколі, як недагуляная ў дзяцінстве гульня. Гульня, дзе пытаньні ўсё больш для нас незразумелыя, а адказы ўсё больш асьцярожныя ды няпэўныя.

– Да отцепись ты с этой "сваёй краінай". Самому не надоело? Чужой ты тут. И почувствуешь ты это на башке своей при первых же успехах идеи вашей светлой, от своих же соратников-большевиков...

На жаль, я ведаю, хто з нас пераможа ў гэтай гульні. Я бачу гэта па сівізьне, якой паболела на ягонай галаве ад часу мінулай сустрэчы, па гэтых нэрвовых: "Куда ты лезешь?" Ды нікуды я ня лезу. Для гэтага я не настолькі імпэтны. Проста калісьці мне думалася, што я – гэта "Я". Аж трыкроць узрастаў ва ўласных вачох ад самай дробязнай, знойдзенай ў сабе непадобнасьці да іншых "Я". Пакуль не дасталеў да высновы, што я ўсяго толькі адзін сярод сабе падобных, з падобнымі думкамі й жаданьнямі. Калі, напрыклад, я думаю так, то чаму ў гэты ж самы момант некалькім тысячам "я" не падумаць гэтаксама. Мудра! І трэба ж было ў такім здаровым стане заразіцца гэтай, можа, апошняй сьветлай авантурай ня толькі майго жыцьця, а яшчэ некалькіх мільёнаў жыцьцяў. Ды, раптам, новае адкрыцьцё. Калі мяне, гэткага інэртнага й неамбітнага *яно* захапіла, то дзе ж астатнія? Энэргічныя, дзейныя, крутыя? Але ўголас я гэтага гаварыць ня буду. Я лепш разьлію пароўну рэшткі гарэлкі. Пасьля запалю, вазьму гітару й гульня набудзе бясьпечны характар. Пад «Темную ночь» з «Офицерским вальсом».

Пасьля я часьцяком забягаў на бацевы рэпэтыцыі, дзе ад дарослasьці маёй не заставалася й сьледу. Дзяцінства, завarожанае аднойчы надпісам "Тише! Идет репетиция", рэфлексіўна завалодвала мною. У пустой, цёмнай залі я зноў быў хлопчыкам, якога пусьцілі на бацькаву працу й дзе шумець нельга. Можна адно зьдзіўляцца недарэчнай прастаце цудоўнага пераўтварэньня, такой непадобнасьці да сябе чалавека, якога ведаеш усё жыцьцё, а цяпер нават па сабе адчуваеш волю таго, хто кіруе. Дакладней, гуляе ў прызначаную сабе аднойчы гульню, уваходзячы ў радасны раж, калі ўсё ідзе паводле ягоных правілаў.

Мне здавалася, што я ўжо пазбавіўся сэнтымэнтаў, набыў неабходны запас цынізму ў ацэнках прыдуманых гісторый. Але зноў быў уратаваны гэтай "несапраўднай" ягонай гульнёю. Брадвэйскаю казкай, амэрыканскай трызьняцінай, па вышэйшай мерцы прафэсіяналізму скроеная, пра невідушчага юнака, які сыходзіць з-пад надзейнай матчынай апекі ў цёмны сьвет у пошуках каханьня як доказу сваёй жыцьцяздольнасьці, як адзінага зразумелага сьвятла. І чым мацнейшая ягоная прага, тым небясьпечнейшае тое каханьне. Зыркай успышкай яно асьляпляе яшчэ болей і прыводзіць героя да загубы.

Посьпех быў неаспрэчны. Як яшчэ адзін доказ жыцьцяздольнасьці гэтага тэатру і бацевай справы. Ён заўтра паедзе, пакінуўшы мне трохі зайздрасьці да ягонай насыпяховай гульні ды безьліч пытаньняў без адказу наконт пасьпяховасьці маёй.

Пакуль усё гэта пісалася, з Масквы прыйшла вестка аб забойстве Рыгора Фігліна. Я хачу спадзявацца, што ягоная гульня ў Гомелі ня скончыцца. Але, баюся, убогай нашай незалежнасьці (ці незалежнасьці ўбогага) тэатар за расейскія грошы непатрэбны, хай і добры, і, нават, расейскі.

А мне што рабіць? Мне. Гледачу й прыхільніку ўсяго жывога й незалежнага. Снобу, які жадае прыйсьці з дамай на нашую «Таганку». Тэатралу, які даўно засумаваў па гульні на сапраўдных нэрвах.

Распачаць, нарэшце, сваю гульню. Уцягваючы ў яе ўсё болей гульцоў ды заўзятараў. Каб заўсёды мець пэўны адказ на пытаньне: "Як там справы?"

Гомель

Адбіткі пальцаў

Працяг з старонкі 1

крыкма крычыць менавіта пра яе: купі, купі! Спакушае цябе па-польску красамоўна: найдасканальшы водар... надзвычай шляхетны смак... вынік непараўнаўча стараннага пражаньня абавязкова найлепшых гатункаў, выбітна зьмяшаных. Пакаштуй сапраўдны смак сапраўднай кавы! і г.д. У рэшце рэшт ты капітулюеш.

На начох на заводзкіх комінах зьяўляюцца сьцягі. Раніцай яны расквечваюць аднастайнае неба. Міліцыя нават за свае заробкі лезьці на вышыню баіцца і толькі здымае з паверхні комінаў адбіткі пальцаў.

4.

З помніка Пілсудзкаму спаўзае белая шата. Ён задумна глядзіць у дол, абаперся на шаблю, у руцэ – маршальскае жазло. Грошы на помнік зьбіралі пяць гадоў, гарадзкія ўлады казырыліся, не згаджаліся даць месца на пляцы. Пацямнелае неба выбухае іскрамі салюту.

Калісьці ён сказаў на допыце, што – беларус. А пазьней ён разьбіў бальшавіцкае войска пад Варшавай, уратаваўшы Эўропу ад акупацыі, а сьвет – ад сусьветнае рэвалюцыі. У Менск-Літоўску ўтварыўся першы польскі авіяатрад, а ў Бабруйску – корпус Доўбар-Мусьніцкага. Паэт-палкоўнік, які ствараў і не стварыў беларускае войска, пахаваны на кракаўскіх могілках, памёр ад сухотаў. Усе вашыя паэты паміралі звычайна ад сухотаў. Адзін ля сіняга мора, іншыя – у савецкіх лягерох. Спрабавалі рыфмаваць нават генэралы. Нацыя паэтаў, якія пачалі з часам паміраць ад гарэлкі.

Лех Валэнса зноў адгадаваў пацучыныя вусы й перапрашае ў мікрафон беларусаў, што палякі нічога ім тады не зрабілі. Ён гаворыць зьбіўна, значыць, хвалюецца. Самі вінаватыя, гаворыш ты сабе. Пілсудзкі хацеў, але вырашаў ня ён, ён толькі камандаваў войскам.

5.

Горача. Вы п'еце каву з адзінай у горадзе жанчынай-пісьменьніцай. Пра фільм аб Сэнт-Экзюпэры яна гаворыць табе: ён быў падобны да лётчыка, але не падобны на пісьменьніка.

Рачныя цеплаходзікі зьмянілі сьцягі і здранцьвелі. Іх апанаваў летаргічны сон. У сваіх непрытомных сьненьнях яны церпяць ад смагі: рака зьмялела.

Гарачы, перапоўнены потнымі целамі тралейбус перапаўзае высокі рачны мост. Сонца ў зэніце. Ты марыш прачысьціць як сьлед галаву, змазаць нібы друкарку, закруціць спружыну, падсыпаць графітавага парашку, зьмяніць чорную вузкую стужку.

6.

На адной бананавай высьпе жаўнеры на чале з афіцэрамі (толькі ад кубінскіх інструктараў) штурмам захапілі прэзыдэнцкі палац. Як заўжды, на досьвітку. Парлямэнт разагнаны, канстытуцыя скасаваная. Арыштаванага прэзыдэнта трымаюць у кашарах. Прэм'ер-міністар – пад хатнім арыштам. Лейтэнант, які кіруе закалотам, абвясьціў па радыё, што дэмакратыя завяла астравітаў на няслушную дарогу, і войска мусіла сказаць сваё слова.

Ня ведаючы, што далей рабіць з уладай, лейтэнант быў змушаны прасіць прабачэньня ў арыштаванага прэзыдэнта.

7.

Сьлівы й алыча абсыпаюцца на асфальт. Растаптаныя абуткам. Апанаваныя гніеньнем. Акуляры за шэсьць марак зь цёмна-зялёнымі шкельцамі. Сэзон сканчаецца. Цэлы месяц цяпла, апошні летні. Ад штодзённай гарачыні баліць галава. *Panadol.* Амаль кожнага дня падстаўляеш яе пад душ. Вельмі асьвяжае. Але не дадае думак. Ад зьнясіленьня, разумовага вычарпаньня, якое заўжды зьнянацку й якога ніколі не пазьбегчы, ёсьць іншы замежны лек. Безь ніякай хіміі. А яшчэ нэўтралізуе ўплыў вялікай колькасьці кавы, якой таксама не пазьбегчы. Жоўцевай бурбалцы гэта спадабаецца.

Адзіны клопат – ня страціць здольнасьці пісаць, уратаваць штандар, не дапусьціць да поўнай капітуляцыі. Своечасова заводзіць гадзіньнікавы мэханізм, запраўляць атрамантам, падсілкоўваць калёрыямі, градусамі, пэрыядычна спраўджаць дыёптрыі, кардыяграму, вагу, тэмпэратуру, моц гуку, танальнасьць, часьціню літараў, іхні лік у радку, памер інтэрвалу. Стаўленьне да сябе як да мэханізму. Пад'ём а шостай, практыкаваньні, душ, кава, аркуш паперы і твой *ceramic pencil*.

Абкаканы ў цэнтры гораду птушкамі маршал даўно абыякавы да свайго лёсу. П'едэстал пад ягоным абцятым тулавам калісьці належаў тав. Сталіну. Платы заклееныя дзівакаватага выгляду вясковай бабай у хустцы. Бясплатна выганяе д'ябла, ратуе ад суроку, спыняе пісаньне пад

Працяг на старонцы 8

Некалькі дзён на паўднёвым захадзе

Наталья Бабіна

ОЖЭЛ БЯЛЫ

Брат, пагойсаўшы на чамадане, каб зачыніўся, заявіў: "У Італіі буду размаўляць зь дзецьмі адно па-беларуску. Напэўна, гэта будзе адзіны месяц у іхнім жыцьці, калі яны будуць чуць толькі беларускую ды італьянскую мовы".

Пазваніў знаёмы й паведаміў цікавыя для нас весткі. Паводле перапісаў насельніцтва, у Прылуках і Заказанцы ў 1905 годзе было ўдвая больш жыхароў, чым у 1921-м; у пятым усе запісаныя маларосамі, а ў дваццаць першым – беларусамі. "Польша ў той час ваявала з Украінай, таму ёй было выгадна рабіць выгляд, што ўкраінскага пытаньня ў нас не існуе, што мы – беларусы", – ставіць дыягназ брат. У 21-м годзе ў вёсках жыло каля 400 праваслаўных і адзін каталік. "Пан Родзай", – у адзін голас робім мы выснову, бо шмат чулі пра настаўніка пачатковай школы, якому на працягу дзясяткаў гадоў маленькія прылучанцы расказвалі на памяць: "Хто ты естэш? Поляк малы. Які знак твуй? Ожэл бялы..." Наша бабуля, калі ў гуморы, чытае цяпер гэты вершык сваёй маленькай праўнучцы. Падчас вайны, у 1939-м, менавіта пан Родзай выратаваў ад немінучай сьмерці заложнікаў – сваіх былых вучняў і іх бацькоў. Адзін толькі ён ведаў нямецкую. Пан Родзай насіў крухмальныя каўнерыкі і хадзіў з тростачкай.

Лядашчы самалёт, у якім брат вязе групу дзяцей на аздараўленьне, бярэ курс на поўдзень. У лядашчым цягніку едзем на поўдзень і мы з Поляй. Туды, дзе ў 1921 годзе сеялі жыта маларосы, а жалі – беларусы.

ПРАЗ БРЭСТ

Ад доўгага чытаньня трохі баліць галава. Літары скачуць у тахт грукату колаў. "У сілу жанра аўтар гэтай хронікі мусіць карыстацца толькі дакумэнтамі, агульнавядомымі фактамі ды найбольш распаўсюджанымі чуткамі", – стыль Камю, як заўсёды, выклікае асацыяцыю з глухаватым голасам стомленага чалавека.

А вось і Брэст – цудоўнае месца, дзе неўміручы дух жыцьця віруе з асаблівай зграбнасьцю. Дрэвы распускаюцца тут на два тыдні раней, чым у сталіцы, летам адсюль вее пахам трускавачнага варэньня, а восеньню харство залатых бульвараў, пабудаваных згодна з тым самым праектам, па якім будаваўся і Санкт-Пецярбург, прымушае забыцца, што некалі гарадзкі магістрат выдаткаваў грошы на тое, каб увесьці пасаду гарніста, які з ратушнай вежы кожную гадзіну трубіў хейнал, абвяшчаючы бег часу... Каменя на камені не засталося ад таго гораду. Няма вежы, няма ратушы, няма безьлічы цэркваў, касьцёлаў, кляштароў. Затое ёсьць невялікі камень, які знакуе гета. Тых, хто жыў у гета, няма.

АЎТАЛАЎКА

У Заказанцы працуюць. Пяспынна. Раз у тыдзень вяскоўцы зьбіраюцца разам – празь лес, сыгналячы на ўсю моц, праносіцца аўталаўка, і, зухавата разьвярнуўшы машыну ля старой вярбы, шафёр ператвараецца ў гандляра. Я гляджу на знаёмыя зь дзяцінства твары, і сэрца сьціскаецца: якія яны, заказанцы, спрацаваныя, худыя, якія ў іх глыбокія зморшчыны... І якія глыбокія вочы.

З рантоўнаю злосьцю ўспамінаю шматлікія аб'явы, якімі забітыя газэты: "Гербалайф – поможет сбросить лишний вес". Скінуць лішнюю вагу...

З-за нязграбнага руху бохан хлеба падае на жухлую траву. Перш чым палажыць хлеб у торбу, жанчына цалуе цёмную скарынку – каб хлеб прабачыў.

ГІСТОРЬЯ

Штовечар Заказанка замірае. Запоўненыя касымі вечаровымі промнямі кроны соснаў пануюць над навакольлем, і, напэўна, калі глядзець зьверху, з паблеклага ад сьпёкі неба, хатаў, што, хаваюцца ў лесе, не відаць. Ля самай мяжы жаўцеюць ад ненатоленай смагі заказанскія сады й агароды.

А раніца тут – заўжды як дыямэнт, настолькі вялікі й чысты, што перад ім дрыжаць рукі.

Раней Заказанка, як і Прылукі, стаяла ня тут, у лесе, а каля самага Бугa. Дня не праходзіла, каб хто-небудзь зь вяскоўцаў, адмысловых рыбакоў, ня вёз на продаж у Брэст агромністага, з чалавека, сама. Восеньню трыццаць дзявятага заказанцаў і прылучанцаў прымусова адсялілі. Адсяленьне пачалося й скончылася ў адзін дзень. Хатамі тых, хто "крычаў", загацілі балота – там і шукалі людзі потым бярвеньне сваіх сьцен. А падлогі тады ва ўсіх былі земляныя. У сорак чацьвертым тых, хто вярнуўся на старое месца, зноў выселілі, на гэты раз назаўсёды. Толькі й засталося ад вёсак: цьвітуць вясной у нэўтральнай зоне зьдзічэлыя сады ды выходзяць водарам буйныя карчы бэзу. Згібелі й старыя могілкі.

А вось царква прылучанская стаіць: калі вялі мяжу, сяляне здолелі ўпрасіць, каб яе пакінулі па гэты бок. У выніку мяжа праходзіць каля самага царкоўнага парогу. Ня ведаю, калі дакладна царква пабудаваная, але ведаю кім: Сьцяпанам, Іванам, Сьцяпанам, Рыгорам, Антонам, Дзям'янам... Ці многа гэта – амаль два стагодзьдзі? Вось ужо амаль два стагодзьдзі сьвятары напрыканцы службы памінаюць гэтыя імёны з надзякай і пашанай.

Нядаўна з царквы выкралі каштоўны абраз. Каб дастаць яго, станавіліся ботамі на алтар – засталіся брудныя сьляды. Пасьля такога алтар з малітвай разабралі й аддалі агню, а на яго месца зрабілі й высьвяцілі новы.

ДАЧНІКІ

А збудаваць царкву заказанцы маглі б і цяпер. Ёсьць майстры з азораным талентам абліччам і брунатнымі ад работы, здольнымі на цуд рукамі. Гэты наш сусед – з такіх. Седзячы за сталом, ён расказвае,

Адбіткі пальцаў

Працяг з старонкі 7

сябе. І ўсё гэта пад акампанэмэнт чытанай уголас біблii. Цябе спыняе на вуліцы знаёмы мастак і агітуе наведаць: некаторых пачынае трэсьці, іншыя шалёна рагочуць або роўма раюць. Але ты даўно ўжо ня пісаесься, а ксёндз забараняе зьвяртацца да варажбітак.

Да мура каралеўскага палацу прыхілены вялізны чаканны герб, трохмэтровы ў дыямэтры. На ягонай паверхні расплясканыя старыя надпісы і серп з молатам, ад якіх засталіся адно сьветлыя плямы. На молата-серпным месцы прылітаваны ў два шэрагі мэталёвы пасак, унутры – нібы кантрольна-сьледавая паласа. Прыблізныя абрысы бульбяной рэспублікі, якой кіруе калгасны старшыня.

У прыватнай галерэі каля гарадзкой турмы карціны нямецкай мастачкі. Ветракі, прускі фахвэркавы мур, разгорнутая панарама старога гораду на беразе ракі. Нібы тэатральная дэкарацыя.

8.

Дж.Оруэл абівае парогі выдавецтваў, прапануе свой «Жывёльны двор». Рукапіс не друкуюць, каб не пакрыўдзіць Сталіна. Ні ў Англii, ні ў Амэрыцы. Ён зусім бяз грошай. Жонка памірае на апэрацыйным стале, ня вытрывала сэрца. Яна вельмі нэрвавалася, што дактарам давядзецца заплаціць пяцьдзесят фунтаў.

9.

Галава перапоўненая тэкстамі. Чужымі і ўласнымі. Газэтным шрыфтам. Навала. Аблога. Захоп. Агрэсія. Ты больш ня можаш чытаць кнігі, слухаць навіны, успрымаць музыку, глядзець кіно. Ты зноў ня здатны напісаць ні радка. Твая галава засьмечаная як перасычаны ўвечары радыёэфір.

Напаўняючы з пляшкі келіх, адразу заўважаеш сапсаваны колер. Віно скісла, пачало брадзіць. Яго не абаранілі нават нямецкія словы *Rote Wein.* Славянскае віно адтуль, дзе адбываецца вайна і сярод вінаграднікаў людзі забіваюць адзін аднаго.

Чаканьне дажджу. Таямнічы неакрэсьлены час, калі лістота запамаціць, ствараючы ілюзію пачатку дажджу.

10.

Над будкай міліцыянта лунае бела-чырвоны сьцяг. У пакоі зьлёгку пахне мускатным віном, разьлітым у кілішкі. Жонка консула цяжарная, у вольнай сукенцы. У кухні завіхаецца гаспадыня. Амаль хатняя атмасфэра. Чамусьці ніхто з узнагароджаных не прыехаў. Так, далёка, аўтобусы на вёску ня ходзяць. Яны – старыя й нямоглыя. Але чамусьці не зьявіўся нават спадар Брускін, які жыве на суседняй вуліцы. Яго польскі прэзыдэнт асабіста ўзнагародзіў Срэбным Крыжам зь мячамі. "Марш-марш, Дамброўскі!" растуляе твае плечы, нібы ззаду ў цябе разгарнуліся крылы.

Прывід страху дагэтуль блукае па гарадзкіх вулках.

11.

Па лесе ў Крэйдавых Гарах разбрыліся алычовыя дрэвы. Жоўтыя і, радзей, чырвоныя ягады вабяць празь лістоту, як запаленыя сьвечкі на каляднай ялінцы. Ты спускаесься па гарах да ракі, схаванай за шэрагамі дрэў. Распранаесься і ўваходзіш у ваду. Сонца сядае ў лес на другім беразе. Праплыўшы першы й апошні раз за ўсё лета, ты вяртаесься.

12.

Прыблізна апоўначы зачынаецца дождж і не спыняецца да раніцы. Як утульна было б застацца, вылезьці з ложка, каб толькі запарыць кавы і вярнуцца з кубкам і кніжкай. Але трэба галіцца перад люстэркам у ванным пакойчыку, прыглядацца да вулічнага тэрмомэтра, гадаць наконт адзеньня, пасьпець на апошні аўтобус з разьдзёртымі крэсламі, змакрэлы й жаласны, як стары валачашчы сабака.

А дождж упарта не жадае спыняцца. Згарнуліся, прыліплі да мэталёвых тычынаў псэўданародныя спадніцы арнамэнтных сьцягоў з калгаснага клюбу. Яны ўсьведамляюць сваю недарэчную прысутнасьць над гарадзкім брукам. Ім няўтульна на залітых чорнай смалою дахах адміністрацыйных будынкаў. Шэрых і няўсьмешлівых. Вялізны чыгунны помнік на пляцы ніяк не паржавее. Ён стаміўся стаяць. У каналізацыі пад ім віруюць дажджавыя ручаі, яму застаецца спадзявацца толькі на іх.

Упершыню на мокрых платах ня вывешаны тандэтныя карціны. Вулічныя мастакі, адрозна ад цябе, засталіся дома. Амаль ніхто не малюе, нехта п'е гарбату, той-сёй налівае з бутэлькі апошнюю чарку, хтосьці пачытвае заўчорашнюю газэту і ўсе аднолькава мараць аб замежных турыстах і ганарарах, якія аднойчы – нібы сьнег на галаву... Кніжкі таксама ніхто не патурбаваў. Дождж шкодзіць іхняму здароўю. Кніжныя гандляры засталіся ў сваіх ложках. Яны нічога не чытаюць, як бармэн ня п'е дома кавы, а, гвалтам разбудзіўшы тэлевізар, глядзяць мэксыканскую «Трапіканку».

13.

У рэдакцыі сьціплай, але зьедлівай газэты адключаны тэлефоны. Каб ня зьвязваліся з забастоўшчыкамі. Як бяз рук. Бязьлюдная выспа. Самота ў перанаселеным горадзе. Камяніца, адцятая ад астатніх і ад усяго сьвету. Паўзы запаўняюцца кавай. У "кнайпе" яшчэ пуставата. Падае дождж, надта захапіўся, хоць даўным-даўно вымыў неба, шыбы й твары. Даюць гарачыя сасіскі з кетчупам пад сіртакі. Па вуліцы праплываюць панцыры парасонаў, хто куды. На закратаваных шыбах стэнаграфуе дождж. Дождж абсыпаў брук порцыяй жоўтага лісьця. У купах дрэў першая сівізна.

Дзесяць ці болей гадоў газэтнай руціны. Карэктуры, клішэ, цыцэра, пэтыт і пантарэль, тоны шрыфту, друкарскай фарбы і дэфіцытнай кандалоскай паперы, тры пары акуляраў, якія ня вытрымалі гэткай процьмы бязглуздага чытва, і паслабелыя на пару дыёптрыяў вочы. Модны партфэль, дыхтоўныя чаравікі, доўгі парасон і акуляры ў нібы-залатой аправе. Пісьменьніцтва пакуль не дало табе анічога, апроч кішанёвае дробязі на каву. Так-так, але зь вінціка й шасьцярэнькі яно паспрабавала зрабіць цябе зэгармайстрам.

Лета раптам скончылася. На моры моцна штарміць. Восем балаў паводле шкалы Бафорта. І магчымы нават першы сьнег. Яшчэ дзень-два назад паветра выгравалася амаль да трыццаці градусаў. На заўтра абяцаюць пяцьдзесят літраў дажджу на кожны квадратны мэтар. Прападзе бульба.

Горадня, 28 31 жніўня 1995 г.

Рэспублікі Беларусі

што вось хадзіў праведаць сваё бульбяное поле ў лесе. "Бачу – два дзятюка з бородами копаютъ зкраю. Я – до їх сваритися. А одьон достає ніж та каже: бачиш, дід? То йди, поки цілий. Проті ножа шо зробиш? От і попов", – дзядзька гаворыць спакойна, нават абыякава.

Пад дачы высеклі лес, пад іх перааралі луг, пад іх нарэшце аддалі поле, дзе былі соткі калгасынікаў з суседняй Стрэдзічы. Калгасынікі зьвярталіся нават у ВС. Уяўляю, зь якім выразам твару чытаў іх ліст Б.П.Савіцкі...

Дачы: недарэчныя развалюхі, напаўразбураныя вагончыкі, шыкоўныя асабнякі і засохлыя, маленькія сторчыкі расьлін, на якія шкода глядзець... Сяляне працавалі тут цяжка, таму і плён іх працы быў. Большасьць з тых, хто цяпер корпаецца на былых сотках, прынюхваючыся да паху шашлыка, гэтага плёну не пабачыць. Нават калі яны вэтэраны працы (як яе разумеюць у горадзе).

Донка з аб'явай пра тое, калі адбудзецца паседжаньне ў садовым таварыстве «Ветеран», была прыкалочана проста да асіны, тым ня менш аддзіраць яе ад дрэва на вачох людзей, што сабраліся да цягніка, я не рашылася. Але гэта зрабіў адзін з тых юнакоў, якіх, на шчасьце, пусьціла ўсьвет Заказанка. На наступны дзень аб'ява з лаўкі, куды ён яе паклаў, зноўку перакачавала на асіну. Тады хлопец яшчэ раз адарваў дошку, разламіў яе надвое й выразна напісаў на абодвух палавінках: "Нармальныя людзі аб'явы да дрэваў не прыбіваюць". Так што заказанцы яшчэ могуць пабудаваць царкву.

ШТО ДА РЭЛІГІІ

Кожную суботу бабуля слухае па радыё прамову (ці што там) каталіцкага сьвятара. Аднойчы выходзіць на двор расчараваная – перадачы няма. Я выказваю меркаваньне, што ксяндза не пусьцілі ў эфір, каб не расстроіць патрыярха, які прыехаў у Менск. "Лукашэнка ж сказаў, – тлумачу, – што будзе падтрымліваць толькі праваслаўную царкву, а каталікоў і баптыстаў – не." "Та-а-ак?" – перапытвае бабуля, і па яе характэрнай інтанацыі я адчуваю, што яна вельмі задаволеная. Празь нейкі час, аднак, дадае: "Але ж той ксьонз так молився, шо й нам пін нэ докаже: і за слабих, і за студентів, і за солдатиків"...

У чарговую суботу перадача зноў ідзе, і бабуля, адклаўшы справы, слухае, для зручнасьці прылегшы на ложак...

НЕЧАКАНАСЬЦЬ

Кожны вечар, пасьля таго, як паліта ўсё, што толькі можна паліць, пасьля таго, як куры заходзяць на седала, а парася з загону – на сталае месца жыхарства ў хлеў, пасьля таго, як, асьмялеўшы, змрок выходзіць з-за камлёў, за якімі да пары хаваўся, і ўсё больш упэўнена расьцякаецца па лесе, настае пара прагнозу надвор'я. Уключаю першую праграму польскага ТБ: "На всходзе краю – дэшчэ пшэлётнэ". Беларусы лянканічна паведамляюць, што над усёй Беларусяй бязвоблачнае неба. Так, а цяпер на першую ўкраінскую праграму: "На північним заході короткочасні дощі". Хто не чакаў у сьпёку дажджу, хай кіне ў мяне камень за лішнюю падрабязнасьць аповеду, але не магу не адзначыць, што назаўтра ўліў такі добры дожджык.

Украінскае тэлебачаньне я наогул гляджу з задавальненьнем: прыемна, што й казаць, чуць з тэлевізара тую мову, якую чуеш і ў полі, і на лавачцы пад грушай... Ды і ўзровень УТБ на парадак вышэйшы за наша. Аднойчы мяне напаткала нечаканасьць: украінцы паказалі інтэрвію з нашым прэзыдэнтам. На самым пачатку карэспандэнтка спытала, ці можна ёй весьці гутарку па-ўкраінску? А.Р.Лукашэнка адказаў, што "мой самый любимый язык – украинский. Я мог бы слушать его целый день". Карэспандэнтка задаволена засьмяялася. Думаю, кожны зь беларускіх журналістаў таксама ўзрадаваўся б, пачуўшы ад прэзыдэнта сваёй краіны такую фразу ў дачыненьні да беларускай мовы.

"Ой, ти козаче з чужого краю! Чом ти не знаєш, дэ я мешкаю?" – сьпявае бабуля.

Залішне гаварыць, што на ўсім абсягу Беларусі, дзе карэнныя жыхары размаўляюць па-ўкраінску, няма ніводнай школы, дзе б іх вучылі чытаць і пісаць на гэтай мове.

САЛА ДЫ ЦЫБУЛЯ

Дачка надбягае да мяне й закланочана пытаецца: "– Мама, а лук по-украински цибуля? – Цибуля. – А сало? – Сало. – Хорошо". Яна зьбягае, а празь нейкі час з хаты даносіцца: "– Бабо, я хочу їсти. – Та-ак? А чого тобі дати? – Сала и цибулі". Бабуля сьмяецца, бразгаюць дзьверы каморы, і хутка прабабця і праўнучка, узброеная вялікай лустаю хлеба і ня меншай лустаю сала, уладкоўваюцца на парозе. Слухаць іх размову – адна асалода. Маё клапянё з набітым ротам сьпявае "Розпрагайте, хлопци, коней...", па ходу справы тлумачачы словы па-расейску. Няблага для чатырох гадоў перакладае.

"Малайчына, – кажу я. – А цяпер хадзі сюды, прасьпяваем гэтую песьню па-беларуску". Выконваючы пастанову сямейнай рады, з траўня гэтага году я больш грунтоўна займаюся з дачкой беларускай мовай. Чаму я гэта раблю? Можа, таму, што з дваццаць першага году заказанцы сталі беларусамі... А хутчэй таму, што як да дваццаць першага, так і пасьля яго все тут вецер з Украіны, і ня з кніг, а ад блізкіх людзей я ведаю, што на вокліч "Слава Украіні!" трэба адказваць "Слава! Слава! Слава навік!", і дзякуючы гэтаму разумею, што слова "нацыяналіст" – гэта не сынонім слова "сволач".

НОЧ

Укладваемся. Ціхенька, каб не перашкаджаць бабулі й дачцэ, уключаю прыёмнік. Перадача з вар- шаўскай піўніцы «Под баранамі». Ня так і далёка адсюль усё гэта – песьня, ціхі сьмех, бразганьне пакладзенага на талерку нажа...

Вокны ледзь шарэюць. Усё сьціхла: рух на недалёкай шашы, грукат жорнаў, што перамолваюць час, вецер. Падабраўшы крысо, ноч пераходзіць за Буг. Я прыслухоўваюся да дыханьня абедзьвюх Поль. Панує цішыня.

Менск

Інтэрнацкая хроніка

Ганна Матусэвіч

У гэтым "аповедзе без канца" сплялося адразу некалькі жанраў: "шуканьне праўды" ў рэдакцыі газэты, апісаньне паходаў да чынавенства (не раўнуючы як у «Новай зямлі», толькі гэтым разам не зямлю шукае наш чалавек і ня ўласнасьць, а хоць якога катуха), хроніка канкрэтных жывых людзей, якая месцамі нагадвае «Камароўскую хроніку», і, калі заўгодна, "мыльная опэра" – бясконцая правінцыйная п'еса, пастаўленая ў дэкарацыях нашых заштатных інтэрнатаў. Між тым, гэта зусім цэльны твор, пазначаны адзінствам стылю і аўтарскае асобы. Чарговы ліст у «НН» загадкавай Л.Г. з Койданава, якая гэтым разам раскрывае сваю асобу...

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асьляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы,
Калісь глядзеў на сонца я.
Няхай усе зь мяне рагочуць.
Адповедзь вось для іх мая:
Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асьляпіла вочы.

Максім Багдановіч

Думаць вершы прасьцей, хоць бы таму, што іх можна думаць і за любой працай у хаце, у полі, у лесе і ў дарозе. Прозу можна таксама думаць там жа, але яе трэба ўрэшце сесьці й занатаваць, інакш яна ўцячэ рассыплецца. Зь вершамі ў мяне кепскія адносіны, а на прозу бракуе часу. Ео на каго ж пакінеш сваіх любых апоўзьлікаў, вушасьцікаў, зайкаў, рыбак, верабейкаў, цудатворцаў, а пад злосьць – урвінцаў, лопатняў і пошасьць? Дый розуму вялікага я так і не прыдбала, а "со средним специальным (медицинским) образованием" надта не разгорнесься. То што ж рабіць часінамі, калі бывае сумна на гэтым сьвеце, панове?

Ня ведаю, як хто, а я асьмельваюся пісаць у «НН». Найперш раскрываюся, бо мая таямнічая асоба пэўна надакучыла ўжо і чытачам і супрацоўнікам. Л.Г. магло быць і Ларысай Геніюш, але цяпер яно будзе Ганнай Матусэвіч. І не таму, што гэта маё сапраўднае імя (паводле пашпарту я Сьцепулёнак, паводле мэтрыкі – Суднік), а таму, што гэта дзявочае прозьвішча дзьвюх маіх родных бабуляў па маме і тату.

Нас высяляў з дому, які назваў малася-мейным інтэрнатам, начальнік СУ-42 Камушэнка П.Н. СУ-42 – гэта "строительное управление" будтрэста №23, які ўжо распаўся. Мы – гэта, здаецца, 11 чалавек, якія не захацелі больш за нішчымніцу працаваць на будоўлі. Камушэнка П.Н. – гэта наш уладарны начальнік, якому хто хацеў і не хацеў – біў паклоны. Дадамо яшчэ, што мая сям'я не ўваходзіла ў лік 11 высяленцаў, але я ўжываю займеньнік "мы", бо гэта нашыя людзі і наш дом. Побач, як вольналюбівая Прыбалтыка, мазоліў вока дом Раманава, дырэктара швейнага аб'яднаньня «Эліс». Цюцелька ў цюцельку такі самы праект, як і наш, але там з ордэрамі, а ў нас бяз ордэраў. Адным словам, мы жылі, як інтэрнаваныя ў інтэрнаце інтэрны (interns – арыштанты).

Дом шумеў, як разварушаны мурашнік, а бараніць сваю хату падняўся толькі Коля Макаед. Пэўна ж таму, што ён сам, калі ня наш дом будаваў, то іншыя, а яшчэ – катэдж начальніку адбухаў за 5,5 гадоў паднявольнай працы ў СУ-42, пакуль сам начальнік разьяжджаў па польшчах. Нехта знутры ледзь чутным, але ўладным голасам патрабаваў ад мяне данамагчы гэтаму мужчыну – Макаеду. Я паслухалася, але ці магла я адна разьбіць муры?

Мур першы. Дэбют. Да вынасу рашэньня я пасьпела нанесьці візыт судзьдзю Сысу Анатолю (?). Гэта быў "умудренный жизненным опытом", сталы чалавек, які Багушэвічаў запавет "каб я панам ніколі ня быў" прыняў за ананімку, а мяне – за Колеву палюбоўніцу. Урэшце суд, як тое суду й належала, вынес рашэньне – высяляць.

Імклівей забегалі мурашы, нават тупат стаў чуваць ад іхных ног. Кучкамі зьбіраліся людзі ўсюды: на двары, у холе, на лесьвічных сходах. Я не падыходзіла да іх, бо мела горкі досьвед стыхіі. Тады яны самі прыйшлі ў нашую хату. Шумелі за незалежны прафсаюз, за страйк... Тады ж Мішка сказаў, што трэба йсьці на злом галавы. Надта ж цікавы гэты Мішка! Усе рысачкі надабраў з усяго нашага народу. Мішка, як і народ, – усё бачыць, усё чуе, усё ведае й знае, што трэба рабіць, але ня робіць. "Вось ты, – кажу, – і станавіся за незалежнага прафорга". Схамянуўся ён, нейкая агнічка ў вачох мільганула й згасла. "Не, – кажа, – я не змагу". І пстрыкнуў сябе пальцамі па шыі. На злом галавы павінна была йсьці я, але ж ці магла я разьбіць муры?

Мур другі. Дужы. Я ўжо нічога не баялася, але тут захварэў Міколка. Гэта было наспаньнё, і мяне апанавалі падвойныя страхі: страх за дзіця і страх, што не змагу пайсьці. Прыйшла доктарка, сказала, што гэта "какой-то вирус" і выпісала заменьнік бісэптолу. Я, вядома, ня стала труціць дзіця ні бісэптолам, ні ягоным сурагатам. Увечары тэмпэратура падскочыла да 40,1%. Тады стрэліла мне думка – сьвечкі! Але мае рукі дрыжалі й былі нікуды ня вартыя, і мусіў муж сваімі таўстымі пальцамі заганяць у дзіцячую дупку сьвечку над адчайны сынаў лямант. Палягчэла.

Але ўсе гэтыя бяссонныя ночы й дні... Толькі прымружу вока – зьяўляюцца нейкія брыдкія жанчыны, нахабна развальваюцца на крэслах каля мяне... Адзін раз, калі я напісала Людзе (мы сябруем 20 гадоў, яна баптыстка), выразна пачула ад тых жанчын: "Дзьве гадзіны". Толькі націск быў пастаўлены, як у Панцеляймона Панамарэнкі. Палепшала Міколку, і я ўночы стала складаць ліст-малітву ў газэту «Свабода». Там я называла нашага прэзыдэнта Неразумнікам і казала, што калі-небудзь Бог пасылае людзям калецтва дзеля ўратаваньня, прасіла толькі разумных людзей адыйсьціся ад Неразумніка і рабіць тое, на што кожны зь іх здольны... "Мама, нешта зьляцела са столі і зьнікла", – трызьніў Міколка. Я прылегла зь ім. Толькі заплюшчыла вочы – зьявіўся на гэты раз мужчына і сказаў: "Я не чапаў". Нараніцу, калі ўжо ляскатаў «Радыёфакт», мільганула ў ім паведамленьне пра адмоўную энэргію Ленінавага маўзалею.

Усе гэтыя трывожныя дні я скрупулёзна выконвала капрызы майго 4-гадовага ўладара. "Мама, ты мне зёлкі падавай у кубку

Працяг на старонцы 10

Інтэрнацкая хроніка

Працяг з старонкі 9

з хлопчыкам Міколкам, а не падавай у цёмным кубку"... Яны адчапіліся ад мяне, і я завезла сваю малітву ў «Свабоду». А Коля ўвесь час езьдзіў па ўсіх інстанцыях. Суд адвёў яму на гэта 10 дзён. У інстанцыях жвайкавалі гумку. Аціх і наш мурашнік, затое на дварэ ў самым разгары была перадвыбарная валтузьня. Я стала прыглядацца да тутэйшых бэнээфаўцаў.

Мур трэці, прывідны. БНФ. Але ж, ці магла я разьбіць мур, няхай сабе й прывідны? Барташэвіч, іхны намесьнік, падаўся мне разумным чалавекам, хоць бы таму, што выслухаў мяне, але адначасна й з савецкімі комплексамі, бо даў мне цыдулку, пісаную па-расейску, з адрасам тутэйшай знакамітай адвакаткі. Я схадзіла да яе, але яна стала жаліцца мне, што хоча ўсё кінуць і паехаць у вёску, да прыроды. Я адказала, што, мабыць, трэба рабіць тое, што хочацца.

Далей цягнулася яшчэ большая нудота. Я напісала павучальную гісторыю пра нас, пачатак якой бярэцца з зараджэньня калхознага прыгону. (Высялялі кулацкую сям'ю Наўроцкіх. Гаспадыня закляла сваю хату. Людзі расьцягнулі бярвеньне й паставілі 2 хаты з адной. Абедзьве хаты згарэлі ў 70-ыя гады.) Прачытала ўсім людзям з БНФ, што прыйшлі на пасядзёлкі ў бібліятэку. Але ў іх былі больш важныя справы: яны прайгралі першы тур, у другі тур сіліліся ўплішчыць дэмакратычнага, але без нацыянальнасьці сьледчага Сазанчука. Я ім параіла: прапала кароўка – няма чаго плакаць па вяроўцы. Ды стойкі лідэр Міхась Цішук мне запярэчыў: "Гэта ня наш шлях: чым горш – тым лепш". На тым і разьвіталіся.

Мур чацьверты. Адвакаты. Калі ўжо яны не маглі абараніць нас, то ці ж магла я адна разьбіць мур? Барташэвіч яшчэ даў мне тэлефон хаты, дзе спыняўся Сазанчук. Пайсьці?

Штораніцы а сёмай гадзіне я малілася за Беларусь. А ў гэтую нядзельку дала сабе палёгку – праспала. І вось у прыўкрасную сонную цішыню залятае Максімаў матылёк. "І ліецца хваляй песьня на раздольны вольны сьвет. Толькі хто яе пачуе? Можа толькі сам паэт?" Я пачула ўсю мэлёдыю ад пачатку й да канца, хоць і не паэт. І пайшла. Сазанчука не застала, гаварыла з Мокатам – даверанай асобай. Кажу яму, што "Вы нас ведаеце, бо гэта Вы, як намесьнік пракурора, далі санкцыю на высяленьне трох сем'яў з малымі дзеткамі на вуліцу". Ён паправіў мяне: "Я дал санкцию на 2 семьи".

– Усё роўна, гэта – парушэньне правоў чалавека!

– Вы не жили в общежитии и не знаете... Если не работаешь в организации – выселяют без предоставления жилья. Так и раньше было.

– Раней мы жылі ў Латвіі...

– Вот видите, Вы здесь не жили... Вы не знаете, что такое интернат. Общежитие и интернат – это разные вещи...

– ... Вы маглі б хоць якую адтэрміноўку даць, знайсьці нейкую шчыліну ў законе і адстаяць гэтых людзей, раз Вы ўжо лезеце ў дэпутаты. Людзі самі сабе гэты дом збудавалі і катэдж Камушэнку вымахалі, а цяпер начальнік выганяе няўгодных яму людзей. Шчэміцеся карміцца каля Лукашэнкавага карыта! Ён жа калека, і чаго Вы з розумам туды прэцеся!

– Вы сходите к Валахановичу! (Валахановіча ўрэшце й выбралі, бо ён – прэдсядацель.)

У гэтым маладым чалавеку, што трымаў малую дачушку на руках, яшчэ жыла душа. Ён пачаў жаліцца, што сам жыве ў хаце на 3 сям'і, што ад цямна да цямна будуе сабе дом, а на разьвітаньне адказаў мне па-беларуску: "Да пабачэньня".

Зьезьдзілі мы яшчэ да аднаго абаронцы – знаёмага майму мужу адваката ў Менску. Трэст распаўся, ці можна нам на гэтай падставе запатрабаваць сабе жыльлё? Дзякуй тому адвакату, што хоць грошай за бясплённую кансультацыю ня ўзяў.

Вось і ўсе муры. А, яшчэ ў «Звязду» напісала. Ну, але там і спадзеву ніякага не было. Гэта ж ня Зорка Вэнэра... Цяпер Вам напісала, але ж ці мур гэта – «Наша Ніва» і ці трэба яго разьбіваць?..

Але гісторыя на гэтым ня скончылася, ня думайце. Хоць зацішак разьлёгся на цэлае лета. Тое не ўважаецца за гісторыю, што ўлетку Шпілеўскія перабраліся ў калхоз. Няшчасную жанчыну з трыма малымі дзяўчатамі ды мужам-п'яніцам папросту перашпілілі да другога інтэрнату. На іхняе месца, ратуючыся ад прусакоў, кінулася трохдзетная сям'я з фурманаўскага інтэрнату, пабудаванага яшчэ за Сталінам. "И раб судьбу благословил". "І ўсё паўторыцца нанаў". Ці ж не нудота?

Маладушнікі не вытрымлівалі камэндантскавых цыдулак з пагрозаю высяленьня, якія яна падкідала ў паштовыя скрынкі, а то й пад дзьверы. Я прасіла людзей трымацца разам, але іх наўмысна разлучалі рознымі тэрмінамі судоў. Галоўная бяда была ў тым, што кожны паасобку кідаўся ў свае лёхі, спрацоўваў інстынкт самазахаваньня: "У лісічкі свая норка, у вавёркі ёсьць каморка". Хто шукаў паратунку ў службовых кабінэтах, хто варочаўся на працу да гаспадара. Былі й такія разумнікі, што разварушвалі вялікія стосы папераў з мэтаю даказаць, што дом зьяўляецца жытлом, а не маласямейным інтэрнатам, але прыходзілі да шчырага перакананьня, што гэта самы што ні ёсьць інтэрнат.

Людзі блукалі ў загадзя падрыхтаваных для іх лябірынтах. Але знайшліся й такія дальнабачнікі, што згледзелі іржавае зьвяно ў таталіным ланцугу аблогі. Яны загадзя пасьпелі разьвесьціся з сваёй паловаю. Мужчынскі розум Колі Макаеда таго не дапетрыў. Ды грэх папракаць у гэтым шчырага працавітага хлопца, калі да разуменьня свабоды не дарасьлі й адукаваныя людзі – нашыя правінцыйныя бэнээфаўцы. Цішук заявіў без апэляцый: "Раз яны ўжо пастанавілі, то высяляць, будзьце ўпэўненыя". Барташэвіч задаў наіўнае пытаньне: ці ёсьць запасная "крыша над галавой" у Колі? А я ім казала пра волю. Наогул, будзь мая воля, я б спаліла той запасны дах, каб не было куды адступаць, але тэрмін маёй волі яшчэ ня быў пазначаны. Я параіла Колю ўладзіць сяк-так узаемаадносіны з судавыканаўцам і Камушэнкам ды зьехаць адсюль зь сям'ёю, што ён і зрабіў.

Нашае беларускае лета ці то працягнулася, ці то праімчалася, але ўрэшце скончылася. Настала бульбяная восень. Я выкапала ўжо бульбу ў бацькоў, а Коля шчэ дакопваў яе ў сваім Гоцку на менскім Палесьсі.

Аднойчы ўранку я выправілася на кірмаш па муку і нечакана найшла на баёвую сцэну. У знадворных дзьвярох ліпела нізенькая, тоненькая, што смычок, заплаканая Галя – Макаедава сястра. Побач мітусіўся тоўсты, вялізны судавыканаўца Хамёнка, кідалася ў вочы міліцыянцкая апратка на маладым хлопцы, тоўпіліся каля грузавой машыны нейкія нікому не вядомыя асобы мужчынскага роду ў вятроўках. Да мяне данеслася: высяляюць Макаеда й Пякарскую. З нашых былі, здаецца, толькі дзьве жанчыны. Адна стаяла мармулькай, другая актыўнічала. Сілы былі няроўныя. Мужчынская сіла стаяла на баку закону, жаночае бясьсільле абараняла правы чалавека на жытло. У маёй душы нешта зашумела – пачаўся бой. Галя прасілася ў мужчын, каб не ламалі дзьвярэй, пакуль не прыедзе брат, не выносілі рэчаў, казала, што званіла брату і што ён прыедзе, мо нават сёньня. Мужчыны дзеілі з кожнай хвілінай усё больш груба, апэлюючы да закону і свайго службовага абавязку. Бедная жанчына даводзіла, што ейны брат сірата, чарнобылец, адрабіў 6 гадоў на будоўлі і няўжо ж не зарабіў адзінюсенькага пакойчыка для двух маленькіх дзетак! Але мужчыны былі мужныя. Тады яна нашаторылася, што тая курыца над куранятамі, і залямантавала: "Спалю, калі палезеце!" Міліцыянт імгненна выхапіў паперу: "Сейчас протокол составлю, заберем в милицию". "І мяне забірайце, я зь ёй разам паеду! Ідзеце, узломвайце дзьверы, калі Бога не баіцеся, бандыты!" – намагала я Галі. Крычала й другая жанчына. Але мужчыны адпіхнулі Галю ад дзьвярэй і рушылі на штурм пятага паверху. Тут прыехалі яшчэ дзьве жанчыны з канторы: нашая камэндантка – таксама Галя, ды зноўабраная старшыня прафкаму Сімакова Яўгенія Мікалаеўна. Галя кінулася да апошняй, упрошваючы пазваніць Камушэнку, каб ён адтэрмінаваў няпрошаны візыт, казала, што заплоціць за ўсе растраты...

Каля Макаедавых дзьвярэй доўга кешкаліся – не знаходзілася сьмельчакоў іх ламаць. Быў там чалавек адзін, заіка, Петкам звалі. Сам жыў у фурманаўскім інтэрнаце, рабіў у СУ-42. Яму сказалі ўзламаць дзьверы, а ён адмовіўся. (Пасьля яго Камушэнка выкрасьліў з чаргі на кватэру, сказаўшы: "Я цябе паслаў вешчы вынасіць з Макаедавай кварціры, ты этага ня зьдзелаў – значыць табе кварціра не нужна". Пазьней і зусім звольніў з працы.) Наступіў зацішак.

Здаецца, вырашальную ролю адыграла трэцяя Галя – мая суседка, якая зьявілася на пятым паверсе са словамі: "А в администрации президента так не разговаривают". Тады яны сталі глядзець Галін (сястры) пашпарт, паказваць свае пасьведчаньні. Затым прыйшла Мікалаеўна, якая не дазванілася да Камушэнкі, але ўзяла на сябе адказнасьць да аўторка не ламаць дзьвярэй. Быў, здаецца, чацьвер, і мы, дзякуй Богу, выйгралі некалькі дзён перадыху.

Увечары зьявіўся Коля. Мы ўмомант выпрацавалі плян дзеяньняў: ехаць заўтра ўсім кагалам у адміністрацыю Лукашэнкі. Кагал наш быў стракаты: дзьве разьвядзёнкі – Пякарская Ларыса і Галя Куксік, я ды Коля.

Хадакі зьбіраліся там з усяе Беларусі. Доўга, нудна цягнуўся ў чарзе час... Нарэшце падыходзім да дзьвярэй з шыльдачкай: "Оноприенко Эдуард Анатольевич". За сталом сядзіць невялічкі, кругленькі, лысаваты мужчынка. Зь ягонае апраткі запомніўся толькі чырвоны гальштук. Мы селі каля парогу. "Ближе, ближе садитесь", – надцягнуў ён нас да стала. Я адразу ўзяла занадта высокі тон: "Если Вы не защитите нас – Вы подпишете себе смертный приговор. Ведь мы все голосовали за Лукашенку". Ён асадзіў мяне, цьвёрда захапіўшы ўладу ў свае рукі, пачаў доўга й нудна апавядаць пра тое, што мы – "винтики, наемные рабочие"... У паўзах я пасьпявала задаваць свае пытаньні: што такое дзяржава і ейныя дачыненьні з намі, хто будаваў спрэчнае жыльлё і якую ролю выконвае тут ён – чыноўнік вышэйшага дзяржаўнага ўзроўню?

Няпэўную сытуацыю перапыніў тэлефон. Эдуард Анатолевіч падняў слухаўку. Голас яго зрабіўся мяккі, ён добранька ўмасьціўся ў сваім крэсьле й завуркатаў, як кот: "Мне бы в баньке попариться..." Доўга цягнулася тое вуркатаньне, а я са сваёй далечыні мэтава, упарта ўглядалася ў Галін малады, прыгожы й сумны тварык. Мая місія ў гэтым кабінэце была скончаная. І я настойліва шукала Галіны вочы. Нарэшце мы сустрэліся і я весела ўсьміхнулася ёй. Мяне лепей зразумела больш вопытная Ларыса: "Вы любите попариться? Мы бы Вас пригласили к себе, но у нас в общежитии на 5-м этаже по вечерам вообще никакой воды не бывает". "Неужели правда?" – шчыра зацікавіўся Эдуард Анатолевіч. Тут ужо й Галя выйшла на сцэну, і ўсё пайшло на лад. Быў знойдзены 114 артыкул, які не дазваляў перасяляць адзінокіх жанчын зь дзецьмі з добрых умоваў у горшыя. Тут і Коля падаў голас за сябе й за сваіх дзяцей, як за чарнобыльцаў. Я махнула на яго рукой, але тое было лішняе. Яго, беднага, добра аддубасіў сам жаночы праваахоўнік: "Вы, мужчина, сами должны семью содержать. Я только одиноким женщинам помогу..." Недзе ў грудзёх сьціснулася маё сэрца, але я ў адказ толькі мацней сьціснула зубы, каб не пашкодзіць справе. А справа была ў тым, каб даказаць тое, што відаць было без аніякіх доказаў: дом, дзе мы цяпер жывем – гэта наш дом, а не Камушэнкаў маласямейны інтэрнат, а будка на Фурманава, куды зьбіраюцца нас выгнаць – гэта будка, хоць і называюць яе таксама інтэрнатам. Такую паперу мог бы даць галоўны санітарны лекар Марыновіч, але нехта зьверху павінен быў вырашыць гэтае пытаньне да яго. Мы сталі прасіць добрага Эдуарда Анатолевіча патэлефанаваць у Дзяржынск. Ён спачатку адмекваўся, але мы сунулі яму падрыхтаваныя загадзя сьпісы тэлефонаў, і ён падняў слухаўку. Камушэнкі не было, і Эдуард Анатолевіч затэлефанаваў у нашу "белы дом". Знайшоў там Сакалоўскага Эдуарда Баляслававіча – намесьніка старшыні гарвыканкаму (старшыня адпачываў) і моцна насварыўся на яго за "провинциальные суды", што няправільна выносяць рашэньні, дагаджаюць местачковым панам. Адно пагана, што добры Эдуард Анатолевіч заступаецца толькі за няшчасных жанчын, пакінутых мужамі.

Працяг на старонцы 32

Расея, убачаная зблізку

Сяргей Харэўскі

У пачатку мінулага жніўня рэдакцыйная брыгада «НН» зрабіла свой традыцыйны летні прамэнад на байдарках, гэтым разам — у Цьвярской вобласьці Расеі.

Наш шлях пралягаў па рэках Обшай, Мёжы й Дзьвіне празь Бельскі, Жаркоўскі й Вяліскі раёны, а скончыўся ў Суражы на Віцебшчыне. Напэўна, гэта якраз тая прастора, на якой мусіць прасочваецца ўзаемапранікненьне Расеі й Беларусі – прыроднае, этнічнае, культурнае. Мяжа дзьвюх краінаў і народаў, якая блукала па гэтых тэрыторыях на працягу стагодзьдзяў, аж пакуль не абазначылася вузкай стужкай сучаснай дзяржаўнай мяжы. Сьляды гэтых гістарычных блуканьняў і цікавілі нас найперш. Іншы край і іншы, непадобны да нашага люд увесь час "напрошваліся" на параўнаньні...

Самая ідэя такога прамэнаду зьявілася некалькі гадоў назад. Было нешта мэтафізычнае ў неўтаймоўным жаданьні дабрацца да гэтае кропкі на мапе – Жаркоўскі на Мёжы, колішняя Калінінская, сёньня Цьвярская вобласьць. Як філятэліст над альбомам, узіраесься ў кропкі й рыскі геаграфічнае мапы... Прадчуваньне простых адказаў, нечаканых адкрыцьцяў, цуду...

За тыдзень вандроўкі нам стала зразумела, што ніякага такога ўзаемапранікненьня няма. Дакладней, яго трэба шукаць і дасьледаваць у сталіцах, у Менску і ў Маскве, бо адбываецца яно праз тэлевізар, праз школу, празь міграцыю й палітыку. Тут жа, за мяжою, нейкія зусім аўтаномныя сьляды падабенства заўважныя толькі на бліжняй Смаленшчыне. Ужо крыху далей ідзе выразна чужы край, жывуць чужыя людзі, якія за чужакоў успрымаюць нас.

Не зважаючы на акцэнт, на беларускую гаворку паміж намі, на кепку «White Russia» з «Пагоняй» на галаве, гэтыя людзі, расейцы, упарта прымалі нас за "прыбалтаў", за латышоў. А ўжо зусім "дасьведчаныя" тлумачылі: Мёжа цячэ ў Дзьвіну, а Дзьвіна ў Балтыку, а там Латвія. Вось як! Зрэшты, на Цьвершчыне даволі часта перапытвалі, у каторую Дзьвіну мы плывем. Для расейцаў усё ж існуюць дзьве Дзьвіны, і ня так істотна, што Паўночная – у паўтысячы км адсюль... Калі Дзьвіна плыве яшчэ й празь Беларусь, то гэта недзе зусім далёка. Не, беларусаў тут няма... Не, раней ня бачыў... Не, у Беларусі ня быў...

Дарога туды была вельмі доўгаю. Не па-беларуску ўжо доўгаю.

На мытні дождж. Пахне жалезам і ўжо недалёкай восеньню. Брэша сабака. Сьцямнела. У закрытым кузаве машыны гэта адчувальна хіба што па гуку рухавіка, ён стаў больш выразны. Вось ужо колькі гадзін як скончыўся асфальт. Машыну гайдае й трасе. Ноч. Кіроўца засынае. Прыехалі...

З аднаго боку, гэтыя краі, бадай, найбольш чыстыя славянскія ў Расеі, мусяць успрымацца намі як наша гістарычная, этнічная, лінгвістычная ўскраіна. Менавіта так яе і ўспрымалі на мяжы XIX-XX ст. Аркадзь Смоліч без ваганьняў прылучаў да абсягаў Беларусі і гэтыя паветы Цьвершчыны. Аднак, зь іншага боку, гэты рэгіён настолькі даўна зьвязаны з Расеяй, што яго няможна цяпер уважаць за нешта асобнае ад яе. Да таго ж гэты край так і не падзяліў зь Беларусяй свой лёс у XX ст. Такім чынам, мы ўсё ж у Расеі, мы замежныя турысты. У краі, што некалі быў мяжою, у краі крывіцкім...

Белы. Летапіснае паселішча . Мястэчка, як для нас, незвычайнае. Усё вакол (як і паўсюль у блізкай Расеі) – будынкі, рэльеф, дарогі – такое, быццам людзі тут удвая-ўтрая буйнейшыя за нашых. Фізычна гэта ня так. Але сам модуль чалавечага руху – больш грубы й шырокі.

Новых дамоў не відно. Старыя, яшчэ ад царскіх часоў, тоўста пафарбаваныя з фасадаў. Пляніроўкі няма. Мястэчка нібы рассыпанае ў краявідзе. Арыенцір стварае галоўная вуліца – шаша. Шыльды на будынках не мянялі бадай чвэрць стагодзьдзя...

Раніца. Па лагчынах, парослых хмызьняком, гадзіне а сёмай зьбіраюцца мужыкі. П'юць зь вялікіх слоікаў вадкасьць рознага колеру. Мы складаем байдаркі. Зусім разьвіднела. Адчыніліся крамы. Чэргі мужыкоў. Пузатая вадакалёнка, чыгунная, надпіс: "1912". Вада нясмачная. Бярозы прыгожыя. Мы ціха сплываем па Обшай. Не заўважылі, як зьнік у хмызох гарадок.

На другія суткі выцечкі зьявілася пэўнае пачуцьцё, што будзем плысьці яшчэ надта доўга, болей чым уяўлялася, і што мы заплылі ў невядомы, чужы край. Край памежнага стану натуры й душы. Нібы нехта пажартаваў з нас. Рака, расьліннасьць, краявід – усё такое ж, якое сотні разоў мы бачылі ў Беларусі, але нібы скажонае – ня столькі маштабамі, колькі гэтым самым модулем. Быццам у нашым жа краявідзе папрацаваў Гулівэр.

"У краіне гэтай, непадобнай на ўсе астатнія, сама прырода зрабілася паплечнікам чалавека, каторы, кленчыўшы перад аднастайнасьцю, зьмярцьвіў усялякую свабоднасьць. Яна таксама паўсюль аднолькавая: балотныя альбо пяшчаныя раўніны, зарослыя, на колькі хапае вачэй, чэзлымі й рэдкімі дрэвамі дзьвюхародаў, бярозай ды сасной, – вось і ўся натуральная расьліннасьць паўночнай Расеі..." Вядома, як пісаў пазьней пра аўтара гэтых радкоў Герцэн, Расея "шмат глыбей таго бруку, па якім кацілася элеганцкая брычка маркіза дэ Кюсьціна". Зрэшты, нас Герцэну не было б чым папракаць: мы дасьледавалі Расею глыбей яе дарогаў, па рэках.

Сярод бясконцых раўнінаў, парослых нягеглаю, хваравітаю флёраю, пачалі дыбіцца вялізныя пагоркі (альбо, як па-нашаму, дык і горы). Мала сказаць, што дрэвы тут больш каржакаватыя, разлапістыя, кожнае з характарам, біяграфіяй. Яны супрацьстаяць аднастайнай бяскрайнасьці тутэйшых краявідаў. Недзе на сумежжы Бельскага й Жаркоўскага раёнаў горы, да таго мала прыкметныя, пачалі вырастаць за паваротамі ракі, як надзіманыя. На адной такой гары мы вызначылі прыстанак. На беразе гара аказалася шмат большаю, чым здавалася з ракі. Пад ёю ў лагчыне цьвіркэлі крыніцы. Ледзь крануты чалавечай рукою ляндшафт гатовы быў распавесьці баляду: дзьве аграмадныя ліпы, пас старога арэшніку, здурнелая ад вуркатаньня крыніцы алешына, а там, вышэй на гары – тры дубы, а за імі пяць бярозаў, дзьве калярытныя, рыхтык "крамлёўскія" елкі, пяток замшэлых валуноў, раўчук, балотца, а за імі – хата, роўная стужка яловага лесу ад краю да краю далягляду.

Відаць – страшэнна далёка, на дзясяткі кілямэтраў: на другім беразе – панурая раўніна паплавоў, дарослых там-сям няпэўным вербалозам. Сядае сонца. Доўга будзе яго відаць...

Тутэйшы чалавек, дзяцюк з заечаю губою, паведаміў, што да аўтобуснага прыпынку адсюль кілямэтраў дзесяць, а адзіны аўтобус – у Белы – будзе пазаўтра... Уся сувязь з астатнім сьветам. У бліжэйшых хатах ніхто не жыве, а сам ён тут начуе, ловіць рыбу.

Стужкі туману зацягваюць рэчышча, як у мультыплікацыі – сунуцца й набухаюць, аж пакуль унізе ўсё не прапала. Зьніклі час і прастора. Мы сядзім на высьпе між аблокаў туману...

Ёсьць сэнс у ранішнім купаньні! Крынічная радасьць вады...

На вадзе нешта бянтэжыць, нешта тут ня тое для звыклага да беларускай ракі падарожніка. Нарэшце пачынаеш разумець. Гэтая рака – не жывая. Ані брохае рыба, ані выскачыць наперадзе качка, як гэта звычайна бывае на Нёмне, Прыпяці, Сажы, на Вяльлі, Бярэзінах, Котры... За дзень бачым адну ці дзьве страказы, якія *ў нас* раюцца вакол байдаркі дзясяткамі.

На першым цэлым мосьце, яшчэ зусім новым, складзеным з бэтонных блёкаў, між якімі можна ўсунуць далонь, а то й дзьве, мы, перахінуўшыся праз парэнчы, зірнулі навокал і лепей зразумелі гэты край. Паўсюль па рацэ, куды толькі можна было кінуць зрокам, стаялі, ляжалі, тырчалі, сядзелі бёрны. Усё дно ракі выкладзена гэткім "паркетам". Зблізу нібыта бязглузда, а зьверху – роўна й чыста, дакладна паўтараючы выгіны ракі, шчыльна ўбітыя ў берагі сасновыя й яловыя палі, тысячы тонаў патанулага лесу. Обшая і Мёжа – забітыя рэкі.

Дзіўна, што ў такіх без перабольшаньня глухіх мясьцінах цяжка знайсьці лясок, прыдатнае месца для супынку: каля ракі – хмызы і два-тры дрэвы, за імі – вялізарнае поле, аточанае лесам ужо праз колькі кілямэтраў. Дый так толькі там, дзе берагі занадта стромыя, нязручныя, каб да іх падабрацца, узяць бэнзапілу, заваліць дрэва, абкорыць яго, расьпілаваць, дацягнуць да ракі і – будзь што будзе! Палова патоне, палову недзе вылавяць. З шумам, гулам, рокатам ляцелі калісьці тут па вадзе старыя сьвежасьпілаваныя камлі, разьбівалі ўшчэнт берагі, каб пасьля назаўсёды сначыць на дне.

Раней, гадоў сто таму, рака была несудаходнаю й непрыдатнаю для сплаву лесу – ад гэтага яе бераглі парогі й вадаспады. Гэты бязьлюдны, лясны, гарысты край сапраўды мог быць натуральнай мяжою паміж народамі й дзяржавамі. Тут, у лясных нетрах, недалёка ад ручая Рубеж, ратуючыся ад манголаў, прыбеглыя людзі заснавалі ў XIII ст. Ардынскі манастыр, які значна пазьней стаў сьвятыняю краю.

У XVII-XIX ст. гэта ўжо была прывілеяваная пустэльня для іерархаў царквы, альбо для заможных грэшнікаў, якія імкнуліся абстрагавацца ад рэчаіснасьці... Падчас апошняе вайны будынкі манастыра, ягоных цэркваў і сабору былі моцна пашкоджаныя, пасьля зь неверагоднымі высілкамі раскіданыя... і кінутыя. Калі мы набліжаліся да таго павароту, дзе мусіла быць сьвятыня, выпадковыя людзі казалі нам, што там нічога няма й глядзець няма чаго... Аднак самыя мясьціны станавіліся ўсё больш лагодныя й пагодныя сярод гэтага дзікага й няўтульнага краю. Прыгадалася слова "намоленасьць". Гэтае месца штодня больш паўтысячы гадоў чула гарачыя словы малітваў...

Насустрач нам выплыў на чаўне адзіны насельнік манастыра, барадаты, з шалёнымі вачыма, аблаяў нас расейскім матам і некуды сплыў. "Інак", як яго завуць тубыльцы, ніякага дачыненьня да царквы ня мае. Ён – бомж, зэк, які пасьля шматгадовай "адсідкі" пасяліўся ў адзіным ацалелым манастырскім будынку. Апроч гэтага калярытнага будынку XIX ст. ад манастыра засталіся паўразбураныя стайні, нейкі дамок, прыстасаваны пад трансфарматар, а таксама шматкроць перааараная зямля навокал колішняга сабору й цэркваў. Месца пад манастыр было абранае надзвычай удала – на высокім пагорку пры сутоку ракі з ручаём у атачэньні няўклюднага казачнага лесу.

У самой вёсцы Ардынцы жывуць дачніцы з Масквы. А тутэйшая кабетка, мове якой могуць пазайздросьціць маскоўскія дыктары, простасардэчна распавяла нам пра ўсе ардынскія памяткі, папярэдзіўшы на разьвітаньне, каб хадзілі па лесе абавязкова абутымі, бо поўна гадзюк. Распавяла і пра тутэйшую дзяўчыну, якая дамагалася аднаўленьня Ардынскага манастыра, але марна. Праз тое патрапіла ў вар'ятню.

Дзіўна, што распавядала яна гэта, шкадуючы пакутніцу, але не спачуваючы яе падзьвіжніцтву. Справа адраджэньня веры ў гэтых краях здаецца ёй безнадзейнаю. Гэта цяжка ўкладаецца ў нашае ўяўленьне пра Расею, сфармаванае праз «Астанкіна», нібы тут ледзь не на кожным кроку аднаўляюцца цэрквы, ходзяць папы з кадзілам, міністры й мэры кленчаць у бажніцах, зьзяе й радуецца Багародзіца. Па ўсёй нашай дарозе ад Белага, праз тры раёны да самога Вяліжа не было відаць аніводнае бажніцы (за выключэньнем малюсенькае царкоўкі ў Жаркоўскім), ні крыжоў, ні капліц. А таўкавіска на месцы старажытнага манастыра толькі нагадала словы зь Біблії: "... брыда запусьценьня". "Праваслаўны атэізм", як гэта гучыць у інтэрпрэтацыі адэпта – прэзыдэнта РБ.

Маркіз дэ Кюсьцін: "Я ўбачыў у Расеі хрысьціянскую царкву, што не падлягае нічым нападкам, якую ўсё, прынамсі вонкава шануе, усё садзейнічае гэтай царкве ў дзеяньні яе духоўнае ўлады, і аднак, яна ня мае аніякае моцы ў сэрцах людзей, нараджаючы толькі крывадушнасьць і забабоны".

Плывем і разважаем пра веру. Чаму адбываецца заняпад праваслаўя? Чаму вера больш падобная на ідэалёгію? Чаму?..

Жаркоўскі. Мясцовыя завуць сваё мястэчка Жаркі, у множным ліку.

Прыстань. Завод. Склады сплаўленага лесу. Мясцовы чалавек крычыць зь берагу, чамусьці менавіта мне: "Плыві сюды, у лоб дам!" Вялікі мост. Ня церпіцца выйсьці.

Кнігарня. На паліцах – толькі вокладкі бяз кніг і пустата. У гожай зубатай прадаўшчыцы з пульхнымі вуснамі тупавата-гульлівы выгляд. Перад ёй – японскі касавы апарат. Душна. Смажыць. Даведваемся, што ўся сыстэма кнігагандлю й саюздруку ў Расеі разваленая. Друкаванае слова – газэту ў райцэнтры можна набыць толькі на пошце. Кніг няма ў прынцыпе.

Плывем на Захад. Сонца сядае нам у вочы і ўзыходзіць за нашымі сьпінамі. Нашы сьпіны рознае шырыні.

Прыйшлі ў вёску. Цішыня. Не відаць ні быдла, ні курэй. Нават сабакаў не чуваць. Бачылі ката. Вайшаў чалавек. Зашмальцаваны. Глухаваты. Дабразычлівы. Вынес мядовага квасу. Вялікі ліпкі слоік. Каламутная вадкасьць с лусткамі сотаў. Смачна. Ваду тубыльцы бяруць з крыніцы – "ключа". Калодзежаў тут няма.

Хаты ў вёсцы параскіданыя абы як, бяз вуліц. Хаты бяз комінаў. Тутэйшы чалавек тлумачыць, што дым ідзе зь дзіркі ў тарцавым шчыце пад страхою. Стрэхі крытыя рубэроідам. Нешаляваныя хаты таксама маюць колер рубэроіду. Рубэроідныя вёскі. Высачэзны быльнёг. Вакол неверагодны абсяг. Відаць так далёка, што аж займае дух. Глухаваты чалавек і гаворыць глухавата. Напэўна, рэдка гаворыць. "Не, – кажа, – тут адны толькі расейцы, іншых ня бачыў". "А жыдоў бачылі?" – раптам пытаецца Сагановіч. Чалавек прастадушна кажа, што не. Некалі тут было шмат людзей і шмат працы. Некалі – гэта за Сталінам. А цяпер усё кінутае.

Рака Мёжа ўбіраецца ў сілу пад суток зь Дзьвіною. Пакрысе яна набывае нечаканую эпічнасьць. Тоўстыя сінія дрэвы, ільсьняна чорныя валуны ў бялюткім шумавіньні. Порсткая плынь. Навальніца. Проста ў твар. Бура і націск... Высока-высока кружляе драпежная птушка. Сінія ажыны на блакітным каменьні.

Паварот. Яшчэ паварот. Рака пашыраецца, але плытчэе. Лес расступіўся. Дзьвіна.

Паўсюль вада. На цыкляпічным камяні цыкляпічны зялёны конік. Камень вышыней у два чалавечыя росты, конік на паў-далоні. Кава на Дзьвінскай вадзе, згатаваная ў вогнішчы. Дзярновіч ходзіць па натуральных рачных пляжах. Абірае найлепшыя пляны для фота. Найлепшы быў бы конік каля Бартосікавага носу. Вельмі зялёны, вельмі вялікі конік...

Ці бывалі вы ў Вяліжы? А ці верыце вы ў цуды? Да прыкладу, у цуд спатканьня на водах...

Плысьці перад горадам нецікава. На раку выходзяць не фасады, а якраз наадварот, ды прырода некуды адступае. Ну во, здаецца й Вяліж.

Першая наша байдарка ўзяла ўлева, да нейкага вудаля зь сям'ёю ў драўляным чаўне. "Далеко ли до города?" – практыкуюцца ў вымаўленьні. У адказ – рогат. Вудаль – сакратар управы БНФ Вячорка з жонкаю й сынам. Такое адбываецца нячаста. У адно лета, у адзін дзень, у адну хвіліну ля аднаго берагу шырокай ракі.

Арына Вячоркава зь Вяліжу. Вяліж рыфмуецца зь Нясьвіжам. Мы рушым на шпацыр. Прадмесьці на ўзгорках старога магдэбурскага места, пакручастыя берагі, вялікая дагледжаная царква зь зіхоткімі залатымі крыжамі. Віцьбіч. Паўстаньне. Беларушчына. Вячорка не стамляецца "грузіць" нам усё, пра што ён ведае тут сам. Вяліж запомніцца.

Але трэба далей. Нам па рацэ. Хутка цямнее. Доўга, ужо амаль адчайна ў халодных прыцемках шукаем сабе стаянку. Прапалі камары. Бракуе прыпасаў. Перайшлі на шчаўе й грыбы.

Наступны дзень проста ідэальны для такога, як наш, спосабу перамяшчэньня. Краявіды пачалі мяняцца, як у калейдаскопе. Каменныя пераката. Ціхія тоні, каменныя глыбы на беразе, балоцістыя нізіны. Не пасьпяваеш захапіць, адчуць гэтыя віды. Вельмі ціха. Па берагох слупы паказваюць адлегласьць да Віцебску. Гэта Дзьвіна. На запыты людзі адказваюць з гатоўнасьцю. Па-беларуску. Аднак яны яшчэ расіяне. Беларусь блізка.

Улетку 1822 году юнкер коннага палка Аляксандар Адоеўскі пісаў: "Как сильно чувствуется разница между Россией и Белоруссией тот час за межою, которая отделяет Псковскую губернию от Витебской. Другой воздух, другая жизнь в моих жилах!". Малады Адоеўскі меў рацыю.

На рацэ памежных слупоў няма. І таму мы арыентуемся па ўскосных прыкметах.

Неўзабаве пайшоў па беразе яблыневы сад. Першы за ўвесь тыдзень выцечкі вясковы сад! Другое – каровы. Вялікі калгасны статак падыйшоў нам насустрач да вадапою, – *адтулы!* Яшчэ – шпакоўні перад хатамі... Нарэшце, ці ня самае яскравае. У хмызах на беразе пяцёра мужчын з дапамогай трактара мяняюць падгнілы тэлеграфны слуп. Уражаньне ад гэтае абыклае сцэны можа зразумець толькі той, хто цэлы тыдзень ня бачыў, каб людзі – пораліся, што-небудзь рабілі, працавалі.

Пунсовыя, глянцавыя й маціцова-ружовыя, жоўтыя, як яечны жаўток, мярцьвяна-бледныя, прахалодныя, корсткія й сакавітыя, мяккія, як вараная бульба, і цьвярдыя, як дрэва яблычкі-яблычкі... Беларусь мая старонка...

Тут проста цікава. Тут усё знаёмае й неаднойчы спазнанае. Тут цікава не параўноўваць, а адчуваць, што ты дома.

Сураж, сьпёка. Шыкоўныя, рыхтык таіцянскія бялюткія пляжы. Ярка-кобальтавыя лужыны й плястыкава-зялёныя плюмажы мяккае травы. Аўтобус на Віцебск. Не, беларуская глухамань – гэта не глухамань. У нейкай вёсцы на прапынку ў аўтобус заходзіць вакаліст «Крамы» Варашкевіч. Што ён тут робіць? Мусіць, тое самае, што і мы. Жыве.

Дзёньнік рэваншыста

Славамір Адамовіч

1995

1 студзеня (нядзеля)

Сустракаў гэты дзень і гэты год з жанчынаю. Глядзелі фільм пра жывёльны сьвет (барацьба за выжываньне паміж ільвінымі прайдамі і зграямі гіенаў).

Цьвітуць амарылісы. Замест навагодняй хвойкі.

2 студзеня (панядзелак)

Вечар. У суседнім пакоі пара ажыцьцяўляе палавы акт. Стогнуць, сьцінаюць зубы й стогнуць. Я так не магу, я ў такіх выпадках рыкаю, што аж на калідоры чуваць. Аднойчы гэткім крыкам перапужаў суседаву кабетку, якая прыйшла да яго па тое ж самае, што я даваў сваёй жанчыне.

Адключылі халодную ваду.

5 студзеня (чацьвер)

Быў на юбілейным вечары Вольгі Іпатавай. Калі Э.Х. пачаў п...ць па-расейску ды Вольгу назваў Валяй, маючы на ўвазе Аколаву, я не стрываў і выйшаў. На гэтай жа імпрэзе нейкі субчык мой кейс пераблытаў са сваім. Разабраліся.

16 студзеня (панядзелак)

На рабоце. Заходзіў Пушкін з магілёўскага цягніка. Гаварылі пра мой вечар, прызначаны на 13.03. Апоўдні ў мэтро сустрэў N. Прыгожая, але сэксуальна не хвалюе. Што за трасца? Чаму? Занадта ідэальная, чыстая, правільная? Тады трэба прызнаць, што сэкс – гэта брудна, брутальна, няправільна.

18 студзеня (серада)

Каб ня мёрлі, то неба падпёрлі б. Народная мудрасьць пра непазьбежнасьць сьмерці.

Учора з Валяй сварыліся, псіхавалі, а потым добра любіліся, аж пакінулі на ложку лужыну. Плавільшчыкі расы.

24 студзеня (аўторак)

Эх, спалі мяне пярун! Жарсьць мая мяне ўваскрэсіць, з крэсівам заміж сэрца, з сасудамі рэк і крыніц заміж артэрыявен. Кроў мая – сок вагіны, вялікай Маткі ўсяго жывога!

Блін, не жыцьцё, а суцэльная рэфлексія на тэму самога сябе.

28 студзеня (субота)

Штосьці канальчык мой дарагі шчыміцца (і тут ужо не да таго, куды б ушчаміцца). Ці застудзіў, ці нешта горшае?

Пісьмо ад Пушкіна. Адзін зь нямногіх. Сапраўдны. Наш. Як я. Таму й сябра. Калі дрэнна, гэты будзе побач.

"Быць чалавекам – самая файная з магчымасьцяў, якую толькі можа прапанаваць жыцьцё. Гэта значыць, зьмяшчаць у сабе ўвесь Космас. І спазнаць сьмерць, чым нават бог ня можа пахваліцца". З Г.Мілера, «Тропік Казярога».

Вечарам піў і закусваў у Вялікай Жанчыны. Зь ёю была сяброўка, арганістка з касьцёлу (святаго/свентэго – адчуваеш роднасьць гэтых словаў?), што на Залатой Горцы. Хацеў бы я пайграць на ейным арганчыку...

4 лютага (субота)

Альбо, як кажа цётка Стася, сыбота. Цікава, адкуль гэтае "ы". Відаць, яно старэйшае за "у". Сустракаецца, вядома, толькі ў мове старых векам людзей.

Дзень цэлы дома. Заходзіла Арганістка. Прыўзьняўшы станік, я гуляў зь белымі арганчыкамі ейных грудзей, я быў катком, а ейныя ружовыя смочкі – пшанічнымі, ячменнымі, жытнёвымі налітымі каласкамі. Ад задавальненьня яна прыкусвала ніжнюю вусенку, тады відаць былі роўныя белыя зубкі чалавечай самкі. Мы цёрліся адно аб аднаго геніталіямі. Яна спрабавала кратаць маю маленькую, кедровага зерня колеру, штучку, але мне гэта было ня вельмі ў кайф. Магутная, шырокая Арганістка. Цяпер вось бегае па калідоры, поўная мною. Праваліцца б мне ў матку Геі, калі ўся гэтая сытуацыя ня ёсьць фантастычна файная!

9 лютага (чацьвер)

Учора раніцай быў у паліклініцы. Ужо іншы ўроляг соваў мне ў пеніс тры разы мэталічны прут. Раскалупаў, п...к, да крыві. Бач, патрэбнага яму для аналізу ён ніяк ня мог зь мяне дастаць.

Сёньня заходзіў Іваноў С., "пад градусам". Кажа, частаваў К.К., каб прынялі да друку яго, Іванова, легендарную паэмку, напісаную 12 гадоў назад. Фэномэн. Нацыяналіст сам па сабе. З катэгорыі выказьнікаў, якіх хапае. А вось дзейнікаў, дзейнікаў катастрафічна мала. Кажа, што К.А. скраў у яго 20 тысяч. Проза жыцьця.

Днём у рэдакцыю заходзіў Т.М., дзейнік, але, на жаль, ня наш. Ды ну яго на хер, засранец! Няхай «Пагоня» друкуе мой яму адказ.

16 лютага (чацьвер)

Сёньня па БТ павінны паказаць мае неандэртальскія сківіцы ў профіль. 14-га наведаў мяне малады тыпчык, прапаноўваў стварыць фірму, узяць беспрацэнтны (?!) крэдыт – усё гэта для ўмацаваньня Арганізацыі. Назваўся Вадзімам Лабанком.

19 лютага (нядзеля)

Сёньня ноччу прыходзіў канец. Правае распухла і апусьціслася. Пісаў крывёю, гноем. Столькі ўсяго трэба зрабіць да 13.03, а тут гэты хрэн зь яйцамі!

20 лютага (панядзелак)

Я ў 5-й клінічнай. Доктар (жыдок) злазіў мне ў задніцу й сказаў хутчэй класьціся на ўколы. Яшчэ суткі – і магло быць позна. Відаць, 8-га сакавіка 62 г. на ст. Унежма, дзе вакол костачкі палітзэкаў, я нездарма ў кашульцы нарадзіўся.

13.45. Далі ўкол у вену і ў левую палавінку.

Абед. Суп гарохавы посны, чарапок пюрэ бязь мяса (на мяне не пасьпелі выпісаць). Лыжка ды кубак павінны быць свае. Хоць пальцам па талерцы квэцай.

З суботы на нядзелю сьніўся сон. Ізноў якіясь канструкцыі, яны разбураюцца, горы цэглы. Нары, на якіх істоты, падобныя на людзей. На галаве адной зь іх зьвіваецца сталёвая зьмяя. Мне хтось паказвае, я гляджу. Потым на месцы вачэй і лба ў істоты зьяўляецца квадратная дзірка. Канец сюжэту.

Вечар. Запісваю верш. Сусед з гангрэнознай нагою пачынае гучна перамяшчаць сківіцы – паглынае арганіку. У шпіталі, відаць, як і ў турме – думка канцэнтруецца на здароўі (свабодзе) і ежы, як бы што зьесьці.

22.15. Усё навокал раздражняе – ідзе верш, дакладней, ужо ён выйшаў, ужо ён просіцца да людзей.

21 лютага (аўторак)

Кардыяграма паказала парушэньні ў рабоце нашага маторчыка. З маім стажам ананіста плюс жанчыны, як яно ўвогуле яшчэ б'ецца.

Сястрычкі тут здараюцца такія, што лепш бы ім наглядчыцамі ў калёніі. А вось абразок "гігіенічны". Прыбіральшчыца, якая парадкуе туалеты і палаты, займаецца яшчэ й на кухні: разносіць хворым пайку, мые посуд; прыбірае за ляжачымі.

Сусед з разьбітай галавой ажыў і пачаў нудна й доўга трыньдзець.

24 лютага (пятніца)

Трасца яго ведае, дзе я мог застудзіць маю залатую цацку? Рэдкая хвароба, тым і небясьпечная. Па калідоры ходзіць такая медсястрычка, што ах! 33 – лічба падступная. Захварэў вось. Гэта лёс выпрабоўвае, але я пэвен, што вылечуся, я яшчэ напішу сёлета ой якую паэму. У медсястры на тварыку Вялікі Маэстра прыладзіў рымскі носік. Рым: багі як людзі, людзі – як багі.

Як жа я буду любіцца як толькі вылечуся! Як змагаецца за жыцьцё старэнькі арганізм хворага ў рэанімацыі. Праляжаў ён там 9 дзён.

У Чачэнскай Рэспубліцы Ічкерыі працягваецца разьня. Нашы людзі маюць на гэта сваё тлумачэньне: хто дужшы, той і пружшы (ці прутшы), альбо: хто дужэйшы, той і прутчэйшы.

27 лютага (панядзелак)

Прозьвішчы хворых, зь якімі я ляжаў у палаце №1 5-й клінічнай бальніцы: Камінскі, Кандраценка (паляшук з-пад Мазыра), Паграбінскі (стары, нетрыманьне мачы), Даражынскі, Шыманец (стары з рэанімацыі, страўнік), Каткоўскі (трафічная язва нагі), Германовіч. Цікава, а дзе хварэюць патэнцыяльныя "славянасаборшчыкі"?

Прыходзіў тав. з БНФ, прынёс гару апэльсынаў. Што ж, прыемна.

1 сакавіка (серада)

Выходжу на волю, хоць і не зусім яшчэ вылечыўся. Кульгавая сястрычка-беларуска робіць старому перавязку. Як жа файна гучыць у ейных вуснах наша звонкае "дзе" і густое "чаго". Люблю!

8 сакавіка (серада)

Дзень нараджэньня. 33! Хрыстосаў век, хоць і не люблю я гэтых асацыяцый на біблейскія тэмы. Адзін. П'ю фуразалідон. Зайшоў сусед, студэнт-выпускнік, падарыў тры кандомы. Жартаўнік, кажа, каб не хварэў.

24 сакавіка (пятніца)

Позна ўвечары з Ц.К. заходзіў нейкі Юра. Нібы хахол, нібы былы член тутэйшага філіялу "РНЕ". Расчараваўся ў апошнім і шукае новую арганізацыю. Прапаноўваў супрацоўнічаць. Маўляў, трэба быць хітрым, тады сам А.Л. дасьць грошы на наша разьвіцьцё. Эх, Юра, ня ты першы з "прапановамі" пад'яжджаеш. І менавіта цяпер, перад выбарамі. Але мы не паддаёмся на правакацыі – мы іх творым самі. І нашы жарты – гэта заўсёды сур'ёзна.

На днях заходзіў П.Б., браў інтэрвію, за якое ён ужо атрымаў авансу 150 "баксаў". Хваліўся, што мог у свой час прабашляць Зьезд Нацыяналістаў у Віцебску, але, бач, не палічыў патрэбным, ня ўбачыў сэнсу. Казёл! Да таго ж, аказалася, што ён, галубок, "блакітны". Цьфу ты, каго толькі няма сярод нас!

24 красавіка (панядзелак)

Паўдня ананіраваў. Горача. Выйшаў у магазін. Там тая, чорненькая прадаўшчыца, што мяне хвалюе. У яе такая вялікая галованька, вусенкі тоўстыя. Хачу. Гэта было ўчора. Пазаўчора зайшоў у "Полымя" да Федарэнкі. У наш зь ім дыялёг упарта лез нехта Кудласевіч. Яму, бедалажыне, мая вечарына 13-сакавіка не спадабалася. Ён у мяне дапытваўся, што такое літаратура. Дурдом!

Сьніўся сон пра вялікую вульву. О, якая яна была жывая і рэальная! Якой жанчыне належала – невядома. Проста вульва, геніяльная, сакавітая, раскрывалася ракаўкай і выпускала жывое – густыя срэбныя крупінкі. Потым сьніўся мост, брудная вада, зь некім стараюся перабрацца праз ваду. Мост разбураны...

Цёпла. Завітаў у Лошыцу. Яна канчаткова развальваецца, занепадае. Вечарам з надсьвіслацкіх кустоў вяртаецца пралятар, цягнучы за сабой сваё нешматлікае сямейства.

Цяпло. Плоць. Плот. Плыткасьць. Плынь. Плён і пот. Жанчына. Навокал і скрозь – яна. Здаецца, хутка яна прарасьце зь мяне самога (і ў гэтым чуцьці няма нічога "блакітнага"), я пачынаю пакрывацца вульвачкамі, я, саракаклітарны... "Войди в меня..." – пяе пявуля па 2-м канале БР.

15 траўня (панядзелак)

Пасьля "Детей лжи" часта пазнаюць у транспарце, асабліва моладзь. Рэакцыя станоўчая, разумныя людзі і зразумелі, што ў тым фільме да чаго. Некуды запрашаюць, радзяць, прапануюць і – патрабуюць радыкальных дзеяньняў. БНФ мяне канчаткова расчараваў, дрыхло інтэлігенцкае.

19-га, пятніца

Рыхтуюся да шмону. Кажуць, днямі БТ і БР перадалі, што пракуратура (якая?) заводзіць (ці завяла?) на мяне справу за прапаганду фашызму ці нечага падобнага.

20 траўня (субота)

Запісваю ў цягніку «Менск-Полацак». Толькі што "пагаварыў" з "гласом народа". Адзін зь іх пазнаў мяне, стаў чапляцца, пагражаў пабіць (ці забіць?). Іншыя вяла супакойвалі яго. Што за ён? Працуе ў міліцыі?

Еду. Чытаю (вядома ў пер. на расейск.) «Антологию французского сюрреализма». Вось якраз дарэчы: "Самый простой сюрреалистический акт состоит в том, чтобы, взяв в руки револьвер, выйти на улицу и наудачу, насколько это возможно, стрелять по толпе". Як актуальна! А апавяданьне ў «Н.Н.» пра "забіць сьвіньню" – гэта ж сёньняшні эксцэс...

Учора тэлефанаваў мне М.С., казаў, што дзён 20 таму памёр А.Пяткевіч. Зямля яму пухам-імхамі, нацыяналісту і паэту.

Пятая каманда атрымала першую партыю мушак. Пачала працаваць наша алейная фабрыка. Далі рамантуе антыкварыят. Я пішу чацьвёртую кніжачку вершаў («Плавільшчыкі расы» – ейная назва), а Пушкін малюе да яе свае фалязафічныя абразочкі.

22 траўня (панядзелак)

На "рабоце". Сёньня пасьля плянёркі мне сказалі пісаць заяву пра звальненьне. І гэта той момант, калі сапраўды трэба. Пры цяперашнім рэжыме ў дзяржвыданьні рабіць няма чаго.

31 траўня (серада)

Міліцыянэры спорваюць зь левага рукава форменнага адзеньня нашыўку з выявай «Пагоні». Праўда, ня ўсе, некаторыя працягваюць насіць «Пагоню», а іншыя (голь на

Славамір Адамовіч (нар. 1962, ст. Унежма Архангельскай вобл.) скончыў школу ў Будславе, сьвірскае СПТВ-17. Рабіў трактарыстам на цаліне, служыў у ВМФ, працаваў на чыгунцы, на заводзе Кірава ў Менску. Скончыў філфак БДУ, быў карэспандэнтам «Настаўніцкай газэты». Уваходзіў у літаратурнае таварыства «Тутэйшыя». Выдаў тры кніжкі вершаў: «Кальварыйскія клёны», «Зямля Ханаан» і «Зваротныя правакацыі». Стварыў суполку «Правы рэванш».

"Непрыгожага пісьменства" ў сучаснай беларускай літаратуры, бадай, яшчэ не было. Таму й назва гэтая – калька з рассейскай мовы ("неизящная словесность"). Аналёгіі знаходзяцца сярод кніг Джойса, Мілера, Жэнэ альбо Маякоўскага... Яны выйшлі з поля ідыліі, у якім іх калегі-пісьменьнікі рабілі сваю "рэвалюцыю" ў межах пэўнай адаптацыі да пэўнай ідэалёгіі й пэўных публічных "прынятасьцяў". Шок быў абумоўлены тым, што ўласна літаратура, як высьветлілася, – зусім ня тая зьява, да якой можна падыходзіць зь меркамі прынятае маралі. Літаратура ў прынцыпе – дзікі чын, выплеск чалавечае стыхіі, якая прагне свайго шчасьця, якога якраз і няма ў "прынятым" жыцьці. Літаратура ня мусіць выхоўваць або навучаць. Гэта справа педагогікі й адукацыі. І менавіта "благообразная" літаратура – справа амаральная, таму што наскрозь хлусьлівая... З гэтым можна згаджацца або не згаджацца, але гэта – ёсьць. Вось чаму мы друкуем гэты твор Славаміра Адамовіча, пакідаючы, зрэшты, усе згаданыя тут факты, ацэнкі й характарыстыкі на адказнасьці аўтара.

Рэдактар

выдумки хитра) і на левае рукаво нашываюць "зубра" (уласна міліцэйская эмблема).

7 чэрвеня (серада)

Львоў. На канферэнцыі «Новыя напрамкі ўкраінскай геапалітыкі», арганізаванай УНА-УНСО. З гасьцей – толькі мы, беларускія правыя. Імпрэза праходзіць у дзяржуніверсытэце «Львівська політехніка». Фантастычны будынак!

Я – беспрацоўны. Рэдактар дзесьці ўздыхнуў з палёгкаю – пазбыўся скандаліста, як жа. Стаў на біржу працы, якая, вядома, ніколі не прапануе адпаведнай мне работы. Усё на вачах згасае. Куды што падзелася? Дзе той дух канца 80-х ды пачатку 90-х? Зрэшты, ці быў ён? Ад слова "дэмакратыя" верне, як і ад слова "камунізм". Абодва тэрміны – фікцыя, эфір, замазка для вачэй і вушэй, якія й так ні бачыць, ні слухаць не жадаюць. Merde!

10 чэрвеня (субота)

Дома, дакладней, у сваім інтэрнатаўскім катуху. Гарачую ваду адключылі. Паскудна. У «Г. А.Климова» зьмешчана маё інтэрвію, а ў «Нар. г.» за 3/5 чэрвеня – палівы С.Грахоўскага пра маю вечарыну ў ДЛ.

22 чэрвеня (чацьвер)

Учорашняе Купальле, ладжанае газэтай «БМ», не адбылося ў поўнай меры, бо яго забаранілі. Зьбіраліся ў парку Горкага, чытаў там свой верш «Разьвітальная для Сашкі». Ночай сьніліся якіясь катакомбы, кампаніі, псіхбальніца, празь сьцяну якой мы спрабуем уратавацца. Але штука ў тым, што выратавацца можна толькі празь дзьверы, якія ахоўваюцца Нейкай Істотай. Трэба забіць Істоту, гледзячы ёй у бельмы.

Быў Вялікі Кітаец Лі Пэн. Цэнтар горада ў раёне пл. Фаласа перакрыты. Тралейбус спынілі каля цырку. Народ мусіў абыходзіць месца "возложений" аж каля былой БВА. Маразм крепчал. Цікава, колькі каштавала гэтае туляньне менчукоў дварамі ў сваім уласным горадзе? Колькі ўвогуле каштуе дзікасьць у канцы 20-га ст.?

1 ліпеня (субота)

Днямі мы напісалі першыя радкі сваёй геніяльнай паэмы; мы, плавільшчыкі ўсеачышчальнай расы; мы, творцы антытаксіну; мы, малявальшчыкі натуральнымі фарбамі; мы, асэнізатары; мы, расістыя...

28 чэрвеня, як паведаміла «Звязда», у гатэлі «Менск» была знойдзена супрацьтанкавая міна з дыстанцыйным кіраваньнем. Справай займаецца Маскоўскі РАУС і КДБ. Адказнасьць за зьдзейсьненае бярэ на сябе арг. «Правы Рэваншу». Акцыя была прымеркаваная да 53-й гадавіны забойства Янкі Купалы. Так падала газэта. Я запісваю без камэнтароў. Час пакажа. Падобна на тое, што ўжо нажыў арытмію. Пісаць паэмы – для гэтага трэба моцныя сэрца й нэрвы. Думаю, яны ў мяне яшчэ папрацуюць. Сёньня «Звязда» выйшла без адбітку «Пагоні». А з сэрца, з сэрца яе ня вылушчыш, ня выплавіш!.. Сёньня ж быў на футболе. На стадыён не прапускаюць ня толькі са шкляной тараі, але й з плястыкавай... І міліцыя, кругом міліцыя, расслабіцца нельга. На другім тайме пайшоў дождж. Курсанцікі змоклі, пасьля чаго ім прынесьлі плашчы.

7 ліпеня (пятніца)

Слухаю па «Свабодзе» (рассейск. рэдакцыя) перадачу пра прапіску. Я, напрыклад, прапісаўся ў сталіцы на 12-м годзе жыцьця тут. І то толькі пасьля адпаведнага рашэньня гарвыканкама. Маўляў, ён там некалі рабочым быў, маўляў, наша душа, пралятарска-сялянская, трэба прапісаць. Як той казаў, дзякуй дзядзьку за сьвярдзёлак, а цёццы за тэбель.

Учора быў у парку Купалы. Хутчэй адчуў, чым убачыў, што Н.М. (цяпер С.) цяжарная. "Убранзавелыя" прамаўлялі "правільныя" словы. Няхай! А мы будзем рабіць "няправільныя" дзеі. З нашымі пілі піва за бюстам Дзяржынскага ў сквэры.

10 ліпеня (панядзелак)

Мала, што гарачай няма, дык і халодную ваду адключылі. І так круглы год. А ў космас некалі першыя паляцелі. У паштовым аддзяленьні № 13 зьявілася "навінка" – ксэракс. Цяпер усе ксэракапіруюць, а паштовыя паслугі – гэта як удасца. Я вось што яшчэ заўважыў: як толькі тая ці іншая рэч робіцца рэччу бытавой, даступнай для ўсіх, яна губляе нутраную самакаштоўнасьць; а пасьля таго, як яе пачынаюць штампаваць мільярднымі тыражамі, рэч губляе й сваю першапачатковую якасьць, грунтоўнасьць. Калі патэфон 50-х, акрамя рэчы бытавой, быў і рэччу эстэтычнай, калі хочаш, духоўнай, то сучасны магнітафон – гэта кандом, гумка, жвачка на адзін раз – пакарыстаў і выплюнуў. Пры гэтым ужо дзеці ня памятаюць, напрыклад, тэлевізары якой мадэлі былі актуальныя ў пару маладосьці іх бацькоў.

Як кажа мая салодкая Арганістка, мутанты спраўляюць гадавіну мутацыёзу свайго Галоўнага Мутанта. Краіна ў кратах. Дзесьці а палове дзявятай увечары зайшоў лягавы з Маскоўскага РАУС, хацеў падаць позву. Адправіў яго назад, растлумачыўшы, што прыму гэтую пісульку толькі тады, калі яна будзе афармленая па-беларуску. Выклікаюць у якасьці сьведкі па "міннай" справе. Але ня зломіш, як піша «НН», дай ёй бог здароўя!

Яшчэ на неастылай ад N. пасьцелі быў з Арганістачкай. Пахі жанчын перабыталіся на мне і вакол мяне.

11-га, аўторак

Памёр Сачанка. Зь ягоным братам я працаваў у «Настаўніцкай». Раніцай дзяўчаты-суседачкі прынесьлі сьняданак. Хіба гэта ня файна?! Няўжо заслужыў?

13-га...

Злавіў мышку ў вадасьцёку душавога, пасадзіў у слоік. Сымпатычная, відаць, як тахкае сэрца. Хоча жыць. І я хачу, але не як мыш, ня ў слоіку, бля, паскуды! Што такое, чаму раптам Хэмінгуэй? Вайна? Гіпанекі варыянт "калектыўнага забыцьця" нам не падыходзіць. Каб застацца, нам патрэбна дзяржава. Рыторыку пануючых "дэмакратычных" дзяржаваў мы ўспрынялі адэкватна. А што ж інтэлігенцыя, яна, здаецца, хоча свабоды, "непадляглосьці"? Калі я бачу на ранішнім прамэнадзе М.Г. з пенаю-цялём, што я думаю пра ўсё гэта? Я думаю, як думае вось той, што прыйшоў да мяне з павесткай: трэба "гасіць", "мачыць". Каго? Таго, хто не дае мне вольна дыхаць. Прэч з дарогі! Вон, фарысеі! Заткніцеся пра дэмакратыю! Вас трахаюць ва ўсе дзіркі, а вы толькі падмахваеце. Вы што, сапраўды думаеце падняць дзяржаву, пачынаючы дзень з выгулу вашага цюцькі? Так сказаць, гадзінку на oxygenium-ванны, 8 г. на адраджэньне, 8 на глыбокі сон... А БНФ? З такімі жывоцікамі, якія носіць яго вярхушка (акрамя Пазьняка ды Вячоркі, бадай), цяжка, вядома, адраджацца. Можна выкінуць якога-небудзь сацыял-дэмакратычнага неданоска... А што далей? Дзе работа з моладзьдзю? За сем гадоў існаваньня не стварыць моцнай маладзёжнай структуры – гэта трэба было пастарацца. Зрэшты, менш крытыкі. Сам рабі, рабі так, каб зь цябе бралі прыклад.

14.07.95 г., г.Менск

Я ў кабінэце № 6 ст. сьледчага Каптура Анатоля Францавіча (Маскоўскі РАУС, дом 9). Побач М.П. зь філфака БДУ, выступае ў якасьці перакладчыка.

... Ты памятаеш Міколку 88-га году. Здаецца, гэта быў летні сэмэстар, у вашай групе – экзамэн па псіхалёгіі. Ваша "псіхічка" па-беларуску не разумее, але вы ўсе дружна заяўляеце, што будзеце здаваць толькі на роднай мове. Пабеглі шукаць такую, якая можа вас зразумець. Тут і зьявіўся Міколка, тады яшчэ, здаецца, сакратар парткаму. Ой жа як ён гневаўся, што вы насьмеліліся патрабаваць экзамэнаў па-беларуску, як гневаўся! Ты не забыў пра гэты характэрны мамэнт? О, колькі іх было, такіх мамэнтаў! А беларускамоўную "псіхіцу" знайшлі. І вы здалі іспыт на "5".

Але вернемся ў кабінэт сьледчага. Перакладчык ледзьве спраўляўся са сваёю місіяй, заікаўся, доўга ўспамінаў самыя элемэнтарныя словы. Так і хацелася яму дапамагчы. Зрэшты, а чаго ты чакаў, Славамір, ад гэтага экс-камуніста? Ён жа так і не захацеў зразумець, што Беларушчына – гэта не філфак, не 80 хвілін аўдыторнага часу зь пятага на дзясятае на бел. мове, а гэта калі твая любімая жанчына шэпча табе ў экстазе аргазму тыя словы па-беларуску, якія шаптала некалісь твая прапрабабка нашчадку князя Чартарыйскага; гэта калі ты не выцьвілай кровачкай здэгенэраванага шляхцюка, а блакітнай крывёю крывіцкага салдата гатовы змыць чорную крывянку нацыянальнай здрады...

Пытаньні, якія задаваў сьледчы, былі прыблізна такія: з кім і дзе жыву? дзе працую? у якой партыі (арганізацыі) знаходжуся? дзе зьбіраемся? ці зарэгістраваны? мэты і задачы «ПР»? чаму не рэгіструемся? ці ёсьць у мяне дома боепрыпасы? ці даваў я каманду на ўстаноўку міны ў гатэлі «Менск»? і г.д. Пасьля роспытаў было апазнаньне і дактыляскапічны экспэрымэнт. Пры разьвітаньні грамадзянін ст. сьледчы падаў руку. Увогуле быў ён ветлівы і не дазваляў сабе грубага тону. Але ж і я , дзякуй богу, пакуль толькі сьведка.

18 ліпеня (аўторак)

Працуем у надзвычайным рэжыме. Кантакты мінімальныя. Летнія базы закрыты на нявызначаны час. У выпадку, калі хто-небудзь з нашых "выпадзе з вакна", пачне дзейнічаць план "Завіруха". Мусіў зьявіцца да пракурора Ігнаценкі, але сёньня я сяджу на хутары. Побач – каток на канапе і «Дневник заключенного» Дзяржынскага. Ніжэй цытую па выданьні: Дзержинский Ф. (толькі цяпер заўважыў, што і па-расейску яго прозьвішча пішацца праз наша "дз") Дневник заключенного. Письма. Минск, «Беларусь», 1977. "... кое-кто уже воображает, что период репрессий кончился". Так пісаў Дзяржынскі 16 жніўня 1908 году. Вельмі актуальна для лета 1995-га.

20 ліпеня (чацьвер)

Пасьля дажджу захаладала. Няхай, затое сьвежа. Нічога рабіць ня хочацца. Здаецца, у анабіёз запаў бы і каб нічога не адчуваць. Гэта ад фізыялягічнага дыскамфорту, ад адсутнасьці элемэнт. гігіены. Чыстае паветра, але бруднае рыла. Гляджу «Гонкі па вэртыкалі». Савецкі маст. фільм. Зусім не шкада сав. сьледчага. Мне сымпатычны яго "ліквідатар", у выкананьні актора В.Гафта.

23 ліпеня (нядзеля)

"А за пределами сознания душа переживает целый процесс, столько раз уже происходивший, и накопляется яд, и когда наступит время, он загорится местью и не позволит теперешним победителям-палачам испытать радость победы". Запіс ад 3 чэрвеня 1909 году.

Рвануў на Дзьвіну. Старажытнае наша мястэчка. Спыніўся ў жанчыны. Тут рай зямны. Адпачываю, супакойваю сэрца. Грызу садавіну-гародніну, п'ю малако й цалуюся, цалуюся, што аж пошчак-рэха па рацэ йдзе. З тою, што падстаўляе мне роцік для пацалункаў, былі ў цудоўным сасновым бары. У аўсах змачылі ейны балахон. Файна было ў хлярафіле – сыравата-мухавата. Дзесьці леваруч крумкач крумкаў і рыпела маладая асінка. Якая буйная й чыстая маліна! "Жить –разве это не значит питать несокрушимую веру в победу?" Эдмундаў Фэля, 3 чэрвеня 1909-га.

Усё ва ўсім, але хто над усім?

26 ліпеня (серада)

У Менску. Чатыры дні адпачынку на Дзьвіне праляцелі. Некаторыя з нашых гатовыя спароць гарачку. Прыходзіцца стрымліваць пад пагрозай кары. Канспірацыя й грунтоўная падрыхтоўка, а для пэсьцяў і сьвятаў яшчэ будзе час. Яшчэ адсалютуем, яшчэ нашы фэсты наперадзе. Нарэшце замежжа пачало пастаўкі "зерня".

"И вот в то время, как слова признанной поэзии отражают то, что сейчас уже умерло, что уже является ложью, родилась новая поэзия – поэзия действия, неизменного долга человеческих душ, отрицающая всякие трагедии, безвыходные положения, беспросветное отчаяние". Зь пісьма Дзяржынскага да жонкі.

Сапраўдная Паэзія ёсьць Рэвалюцыя. Эпіграф да чацьвёртай кніжкі.

Дзяржынскі не любіў інтэлігенцыю й нацыяналізм. Шкада, што ён не любіў апошняга. Быў бы нашым – была б і Беларусь нармальнай дзяржавай.

Ніякіх адзнакаў, што заўтра Дзень незалежнасьці. Чытаю карэспандэнцыю, адпісваю пісьмы.

27 ліпеня (чацьвер)

Дзень Незалежнасьці. Сумна. Фронту забаранілі сьвяточнае шэсьце. Рыхтуюся да сутычкі зь міліцыяй. Як лёгка паголеным шчокам, як цяжка ў грудзях...

28 ліпеня (пятніца)

Учора сутычкі адбыліся ў парку Чалюскінцаў. Пакуль абываталь "сьвяткаваў", амон зьбіваў нашых. Мяне й яшчэ двух узялі каля ўваходу на ст. мэтро. Ноч правёў у Першамайскім РАУС. У вялікай, але душнай камэры, было нас 8 чалавек. Адзін ублюдак касіў пад крутога. Ужо яго чакае наша сьвінцовая ляндрынка.

Выпусьцілі мяне сёньня а дзявятай, бо я падпісаў пратакол затрыманьня. Сьцяг канфіскавалі ціхенька. Далі яшчэ 60 тысяч штрафу. Так я вам, ... , і заплаціў. Нач. Першамайскага РАУС падпалкоўнік Пятровіч. Жыві і памятай.

"Когда я думаю о том, что теперь творится – о повсеместном якобы крушении всяких надежд, я прихожу к твердому для себя убеждению, что жизнь зацветет тем скорее и сильнее, чем сильнее сейчас это крушение".

Падпісваюся пад гэтымі словамі майго земляка і мушу ставіць пакуль што кропку. Іншыя алоўкі чакаюць нас. Атрамантам артэрыявен мы пачынаем крэсьліць знакі нашай Свабоды.

Працяг будзе, грамадзянін пракурор.

ПЛАВІЛЬШЧЫКІ РАСЫ

урывак з паэмы

Мы любім горача халоднае лязо.
Няхай па ім сьцякае кроў ахвяры.
Каб вольна жыць і спраўдзіць нашы мары,
мы адназначна выбіраем "Зло".
Але для нас, для нас яно "Дабро".
Злом ёсьць яно для ворагаў Айчыны.
Паставім здрадзе піку пад рабро
за герб, за сьцяг ды іншыя злачыны.
Пячыся, сука, падла, на нажы.
Энэргію спазнай беларусінаў.
Павесім здраду на худой асіне,
а служкаў ейных, навалач і псіну,
закінем у пушчанскія лаўжы.
Мы шыхт у шыхт ідзём і наш клінок
гатовы ўзрэзаць ворагу вантробы,
мы не баімся арышцанцкай робы,
мы за Айчыну робім гэты крок.
З дарогі, страх! Зашыйцеся ў нару,
гайня інтэлігентных імпатэнтаў.
Гару бяруць, сягаючы ўгару,
і тыя, хто гатоў да інцыдэнтаў.
Мы шыхт у шыхт... Устаўлены запал,
глядзяць за гарызонт прыцэл і руля,
і фаўст-патрон рахуе: ці прапаў,
ці панам буду, калі схібіць куля.
І вось прыйшлі. Займаем нумары.
Яшчэ лясок не разагрэла сонца,
яшчэ раса, і сьвет такі бясконцы,
і сьпяць у пад'яленцах камары.
Хвіліна-дзьве – і "пяты" распачне,
затым "сямёрка" паласьне канкрэтна,
пасьля імпэтна шухне РПГ
і дух кладоў адчуецца ў паветры...

Ліпень 1995

ДАРОГА

Вольга Бабкова

Тэма "мікрагісторыі" была распачатая ў 3-м нумары «НН» сёлета артыкулам Вольгі Бабковай «Вясельле» пад рубрыкай «Гісторыя штодзённасьці»*. Сёньня мы публікуем наступны матэрыял гэтага цыклю — «Дарога». З архіўных дакумэнтаў аўтарка выбірае й абагульняе факты, зьвязаныя з гэтай тэмай: назовы й характар дарог сярэднявечнай Беларусі, тагачаснае будзённае жыцьцё і здарэньні на дарогах. Гэтак гістарычны матэрыял ачышчаецца ад дыдактычнасьці, падахвочвае да параўнаньняў, набліжаецца й засвойваецца. Паступова ўзьнікае новы мэтад інтэрпрэтацыі гісторыі.

«Гісторыя пад мікраскопам» – адно з апошніх захапленьняў постмадэрнісцкай гістарыяграфіі, якая імкнецца стварыць універсальны тэкст (і гіпэртэкст) – навукова дакумэнтальны, праблемны, не абцяжараны ідэалягічнай дыдактыкай і адначасова блізкі ды зразумелы для пасталітага чытача.

**На недакладнасьць гэтага тэрміну зьвярнуў увагу Алег Латышонак зь Беластоку: "Мае дзед і баба жаніліся толькі раз дый раз згулялі вясельле. Затое войнаў перажылі пяць: японскую, І сусьветную, польска-савецкую 1920 г., савецка-польскую 1939 г. і нямецка-савецкую. Да таго яшчэ тры рэвалюцыі: 1905 г. і дзьве ў 1917. Пытаюся ў Вас, што было для маіх дзядоў тэмай больш штодзённай: вайна ці вясельле? Сваты ці рэвалюцыя?"*

Дарога – як рака: разгаліноўваецца на шматлікія прытокі – сьцежкі і цячэ паўз двары, гарады, агароды, усё закранаючы сабою і ўсё пакідаючы па-за сабою.

Алесь Разанаў

Дарога – паласа зямлі, прыстасаваная для язды і хадзьбы.

Гістарычны слоўнік беларускай мовы

Сярэднявечныя дарогі – гасьцінцы, тракты, шляхі, сьцежкі, пуцявіны... Колькі было іх, што несьлі вандроўных, сялянаў, манахаў, купцоў – падарожнікаў у сваім часе. Дарогі злучалі вёскі зь мястэчкамі, гарады з фальваркамі. Злучалі ўсё з усім. Ногі чалавека пратапталі сьцяжыны да ўсіх месцаў, прыдатных яму. Ці то была карчма, млын ці велічэзны дуб у бары. Зарасталі травой адныя сьцяжыны – зьяўляліся новыя, як найяскравыя праявы прысутнасьці чалавека ў сьвеце.

Апроч здарожаных і зьнямоглых падарожных, што ўласнымі нагамі вымяралі мілі сваёй і чужой зямлі, па дарогах таксама езьдзілі на конях, калёсах, вазах, падводах, карэтах, узімку – на санях. Апошнія, у сувязі з раньнімі завеямі, выцягваліся ўжо напрыканцы восені, як сьведчаць пра тое актавыя запісы*. Чалавек імкнуўся ўпрыгожыць гэтыя сродкі руху, як з павагі да самога сябе, так і да дарогі. Гэтак, сані прыгадваюцца "малеваные", воз – "нарадный", а што тычыцца конскіх рыштункаў – дык гэта цалкам залежала ад заможнасьці падарожніка. Выкарыстоўваліся сёдлы "з войлакам", "казацкие", "гусарские", турэцкія, крытыя саф'янам, "возницкое", "подмалеваны демид роботы острозское", а таксама "седло малеваное з радом мосендзовым".

Другая дзейная асоба дарогі, чые адбіткі перамежваліся зь сьлядамі чалавека – конь. "Конь вороной белокопытный", "конь шерстю половый иноходник", "конь шерсцею белою", "конь мышатый белокопытный", "шпаковатый", "кары", "тисовы", "рыжарабы", "стрекаты", "кони почтовые турецкие и стадныя", "езные и робочые", "шлехедские", "конь дворный возничок панский", "коник дрыгантик рыжый". Конь – верны памочнік і спадарожнік, аб'ект куплі й продажу, сьведка крадзяжу й злачынства. Неаднойчы ў актах сустракаліся факты гвалту ў дачыненьні да коней, калі злодзеі білі іх абухамі й кіямі, ледзь не забіўшы да сьмерці. "видел... коня шерстю сивого, шаблями зрубаного, а меновите на крыжу видел рану тятую, а на хвосте... две раны тятых крывавых, на стегне..."

Дарогі крыжаваліся, сыходзіліся, разьбягаліся ў розных кірунках, складалі заблытаныя малюнкі на мапе-зямлі, якія, мабыць, былі бачныя адно птаству ў небе. Але ж пачаткам шляху звычайна зьяўлялася вуліца населенага месца, менавіта таму малюнак асноўных вуліц горада практычна не мяняўся на працягу стагодзьдзяў, бо яны былі зьвязаныя з накірункам вялікіх дарог і таму мелі адпаведныя назвы. У 1600 г. дарога, што вяла ў бок Магілёва ў Менску пачыналася з вуліцы Вялікай Магілёўскай. Пэўна, што "гасцинец великий виленский" браў пачатак зь Віленскай вуліцы, гэтаксама былі й іншыя накірункі. Існавалі й такія дарогі, якія пачыналіся ля гаспадарскага ганку й вялі да рэчкі, г.зв. "дорога выгонная"; праціналі наскрозь пушчу ці гай, закручваліся "обапол речки". Здаралася й так, што раптам даўняя дарога зьнікала, яе межы руйнаваліся і тады паступала чарговая скарга ў гродзкі суд, як, прыкладам, ад каралеўскага лясьнічага кн. Івана Палубенскага на зямяніна Яна Гашчоўскага за захоп слонімскай пушчы й псаваньне дарогі: "... дорогу старожитную давно от ревизоров господарских до села королевского Ходаков положоную кгвалтовне заорал, границы и копцы старые попсовал и ново свои засыпал..."

У актавых матэрыялах занатаваны пэўны гістарычны выраз пра дарогу – "дарога добровольная", "звыклая", "звечная", што значыць вольная, адкрытая, даступная для ўсіх апякунцаў сьв. Аўласа (старажытнага Вялеса) – абаронцы й апекуна "человека подорожного". Але, відаць, нядбайна маліліся вандроўныя, выпраўляючыся ў дарогу, бо часам акурат яна рабілася месцам страшэнных злачынстваў, гвалтоўных нападаў, боек ды рабункаў. "Усё, што здараецца з дарогай, здараецца і з чалавекам, і ўсё, што не здараецца з чалавекам, здараецца якраз у дарозе" (А.Разанаў).

"На ростанях дороги", апроч "люду подорожного, спрацаванага" сустракалася безьліч іншых, што скіроўваліся ў розныя бакі тагачаснага сьвету. Хто ў свае маёнткі на Падляшша "ку Короне Польской", хто на Валынь, хто на Русь, хто на вайсковую паслугу ў Інфлянты, хто ў Жамойцію, а хто ў Менскі край – "до тутошнего места Менского до Литвы", ці да "земли Новгородское", а хто яшчэ далей...

Усе гэтыя "езные и пешые" – драбы, жакі, віжы, пахолкі ў чырвонай барве, людзі служэбныя, "торговые купецкие", "текуны", "бакаляры", зьбегі, галота... былі добра ўзброеныя. Сама дарога вымагала гэтага. Супраць "человека подозроного" напагатове былі розныя "брони войне належачые": "шаблі булатные", ко-

* Для тэкста выкарыстоўваліся вытрымкі й фрагмэнты з актавых кніг «Слонімскі гродзкі суд» (сярэдзіна XVI ст.) і «Менскі гродзкі суд» (1600 г.), якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Беларусі.

Дзьве кніжкі пра дзьве вёскі

o. Aleksy Wołkowski. Historyczny oraz statystyczny opis cerkwi i parafii w Czarnej Cerkiewnej / Wstęp i przypisy Doroteusz Fionik, Sławomir Iwaniuk. – Czarna Cerkiewna – Bielsk Podlaski: Bractwo Młodzieży Prawosławnej Diecezji Warszawsko-Bielskiej, 1994. – 87 s.

Irena Matus. Wieś Strzelce-Dawidowicze w tradycji historycznej. – Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 1994. – 242 s.

Як вядома, гісторыя пішацца або з прымусу, або з унутранай патрэбы. Гісторыя адной вёскі – таксама. Вось апошнія прыклады, якія зьявіліся ў асяродзьдзі польска-беларускай навукі: нарыс айца Аляксея Валкоўскага і манаграфія Ірэны Матус пра дзьве беларускія вёскі ў Полыпчы – Чорную-Царкоўную і Давыдавічы.

Нарыс а. Аляксея быў напісаны яшчэ ў 1891-1892 гадах паводле інструкцыі епархіяльных уладаў. У свой час быў такі даволі значны, як бы мы цяпер сказалі, праект: складаньне прыходзкіх летапісаў і гістарычна-статыстычных вопісаў парафіяў. Некаторыя з гэтых твораў былі надрукаваныя ў «Епархиальных ведомостях» беларускіх губэрняў, большасьць – загінула. Вопіс Чорнай-Царкоўнай захаваўся і, нарэшце, таксама пабачыў сьвет.

Твор невялікага памеру, надрукаваны па-расейску і ў польскім перакладзе. Захаваўся ў царкоўным архіве і прыходзкі летапіс Чорнай-Царкоўнай. Але ў новым выданьні ён не надрукаваны. Верагодна таму, што не такі зьмястоўны, як вопіс.

Пісаць прыходзкі летапіс складана. Трэба распытваць жыхароў аб далёкім і недалёкім мінулым, аб іх сучасным жыцьці. Зразумела, што прыхадзкі сьвятар і сам шмат чаго з гэтага ведае. Але каб даверыць гэта паперы, а потым перадаць начальству – трэба праводзіць старанны адбор і цэнзуру непажаданых зьвестак. Напрыклад, а. Аляксей мімаходзь згадвае пра падзеі 1863 году, аб тым, што ў прыходзе былі нейкія "мнімыя" бунты, а некаторыя сяляне набылі заможнасьць, задушыўшы багатага ксяндза. Начальству такая гісторыя ня трэба. Але што можна прапанаваць наўзамен? У выніку гісторыя прыходу атрымліваецца фрагмэтарнай, яна замяняецца статыстычным нарысам.

Рызыкнем дапусьціць, што ў гісторыі пераважаюць пэсымістычныя падзеі. Стварацьаптымістычную карціну жыцьця можна толькі на шырокім прасторавым фоне, набраўшы прывабных фактаў адусюль патроху. Калі ж у гісторыка прастора не шырокая – "проза" будзённага жыцьця выступае на першы плян.

Аб гэтым міжволі думаеш, чытаючы кнігу Ірэны Матус. Гэта манаграфія ў сучасным разуменьні слова. У адрозьненьне ад папярэдняга аўтара, Матус пісала яе не на прапанову начальства, а, відаць, з уласнае ініцыятывы: "Гэтую працу лічу не абавязкам, а свайго роду спатканьнем з жывой гісторыяй".

Кніга прысьвечаная перыяду ад канца XIX да 1944 году. Кожны, хто гаварыў зь людзьмі на вёсцы, ведае, што жывая памяць пя йдзе ў глыб часу далей за канец XIX – пачатак XX ст. Гэта й перадвызначыла першую храналягічную мяжу дасьледаваньня. Другая мяжа абумоўленая тым, што пасьля яе пачынаецца ўжо сучаснасьць.

Людзі вёскі Давыдавічы былі шчырыя з аўтаркай, дый цяжка было нешта схаваць ад яе – яна тут нарадзілася й пражыла першыя гады жыцьця. Кніга атрымалася вельмі насычаная жыцьцёвым матэрыялам, значыць – праўдзівая. Ацэнак аўтарка пазьбягае: падзеі гавораць за сябе самі (адносіны з панамі, рэвалюцыя 1905 году, вайна 1914 году, эвакуацыя й рээвакуацыя, прыход Саветаў у 1939 годзе, вайна, партызанка). Адсюль узьнікае і дваістае пачуцьцё: відавочны шчыльны кантакт аўтаркі зь яе інфарматарамі й адчужанасьць ад іх. Вырашаць, добра ці блага рабілі яе аднавяскоўцы, Матус пакідае чытачу кнігі.

Што ж, кожны робіць свае высновы. Для некаторых будзе адкрыцьцём тое, што давыдаўцы зусім ня памятаюць пра падзеі польска-бальшавіцкай вайны 1920 году, для іншых – тое, што яны ўпэўненыя, што іх вёску ў 1905 годзе наведаў Ленін. Цікаўны чытач даведаецца пра тое, як у вёсцы зьявілі ся бульба й самагон, чым прымусовыя работы пры Саветах адрозьніваліся ад такіх жа пры немцах, чаму людзі кармілі партызанаў... Яскравы эпізод характарызуе наіўнасьць давыдаўцаў. Калі адзін з гаспадароў хаваўся ад немцаў у лесе, чакаючы прыходу Чырвонай Арміі, немцы нагадзілі ў ягонай хаце. Узрушаны чалавек вельмі хацеў прывесьці сюды вызваліцеляў, каб яны паглядзелі на гэтае фашысцкае бескультур'е. Новы абстрэл вёскі зноў прымусіў яго схавацца ў лесе. Калі ён вярнуўся ў другі раз, то адчуў, што сьмярдзючы пах памацнеў. Тут ўжо пабывалі вызваліцелі. І выкарысталі яны ня цёмныя куты ягонай хаты, а патэльню на пліце...

Для польскага чытача ў колеры на шыкоўнай паперы надрукаваная ўкладка: школьная пахвальная грамата 1941 году з партрэтамі Леніна й Сталіна. Экзотыка! Падаюцца кароткія біяграфіі вяскоўцаў, слоўнік мясцовых мікратапонімаў, схемы вёскі на розныя часы, статыстычныя табліцы насельніцтва (пайменныя). Большасьць гэтых матэрыялаў застанецца незапатрабаванаю, але, відаць, аўтарку гэта не бянтэжыць – яна ж пісала кнігу для сябе й свайго чытача.

Што не было канчаткова высьветлена аўтарамі абедзьвюх кніг, дык гэта этнічны склад вёсак. А. Аляксей вагаўся: у Чорнай-Царкоўнай говар беларускі з маларасійскім дамешкам. Жыхары Давыдавічаў падчас перапісу 1921 году назваліся беларусамі, хоць насілі фармальна ўкраінскія прозьвішчы, а ў Расеі іх звалі то хахламі то беларусамі. Урэшце, час зрабіў сваё: пальшчызна ўзяла верх...

Як трэба пісаць гісторыю вёскі, у свой час паказаў вядомы гісторык М.Улашчык. У яго знайшліся пасьлядоўнікі. Але афіцыйную беларускую навуку вёскі не цікавілі. Толькі апошнімі гадамі яна сыйшла на ўзровень раёнаў, але яшчэ не асобных вёсак. Жывая гісторыя асобнай вёскі небясьпечная для палітычных спэкуляцыяў. Таму застаецца даць сучасным гісторыкам параду: не пішыце, калі раптам прапануюць, гісторыю вёскі на замову. Пішыце яе ў вольны час, для сябе і для цікаўных людзей. Гэта будзе бесьсьмяротная кніга.

Гараджанін

рды, мячы, бардышы, сагайдакі, кіі, "секиры полские", "ощепы казацкие", пулгакі, ручніцы швэдзкія кароткія ці доўгія, лук са стрэламі, аркабузы, нажы маскоўскія і вугорскія, а то й проста мачука, косы рагаціны, калы, пугі ды камяні. Зброя ўжывалася і для нападу, і для абароны, і для пагоні.

Амаль 400 гадоў таму, на самым пачатку кастрычніка, мусіць, у самую "Восень Сярэднявечча" па дарозе з "Незвижа да Менска" ехаў самотны вершнік на інаходніку "шерстю половой", на прыгожым сядле "малеваным". Апрануты ён быў па-шляхецку: у жупан фалюндышавы з шнурамі "жолтою каразею падшитый", "шлык мармуровы" атласам зялёным "поволочоный", "убранне фалюндышавае бурнатнае, поес едвабны турецкае работы", боты саф'янавыя. Пры ім былі некаторыя рэчы: нажы маскоўскія, хустка турэцкая, шабля "оправная золотистая".

Няблізкая дый недалёкая дарога зь Нясьвіжа да Менску. Ёсьць час для роздуму, для сузіраньня. Дарога вядомая й невядомая. Сёньня дождж, заўтра – блакіт. Сёньня аблокі загрувашчылі небасхіл, а колісь – адно дрэвы ратавалі ад бязбожнай сьпякоты... Хто ён, самотны вершнік? Акты захавалі ягонае імя – Станіслаў Збуйнеўскі – служэбнік ваяводзіча віцебскага Юрыя Паца. Захавалася гэта таму, што да Менску шляхціч Станіслаў не прыехаў і цела ягонае знойдзена не было, бо "... недоеждчаючы корчмы пана Еноха Кавасинского, называемое Кухтич, недоеждаючы мосту..." ён быў гвалтоўна спынены, абрабаваны, забіты й немаведама куды схаваны. Нагода забойства паўсюдная – прагнасьць да чужога. Падарожны меў пры сабе грошы – уласныя і гаспадаровы.

А па дарозе зь сяла Матарова да сьмілавіцкай царквы сьв. Юрыя ў самыя велікодныя дні рабаўнікі спынілі й абрабавалі матароўскіх сялянаў, паздымаўшы зь іх сьвяточную вопратку "убране новое сукна белого, ... сермягу сукна белого, кажух новы, колпак лисами подшыты", а таксама "рушник долгий ткацкий" дый іншае.

Часьцей за ўсё здарэньні адбываліся "ночным а злодейским обычаем", ці надвячоркам, як, прыкладам, адбылося зь Дзьмітрыем Закалічам "праве на заходе сонца на добровольной дорозе на врочыщу у сосен радовых, не доеждчаючы Ляховое Лукі, неподалеку Менска", ці калі бралася "вжо на вечор" і дарогу прыходзілася асьвятляць лучынай. Ці на малой і невядомай дарозе, ці на "гостинцу великом звыклом виленском", ці ў дзень, ці ўначы сыходзіліся шляхі ката і ахвяры, а вынік іх драматычнай сустрэчы рабіўся яшчэ адным радком у судовых кнігах.

Рабаўнікі зьяўляліся перад агаломшанымі падарожнікамі раптоўна, рэдка калі на адным, часьцей з слугамі й памагатымі, ці то зь лесу, ці зьнянацку "... выпадшы з закустовя". Вось якім чынам апавядае пра такі выпадак зямянін Аляксандар Ляўковіч: "... выпадшы з закустовя земенин... Ивана Песляк... не маючы до мене ниякое потребы, сам особою своею с кием, а маючы з собою многих помочников с косами, которых он сам лепей знает... учынивши окрык "Бий! Забий!" мене дей невинне сам рукою своею кием збил... и если бым на коню не рушыл, подобно бы мне он смерти приправил... И гонечи за мною, похвалку на здорове мое учынил, мовечы злыми словы, яко се ему подобало, иж дей о том собе ведай, што... от мене згинеш и жив не будеш".

Па іншаму скончылася падарожжа баярына Храмея, які "... едучы... з Новагрудка от пана своего... посланым до Оршан, до дому своего и трафилосе дей ему, в товаристве ехати в дорозе килько миль... з земенинам Василем Тихоновичом..." У гасподзе Яраша Зяньковіча ў Менску, дзе спадарожнікі спыніліся разам, "товарыш" зьнік, пакінуўшы баярына Храмея на палове шляху без аніводнага гроша. Так "злучалися в дорозе" і іншыя пешыя і конныя...

Найбольш цярпелі ліха на дарозе частыя наведнікі карчмы, аматары бяседы й учты. Найчасьцей яны заставаліся жывыя, але ж абрабаваныя да рэшты. Падданы Гаўрыла з Азарыч скардзіўся ў судзе: "... калита з мене знята недавных часов злодейским обычаем, тоест в пост теперешний великий. На третей недели у пятницу ишолом з места Слонимского пьяный и заснулом на дорозе... то так дей пьяного и спячого обрано мя, знята тая калита, а в калите копа грошей, гребень, хустка, а сермяг знято две, которую дей калиту купилом в мещанина слонимского Ивашка Кузютича..."

Цярпелі й больш заможныя людзі і ўсё па тых жа прычынах: "... прыехал по потребе ... пана Крыштафа Кграевского с пенезми... закупуючи лесов на выроблене попелов... а так не моглом дей торгу жадного вчинити... с тыми пенезми... назад до Подляша поехал, и переехавши место Тимковичи и село Тимковское, яко будучи чоловек подпилый, попустивши коня своего на поле близко дороги Клецкое... ниж ми дей неякий земенин... надехавши до мене гдем спал, з оного коня моего знял седло з сумками, в которых сумках было петдесят золотых чирвоных, кошуль две простых тонких, ручников три, один коленский, другий просты, шыты белю, третий простой, в которым ручнику тые злотые были, нож жолтый угорский, а тревики новые при седле, кгермяк чорного сукна утержинового..., ощеп козацкий, узда, то все забравши и до себе на воз побрал и с тым уехал..."

Ахвярай на дарозе былі ня толькі людзі, але й жывёлы. Адзін з такіх нетыповых выпадкаў таксама патрапіў у актавыя запісы. Цівун маёнтка Хажова харунжынай ашмянскай Гальшкі Ясенскай Мікола Урбановіч "... перенемшы на дорозе, которая идеть з Лебедева до села панов Головничов, прозываемого Мойсич, вепра кнореза у семи годох, который бег з села Мойсич, там же на той дорозе, он нет ведома для которое причыны перенемши на смерть забил..." Чаго толькі ня ўпісваў замкавы пісар у тоўстыя судовыя кнігі! Нават вепрука-сямігодка, што шпацыраваў па пыльнай вясковай дарозе. Чыясьці ўласнасьць – чыясьці здабыча.

Што за краявіды адкрываліся вачам падарожніка падчас ягоных вандраваньняў? Найчасьцей лясы, раўніны, пагоркі на далягляд зе, "ямы-ямища", "речки-речыща", "сажовки", балоты, "озерыща", млыны, карчмы пры дарозе, абарончыя башты, дубовыя й бярозавыя гаі, ды самотныя агромністыя валуны, якіх багата было раскідана на прасторах нашае зямлі. Штосьці цешыла вока, штосьці прымушала здрыгануцца. Так, баярын Ян Шымановіч, едучы "добровольной дорогой з места Менского идучою", мінуў шыбеніцу, непадалёк "Кислинага балота".

Ці не знаёмае нам пачуцьцё падарожніка, які нарэшце дабраўся перад зьмяркань ем да доўгачаканага места і з пагорку ўзіраецца ў каляровую пляму гарадзкога краявіду: дамкі, храмы, сады... А за сьпінай – у цемры губляецца тракт.

На сваім шляху падарожнік мусіў пераадольваць і вадзяныя перашкоды, калі, зразумела, сам не выпраўляўся на платах ці "вытинах". Добра калі былі масты. Але часам і на іх адбываліся прыкрыя здарэньні, як з панам Юрыем Рамановічам, які "месеца июля... едучы... до Менска... и далей на Русь по потребах своих, гды переежджаючы реку... ось передняя зламала и весь воз у воду упал. За которым упадненем речей немало се помачало и попсовало у тлумоку. Межы которыми речами и листов немало было, которые помокли..." І таму прыйшлося небараку пасьля перажытага цягнуцца да менскага "враду" і там перад падстаростам Адамам Салагубам "обтежливе жаловать и оповедать", паказваючы "листов помоклых немало..."

Дарога ратавала, хавала, губіла, пагрыбала, вабіла. Была росначчу й надзеяй. Магла быць і была шляхам у нябыт.

... з Ушы да Краснага Сяла, ад Койданава да Вертнікаў, з Трусавіч да Радашкавіч, з Паняціч да Белых Лужаў, зь Менску да Навагародку, зь Вільні да Маладзечна, Вялікая з Ракава да Менску, з Ракава да Ісачы, зь Менску да Міханавіч і да Дукор, з Луцку да Менску, дарога Слуцкая, гасьцінец з Быхава да Магілёва, гасьцінец Радашкаўскі, дарога Вялікая Сьвіслацкая...

"Дарога – палімпсэст, тора чалавечай гісторыі: што на ёй выдрукоўваюць адныя, сьціраюць, выдрукоўваючы сваё, другія".

(Алесь Разанаў)

Слоўнік тэрмінаў

АБУХ – ударна-драбільная зброя накшталт сякеркі на доўгім цаўі
АРКАБУЗ – пішчаль, старажытнае ружжо
БАКАЛЯР – бакалаўр, школьны настаўнік
БАРВА – мундзір
БАРДЫШ – халодная зброя ў выглядзе шырокай сякеры з закругленым у форме паўмесяца лязом, насаджанай на доўгае дрэўка
БАШТА – абарончая вежа
БЕЛЬ – белыя ядвабныя ніткі
БЯСЕДА – гулянка
ВИЖ – судовы выканаўца, сьведчыў у судзе пэўныя факты
ВЫТИНЫ – вялікагрузнае рачное судна, баржа
ГЕРМЯК – шырокі плашч без рукавоў, накідка, род епанчы
ДЕМИД – від сядла
ДРАБ – пешы воін, ахоўнік
ЖАК – шкаляр, бедны студэнт
КАЛИТА – мех, торба для грошай
КАПА ГРОШАЙ – грашовая адзінка = 60 літоўскіх грошаў
КАРАЗЕЯ – тоўстае, грубае сукно
КИЙ – палка з загнутай ручкай
КОРД – кароткі меч
МАЧУКА – палка, булава
ОЩЕП – вошчап, дзіда
ПОХВАЛКА – выказаная публічна пагроза, намер забіць, замах на жыцьцё, здароўе ці маёмасьць
ПУЛГАК – ручная агнястрэльная зброя сярэдняга памеру, род мушкета
РАД – дэталь конскай зброі (вупражы)
РУЧНИЦА – стрэльба
САГАЙДАК – камплект з луку, налучча і калчана з стрэламі
ТЕКУН – скараход, ганец
ТЛУМОК – скураны вузел
УЧТА – пачастунак
ШЛЫК МАРМУРОВЫ – каўпак з футра чорнай лісы

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ АГЛЯД

У сьвет выйшаў другі нумар створанага летась часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд». Як першы ў Беларусі спэцыяльны пэрыёдык па гістарычных навуках, «БГА» бярэ на сябе пэўныя задачы ў разьвіцьці навуковай беларускай гісторыяграфіі. Згодна з рэдакцыйнай канцэпцыяй, часопіс мае зьмяшчаць новыя дасьледаваньні, пераважна праблемныя, публікаваць найбольш важныя архіўныя матэрыялы, ініцыяваць мэтадалягічны плюралізм (хаця б знаёмячы зь немаркысыцкімі працамі) ды рэфэраваць замежныя выданьні. Сталая ўвага «БГА» зьвернутая на айчынную гістарычную літаратуру.

- Новы сшытак часопіса адкрываецца мэтадалягічным блёкам, які прадстаўлены артыкулам Марыны Сакаловай «Да мэтадалёгіі аналізу грамадзка-палітычных рухаў».
- Людміла Дучыц вызначае ролю балцкага элемэнту ў этнагенэзе беларусаў і прыходзіць да высновы, што балта-славянская этнічная супольнасьць як аснова беларускага народу існавала ўжо на пачатку II тысячагодзьдзя н.э. (артыкул «Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі ў пачатку II тыс. н.э.»).
- Аляксандар Смалянчук дасьледуе гістарычную сьвядомасьць палякаў былога ВКЛ перад першай сусьветнай вайной, паказвае эвалюцыю іхняе ідэалёгіі («Гістарычная сьвядомасьць і ідэалёгія палякаў Беларусі й Літвы пачатку XX ст.»).
- У рубрыцы «Інтэрвію» – размова зь вядомым знаўцам гісторыі ВКЛ прафэсарам Юліюшам Бардахам.
- Блёк перакладаў складаюць: праца вядомага галяндзкага гісторыка культуры Ёгана Хейзынгі «Нацыяналізм у сярэднявеччы» (аўтар высьвятляе, калі ў Эўропе пачалі разьвівацца нацыянальная сьвядомасьць і пачуцьцё айчыны) і артыкул нямецкага вучонага Аўгуста Нічкэ «Праблематыка гістарычнай антрапалёгіі», што паказвае, як пановаму можна інтэрпрэтаваць пэўныя падзеі мінулага, калі іх разглядаць антрапалягічна, улічваючы адпаведныя эпосе магчымасьці чалавечай актыўнасьці і характар рэакцыі.
- У "архіваліях" друкуецца працяг успамінаў Францішка Кушаля «Спробы арганізацыі Беларускага Войска пры нямецкай акупацыі Беларусі».
- Самакаштоўны па інфармацыі блёк рэцэнзіяў на новую гістарычную літаратуру, пераважна польскую й нямецкую.

«БГА» атрымліваюць дзясяткі бібліятэк сьвету – у Бэрліне, Боне, Вене, Цюрыху, Парыжы, Вашынгтоне, Нью-Ёрку і г.д. У Беларусі сьвежы сшытак часопіса можна купіць у Менску (у рэдакцыі, або ў шапіку ТБМ) ці выпісаць па пошце наложанай аплатай.

Кошт аднаго асобніка – 15 тысяч руб. Адрас для замоваў: 220072, Менск, вул. Скарыны 1, рэдакцыя БГА, або 220115, Менск, а/с 71.

Вайдотас Даўніс

□□□

Кожнае нашае слова – авал.

Калі чалавек мае свайго першага прародзіча, дык тым болей яго мае слова. Нашыя словы паходзяць з слова, адтуль яны выцякаюць.

Іх падарожжа авальнае: яны разыйшліся, а цяпер сыходзяцца. Яны ўсе ў адным, яны адно ва ўсім.

Таму, калі я хачу вымавіць гэты горад, я чую бруеньне ўсіх словаў. І разам з тым мне паслухмянае адно-адзінае.

Тут і літвін, і грэк, і жыд, і русін, і паляк, і прус, і караім, і татарын.

І разам з тым тут няма ні грэка, ні жыда.. Толькі адзінае слова, якое вымавіўшыся, становіцца імем.

□□□

Хачу сказаць толькі: скрыжаваньне сьвятла й цемно – вось імя майго гораля.

Ключ майго гораду шукае адпаведнасьці ў гэтым скрыжаваньні. Калі апускаецца сьвятло, калі яго сустракае цемра, я спрабую пасьпець вымавіць гэтае імгненьне. Калі вымаўляю, кажу: вось часіна!

Думка й сон, хоць паходзяць ад розных пачаткаў, спараджаюць адзін плод. Імя гэтаму плоду – Памяць.

Я гавару, значыць, памятаю.

□□□

Таму я ведаю: ёсьць выгіны гарызонту, пад якімі я згінаюся, і ёсьць пагоркі, пад якімі я выпростваюся.

Ёсьць краіна, дзе камень прытуляецца да дрэва, дзе вечная вясна прытуляецца да вечнае восені. Кожная касьцельная вежа прытуляецца да неба, але яшчэ болей – да плачу грэшніка.

Ніводная вежа тут не правячае сьвету. Ніхто не гаворыць тут пра пераможцаў або пераможаных. Толькі цёплы подых прытомленага падарожніка на ўскрайку зімы. Толькі сухі кашаль на ганку лета.

Спыняесься на гэтым раздарожжы й чуеш: Імпэрыя скончылася, Каралеўства з табою!

□□□

Перайсьці праз дождж, празь сьнег, праз золь, праз слоту, празь вільгаць сутоньня, праз пляц, праз вуліцу, перайсьці празь лівень, праз літву, праз раскалыханыя водбліскі ліхтара, праз чорны брук, праз расталы горад, праз выпетраныя завулкі, праз сны памерлых, празь зьніклыя словы, празь нямыя ймёны, празь цёплы прымарожаны воск прадмесьцяў, праз рэчку, праз мост, – як наканавана.

Перайсьці праз пляц вынесены крыгаходам, праз астылае гета, праз попел, выбелены ветрам, перайсьці праз горад, дзе адна чара схаваная, другая разьлітая.

□□□

Не, нікога.

Але я чую, як спыняецца воз сярод высушанага стэпу, як рыпяць колы, як фыркаюць коні. Бачу, як ты паварочваесься й апошні раз глядзіш назад. Вецер коле табе ў вочы. Пыліць убогая трава. Цішыня вярэдзіць паднябеньне. Ты кажаш: "Едзем, ніхто ня кліча".

Ты памыліўся. Гэта клікаў я.

З кнігі «Вільня. Імя й Слова» (1993)

Пераклаў Сяргей Шупа

Гутарка пра Вільню з аўтарам гэтых словаў, а таксама два ягоныя эсэ былі надрукаваныя ў «Нашай Ніве» (№12, 1993).

Дзёньнік прыватнага чалавека

СЭЗОН ПАВЕТРАНЫХ ШАРОЎ

Сяргей Дубавец

Ёсьць здарэньні, якія ня можна ўсьвядоміць. Мы іх толькі апісваем. Гэта як апісальны пераклад. Слова "вырай" выпростае істоту з ног да галавы, як бы вырастае ў табе, яно стала часткай твае сутнасьці. Па-расейску яго можна перакласьці толькі апісальна: "теплые края, перелетные птицы, время отлета"...

Вайдас Даўніс загінуў у віленскім Нагорным парку на сьвяце паветраплаваньня. Ён не пасьпеў забрацца ў кошык, калі шар сарвала зь месца. Ён толькі зачапіўся і вісеў на руках. Калі вышыня стала ўжо невыратоўная, за сто мэтраў, калега схапіў яго за куртку. Вайдас адпусьціў рукі й высьлізнуў з адзежы... Засталося ў яго пяцёра дзяцей.

Так выглядае "апісальны пераклад" таго, што здарылася ўлетку, але што не дасцца ўсьведамленьню. Нехта назваў ягоную сьмерць недарэчнай, нехта – артыстычнай. Што да мяне, дык я так і не паверыў. І не таму, што ня быў тады ў парку. Проста бываюць рэчы, усьведамляць якія няма ані сэнсу, ані тым больш жаданьня. Адразу пачынаеш разважаць: хто гэтым усім кіруе? А такія развагі ні да чога не прыводзяць.

Мусіць добра быць акуратным каталіком-літоўцам. Яны ведаюць, дзе аднялося, а дзе прыбыло, і куды мы ўсе йдзем. А я ня ведаю. І што ні кажы, гэтае няведаньне – маё. Я ведаю, што ніколі ня буду верыць. Мне проста няўтульна, быццам аднялася нейкая здольнасьць. Як бы горш стаў бачыць, чуць, рухацца, а прычыны – няма.

На саракавы дзень пасьля гібелі Даўніса нас, супрацоўнікаў «НН», запрасілі ў віленскую малую залю Барока на вечар памяці нашага калегі й раўналетка. У Літве Даўніс займаўся прыблізна тым, чым мы займаемся ў Беларусі – пісаў і выдаваў літаратуру. Нехта назваў яго домам культуры ў адной асобе. А філёзаф Шлёгерыс сказаў, што сьмерць Даўніса на працёртым палатне сучаснай літоўскай культуры сталася вялізнаю дзіркай, і яго няма кім замяніць.

Мы слухалі Баха, і кожны напэўна думаў пра чалавека на маленечкім здымку, які стаяў на аргане.

Даўніс быў зьвязам адноўленае «НН» зь Літвою, зь літоўшчынай. Як для мяне, дык – самы трывалы й надзейны зьвяз, стары сябра. Мне заўсёды здавалася, што я пачуваю сябе зь ім як крыху больш гарачай пароды чалавек, гэткі "парывісты славянін", Міця Карамазаў. Як гэта растлумачыць?.. Больш шырокія і нязграбныя рухі й думкі... Гэтага нельга было схаваць ці ўтаймаваць, бо гэта ў крыві. У ягонай і ў маёй.

Але зараз я злавіў сябе на думцы, што, трапляючы ў асяродзьдзе маіх маскоўскіх калегаў, я заўсёды пачуваюся зь імі ня кім іншым, а менавіта Даўнісом. І ўжо не магу ані адкрыцца, ані ўзбудзіцца болей, чым дадзена. І гэта ўжо яны пачуваюцца з мною Міцямі Карамазавымі. А я – Даўніс. І калі яго сапраўды больш няма, то гэта ад яго ўва мне і застанецца назаўсёды. Нават калі я ня буду ведаць, як гэта назваць.

Старыя сябры не паміраюць. Яны, як сваякі й блізкія людзі, уваходзяць у нас саміх і застаюцца там, і ўжо разам з намі ўваходзяць у іншых. Магчыма, так памнажаецца сьнет...

□

Дзіўна, што з усіх маіх апісаньняў мінулага сэзону ягонымі знакамі застаюцца словы "неўразумелая сьмерць" і "паветраны шар". Яны ўвесь час спалучаюцца між сабою (як і ў прыкладзе з амэрыканскімі падарожнікамі, якіх зьбілі над Беларусяй), надаючы ўсяму, што адбываецца, нейкі камічна-трагічны зьмест. Што можа быць лепшаю антытэзаю сьмерці, чым паветраны шар? Ніхто й блізка ня думаў, што ў нас будуць забіваць амэрыканскіх спартоўцаў. Ніхто й блізка не дапускаў, што можа памерці Барыс Сачанка.

Пасьля такога здарэньня, якое зноў ня можна ўсьвядоміць, пачынаеш шукаць вачыма наўкола – а хто ж застаўся? Да каго яшчэ можна прыйсьці табе, ці то леваму, ці то праваму – любому, і хто б не выстаўляўся перад табой уласнай пэрсонай, а думаў, як з тваіх жаданьняў вырабіць толк. Сачанка не павучаў, а даваў зразумець...

Я пачынаю новае апісаньне, хоць сэнс ня ў гэтым. Сэнс у тым – для мяне асабіста – што гэта быў адзіны чалавек з старэйшага пакаленьня, зь якім мяне не лучыла нічога, акрамя мовы. І нічога, акрамя мовы, не было істотнае ў гэтай лучнасьці. Ані там характар, ані рэгаліі, ані ўзрост з досьведам. Магчыма, таму Барыс Сачанка быў для мяне сябрам? Бо аднае мовы было дастаткова, каб зьявілася патрэба гаварыць, сустракацца, даваць і атрымваць пачуцьцё адзінства, надзейнасьці, жыцьцёвасьці тваіх вычытаных у кніжках думак.

Да іншых старэйшых заўсёды цяжка было прабіцца. Гаворыш, а ніякае еднасьці табе не перадаецца. Можа быць, маё пакаленьне так доўга бурапеніла й бурапеніць ад таго, што дагэтуль яно як бы не прызнанае, не прынятае, і цяпер ужо будзе прынятае й прызнанае толькі біялягічным парадкам. Ня стану дашукваць, чый тут комплекс – старэйшых ці наш. Мабыць, позна пра гэта гаварыць. І гаворыцца толькі дзеля таго, што ў Барыса Сачанкі такога комплексу не было. Які-небудзь акальны студэнт ішоў да партыйнага і літаратурнага начальніка і сустракаў на гэтай верхатуры афіцыёзнага жыцьця поўнае разуменьне сваіх беларускіх ідэй, мараў і страхаў. Ясна, што наш студэнцік пасьля гэтага выходзіў у людзі бяз страты сваіх перакананьняў і прынцыпаў. Бо тут знаходзіўся такі шлях, на якім такое было магчымае.

... Нічога ня буду казаць пра "дзірку ў працёртым палатне культуры". Сьмерць правакуе на прыгожыя словы. Але гэтая прыгажосьць дзеля суцяшэньня сама ведае, што не суцешыць. Бо замены Сачанку – ні ў якой яго іпастасі – няма.

□

І я вяртаюся ў Літву, каб распавесьці пра яшчэ адзін паветраны шар гэтага сэзону.

Літва, нібы адмыслова дзеля Беларусі, стварае хрэстаматыйныя ілюстрацыі – узоры быту нацыянальнай дзяржавы. Літва – выдатніца ў школе постсавецкіх народаў, акуратная й старанная, прагная да вучобы, яна пераходзіць з клясы ў клясу, павялічваючы адлегласьць ад трэцягодніцы-Беларусі, якая прагульвае ўрокі, як прагульвае іх неахайная дзяўчынка ў заношанай школьнай форме – прагульвае не дзеля кіно ці нейкіх іншых забаваў, а дзеля самога прагульваньня. І гэтаксама як дзяўчынка-трэцягодніца Беларусь недалюбвае Літву, пазьбягае гэтай стараньніцы, якая марыць паступіць ва ўнівэрсытэт аб'яднанай Эўропы, бо сама Беларусь ня марыць ні пра што.

Нашая тоеснасьць – у мінуўшчыне.

У музэі бурштыну ў Паланзе – чысьціня й парадак. Бурштынавая нацыя стварыла музэй пра ўвесь бурштын сьвету – Амэрыка, Афрыка, Сібір... Літоўцы ведаюць, чым могуць узяць, і бяруць. Баскетбол, бэкон, бурштын... А знаходзіцца музэй у добра адрэстаўраваным палацы графа Фэлікса Тышкевіча (з "нашых", лагойскіх Тышкевічаў). У мэмарыяльным пакоі графскае сям'і сярод здымкаў і асабістых рэчаў старажытны паліфон, працінаючы душу й будзячы генную памяць, вызвоньвае палянэз Агінскага. Таго самага Агінскага, чый падобны палац у Залесьсі каля Смаргоні занядбаны ў нішто.

Адзін лёс у дваранства Вялікага Княства Літоўскага – "Разьвітаньне з радзімай". А вось у палацаў у іхных лёс розны. Калісьці над наступам узбуджанага люмпэну эліты пакінулі край. Але куды ж без элітаў? І цяпер мы маем эліты зь люмпэну.

Калі ў верасьні ў Вільні купалаўскі тэатар паказваў сваю «Ідылію», там была заключная сцэна, калі дваранства пакідае Беларусь. Заля здрапцьвела. У мёртвай цішыні пачуліся гукі паліфону. Зразумела, што гэта быў палянэз Агінскага. Дэкарацыі на сцэне ператварыліся ў... паветраны шар і ў кошык, куды паселі нашы ідылічныя паны. Усё неверагодна прыгожае – аж мароз па скуры. (У гэтым выпадку прыгажосьць ня мела на мэце суцяшэньня і таму выклікала ня роспач, а "праведны гнеў".) Ідылія скончылася. Паны ўзьнясьліся. А хто ж застаўся?..

Перад палацам Тышкевіча ў Паланзе стаіць скульптура Міласэрнага. Ягоныя рукі раскрытыя, нібы абдымаюць увесь гэты край. Тут – ягоная краіна, ягоныя людзі, ягоны музэй бурштыну. За Тышкевічавым паркам чуваць, як шуміць цёплае мора...

НАША НІВА

... Што мяне захапляе ў хрысьціянстве? Глыбіня пачуцьцяў. Але з другога боку, я заўсёды адчуваў перад хрысьціянствам страх. Бо я заўсёды баяўся пакласьці ўсё на адну шалю. Паставіць усе чалавечыя дачыненьні на адну карту — карту любові...

Амос Оз. Сьмерць паху ня мае. Старонка **20**

... Рэстаран уладкаваўся над самай Іст-Рывэр, паміж двума мастамі з гірляндамі блакітных лямпачак, якія глядзеліся неяк правінцыйна і нараджалі ў нецьвярозай душы тугу па Бацькаўшчыне...

Уладзімер Арлоў. Занатоўкі з падарожжа ў Злучаных Штатах Амэрыкі — на старонцы **24**

INTERNATIONAL



Шэймас Хіні, які атрымаў Нобэлеўскую прэмію 1995 году ў галіне літаратуры

Шэймас Хіні

1
Звычайна ён піў сам з сабою,
Шурпатым вялікім пальцам,
Паказваў на верхнюю паліцу,
Каб налілі яшчэ адзін ром
З чорнай парэчкай – навошта
Без патрэбы падаваць голас –
Або на хаду замаўляў куфаль цёмнага,
Імітуючы жэстам, як дастаюць корак;
А калі зачынялі, выходзіў
У сваіх рыбацкіх ботах і кепцы
У непрыглядную цемру дажджу,
Работнік бяз працы.
Пэўны ў сабе й хітраваты,
Няўклюдна тактоўны,
Рыбацкае пільнае вока
І чуйная сьпіна.

Ён ніяк ня мог зразумець
Майго другога жыцьця.
Часам, седзячы каля стойкі,
Заўзята шчыруючы з нажом
Над тытунёвым брыкетам,
У перапынку між чаркамі,
Ён заводзіў размову пра вершы.
Нам бывала добра ўдвох.
Баючыся падацца паблажлівым,
Я спрабаваў неўпрыкмет
Неправесьці гаворку на вугроў
Або на фурманскае рамяство
Або на дзецюкоў з ІРА.

Аднак мае хітрыкі
Ён адчуваў сьпінаю:
Яго разьнесла ў шматкі
Нападпітку
Падчас камэнданцкай гадзіны,
Праз тры ночы пасьля таго, як забілі
Тых трынаццаць чалавек у Дэры.
СПЭЦНАЗ – БУЛЬБАШЫ 13:0 –
Было напісана на сьценах

У тую сераду,
Калі ўсе затаілі дыханьне.

2
То быў дзень халоднай
Золкай цішыні, узьвеяных ветрам
Стыхара й суканы:
Абсыпаныя дажджом і кветкамі
Труна за труною
Выплывалі зь дзьвярэй
Поўнай людзьмі катэдры,
Нібы кветкі па ціхай рацэ.
Супольнае пахаваньне
Спавівала нас сваім палатном,
Абгортвала і стуляла.

Нішто не магло ніколі
Утрымаць яго ў хаце
Як бы ні патрожалі ў тэлефоне,
Якія б чорныя сьцягі ні вывешвалі.
Я бачу яго, як ён азірнуўся на выбух,
Раскаяньне й страх, зьмяшаныя
На яшчэ пазнавальным твары.

"Вось ты, як лічыцца,
Адукаваны чалавек, – я чую,
Як ён пытаецца ў мне, – Ану,
разгадай мне гэтую вар'яцкую загадку".

3
Я спазьніўся на пахаваньне,
Раніцой таго дня
Мяне ўзялі на ягонае судна,
Вінт вуркатаў, месячы ў бель
Лесныя воды пад кілем,
Я каштаваў зь ім свабоду.
Вось так адарвацца ад дна,
Плюнуць на ўлоў, і ўсьміхацца
Намацаўшы рытм, які нясе цябе
Мілю за міляй,
У тваё патаемнае месца
Недзе там, далёка, за небакраем...

Прывід, што на сьвітанку,
Брыдзе праз дажджлівую цемрадзь,
Спытайся ў мяне зноў.

Пераклаў з ангельскай BKZ

Раман пра зьдзіўленьне

Амстэрдам

Адам Глёбус

А-а-а... Ну вядома, пра зьдзіўленьне, пра сустрэчу зь дзівам, пра шырока раскрыты рот. Слухай.

Ну, што можа зьдзівіць больш за супадзеньне? Паводле розных тэорыяў верагоднасьці, такога быць ня можа, таму што ня можа быць. А яно ёсьць! Яно, дзіва, існуе.

Вось у самалёце «Менск-Варшава» нахіляюся да сьцюардэсы - струнка, насаценькай паветранай правадніцы. Я гарнуся, каб прачытаць яе прозьвішча на цэтліку, што целяпаецца, прышпілены да форменнага штрыфэля. А яна адхіляецца, сьцюардэса ня ведае пра мой кепскі зрок. У яе ўзьніклі іншыя думкі пра мой нахіл, але чужыя думкі я не зьбіраюся рассакрэчваць. Кожнаму сваё. А тутака раз, і дзіва сапраўднае: ня кожнаму сваё прозьвішча, а адно на дваіх чужых людзей. Ня верыш? Можаш у майго брата перапытаць, ён таксама бачыў на сьцюардэсавай картцы роднае прозьвішча. Брат нават ёй сказаў, пра агульнае прозьвішча. Дзяўчына заружавела. Люблю, калі дзяўчаты чырванеюць. Ружавасьць на шчоках вельмі эратычная праява, пячатка сэксу й сораму, знак узбуджанасьці. Як і драпіны, пакінутыя на дзявочых руках кацінымі кіпцямі, я таксама залічваю да любоўных адзнакаў. У сьцюардэсы былі падрананыя рукі, і мне зрабілася сумна ад выгляду лілёвых пісягоў і ад успамінаў.

Я згадаў сваю котку, тоўстую кацяру па мянушцы Плюс. Проста, калі яна куплялася за тры рублі на кірмашы, дык была маленечкім чорным кацянём з слаба выразнымі палавымі прыкметамі. А калі кацянё падрасло, дык афармілася коткаю, а вось мужчынская мянушка засталася. Якая ў рэшце рэшт розьніца? Для мяне як гаспадара аніякай прынцыповасьці няма, ці котка па кілімах ходзіць, ці кот. Гэта для жывёлы была прадвызначаная розьніца, і Плюс скокнула з гаўбца на сакавіцкі сьнег, яна паляцела зь пятага паверху ў начную цямрэчу на покліч ката-спакушальніка. Плюс няўдала прызямлілася й зламала заднюю лапу. Дзесяць дзён праляжала мая любая, злосная котачка на кіліме ў перадпакоі і адыйшла. Толькі гладзіць сябе больш нікому ніколі не дазваляла. Плюс зрабілася аскеткаю, і ў значна большай ступені, чым можна падумаць. Бо нашую Плюс мая цешча па жончынаму даручэньню знасіла над пахаю ў вэтэрынарную лякарню. Там котка пакінула свой параджальны ворган. Вэтэрынар як бы ўзаконіў бясполазасьць жывёлы. Плюс зрабілася ніякага роду, і вясновае скавытаньне спакушальнікаў болей не кранала яе маленькую драпежную душу.

А вось паводзіны суседзкай кудлатай коткі страшэнна раздражнялі Плюс. І бясполая істота нападала на гаўбцы на чужынку, у неба ляцела поўсьць. Чужынка ўцякала на свой гаўбец, дзерлася па сьцяне й залягала на дзьвюх вяровачках для сушкі бялізны. Котка вісела на вяровачках, пакуль на гаўбец не выходзіў гаспадар і не праганяў Плюс, якая сычэла на вугравatага хлопца, як атрутная зьмяя. Толькі вуграваты сусед не баяўся ні сычэньня, ні ўзьнятай дыбарам поўсьці. Ён спакойненька браў сваю котку на рукі й сыходзіў. Са мною сусед ніколі не вітаўся. Чаму? Ня ведаю. Праўда, і я зь ім не вітаўся, больш за тое, я рабіў выгляд, што ні яго, ні ягонае кудлатае коткі наогул не існуе ў прыродзе, а таму й праблемаў нуль. Пра чортаў нуль я прыдумаў пазьней, калі Плюс прапала. Я шукаў, шукаў, шукаў. Пад канапамі, за плітою, за ваннаю, на шафах, на буфэце, на калідоры, пад гаўбцом, у суседніх дварах. Клікаў: "Плюс, Плюс, Плюс... Котачка мая... Плюс, Плюс, Плюс..." Нуль. Усе маe, жончыны й доччыны пошукі, сплюсаваныя разам, далі нуль, пустэчу, як вечнасьць. Плюс прапала назаўсёды. Я ня буду нагаворваць на суседа й ягоную котку, што спакойненька гуляе на

Працяг на старонцы 18

Перад мінным полем

Ліст зь Бялграду пра сяброўства

Ёвіца Ачын

Магчыма, нашае існаваньне ў часе зьмяняе кірунак, або скančаецца ранейшая прастора гісторыі. Шкада слоў, каб казаць, якое разнастайнае багацьце нашага жыцьця змарнела на працягу апошніх гадоў. Здаецца, наша жыцьцё пакінула рэальны час. Усё, што з намі адбываецца, злачынствы й тэрор, мы ўспрымаем як гіпэррэальнасьць, якая нас не датычыць, нават тады, калі мы – ахвяры. Гэты, на маю думку, катастрафічны паварот напэўна можна было прадбачыць, але ягоныя наступствы былі і ўсё яшчэ застаюцца непрадказальнымі. Магчыма, гэты паварот быў запраграмаваны, быў проста неабходны нам, як галюцынагенны наркотык, што дазваляў вытрываць пераход з рэчаіснасьці ў нерэчаіснасьць. З той самай хвіліны, калі быў вынайдзены выключальнік, што падзяліў ілюзіі й рэчаіснасьць, (яго ў нас адразу й забралі, зрабілі недаступным), а жыцьцёвыя пераходы паміж іншым і мною былі абарваныя, была ўстаноўленая аўтаматызацыя выбранага або выкліканага канфлікту. І хоць некаму й здавалася, што гэта ня мае асабіста зь ім ніякае сувязі, дастаткова зірнуць у прорву, якая адкрываецца разам з паразай, і распазнаць сярод непрадчуваных наступстваў таксама й сваю асабістую далёкасяжную паразу, якая б'е па тварыі, назбаўляе асабовасьці й робіць сумнеўнымі ўсе будучыя зносіны зь іншым.

Зносіны зь іншым цяпер зноў падазроныя, яны ўважаюцца за здраду тосcнасьці. Яны адзіна магчымыя хіба як захоп, падпарадкаваньне й зьнішчэньне іншага. Разам з гэтым імкненьне падтрымваць і захоўваць якасьці й разнастайную плённасьць у жыцьці чалавека, выраз найбольшае прагі кантактаў зь іншым, імкненьне, зразуметае як творчасьць і адкрыцьцё, назбаўленае жыцьцёвай сілы з-за сумневу й недаверу. Магчыма, сумнеў, пра які йдзе гаворка, існаваў заўсёды й ніколі цалкам не загасаў, хоць над пытаньне ставілася яго мэтафізычная правамоцнасьць. Аднак нягледзячы на тое, ці ён існаваў у гісторыі заўсёды, ці прымаўся моўчкі, выступаў пад маскай, ці проста быў калісьці зьліквідаваны, каб потым зноў адрадзіцца – застаецца фактам, што хоць мы зусім гэтага не хацелі, жыцьцё напае падпала выпрабаваньню.

Паразы, пра якую кажу – а я адчуваю яе перадусім як асабістую й індывідуальную – я ня здолею ніякім чынам апісаць ці выказаць. Яна ў маім выпадку – мэлянхолія самой сілы апісаньня, мэдытацыі й выказваньня. Калі я толькі захачу сёньня штосьці сказаць, я апынаюся зь ёю твар у твар, змагаюся за тое, каб дасягнуць неабходнага засяроджаньня, каб сябе – і яе таксама – вырваць з аўтаматызацыі прыцягненьня сьмерці, якая тую мэлянхолію спарадзіла й мацуе. Але яе перашкоды – гэта аблудныя сьцежкі напрасткі, якія нікуды не вядуць, а толькі падаўжаюць канец, неспадзявана адкрываючы перад намі яго страшнае, невыноснае пекла, складзенае з паўтарэньняў.

... Паддадзены выпрабаваньню давер да іншага згубіўся, а разам зь ім быў страчаны давер да самога сябе. Чаму й каму можна цяпер паверыць? Гэты струс мае характар эпідэміі. Мы знаходзімся перад мінным полем, дакумэнтацыя якога недзе згубілася...

Вера ў іншага? Паддадзены выпрабаваньню пасеянай віны, распаленай нянавісьці, зробленых злачынстваў давер да іншага згубіўся, а разам зь ім быў страчаны давер да самога сябе. Чаму й каму можна цяпер паверыць? Гэты струс мае характар эпідэміі. Мы знаходзімся перад мінным полем, дакумэнтацыя якога недзе згубілася. Ёсьць толькі асобныя лісткі з запісамі аб родзе мін або іх разьмяшчэньні. Гэтае параўнаньне – штосьці большае чым параўнаньне, таму што якраз самі мы, закладаючы будучыя камунікацыі, павінны будзем сапраўды разьміноўваць небясьпечныя палі.

Вяртаньне даверу да іншага, пры захаваньні ўласнай свабоды ва ўсіх яе вырашальных постацях, – вось стаўка ў навязваньні сяброўскай перапіскі. Гэты ўклад, магчыма, у гісторыі невыніковы, магчыма, не гарантуе нічога вялікага, але ён дапамагае перахварэць асабістую паразу, дазваляе над прорвай таго, што страчана, выказаць уласнае аблічча, гатовае да зьвяртаньня, даваньня й прыйманьня. Пагружаны ў мэлянхолію, я ўсьвядоміў сабе, скуль прыйшло мне на думку гаварыць аб сяброўстве, калі на пачатку студзеня 1994 году мяне запрасілі ў Любляну для ўдзелу ў працы адной альтэрнатыўнай групы. Гктарка закладае пэўныя перадумовы сяброўства. Французкі мысьляр Жак Дэрыда два гады таму як адну з тэмаў дзьвюх сваіх бялградзкіх лекцый выбраў праблему палітыкі сяброўства. Гэта быў апасродкаваны, але этычны выбар. Сваё ж рашэньне я ўважаю за неабходнасьць з роду паэтыкі разнастайнасьці, якая захоўвае жыцьцё ад непазьбежнай дэструкцыі й сьмерці, ад варожых парваньняў зь іншым.

Сяброўская перапіска захоўвае перапіску зь сяброўствам, нават калі сяброў няма.

Славутая, часта цытаваная й камэнтаваная апастрофа, прыпісваная Арыстоцелю "О, сябры мае, няма ніводнага сябра", сэнс якой як быццам самазьнішчаецца, выклікала рэпліку Фрыдрыха Ніцшэ. Пасьля разьдзелу «Аб сябрах» у «Чалавечым, надчалавечым» тую апастрафаваную апастрофу прамаўляе мудрэц у хвіліну сьмерці. Гэта да нас ён зьвяртаецца, паміраючы. Як грэкі, ён разумее й прамаўляе слова сябра з сэмантычнага поля слоў *philia* і *homonoia*, на якім – у тым самым руху – злучаюцца сяброўства, пазнаньне й сьмерць. Апастрофа ў Ніцшэ неперавернутая, яна нібы заклікае да агаленьня скампрамэтаваных элемэнтаў хрысьціянскага разуменьня бліжняга як заложніка, асновы пошуку тоеснасьці й падабенства. "Непрыяцелі, няма ніводнага непрыяцеля". Ці праз гэта яна загадзя пачынае разбураць падставу, на якую абапіраецца палітыка зь яе заўсёды адкрытай магчымасьцю рэальнай вайны і ўжываньня фізычнай сілы? Мы як бы стаім перад заклікам, каб у вызначэньні "сябра" парваць з выключна палітычнай лёгікай, згодна зь якой сканструяванае адрозьненьне "сябра-нясябра". Але хто з нас кажа: "Непрыяцеля, няма ніводнага непрыяцеля"?



Ніцшэ будуе нечаканую апазыцыю, якая, магчыма, павінна замяніць апазыцыю "прыяцель–непрыяцель". Заклік паказвае кірунак – неперавернутая апастрофа адрасаваная – жывому шаленцу. Паміраючай мудрасьці супрацьпастаўляецца жывое шаленства. Іронія ў гэтым выпадку балючая, што ня мусіць аднак зьмяншаць яе лекавай моцы. Таксама як гэтай моцы нішто не гарантуе, нават наш сяброўскі давер.

О, сябры мае, дзе вы, чым вы сталі, ці існуе яшчэ сяброўства зь іншым, у тым ліку і з чужаземцам?! Такія пытаньні праклятыя, нават

Амстэрдам

Працяг з старонкі 17

маім гаўбцы. Я скажу толькі іншае: амаль паўгода на маіх руках няма лілёвых пісягоў ад каціных кіпцяў, такіх жудасна жывапісных драпінак, якія былі у сьцюардэсы з маім родным прозьвішчам, што паслужліва ўсьміхалася на борце самалёта «Менск-Варшава».

У польскай сталіцы я заўсёды транзытнік, як на станцыях Баранавічы, Ворша й Дно. Таму нічога дзіўнага ў Варшаве ня бачыў, толькі чуў – прыемны жаночы голас у мужчынскай прыбіральні. Я ціхенька выціраў вымытыя рукі папяровым ручніком, калі з-пад столі на маё прычасанае цемя паліўся лагодны галасочак з паведамленьнямі, што трэба выбірацца з прыбіральні хутчэй, калі ёсьць жаданьне вылецець у Амстэрдам. Мільганула думка: прапанаваць вакзальным і паветраным службам рабіць абвесткі мужчынскім голасам, але я адкінуў прапанову разам з пакамечаным папяровым ручніком, бо мужчынскі голас у жаночым ватэрклязэце – яшчэ большая недарэчнасьць.

О, гэтая прырода, зь яе падзелам палоў! О, гэтае паўсюднае штоімгненнае разьдзяленьне на чорнае й белае, на «інь» ды «ян». О, гэты фундамэнтальны выраз: "Пол гэта – лёс!" А я прыхільнік шарага колеру, і мой час паміж папярэднім і наступным, паміж днём і ноччу – час шарай гадзіны, час спакою й цішыні, час сталёвых штандараў і ціхіх размоў. Але жыцьцё не складзеш з ланцуга сутонлівых нірванных імгненьняў. На жаль.

Намеры паспаць у самалёце «Варшава-Амстэрдам» скончыліся знаёмствам з суседам, які таксама спрабаваў заснуць і ня мог. Гэта быў ветлівы амстэрдамец польскага паходжаньня зь беларускім прозьвішчам Сакалоўскі. Ён служыў кансультантам пры міністры ўнутраных спраў Польшчы й дапамагаў у стварэньні на берагах Вісты паўнавартаснай, узброенай кампутарамі й пісталетамі сацыяльнай паліцыі. Ва ўнутраных дзяржаўных справах я зусім недасьведчаны прафан. Таму гутарка перавялася на пабытовы ўзровень. Што колькі каштуе ў слынным Амстэрдаме? Кошты вялікія. Нідэрляндзкі гульдэн роўны зь нямецкаю маркаю. Знаёмствы з кансультантамі бясспрэчна каштоўныя. Разьвіталіся мы цёпла, сардэчна, інтэлігентна. Але памылка была зробленая: я не спытаў пра выйсьце з аэрапорту.

Амстэрдамскі аэравакзал досыць вялікі, ну і крамы прывабныя, люстраныя, танныя. Каб выйсьці з аэрапорту, давялося спусьціцца на эскалятары ў пусты, цалкам бязьлюдны хол. Ні душы. Ні чэргаў, ні мытнікаў, ні тых, хто чакае, ні тых, хто сустракае. Нікога. Пустэльна. Сьцюдзёны бляск турнікетаў. Гэта насьцярожыла й зьбіла з тропу. Я з братам зрабіў яшчэ адно кола гонару па аэравакзалу, каб потым вярнуцца ў той самы бязьлюдны хол і падыйсьці да турнікетаў. У момант з бакавых дзьвярэй выскачыў гнуткі чакалядны мурын, каб ружовымі падушачкамі доўгіх пальцаў выхапіць мой пашпарт і, зірнуўшы ў вочы фотакарткі, праштэмпляваць візу краін БэНіЛюкс. Тое самае адбылося з братавым дакумэнтам, і праз імгненьне мае лёгкія прагна ўцягвалі начное вільготнае паветра Нідэрляндаў.

У гатэль мяне везла, канешне, таксоўка. Можна было на аўтобусе ці электрычцы, што таньней. Але калі ты ў Амстэрдаме й для цябе замоўлены нумар у пяцізоркавым гатэлі «Краснапольскі», дык мусіш ехаць на таксі, бо швэйцар цябе не зразумее, хоць і ўмее вітацца на ўсіх больш-менш вядомых у сьвеце мовах. Дарэчы, калі хочаш ведаць, таксоўкі лётаюць у Амстэрдаме з хуткасьцю сто дваццаць кілямэтраў у гадзіну. Так што начным незнаёмым горадам я любаваўся праз таксовачнае шкло зусім нядоўга.

Мне больш спадабалася любавацца пляцам Дам праз вакно гатэльнага нумару трыцатысячы трыццаць тры. Вакно выходзіла на каралеўскі палац, той самы велічны палац, у якім павінна жыць каралева Нідэрляндаў. Толькі Яе Вялікасьці там не было. І ніводнага разу мне не давялося пабачыць, каб туды заходзіла каранаваная асоба. Зрэшты, на маіх вачах у шыкоўны, з рабрыстым купалам і струнікімі пілястрамі, эўрапейскі палац ніхто не заходзіў. А з надыходам паўночнай золкай цемры на ўсім шматваконным фасадзе загаралася толькі адно вакенца, нехта, пэўна, тоўсты ахоўнік, глядзеў тэлевізар.

Мне ж глядзець, хай сабе й трыццаць тэвэпраграмаў, зусім не захацелася. Які, ёмаё, тэлевізар, калі ты самым натуральным чынам у Амстэрдаме? І можна спакойненька выйсьці на пляц Дам, што азначае не асобаў жаночага лёсу, а дамбы, канструкцыі для затрымкі вады, дзеля засьцярогі мясцовасьці ад затапленьня. А выйшаўшы, можна тут жа пачуць: "Кока, кока, гашыш?!" Амстэрдам – горад вольных, свабодных і не славянскіх нораваў. Хочаш какаін? Купляй, нюхай, кайфуй... Не жадаеш какаіну? Набывай гашыш, купляй анашу, ужывай алькаголь... Можаш з рук у мурына, на пляцы Дам, не адыходзячы ад гатэля «Краснапольскі», прыдбаць любы (бяз націску) кайф. А калі ты, як я, гідзісься вулічных гандляроў наркотыкамі, дык можаш з пляца Дам павярнуць на вуліцу Дамрак і рушыць у бок чыгуначнага вакзалу. Дамрак будзе зіхцець і пераліваць вітрынны бляск, а ты будзеш спакойна й самаўпэўнена ісьці й думаць: Вось іду па Амстэрдаму, проста, бязмэтна. Дзеля ўласнага лёгкага задавальненьня шпацырую сабе па вуліцы Дамрак. І ўсім прадаўцам кайфу зноў і зноў кажу: "Ноў і ноў". Мне і так выдатна.

Адно мне яўна назаляла: брудныя гандляры наркотыкамі. Пакуль дайшоў да вакзалу, у мяне ледзь галава не адкруцілася ад бясконцых "не".

У першы амстэрдамскі вечар мне цалкам хапіла караценькага шпацыру, каб сьмяротна стаміцца і, праглынуўшы гарачую канапку ў «Макдональдзе», вярнуцца ў гатэль і заснуць, каб прысьніць эратычны сон...

Нібыта прыехаў я не ў сталіцу Нідэрляндаў, а ў горад на рэчцы Прыпяці, слынны Мазыр, да сваёй даўно пакінутай жанчыны – Тамары. Яна сустрэла мяне на аўтобусным прыпынку. Стаяла жахлівая сьпёка, і Тамара скардзілася, што доўга чакала й стамілася ад гарачыні, а я чамусьці не захацеў ісьці да яе дамоў, каб у цяньку папалуднаваць, а загадаў цягнуцца на будоўлю, дзе Тамара зрабіла мазаічнае пано. Мая жанчына мела мастацкую адукацыю й выкладала з каляровых каменьчыкаў постаці будаўнікоў лепшай, сьвятлейшай, справядлівай будучыні. Толькі ў дадатак да самавітай адукацыі Тамара мела наравісты характар і мужчынскую, жывёльную, казіную ўпартасьць. Паказваць пано яна адмовілася. І мы, як бывае ў сьне, вокамгненна апынуліся ў

тады, калі іх задае не паэт. Яны як сьмяротная рана, што сьцякае крывёю. Вось як магла б і мусіла гучаць апастрофа пасьля Арыстоцеля й Ніцшэ... Такою хацела б быць мая сяброўская паэтыка... Маё запрашэньне да перапіскі, да пэўнага досьведу сяброўства. Досьведу, вылучанага да гэтага часу зь філязафічных і палітычных, а гэта значыць і з нацыяналізаваных, канфэсіяналізаваных і сэксуалізаваных канонічных мэдытацыяў, інтэрпрэтацыяў і камунікацыйных мадэляў...

... Умовай сяброўства ёсьць незалежнасьць. Мы сябруем з іншым, вызваленыя ад усіх повязяў. Тут няма чаго больш выракацца. Мы ўжо зрабілі гэта ў хвіліну, калі нарадзілася сяброўства...

Калі ня што іншае, дык уласна праблема працягу мысьленьня сяброўства, разам з усімі палітыкамі, якія прыпісваюцца паняцьцю сяброўства, пачынаючы ад грэцкага разуменьня аж да хрысьціянскага, ад дэмакратычнай канцэпцыі да рэвалюцыйнай, прыводзіць да сытуацыі перабольшанае блізкасьці, якая ўжо не дазваляе нам убачыць, з чым ці з кім гэта мы так блізка. Мы мусім памятаць пра некаторыя перадумовы дыялектыкі: мысьленьне пра нешта закладае зьнікненьне ў працэсе мысьленьня таго, што мысьліцца. У рэшце рэшт сяброўства ня можа быць толькі прадметам якогась мысьленьня, асабліва калі рэальны досьвед сяброўства будзе паддадзены найвялікшаму выпрабаваньню, якое па сутнасьці ёсьць крыніцай сяброўства – выпрабаваньню сьмерці. Нам патрэбны нехта, хто правядзе нас у сьмерць, каб пайсьці ў сьмерць, сам ужо без жыцьця. З мэтафізычнага мысьленьня вынікае, што найглыбейшага сутыкненьня зь нейкім суб'ектам мы дасягаем тады, калі ім валодаем. Парадаксальная непадатнасьць сяброўства мысьленьню палягае па сутнасьці ў тым, што сяброўства паходзіць з досьведу абсалютнага пазбаўленьня, калі любая ўласнасьць і валоданьне страчваюць сілу. Гэта ня толькі вырачэньне, гэта не аскеза, у аснове якой ляжыць давер да вышэйшай істоты – да бяспамяцтва. Вырачэньне ў досьведзе сяброўства не выступае нават як цнота (у якой заўгодна вэрсіі, грэцкай або хрысьціянскай), да якой мы імкнемся й якой урэшце дасягаем як узнагароды за нашу працу, адданасьць і волю. Тут няма ніякага рэлігійнага сэнсу.

Умовай сяброўства ёсьць незалежнасьць. Мы сябруем з іншым, вызваленыя ад усіх повязяў. Тут няма чаго больш выракацца. Мы ўжо зрабілі гэта ў хвіліну, калі нарадзілася сяброўства, у акце, для якога мы ня знойдзем ніводнае аналёгіі ў прызнаных дагэтуль структурызацыях праўды сьвету. Няма тут таксама й ахвяры, прыношванай заўсёды за кагосьці або за штосьці; за кагосьці, з кім мы становімся блізкія таму, што ад пачатку адчуваем яго як бліжняга, альбо штосьці, чаму мы гатовыя аддацца дарэшты як апошняй вартасьці, каб нарэшце ўзьнесьці яе на трон. Іншы або іншае можа быць далёка, затопленае ў самоце, у сваім выключэньні зь любой жывой супольнасьці, таксама, як гэта можа адбывацца з намі. Блізкасьць здалёку, пра якую гаворыць Ніцшэ ў «Заратустры», што зноў адбіваецца рэхам як "супольнасьць без супольнасьці" альбо "нэгатыўная супольнасьць", "непрызнаная супольнасьць", а значыць сяброўства паміж тымі, хто ня мае сяброў, – гэта рэфлекс згаданага вышэй досьведу. Перад сьмерцю мы ўсе аддаляемся ад сябе бясконца, мы блізкія сабе з усё большага аддаленьня. У выпадку Ніцшэ гэта было амаль прарочае прадчуваньне сьвету лягероў сьмерці. Карацей кажучы, ніводнае з грэцкіх або хрысьціянскіх патрабаваньняў ахвяры тут не выконваецца, бо дазвол, каб даль надалей была даляй, спрычыніе тое, што любая ахвяра траціць мэту. Адмаўленьне, даваньне, існаваньне й дар, усё, з чаго калісьці складалася ахвяра, цяпер, ва ўмовах найбольшых выпрабаваньняў чалавечага існаваньня, аддзеленае ад ахвяры й патрабуе новага сэнсу як этычны чын. Разам з страчанымі багамі, разам зь зьнікненьнем іхных гарантыяў на правы розных гістарычных і структурных формаў супольнасьці, сяброўства становіцца свабодным дачыненьнем да іншых чалавечых істотаў, дачыненьнем, у якім адмаўляецца ахвяра (сяброўства ня можа быць падставай выпрабаваньня іншага ябо ягонага сяброўства, што прыводзіць да зьбядненьня або дэманізацыі, да нябеснага ці зямнога спараджэньня злачынства), бо інакш яно магло б стацца толькі алтаром у сьвеце лягероў. Пры чым інтэрпрэтацыі сяброўства, паклікаючыся на ахвяру, спрыяюць кананізацыі паняцьця, падноўленага ўлучэньнем у грэцкія або хрысьціянскія схемы. Калі выйсьці за схемы – рэч у тым, каб жыць у сяброўстве, каб здабыць яго з забыцьця як згублены шанец, а разам зь ім мець нагоду да новага вяртаньня страчанай рэчаіснасьці нашага жыцьця.

Twórczość, 9'1995

ТВАР ІМПЭРЫІ

Уладзімер Пазьнеўскі

Партрэт былой савецкай імпэрыі я пабачыў увосень 93 году ў трамваі лініі нумар два, якая вядзе з цэнтру Львова на Лычакаў. У той дзень імпэрыя набыла аблічча вагонаважатай, заплылай тлушчам кабеціны ў мундуры, якая нібы старшы лейтэнант у казарме муштравала пасажыраў праз увесь час паездкі. Яе гучны голас, узмоцнены дынамікам, укручваўся ў мазгі, не дазваляў засяродзіцца на сваіх думках. Увайшоўшы ў трамвай, мы на нейкія поўгадзіны сталіся ўласнасьцю гэтай саракагадовай жанчыны, якая бесьперапынна павучала, рабіла заўвагі або давала ўказаньні.

– Ты, у жоўтай шапцы, так, я табе кажу, чаму не трымаесься за парэнчы? Ты што, першы раз на трамваі едзеш? Значыць зь деревні прыехаў. Яно й відно.

Вусны мажной кабеты не спачывалі ні хвіліны. Словы выляталі зь іх з кулямётнай хуткасьцю. Я заўважыў, што яна гаварыла па-расейску. Узброеная вялізным зваротным люстэркам, яна няспынна пасьвіла нас вокам, тым часам як мы толькі ў рэдкія імгненьні маглі заўважыць яе пафарбаваныя валасы, круглы твар, размаляваныя вусны і тлустыя палосы броваў. У гэтым архірасейскім у сваёй расейскасьці твары, што прыгадваў порцыю пудынгу, вылучаліся чуйныя вочы. Блакітныя цені, пакладзеныя на павекі з гэткай самай шчодрасьцю, як і памада на вусны, здалёк выглядалі як незабудкі ў сьпірце. Падабраўшы нас на прыпынку як падазроных асобаў, яна цяпер уволю зганяла на нас усе свае эмоцыі. У яе паводзінах было штосьці ад вартаўніка або канваіра. Дзякуючы мундуру, яна адчувала сябе неаспрэчнай уладай. Не чапала яна толькі вайскоўцаў і міліцыянтаў.

– Грамадзянін інвалід! Вас што, прыклеілі да падлогі? Прайдзіце наперад. Што за людзі! Што за людзі!

– Ты, цяжарная! Ня стой з жыватом на праходзе. Жывот як барабан. Можа шосты ці сёмы месяц. Толькі не кажы, што табе нехта выпадкова. Усе так кажуць.

І мы пачулі здаровы пралетарскі сьмех вагонаважатай, якая зараз жа знайшла сабе новую ахвяру. На вуліцы Лычакоўскай яна не спынілася на прыпынку, і нейкі старэчы голас пачаў нясьмела енчыць па-ўкраінску, што можа б усё ж спынілася, бо яму ўжо восемдзесят і ў яго хворая нага. Надта ж цяжка вяртацца.

– Там зашмат зьбіралася сесьці, – абарвала яна. – А ў мяне інструкцыі. А вы што, не чыталі, што рух на сьвежым паветры значыць здароўе? Какое безобразіе.

– Не такое яно сьвежае, – сказаў стары.

– Ніхто вас не ўпаўнаважваў крытыкаваць па лініі экалёгіі, – буркнула яна.

Я назіраў за паводзінамі пасажыраў, якіх абражала пышнацелая кабеціна. Ніякага нэрвовага ціку на тварах. Поўная абыякавасьць. У татальным маўчаньні, як аўтаматы, яны выконвалі яе ўказаньні. Быў аднак у іхных паводзінах такі момант, калі на нейкую сэкунду, адчуваючы сябе вінаватымі, яны імкнуліся схавацца за плечы суседзяў. Схавацца, ня кідацца ў вочы ўладзе, вось першы рэфлекс. Зьедлівыя зьдзекі гэтай бабішчы не рабілі ні на кога вялікага ўражаньня. Ясна, што ўлада мае права, бо на тое яна і ўлада. І тады, у тым львоўскім трамваі, мне прыгадалася прагулянка па Арэнбургу ў кампаніі Герхарда, аднаго расейскага пісьменьніка-пачаткоўца. Памятаю, што абодва мы добра бавілі час у абдымках Бахуса. Рака Урал, што цячэ праз горад, была мяжою кантынэнтаў. Калі нам абрыдала Азія, мы пешкі пераходзілі мост і гулялі ў Эўропе. Было гэта гадоў дваццаць таму.

– Адкуль у цябе такое дзіўнае імя? – спытаўся я ў Герхарда. – І яшчэ па бацьку – Адольфавіч?

– Я не расеец. З паволскіх немцаў, значыць.

Герхарду я ўдзячны за кароткую лекцыю пра расейскую душу.

– Такая душа існуе. Але яна нібыта й ёсьць, а нібыта яе й няма. Расейская душа, ведаеш, зьяўляецца на хвіліну падчас гулянкі, калі на стале водачка і сялёдачка. У такія хвіліны шмат хто аддаў бы іншаму сваё сэрца на талерцы. А назаўтра бярэш расейскую душу, пакуеш яе ў мундур, ну, не адразу генэральскі, а, скажам, вакзальнага насільшчыка, і за адну хвіліну зьнікае ня толькі душа, але часта нават і чалавек. Замест яго зьяўляецца скотіна. У сьвеце зашмат чыталі Дастаеўскага і лічаць, што расейская душа тое, ці то расейская душа гэтае. Гэта памылка. Існуе толькі душа імпэрыі. А імпэрыя ўсіх нас разглядае як закладнікаў. Яе геніяльнае вынаходзтва ў тым, што кожнаму яна вызначыла дзьве папераменныя ролі: вартаўніка й зэка. Імпэрыя можа нібы й зьнікнуць, але ўсё роўна яна несьмяротная, бо жыве ў кожным з нас.

Kresy, 2'1995

лесе, дзе не было сьпёкі, а стаяла цяплынь і ціша, і можа было распрануцца й пазаймацца тым, чым захпляюцца ён і яна, калі вельмі кахаюць адно аднаго. Тамара ўзьняла спадніцу, легла на падасланы швэдар, разьвяла блакітныя сьцёгны й прашаптала: "Толькі давай хутчэй, я саромеюся ў лесе". Мне зусім не спадабалася абразьлівае "хутчэй", але я ня стаў удакладняць, наколькі моцна маёй жанчыне не падабаецца інтым у лесе. Я ўвайшоў у маленечкую мышыную адтуліну, каб хутчэй забыцца на ўвесь навакольны сьвет. І я забыўся. І апынуўся, так бывае ў сьне, у кватэры Тамарыных бацькоў. Я сядзеў на маленькай варэльні й з апэтытам еў дробныя, добра прасмажаныя катлеты. Тамара стаяла ў кутку зь белай вяроўкаю ў руцэ. На ёй быў адно празрысты халацік, пад якім тырчалі вялікія, поўныя малака грудзі, а там, дзе смочкі дакраналіся да тканіны, распаўзьліся дзьве вільготныя пляміны. "Зараз, даем катлеты і нацягну тваю вяроўку для сушкі пялюшак". Тамара не адказала, толькі ўздыхнула цяжка, як па нябожчыку, і сыйшла ў пакой да нашай трохтыднёвай дачкі. Дакаўтаўшы катлеты, у дзіцячы пакой прыцягнуўся і я. Тамара карміла Вольгу, а я глядзеў і зьдзіўляўся – якія вялікія цыцкі парабіліся ў маёй жанчыны. Пакарміўшы, яна пачала спавіваць дзіця, і я спытаў: "Чаму ў нашае Вольгі ўвесь жывот выпацканы зялёнкаю". "А вось такія мастакі працуюць у мазырскай радзільні, ня могуць акуратна пафарбаваць пуп". Мы не засьмяяліся. Мы апынуліся ў Менску на Прывакзальным пляцы. Ішоў сьнег. Было дванаццаць гадзінаў ночы. "Мне трэба бегчы, інакш спазьнюся на цягнік". Я паспрабаваў быў утрымаць Тамару, але марна, яна вырвалася, і хуценька пабегла ў асьнежаную цемрадзь.

А прачнуўся я ў Амстэрдаме, на пляцы Дам, на трэцім паверсе гатэля «Краснапольскі», у мяккім шырокім ложку. Нумар залівала цёплае жаўтаватае сьвятло, якім падсьвечваліся фасады будынкаў, каб начны горад не губляў урачыстасьці. Я сеў на ложку і ўтаропіўся на вялікі шкляны стол, на якім красавалася залацістая лямпа. Стол і лямпа адбіваліся ў насьценным люстэрку й зіхацелі прыцішаным бляскам. Багацьце дадае ўпэўненасьці, але не дае весялосьці. Я маркоціўся, седзячы ў ложку найшыкоўнейшага эўрапейскага гатэля. Над маёй галавою вісела квадратная карціна, вышытая залатымі ніткамі і ўпрыгожаная штучнымі пярлінкамі. Такі зграбны акуратны жаночы палавічок, выштукаваны ўмелымі рукамі й прымацаваны да сьцяны. Сумна. Я павалокся ў душ і гарачай вадою спрабаваў змыць маркотны настрой, і змыў.

Напіўшыся гарачае кавы, я расштурхаў брата, і мы рушылі ў раніцу Амстэрдам. У ягоныя срэбныя туманы, што ўздымаліся над каналамі й плылі праз вузкія вулкі, паўз цагляныя казачныя дамкі, у якіх ужо паадчыняліся крамкі. У адной з крамак прадавалася шэсьцьдзесят тры мільёны скураных вырабаў: пасаў, партманэтак, похваў для акуляраў і похваў для ключоў, тэчак, валізаў, чамаданаў і дыпляматаў. Чорных, чырвоных, залацістых, зялёных, брунатных, шарых і папяловых. І усё можна пакратаць, узважыць, памацаць, адчыніць, каб зазірнуць у духмянае скураное нутро, куды так і хочацца схаваць чароўную скарбонку з дыямэнтамі. І сапраўды, калі ты ў Амстэрдаме, сусьветнай сталіцы дыямэнтаў, дык чаму ж не набыць скураны партфэль? А таму, што ў мяне ёсьць і партфэль і валіза, зробленыя з скуры барсэлёнскага быка, што згінуў на карыдзе. Але гэта ў мяне, а вось у брата не было скураной валізы, і я ўгаварыў выбраць і набыць лепшую з найлепшых.

Мы вярталіся праз туман і імжу, калі нам насустрач выйшла прастытутка ў чорных ботах на высокіх тонкіх абцасах. Акрамя ботаў на ёй блішчаў скураны купальнік і сьвяціўся плацінавы парык. Яна паліла цёмную цыгарэтку праз доўгі мундштук і відавочна радавалася жыцьцю. Яна ўсьміхнулася й кінула "хэлоў". Мне зрабілася няёмка за сваю футравую куртку й братава паліто, а яшчэ за шыкоўную валізу, а яшчэ за пудру й танаж, якімі прастытутка пакрыла ня толькі твар, шыю й вушы, а сьцёгны і грудзі. Я паружавеў ад першага блізкага спатканьня зь немаладой амстэрдамскай жанчынай туманных паводзінаў. А потым была разгубленасьць. Нібыта мяне падманулі, замест сапраўднага чалавека паказалі акторку, якая выконвае ролю цацкі.

Толькі ўсё мяняецца, забываецца й згладжваецца вельмі хутка, калі ты ў Амстэрдаме, і навокал усё паўсапраўднае й крывое, як руль у ровара. У Амстэрдаме крывыя вуліцы, нахіленыя дамы, няроўныя фасады, хісткія адлюстраваньні. У Амстэрдаме, як у казцы, няма мяжы між сапраўдным і штучным, сном і рэальнасьцю, падманам і праўдаю. І ты можаш пачуць, як у канале стогне амстэрдамская пачвара-людажэр, які высмактаў кроў з трыццаці шасьці прыгажуняў, і стогн крывасмока цябе ня зьдзівіць.

Цябе ўразіць літоўскі жабрак у пальчатках з адрэзанымі пальцамі. Ён прынясе ў кавярню цэлую процьму смуроду. Ён сьцягне з талеркі недаедзены гамбургер і кінецца ўцякаць ад разьюшанага гаспадара. Літовец зьнясе ў раніцу туман ня толькі бадзяжны дух, а і зялёную шапку з вайсковай кукардаю. Спачатку я падумаў, што на ваўнянай шапцы беларускі герб «Пагоня», які носяць міліцыянты, але прыгледзеўся, пазнаў літоўскі, і на сэрцы зрабілася крышачку весялей. Хай сабе злодзей ганьбіць дзябёлую суседку Літву, абы радзімую Беларусь не чапаў брудныміпальчаткамі. Вось так выяўляецца дробны патрыятызм. Ну й што? У Эўропе ўсё дробнае. Гэта ў Азіі з Амэрыкай усё вялікае. Вялікая нацыя. Вялікая мова. Вялікая будучыня. Для Эўропы празьмерная веліч – ненавісная, а ўсялякія загусьценьні – антыпатычныя. Таму яна ўсё чыста дзеліць, разьнімае, рассмоктвае й памяншае да чалавечых памераў. Пасьля эсэсэсэраўскіх імпэрскіх маштабаў нармальныя прапорцыі выдаюць за дробнае, за няважнае, за нявартае ўвагі. Але да чалавечага імгненна прывыкаеш, яно ж сваё, роднае, эўрапейскае, забытае, але сваё. І калі ты ў Амстэрдаме, дык выразна разумееш, што ў Расей- скай імпэрыі ты працуеш, а ў Эўропе жывеш, бо нарадзіўся беларусам.

Вядома, у Амстэрдаме шмат амэрыканскага, шмат азіяцкага, але яно падпарадкавана эўрапейскім законам, яно пасечана і ўстаўлена ў невялікую раму. На галяндзкай зямлі не збудуеш хмарачос.

Працяг на старонцы 24

СЬМЕРЦЬ ПАХУ НЯ МАЕ

Гутарка Амоса Оза для польскага часопіса «Literatura na Świecie»

– Пачну ад рэчы, якая найболей уразіла, калі я чытаў Вашыя раманы, апавяданьні, а таксама эсэістычныя выказваньні – узяць хоць бы прамову ў Франкфурце. Я маю на ўвазе Вашае асаблівае стаўленьне да зла. Ці не хацелі б Вы гэтае стаўленье акрэсьліць: ці зло мае выпадковы, аказіянальны характар, або, магчыма, яно зьяўляецца часткаю сьветабудовы і мае онталягічны, субстанцыянальны статус?

– Мне цяжка адказаць на гэтае пытаньне ў ягоным касьмічным маштабе, і я хацеў бы засяродзіцца толькі на чалавечым зьле. Мне здаецца, што ў людзей зло выступае як сьведамы выбар і як "прынада". Я не сустракаў зла сярод драпежных зьвяроў – ні ў гарах, ні ў раёне, ні ў лесе. Я бачыў зло толькі сярод людзей. Магчыма, зло – гэта вылучная ўласьцівасьць чалавецтва і належыць вылучна яму. Я не гавару тут пра экстрэмальную зьяву – злых людзей. Я гавару пра людзей добрых – або амаль добрых – якія ўчыняюць зло. У гэтым ёсьць нешта патаемнае. Ці зло прыносіць нам прыемнасьць? Ці жорсткасьць – гэта частка нашай гульні? Ці жорсткасьць – гэта частка нашай сэксуальнасьці? Ці жорсткасьць – гэта частка ўнутранай дэфініцыі кожнага з нас? Вось пытаньні, якімі я шмат праймаўся ў кожным маім рамане й апавяданьні. Ва ўсялякім выпадку зло йснуе.

– Мне аднак хацелася б пэўнае адназначнасьці: ці Вы лічыце, што зло ў чалавечым сьвеце непазьбежнае?

– Так. Але мне здаецца, на нас, ня гледзячы ні на што, ляжыць абавязак увесь час клясыфікаваць гэтае зло – адрозьніваць паміж злом і дабром, паміж злом, "горшым злом" і "найгоршым злом", паміж шэрым і чорным колерам. Адгэтуль і мая вялікая дыскусія зь Ісусам. Мы нарадзіліся амаль у тым самым месцы, вельмі блізка адзін да аднаго. Мы амаль з аднаго квартала – ад ягонага дому ў Бэйт-Лэхэме да майго дому толькі дзевяць кілямэтраў. І між намі йснуюць розныя канфлікты, розьніца ў паглядах. Ён, напрыклад, думаў, што ў дзяцей няма зла – і памыляўся: бо ня меў дзяцей.

– Пакінем пакуль што Ісуса, да якога мы пазьней яшчэ вернемся, бо я ведаю, што ён для Вас важны, што дыялёг зь Ісусам выразна выяўляецца ў некаторых Вашых выказваньнях, што Вы зь ім якраз вядзеце спрэчку пра зло. Я хацеў бы зараз трошкі пагаварыць пра Вашую творчасьць: ці ўсё ж – кажучы спрошчана – яе можна разглядаць як нейкую барацьбу або гульню з злом? З поўным усьведамленьнем таго, што барацьба гэтая невырашальная, што гульня гэтая ня мае канца?

– Так, гэта праўда. У гэтай барацьбе на сваім баку я маю гумар і ўнутраную літасьць да самога сябе. А таксама хірургічную сьведамасьць, сьведамасьць таго, хто праводзіць апэрацыю.

– Я заўважаю ў Вашай творчасьці яшчэ адзін матыў – бо гэтак часта збудаваныя вобразы герояў Вашых твораў, напрыклад «Чорнай скрынкі» – матыў, які дае зразумець, што зло – нешта вельмі банальнае. Што ім па сутнасьці прасякнутая ўся нашая штодзённасьць, нашыя дробныя справы.

– Так, але не да канца. Вядома ж, зло – банальнае. Але ёсьць і зло вельмі глыбокае. І тут Ганна Арэндт...

– Я якраз зьбіраўся спытацца ў Вас пра кнігу Арэндт «Айхман у Ерусаліме», якая ў нас была вельмі папулярная – менавіта ў кантэксьце трывожнае праблемы банальзацыі зла ў татальных сыстэмах...

– ... трапіла ў Айхманаву пастку. Бо Айхман здаваўся ён нейкім банкаўскім службоўцам, нейкім бюракратам. І ёй здавалася таксама, што зло – зьява канцылярская, бюракратычная. І аднак гэтае зло не банальнае. Гэта зло, надзеленае сілаю паэтычнае творчасьці. Напрыклад, той невядомы нацыст, які вынайшаў газавыя камэры – "душавыя пакоі" з газам. Ён ня быў банальны: ён знайшоў вельмі глыбокую мэтафару. І меў таксама глыбокае адчуваньне псыхалёгіі. Бо жыдам дзьве тысячы гадоў казалі, што яны брудныя. А ў дадатак да гэтага яны яшчэ доўгія дні й ночы парыліся ў цялячых вагонах. Дык калі пасьля прыбыцьця ў лягер ім прапанавалі схадзіць у душ, яны зусім не хваляваліся за свой лёс. Калі б ім сказалі, што там нейкае бюро або што там робяць здымкі для пашпарту – яны не былі б такія спакойныя. Сказаць жыду: "Будзь чысты, і тады мы цябе прымем" – гэта вельмі глыбокая рэч. Ня ведаю, хто быў тым невядомым нямецкім паэтам. Можа ён яшчэ й сёньня недзе жыве? Але гэта якраз тое небанальнае зло.

– Бо яно абапіраецца на падсьведамасьць народу адрынутага й засуджанага, народу з ганебным кляймом?

– Не, аўтар тае "мэтафары" пранікае ў душу народу дзеля таго, каб тысяча людзей была ў стане забіць мільёны. Ня так проста забіць нават мільён кароваў. А вось ён хацеў, каб яму паверылі, калі ён будзе граць на флейце...

– Як той пацукалоў з Гамэльну...

– Менавіта.

– Цяпер іншы матыў Вашае палемікі зь Ісусам, якая мае для мяне два больш шырокія вымярэньні: гэта – з аднаго боку – дыспут або дыялёг з прарокамі ўвогуле, з другога – дыялёг з хрысьціянствам, якое Вас адначасна захапляе й адштурхоўвае. Дык вось пытаньне: што ў хрысьціянстве такога выразна непрымальнага й выразна прыцягальнага? Як Вы гэта бачыце як чалавек, які прыходзіць з глыбіняў юдаізму й гаворыць з хрысьціянствам?

– Што мяне захапляе ў хрысьціянстве? Глыбіня пачуцьця. Юдаізм – значна менш пачуцьцёвая рэлігія. Для мяне заўсёды йснавала нейкая чароўнасьць, якая выплывала з глыбіняў хрысьціянскіх пачуцьця, перадусім каталіцызму. Але з другога боку, я таксама заўсёды адчуваў перад ім страх. Бо я заўсёды баяўся паказьці ўсё на адну шалю. Паставіць усё, усе чалавечыя дачыненьні на адну карту – на карту любові. І яшчэ адно – сам крыж. Я шмат разоў пытаўся сам у сябе: чаму хрысьціянства выбрала сабе за сымбаль менавіта крыж? Прадмет, які ўяўляе сабою прыладу катаваньня? Нарэшце, мяне непакоіў і сам Укрыжаваны – партрэт чалавека, ахопленага страшнымі пакутамі. Чаму хрысьціяне ня выбралі сабе за сымбаль чалавека, які ступае па вадзе, чаму гэтым сымбалем ня сталася постаць калекі, які пакідае свой ложак і йдзе здаровы? У хрысьціянстве столькі прыгожых сымбаляў. Але гэтая рэлігія выбрала найгоршыя й найбольш трагічныя. Шмат разоў, будучы жыдоўскім дзіцёнкам, я пытаўся таксама: што адчувае хрысьціянскае дзіця, якое ўстае раніцай, калі першае, што яно бачыць на сьцяне, – гэта выява чалавека, які пакутуе ад садызму. Ці гэта выклікае толькі літасьць? Ці так-



Амос Оз. Здымак Эрыка Фэйнблята.

ПРАРОК НАСУПЕРАК САБЕ

Амос Оз – ізраільскі пісьменьнік, якога добра ведаюць у сьвеце. Ягоныя кнігі перакладзеныя з гэбрайскай на трыццаць моваў. Посьпех і розгалас прынесла яму як мастацкая проза, так і палітычная публіцыстыка ў справе ізраільска-палестынскага кампрамісу.

Нарадзіўся Оз у 1939 годзе ў Ерусаліме, яшчэ пад брытанскай адміністрацыяй, у сям'і польска-расейскіх імігрантаў. Ягоныя продкі – навукоўцы й настаўнікі, а таксама праварадыкальныя дзеячы сыяпізму. Ягоныя бацькі ў пачатку трыццатых гадоў *прыехалі ў Ерусалім, несучы рану,* – як кажа Оз, – *якая ніколі не загаілася.* Яны лічылі сябе эўрапейцамі, а большасьць Эўропы лічыла іх непажаданымі касмапалітамі. *Паміж сабою яны размаўлялі па-польску і расейску, чыталі па-нямецку і ангельску, марылі на ідыш, але яго вучылі толькі па-гэбрайску.*

Пятнаццацігадовым хлопцам Оз бунтуецца супраць бацькавага сьвету каштоўнасьцяў і ўцякае з дому ў кібуц Хульда, дзе працуе й сканчае школу. Кібуц пасылае яго на вучобу. Пасьля сканчэньня ўнівэрсытэту Оз вяртаецца ў кібуц і на працягу дваццаці трох гадоў займаецца пісьменьніцтвам, гаспадаркай і настаўніцтвам у школе. Свае ганарары ён аддае ў агульную касу. У танкавым аддзеле Оз бярэ ўдзел у шасьцідзённай вайне 1967 году і ў вайне Суднага Дня ў 1973. Потым ён скажа, што ёсьць толькі дзьве каштоўнасьці, якія апраўдваюць вайну: жыцьцё й свабода. І што ніколі ня стаў бы змагацца за "правы продкаў" ці за дадатковы кавалак зямлі, прыродныя багацьці або ў імя "нацыянальных інтарэсаў". У 1986 годзе разам зь сям'ёй Оз пакідае кібуц. Цяпер ён прафэсар гэбрайскай літаратуры ва ўнівэрсытэце Бэн Гурыёна ў Бээр Шэве.

Дэбютаваў Амос Оз ў 1965 годзе зборнікам апавяданьняў «Там, дзе выюць шакалы», які прынес яму першую літаратурную ўзнагароду. Праз год ён апублікаваў аповесьць «Магчыма, у іншым месцы», прызнаную за зьяву вялікага таленту. З наступных твораў найбольш вядомыя – «Мой Міхал» – кніга, якую называюць ізраільскай «Спадарыняй Баварыі»; «Да сьмерці», томік, які ўключае дзьве змрочныя навэлы; раман «Дакраніся да вады, дакраніся да ветру»; «На зямлі Ізраіля» – зборнік літаратурных рэпартажаў; урэшце, нашумелая кніга «Чорная скрынка», якая атрымала прэстыжную французскую літаратурную ўзнагароду *Prix Femina Etranger,* і іншыя. У 1991 годзе выйшла «Фіма», прызнаная як "постідэалягічная" кніга. Гэта досьлед паралюшу волі, а таксама страсны твор пра жыцьцё, палітыку, плоць і гісторыю. Найноўшы раман Оза «Не кажы, што гэта ноч» зьявіўся ў студзені 1994 г.

Творы Оза выклікаюць у яго на радзіме цэлую гаму эмоцый: ад захапленьня й любові – да гвалтоўных атакаў, і правакуюць бурныя дыскусіі. Гэта адбываецца ня так, як у англасаксонскай культуры, дзе пісьменьнікам вызначана роля тонкіх суразмоўцаў. У жыдоўскай традыцыі, таксама як і ў славянскай, іх уважаюць за прарокаў, выразьнікаў ідэі, сумленьне нацыі. Оз прызнае, што натхненьне на літаратурную працу ён чэрпае з трагічнай мінуўшчыны свайго народу, але, нягледзячы на гэта, ён лічыць, што тая мінуўшчына павінна страціць сваю ўладу, і адмаўляе любыя формы яе тыраніі.

Ex Libris

сама жорсткасьць? Гэта вельмі цяжкія пытаньні. І я ня маю на іх адказаў. Але калі Вы ў мяне пытаецеся пра амбівалентныя пачуцьці да хрысьціянства, я паспрабую выглумачыць іх, узяўшы два аспэкты: музыку Баха й партрэт Укрыжаванага, катэдральную царкву й экстаз жорсткасьці й самакатаваньня, элемэнты духовасьці й элемэнты садамазахізму, цудоўныя карціны й вялікую замілаванасьць да пакутаў. Я асабіста ненавіджу пакуты. Мне здаецца, што пакуты – рэч дрэнная. Таксама й пакуты, якія чалавек прычыняе сабе сам. У мяне таксама не выклікае ніякае сымпатыі нянавісьць хрысьціянаў да свайго цела. Я хачу, каб цела было маім сябрам. Зрэшты, гэта ня так лёгка. Мае дачыненьні зь целам – як дачыненьні з жанчынай. Трэба даць целу даглядаць за целам. І не заўсёды гэта ўдаецца. Але, натуральна, я не прымаю нянавісьці да цела. Ня цела грэшнае. І ня цела крыніца зла. Зло, пра якое Вы перад гэтым пыталіся, паходзіць ня зь цела.

– Я пытаюся пра хрысьціянства не без прычыны: у адной з Вашых гісторый апавядаецца пра Крыжовы паход. Там адчуваецца захапленьне хрысьціянствам і разам з тым непрыманьне тых яго момантаў, пра якія Вы якраз згадалі. Зрэшты, гэта вельмі змрочная кніга... Вось жа я хацеў бы ведаць, як бы Вы акрэсьлілі адказнасьць хрысьціянства за перасьлед жыдоў, які чыніўся на працягу многіх пакаленьняў? Бо за гэта адказны ня толькі нэопаганскі нацызм, але й хрысьціянства мае за сабою нядобрую традыцыю...

– Існуе нэўная сувязь паміж нацыстоўскім нэопаганствам і хрысьціянствам: свастыка – гэта нібы скрыўлены крыж. Натуральна, тут ёсьць сувязь, але ёсьць таксама нэўныя ступені адказнасьці, нэўная яе клясыфікацыя. Таму я ніколі не пагаджуся зь ідэяй, што кожны хрысьціянін вінаваты перад жыдамі. Бо ідэя калектыўнае віны – гэта антыжыдоўскае паняцьце. Мне здаецца таксама, што жыды й хрысьціяне павінны распачаць сур'ёзную размову й дыялёг, які спазьніўся на дзьве тысячы гадоў. Гэтую размову трэба весьці цяпер – у сытуацыі, калі мы, жыды, не стаім на каленях з-за страху і ўласнае слабасьці, а хрысьціяне не стаяць на каленях з-за пакутаў сумленьня й пачуцьця віны. Мы мусім весьці гэтую размову як роўныя – ніколі раней гэта не было магчыма. Можа, жыды баяліся хрысьціянаў, адчуваючы на сабе цяжар адказнасьці з прычыны стаўленых перад імі абвінавачаньняў? Бо ж яны мусілі гаварыць аб розьніцы сьветаўспрыманьня ў нашых рэлігіях. Вось жа мы павінны – паўтараю – весьці гэтую размову: не на тое, каб наварочваць адзін аднаго ў сваю веру, а каб весьці нармальнае рэлігійнае жыцьцё, жыцьцё ў разнастайнасьці.

– Цяпер зусім іншы матыў. Мы мала ведаем пра новагэбрайскую літаратуру. Існуе, праўда, некалькі анталёгіяў, ёсьць крыху перакладаў. На гэтым фоне ўзьнікаюць розныя пытаньні. Напрыклад пытаньне, як можна быць пісьменьнікам унутры крыху штучнай мовы, якая доўгія стагодзьдзі была мёртвай мовай літургіі? Вядома ж, я ведаю пра нэўную пераемнасьць, пра йснаваньне вялікай гэбрайскай паэзіі ў абшары візантыйскага сярэднявечча або пісьменьнікаў XIX стагодзьдзя, такіх як Чарнігаўскі або Шнэур, пра творчасьць Агнона – "бацькі-заснавальніка" новагэбрайскай літаратуры. А гэта ж, апрача ўсяго іншага, мова, на якой – паводле нашага пабытовага ўяўленьня – выказваліся пераважна ісьціны аб мэтафізычным зьле й дабры, аб кантакце чалавека з Богам, аб вялікіх трывогах, якія не мясьціліся ў душы адной асобы, аб праўдах веры й правілах Старога Закону. А цяпер зьяўляецца мова зусім іншая: мова вельмі канкрэтная, вельмі эмпірычная, на якой гавораць пра цыраваньне шкарпэтак, пра звычайнае чалавечае каханьне, пра нястачу грошай, пра невядомыя аўтарам Бібліі тэхнічныя прыстасаваньні. Ці паміж дзьвюма гэтымі мовамі няма вялікае "прорвы"? Як Вы даеце сабе рады з гэтай жывой новагэбрайскай мовай, якая для Вас натуральная, бо Вы ў ёй выхоўваліся?

– Я разумею гэтае пытаньне так: як можна весьці дыскатэку па-лацінску? Аднак, як выяўляецца, можна. І ня толькі можна, бо пры гэтым узьнікае яшчэ й шмат розных гумарыстычных і вельмі цікавых сытуацый. Але трэба быць асьцярожным – як Данііл ў клетцы з ільвамі. Бо гэта выглядае прыблізна так: Вы ў катэдральным саборы й Вам раптам захацелася пайграць на гармоніку. Акустыка неверагодная, гук можа Вас проста забіць! Але, з другога боку, адкрываюцца цудоўныя магчымасьці, калі Вы здолееце належным чынам выкарыстаць гэтую акустыку. Кожны гук у гэтым Вашым граньні будзе мець тэалягічнае адценьне, але гэты тэалягічны аспэкт мае адначасна й гумарыстычныя рысы або нават вядзе да пародыі. Сёньняшняя гэбрайская мова – зусім як ангельская элізабэтанскага пэрыяду. Гэта вулкан. Вы можаце ўвесьці ў мову словы й правілы, можаце дадаць прэфіксы й суфіксы – бо мы маем нібы кампутар зь Пяцікніжжа, склад карэнных структур, адкрытых у розных кірунках. Дзякуючы гэтаму ўзьніклі такія словы як *авірон* 'самалёт' (ад слова *авір* 'паветра'), або хоць бы той самы кампутар – *махшэв* (ад слова *махшава* 'думка'). І так у гэбрайскай мове можна зрабіць усё – трохі з гумарам, трохі з фантазіяй, трохі з анархізмам. Жыць сёньня ў гэбрайскай мове – гэта жыць у цудоўную эпоху: у ёй ужо ёсьць некалькі словаў, якія вынайшаў я сам – паводле старых мадэляў. І яны ўжо ўлучаныя ў слоўнікі. Адно слова вярнулася да мяне ад таксіста, які нават ня ведаў, што яго выдумаў я. Гэта бліжэй за ўсё да несьмяротнасьці: кнігі мае некалі забудуцца, але словы, якія я вынайшаў, выдумаў, ужо кружаць па жылах мовы. І іх ужо нельга адтуль прыбраць. І гэта словы, якія вядуць няспынны дыялёг зь Пяцікніжжам. Вось жа – каб закончыць гэтую тэму – я граю на гармоніку ў царкве.

– Калі мы ўжо загаварылі пра мову: надзвычай важнае значэньне ў гэбрайскай мове маюць літары – зычныя, яны – подых Бога, матэрыя стварэньня сусьвету. Ці ў сувязі з гэтым, працуючы ў новагэбрайскай мове, у вас не ўзьнікае ўражаньня, што Вы ўдзельнічаце ў сьвятакрадзтве, крадзеце ў Бога ягонае права на стварэньне сусьвету?

– Сьвятакрадзтва – частка цудоўнай жыдоўскай традыцыі. І жыды ўжо ня першае тысячагодзьдзе спрачаюцца з Богам амаль па-сямейнаму. Гэта рабілі прарокі, гэта рабіў таксама Ісус, гэта робяць хасыды, а таксама сучасныя пісьменьнікі. Магу даць Вам два прыклады: аднаму зь іх ужо чатыры тысячы гадоў, другому – толькі пяць. У «Кнізе Быцьця» Абрагам таргуецца з Богам за жыхароў Садома й Гаморы дакладна гэтаксама, як гандляр ужываным аўтамабілямі: змушае Яго паабяцаць ацаліць тыя гарады, калі б у іх засталося – па чарзе – пяцьдзясят, сорак пяць, сорак, трыццаць, дваццаць, а ў канцы толькі дзесяць праведнікаў. І кажа: "Хіба ж Той, які стаіць судзьдзёю над усёй зямлёй, мог бы ўчыніць несправядлівасьць?" (Бц 18.25). Інакш кажучы: выклікае Бога на суд. Праз тысячагодзьдзі ізраільскі паэт Егуда Аміхай бярэ адзін з вэрсэтаў нашай жалобнай малітвы: *Эль малэ рахамім* (Бог поўны літасьці) і піша верш з чатырох радкоў, абаперты між іншага на складанай гульні словаў:

Бог поўны літасьці,
Але калі б ён ня меў літасьці,
Літасьць была б у сьвеце,
А ня ў Богу.

І гэта, вядома ж, сьвятакрадзтва. Сьвятакрадзтва належыць да сфэры веры й тэалёгіі: чалавек не праклінае Бога, калі ён ня мае Бога ў сэрцы. Натуральна ж, атэіст Бога не праклінае.

– Вы, калі гаварыць пра генэзу, пра жыцьцяпіс, паходзіце з традыцыі ашкеназійскіх жыдоў, якія прайшлі эпоху Асьветніцтва, Гаскалы. А якое Вашае стаўленьне да іншых традыцыяў – я маю на ўвазе перадусім містычную традыцыю, традыцыю Кабалы? Я заўважыў у Вашых тэкстах розныя матывы, якія сьцісла зьвязаныя з гэтай містычнай традыцыяй, напрыклад у «Маім Міхале» так проста й апавядаецца пра барацьбу цемры й сьвятла. Таксама важную ролю ў Вас адыгрываюць сны, вырашальную для раманных герояў. Але менавіта з дапамогаю сноў кабалісты часта тлумачылі сусьвет і прызначэньні, якія накаваў яму Бог. Наколькі важная для Вас містыка?

– Я вельмі рады, што Вы заўважылі ў маіх кнігах менавіта містычныя элемэнты, бо яны ў іх вельмі моцныя.

– Напрыклад у «Фіме»?

– Так, напрыклад. У мяне патрэба містычнага перажываньня – я маю на ўвазе ўнутраную містыку – зьвязаная з пачуцьцём жыцьця. Я ўспрымаю жыцьцё як нешта містычнае. Я стараюся жыць рацыянальна, але ж гэта зусім не рацыянальнае практыкаваньне. Таму я бяру, скажам, нейкі містычны напой і п'ю яго з шклянкі рацыяналізму. Я разумею, што трэба вельмі сьцерагчыся татальнай містычнасьці. Бо тая суцэльная містыка – гэта таксама захапленьне сьмерцю і занядбаньне самога жыцьця. А разам з тым дзіўна тое, што само жыцьцё паходзіць зь містычнае крыніцы – жыцьцё пачынаецца містычна, містычна яно й канчаецца. Але жыцьцё ня можа разьвівацца выключна на містычнай дыеце.

– Ці так у сувязі з гэтым належыць разумець паразу Ганны з рамана «Мой Міхал», якая сваё рэальнае жыцьцё жыве якраз у паўсьне, у мроях?

– Так. Таму я яе люблю й мне яе вельмі шкада. Але я таксама сярджуся на яе ад імя яе сына.

– Ці йснуе для Вас іншае месца ў сьвеце гэткае ж чароўнае, як Ерусалім? У мяне стварылася ўражаньне, што няма нічога настолькі важнага – я тут маю на ўвазе не рэлігійнае, нацыянальнае або культурнае разуменьне Ерусаліма, а вельмі асабістае. Нават кібуц, пра які Вы пішаце з сэнтымэнтам і які, як ведама, зьвязаны з важным этапам Вашай біяграфіі, ня мае, як мне здаецца, таго значэньня. І таму чытач перажывае – чытаючы хоць бы «Чорную скрынку» – Ерусалім разам з Вамі, бачыць яго Вашымі вачмі. У чым жа для Вас – у двух словах – палягае тая пазарэлігійная, тая вельмі асабістая вартасьць Ерусаліма?

– Для мяне Ерусалім – гэта сустрэча справаў вельмі празаічных з рэчамі лірычнымі й паэтычнымі. Гэта месца, у якім ты мыеш шкарпэткі, пячэш яечню і ўвесь час адчуваеш сябе на мяжы духовага аргазму. Гэта месца, у якім найвышэйшы аргазм і найзвычайнейшая проза сустракаюцца й становяцца адной цэласьцю. І гэты сутык – ключ да ўсяго. Ключ да таго, што зрабіла мяне пісьменьнікам. Усьведамленьне таго, што ёсьць містычнасьць, і – з другога боку – усьведамленьне таго, што ў прарокаў і ў Ісуса часта дрэнна пахла з чаравікаў. Гэтая сувязь і ёсьць жыцьцё. Сьмерць паху ня мае.

[Варшава, верасень 1994]

Размаўляў Збігнеў Мікалэйка,
Literatura na Swiecie. Nr.1-2, 1995

Чаму я вырашыла пісаць па-ірляндзку

Нуала Ні Гональ

Ня так даўно я тэлефанавала маёй маці ў нейкай сямейнай справе. "Ну, што ты цяпер пішаш?" – спыталася яна, больш каб падтрымаць размову, чым дзеля чаго іншага. "А, так сабе, эсэ для *New York Times*", – адказала я як мага больш безуважна. "І пра што ж?" – спыталася яна. "Пра тое, як гэта – пісаць па-ірляндзку", – адказала я. На тым баку дрота нейкую хвіліну панавала маўчаньне, пасьля я пачула: "Ну, спадзяюся, ты скажаш ім, што па-ірляндзку пішуць толькі вар'яты". Канец размовы. Я атрымала адплату. І гэта ад маёй маці – адзінай у нашай сям'і, для каго ірляндзкая мова была родная. Яна ня чула ніводнага ангельскага слова аж да шасьцёх гадоў, пакуль не пайшла ў школу, і толькі будучы падлеткам сьцямі-ла, што слова, якім у хаце называлася вельмі важная рэч, аграфка, было ўзапраўды двума словамі – *safety pin* – і словы гэтыя былі ангельскія. Тыпова.

Але, папраўдзе, ня так дзіўна. Неяк нядаўна я была на прыняцьці ў амэрыканскай амбасадзе ў Дубліне ў гонар двух іхных паэтаў, Тоні Морысан і Рычарда Уілбура. Пастаяўшы ў чарзе, мы набралі з швэдзкага стала закусак і селі за найбліжэйшы вольны столік. Ірляндка, што села насупраць мяне, спыталася, чым я займаюся. Перш чым я пасьпела раскрыць рот, у размову ўлез яе спадарожнік: "О, Нуала піша вершы па-ірляндзку". А пра што ж я пішу? пацікавілася яна. І зноў, перш чым я пасьпела адказаць, ён адказаў за мяне: "Яна піша вершы пра каханьне й ростань, і большасьць іх я магу працытаваць з памяці". Мне гэта пачало абрыдаць, і я паспрабавала адначасна запярэчыць і даць яму фору. "Уласна кажучы, – заявіла я, – калі пра што й варта пісаць, дык толькі пра нешта вялізнае: нараджэньне, сьмерць ды пра найважнейшае, што стаіць паміж імі – сэкс". "О, – насьмешліва сказала мне ягоная сяброўка, – хіба ў ірляндзкай мове ёсьць слова "сэкс"?"

... і я падумала – ці чорнаму пісьменьніку ў Амэрыцы даводзіцца цярпець нешта падобнае? Я тут, у сваёй краіне, мушу бараніць афіцыйную мову дзяржавы ад суайчыньніцы, якая, відаць, лічыць няведаньне гэтае мовы вялікім дасягненьнем...

Я паглядзела на другі столік, дзе сядзела Тоні Морысан, і падумала – ці чорнаму пісьменьніку ў Амэрыцы даводзіцца цярпець нешта падобнае або адпаведнае. Я тут, у сваёй краіне, мушу бараніць афіцыйную мову дзяржавы ад суайчыньніцы, якая, відаць, лічыць няведаньне гэтае мовы вялікім дасягненьнем. Тыпова, але ўсё ж, мабыць, ня так дзіўна.

Я растлумачу. Ірляндзкая мова (гэтак яна завецца ў Канстытуцыі Ірляндыі; называць яе гэльскай цяпер лічыцца не зусім дарэчным і ўспрымаецца як лёгкая пагарда) – гэта кельцкая мова, на якой гаворыць невялічкая меншасьць карэннага насельніцтва пераважна ў маленькіх вёсках на заходнім узьбярэжжы. Гэтыя ірляндзкамоўныя тэрыторыі называюцца Гэйлтахт і ўяўляюць сабою апошнія рэшткі даўніх гістарычных эпохаў, калі ўвесь востраў быў ірляндзкамоўным або адным вялізным Гэйлтахтам. Колькасьць людзей, якія дагэтуль карыстаюцца мовай у штодзённым побыце – пытаньне, вакол якога не сыціхаюць спрэчкі, яна вагаецца ад 100 000 паводле самых аптымістычных ацэнак да 20 000 паводле самых кансэрватыўных. Дзеля круглае лічбы дапусьцім, што іх каля 60 000, або каля 2 працэнтаў насельніцтва Ірляндзкае Рэспублікі.

❧❧❧

Дзякуючы намаганьням руху Ірляндзкага Адраджэньня й выкладаньню ірляндзкае мовы ў сыстэме адукацыі, на мове гаворыць з рознай ступеньню частасьці й гладкасьці значна большая колькасьць людзей, якія вывучылі яе як другую мову. Аж да таго, што дадзеныя перапісаў за апошнія пару дзесяцігодзьдзяў нязьменна канстатавалі, што да мільёна людзей, або каля 30 працэнтаў насельніцтва Рэспублікі, цьвердзяць, што валодаюць ірляндзкай мовай. Да гэтага можна дадаць 146 000 чалавек у шасьцёх графствах Паўночнай Ірляндыі, якія таксама могуць гаварыць на мове. Гэтая лічба ў адзін мільён, вядома ж, вельмі падманлівая і ні ў якім разе ня сьведчыць пра шырокае ўжываньне мовы ў штодзённым побыце. Гэта хутчэй азнака агульнае прыхільнасьці да мовы, прыгожыя летуценьні аб тым, што хацелася б мець. Тым ня менеш гэтая прыхільнасьць вельмі важная.

... шмат каго з замежных навукоўцаў захапляла тое, што гэтая гаворка ўбогіх сялянаў заўсёды вось-вось гатовая выбухнуць паэзіяй...

Той факт, што ірляндзкая мова і, беручы шырэй, літаратура сёньня ў Ірляндыі маюць небясьпечна хісткі статус, выглядае выразным кантрастам да іх доўгай і слаўнай гісторыі. На маю думку, ірляндзкамоўнае пісьменства – найстарэйшая няспынная літаратурная дзейнасьць ва ўсёй Заходняй Эўропе. Яно было запачаткаванае ў V ст. і квітнела ў багатай і разнастайнай рукапіснай традыцыі праз усё Сярэднявечча. За ўвесь гэты час любыя завасўнікі – нарманы, англа-нарманы, ангельцы – непазьбежна асыміляваліся, становячыся большымі ірляндцамі за самых ірляндцаў. Але Бітва пры Кінсале 1601 году, у выніку якой брытанцы разьбілі й выгналі з краю апошніх незалежных ірляндзкіх князёў, а таксама трагічныя катастрофы неспакойнага XVII ст., улучна з гвалтоўнымі перасяленьнямі, разбурылі сацыяльную апору мовы. Яе заняпад быў значна паскораны вялікім голадам сярэдзіны XIX ст.; бальшыня з таго мільёну, што памёр з голаду, і тых мільёнаў, што на ўбогіх судзінах адплылі ў Амэрыку, гаварылі па-ірляндзку. Тое, што бальшыня тых, хто выжыў, стаялі перад непазьбежнасьцю эміграцыі, паскорыла пераход на ангельскую мову – бо й праўда, "На што табе тая ірляндзкая мова ў Бостане?"

Колішняя высокая культура карэннага насельніцтва захавалася ў простай гаворцы рыбакоў і дробных гаспадароў, і якраз гэтую мову я вывучыла, калі мне было пяць гадоў, у Заходнім Кэры ў 1950-х ва ўмовах поўнае ізаляцыі, быдучы аддадзеная на выхаваньне маёй цёткі ў парафіі Вэнтры. Ірляндзкая мова вызначаецца незвычайнай гнуткасьцю й эмацыянальнай адчувальнасьцю; дасьціпнай і вясёлай жартаўлівасьцю ды безьліччу гістарычных і міталягічных асацыяцыяў; гэта інструмэнт незвычайнае глыбіні й шырыні ўяўленьня, зладжаны шматлікімі пакаленьнямі аж да таго, што зь яго дапамогаю можна падабраць і прасьпяваць любое адценьне пачуцьцёвых мадуляцыяў, якія толькі могуць узьнікнуць паміж людзьмі. Шмат каго з замежных навукоўцаў захапляла тое, што гэтая гаворка ўбогіх сялянаў заўсёды вось-вось гатовая выбухнуць паэзіяй. Карацей кажучы, той пэдагагічны выпадак, дзякуючы якому я ў маленстве вывучыла мову, безь перабольшаньня можна назваць незвычайна творчым.

Ірляндзкая мова Адраджэньня, або "кніжная ірляндзкая", была чымсьці зусім іншым, я вывучыла яе ў школе. І хоць маім першым літаратурным каханьнем былі мунстэрскія паэты Эган О Рахілі і Эан Руа О Сулевань і я цэлымі старонкамі завучвала вершы, якія не праходзілі ў школе, калі я сама ўзялася за пяро, мне не прыйшло нават думкі ў галаву, што я магла б напісаць нешта па-ірляндзку. Дух адмаўленьня быў авалодаў і мною. Пісаць вершы па-ірляндзку было нечым інтэлектуальна сумнеўным. Таму мае першыя спробы – элегіі на сьмерць Бобі Кенэдзі й Марціна Лютэра Кінга, надрукаваныя ў школьным часопісе – былі скрозь англамоўныя. Усё ў іх было нібыта ў парадку, але нават я адчувала, што нешта ў іх ня так.

І раптам пісаньне ірляндзкай паэзіі па-ангельску падалося мне вельмі бязглуздым заняткам. І я зьмяніла мову пасярод верша й перапісала той самы верш па-ірляндзку – і адразу пабачыла, што выйшла значна лепей. Я паслала яго на конкурс у *The Irish Times*, дзе ён выйграў узнагароду. Вось і ўсё. Да ангельскае мовы я ўжо болей не вярталася.

Я выбрала сваю мову, ці дакладней, напэўна, на нейкім вельмі глыбокім узроўні, мова выбрала мяне. Калі ў нашай істоце ёсьць той узровень, які, ня маючы іншага слова, я б магла назваць "душой" (а я веру, што тое слова ёсьць), дык дзеля нейкае назаўсёды мне незразумелае прычыны, моваю, на якой гаворыць мая душа і якая нараджаецца ў маёй душы, сталася ірляндзкая. У 16 гадоў я зрабіла свой выбар. Так сталася. І так ёсьць. Іншага я ня маю.

Аднак калі сам выбар – пісаць вершы па-ірляндзку – быў просты, усё іншае, што зь ёю зьвязанае, зусім ня простае, асабліва крывадушная пазыцыя дзяржавы. З аднаго боку, ірляндзкая мова шануецца як нацыяналістычны сымболь (прыклад – традыцыйныя "cúpla focal", "пара словаў", на пачатку і ў канцы прамоваў палітыкаў, тэледыктараў і нават сьцюардэсы ў самалёце). З другога боку, ня будзе перабольшаньнем сказаць пра абыякавасьць і нават варожасьць дзяржавы да ірляндзкамоўнага насельніцтва, калі яна ня можа забясьпечыць дзейнасьць па-ірляндзку нават самых асноўных службаў для тых, хто хоча весьці свае штодзённыя справы на гэтай мове.

Кампутар па-ірляндзку не разумее – вось найпершае апраўданьне дзяржавы, якая адмаўляецца ўжываць ірляндзкую мову ў сваім справаводстве, нават у раёнах Гэйлтахту. За ірляндызацыю кожнае асобнае ўстановы да-

... ня будзе перабольшаньнем сказаць пра абыякавасьць і нават варожасьць дзяржавы, якая адмаўляецца ўжываць ірляндзкую мову ў справаводстве. За ірляндызацыю кожнае асобнае ўстановы даводзіцца весьці барацьбу. Прыкладам, ірляндзкія школы ў бальшыні былі запачаткаваныя групамі бацькоў, часта насуперак бязьлітаснаму супраціву з боку Аддзелу Адукацыі...

водзіцца весьці зацятую барацьбу. Так, прыкладам, Gaelscoileanna, ірляндзкія школы, у пераважнай бальшыні былі запачаткаваныя групамі бацькоў, часта насуперак бязьлітаснаму супраціву з боку Аддзелу Адукацыі. А адзінаю прычынай, дзякуючы якой мы маем сёньня адзіную ірляндзкамоўную радыёстанцыю, было тое, што каля 20 гадоў таму група праваабарончаў заснавала пірацкую радыёстанцыю на Захадзе на вялікі сорам Ураду, які пасьля гэтага быў проста вымушаны арганізаваць гэтую жыцьцёва важную службу. Сёньня шмат гаворыцца пра адкрыцьцё ірляндзкага тэлеканалу, але я паверу ў яго толькі калі пабачу.

Можна было б спадзявацца, што на нашым баку будуць прынамсі нацыяналістычныя дзеячы культуры й нашыя браты па пяру, што пішуць па-ангельску. Нічога падобнага. Нядаўні дакумэнтальны тэлефільм пра Томаса Кінсэлу пачынаецца з урачыстага аповеду паэта пра тое, што ірляндзкая гісторыя пісалася па-ірляндзку ад пятага стагодзьдзя да дзевятнаццатага. Пасьля гэтага йдзе шматзначная паўза. Мы чакаем, калі будзе згадка пра тое, што жыцьцё, досьвед, пачуцьцёвая сьведамасьць ды нават і гісторыя выказваюцца праз ірляндзкамоўную літаратуру яшчэ й сёньня. Дарма чакаем. Гэткім антыкварскім фокусам аўтар намякае нам, што ірляндзкія англамоўныя пісьменьнікі сталіся сёньня натуральнымі спадкаемцамі паўтаратысячагадовае традыцыі ірляндзкамоўнага пісьменства. Падтэкст фільма: ірляндзкая мова памерла.

Дык хто ж тады такая я, а таксама шматлікія іншыя пісьменьнікі, што ствараюць сёньня сучасную літаратуру па-ірляндзку? Хадзячы нябожчык? Лінгвістычны прывід?

Аднак, з майго боку было б несправядліва выстаўляць аднаго Томаса Кінсэлу; гэткая падступная "здрада" ў дачыненьні да сучаснай ірляндзкамоўнай літаратуры квітнее й пануе сярод нашых англамоўных братоў-пісьменьнікаў. Як сказала мая ірляндзкамоўная каляжанка-паэтка Біды Джэнкінсан: "Нас прымушаюць прыйсьці да іранічнай высновы, што калі мы памрэм, спакойна ўздыхнуць тыя, хто адчувае сябе няёмка ў сваёй ірляндзкасьці пакуль існуе жывая моўная традыцыя, да якой яны не належаць". Аднак хай яны сабе далучаюцца да традыцыі, калі ім гэтак хочацца, мне не шкада. Але хай на іх халера, калі іхная культурная тоеснасьць будзе забясьпечвацца за кошт майго йснаваньня або йснаваньня маёй мовы!

Я вельмі добра сабе ўяўляю, як бы некаторым хацелася бачыць ірляндзкамоўную літаратуру гэткім апошнім перадсьмяротным хрыпам старое жывёліны. Што да іх, дык чым раней мова ляжа й памрэ, тым лепей, каб яны маглі спакайней расьцягаць яе па частках, гандлюючы сваім "этнічным шыкам" у выглядзе перакладзікаў "зь ірляндзкае". Ім і ў галаву не прыйшло б сесьці й як сьлед вывучыць жывую мову. Думаю, што яны будуць моцна ўражаныя, калі нябожчык, якога яны ўжо даўно запісалі ў анёльскія хоры, быццам нейкі Тым Фінэган устане й загаворыць зь імі.

❧❧❧

Не заўсёды бывае так, што памыляецца толькі адзін бок. Ірляндзкамоўныя пісьменьнікі часта станавіліся ахвярамі таго, што гісторык літаратуры Тэрэнс Браўн назваў "атмасфэраю нацыянальнае фанабэрыі й культурнае выключнасьці", і іхны талент не заўсёды адпавядаў той ролі, якую ім было наканавана адыгрываць. Тым ня менш, яшчэ доўгі час пасьля ўзьнікненьня высокіх літаратурных стандартаў па-ірляндзку (Шан О Рырдань, Марцінь О Дзірань, Майра Уак-а-Ты ў паэзіі, Марцінь О Кайнь у прозе), ірляндзкамоўнае пісьменства вельмі заўважна адсутнічала ў анталёгіях 50-х і 60-х гадоў. Ужо нават у 70-х гадох адзін з нашых "вялікіх", Шан О Рырдань, неяк пачуў у радыё, як два нашыя англамоўныя браты па пяру гаварылі пра тое, што "ў Ірляндыі ў 50-я гады ў паэзіі панавала зацішша", тым самым зводзячы на нішто тую вялікую працу, якую выканалі якраз за гэтае дзесяцігодзьдзе О Рырдань і яго ірляндзкамоўныя калегі. Дык ці варта зьдзіўляцца, што, аддаўшы ўсё сваё жыцьцё паэзіі, ён памёр у несуцешным смутку й горычы.

Што да культурных нацыяналістаў, дык ірляндзкая мова ніколі не была моваю нацыяналістычнае мабілізацыі. У адрозьненьне ад іншых малых дзяржаваў, дзе нацыяналізм узьнік у XIX ст., у Ірляндыі колеру яму надавала пераважна рэлігія, а ня мова. Дэніел О'Конэл, Вызвольнік, які паходзіў з Кэры й меў роднаю моваю ірляндзкую, на вялізных масавых мітынгах у 1820-1840-х гадох звычайна выступаў па-ангельску, хоць гэтую мову не разумелі каля 70 працэнтаў тых, да каго ён зьвяртаўся, Чаму? Таму што словы ягоныя перадусім былі скіраваныя да рэпартэраў і чытачоў лёнданскай *The Times*. Асабліва балюча ўсьведамляць тое, што ў тым часе, калі нацыяналізм быў галоўным рухавіком разьвіцьця сучасных літаратурных моваў, прыкладам, нарвэскае, вугорскае, фінскае або эстонскае, якраз у тым самым часе ірляндзкая мова з мовы высокае літаратурнае культуры ператварылася ў простую сялянскую гаворку. Пад той час, калі распачалося адраджэньне, вялізная шкода ўжо была нанесеная і мова была ўжо ў стане непапраўнага заняпаду (у 1880 на ёй гаварылі толькі 14,5 працэнтаў). Абуральная недальнабачнасьць нацыяналістаў-культурнікаў трывае надалей, яна красамоўна выявілася ў ганебнай няўвазе да творчасьці па-ірляндзку ў нядаўна выдадзенай трохтомнай анталёгіі «Field Day Anthology of Irish Writing».

... нацыяналісты-культурнікі, не прызнаючы за ірляндзкай мовай інтэлектуальнага грунту для рацыянальнага дыскурсу або народнага падмурку вуснае традыцыі, ахоўваюць яе як кунсткамэру сваіх утапічных фантазіяў; яна ў іх спракаветная, нязьменная, "творчая", аднак апрача гэтага практычна непатрэбная...

Дык жа й ня дзіва, што мы, ірляндзкамоўныя паэты й празаікі, улучаныя ў анталёгію, адчуваем сябе зьведзенымі да нейкага экзатычнага фону, як ірляндзкая музыка ў выглядзе "мясцовага каларыту". Такім чынам, нацыяналісты-культурнікі, не прызнаючы за ірляндзкай мовай інтэлектуальнага грунту для рацыянальнага дыскурсу або народнага падмурку вуснае традыцыі, ахоўваюць яе як кунсткамэру сваіх утапічных фантазіяў; яна ў іх спракаветная, нязьменная, "творчая", аднак апрача гэтага практычна непатрэбная.

Якое дачыненьне ўсё гэта мае да мяне, паэткі, якая піша па-ірляндзку? Ну, паколькі я, як і ўсе слабыя й нетрывалыя чалавечыя йстоты, падсьвядома прагну славы і ўсеагульнае ўвагі, натуральна ж я баюся, што мяне ня так зразумеюць або ня так патлумачаць і што ў рэшце рэшт я застануся незаўважаная ў сваёй роднай

(Нябожчык, які ўстаў і загаварыў)

краіне. Гэта мяне прыгнятае, я скарджуся й наракаю, я хаджу па кватэры й бурчу сабе пад нос. І аднак недзе ў самай глыбіні душы гэта ані мяне не хвалюе. Усё, аб чым я толькі марыла – гэта каб мяне не чапалі ды каб я магла й далей пісаць вершы па-ірляндзку. Ніколі не забуду, як аднойчы я выступала ў зале, дзе слухачоў можна было пералічыць на пальцах адной рукі. І я была гатовая да гэтага. Гатовая я й цяпер.

Аднак мне заўсёды было вельмі прыемна выходзіць на значна шырэйшую аўдыторыю дзякуючы перакладам, асабліва сярод таго мільёна, які хоць крыху разумее па-ірляндзку. Шмат хто зь іх, магчыма, добра ведаў мову адразу пасьля школы, але з тых часоў ня мсў нагоды яе ўжываць дзеля адсутнасьці функцыянальнага кантэксту, які б апраўдваў яе ўжыванне. Асабліва мне падабаецца, калі мая паэзія ў англійскіх перакладах адсылае чытачоў да ірляндзкага арыгіналу і калі яны памалу знаходзяць даўно згубленыя ніткі мовы, якая з поўным правам ім належыць. Мне таксама вельмі прыемна выяжджаць час ад часу за мяжу й выходзіць на шырэйшую публіку з дапамогаю дзьвюхмоўных выступаў і публікацыяў.

Аднак галоўная мая аўдыторыя – гэта тыя, хто чытае мае вершы толькі па-ірляндзку. Звычайны наклад кнігі вершаў у Ірляндыі – ад 1000 да 1500 асобнікаў. Гучыць нібыта й сьціпла, пакуль не даведаесься, што гэта палічылі б добрым накладам шмат англамоўных паэтаў у Ірляндыі, ды нават і ў Брытаніі або Амэрыцы, дзе жыве значна больш людзей.

Сама старажытнасьць ірляндзкай літаратурнай традыцыі таксама складае невычэрпную крыніцу творчае сілы для мяне як паэткі. Гэта выяўляецца на двух узроўнях: першы зь іх пераважна моўны й рытмічны, а другі – тэматычны й патхняльны. Што да моўнага узроўню, дык старажытнаірляндзкая мова, хоць бясспрэчна вельмі складаная, значна бліжэйшая да сучаснае ірляндзкае, чым, скажам, англасаксонская да сучаснай ангельскай. Любы чалавек, маючы базавы моўны запас, можа пасьля кароткае практыкі чытаць бальшыню сярэднявечных тэкстаў у арыгінале.

Таксама й тэматычна старажытная літаратура – гэта Божы падарунак, хоць я толькі цяпер паволі пачынаю ацэньваць тыя ўнікальныя магчымасьці, якія яна дае сучаснаму аўтару. У Ірляндыі й за мяжою на сёньня вядома больш за 4000 рукапісаў, якія зьмяшчаюць тэксты ад ірляндзкае старажытнасьці да сучаснасьці. Праўда, апрача вялікіх сярэднявечных зборнікаў, толькі каля пяцідзесяці рукапісаў створаныя да 1650 году. Аднак пераважная бальшыня рукапісаў, старанна скапіяваных пасьля гэтае даты, – гэта дакладныя адбіткі значна старэйшых назаўсёды страчаных тэкстаў. Ускладняе справу тое, што ўсё гэтае багацьце з гледзішча сёньняшняга дня даволі ныўдала скаталягізаванае.

Прыкладам, шмат якія матэрыялы, якія маюць велізарную псыхалягічную й сэксуальную цікавасьць, апісваюцца з маралізатарскіх пазыцыяў мінулага стагодзьдзя як "нягодныя й непрыстойныя казкі, непрыдатныя для публікацыі". Шмат якія з гэтых рукапісаў людзкое вока ня бачыла ад таго самага часу, калі яны былі гэтак анісаныя. У дадатак, увагу навукоўцаў амаль выключна прыцягвалі тэксты з эпохі да нарманскага заваяваньня як некранутыя крыніцы найчысьцейшае вады з роднае глебы (зноў тыя нацыяналісты-культурнікі!), у выніку чаго вялізны корпус пазьнейшых тэкстаў быў несправядліва занядбаны. Галоўная каштоўнасьць гэтых тэкстаў для мяне палягае ў тым, што яны засьведчылі захаваньне нават да самых позьніх гістарычных часоў асобнага бачаньня сьвету, карэнна адрознага ад ангельскае мэнтальнасьці, якая пазьней яго зацьміла.

Дзякуючы асабліваму зьбегу акалічнасьцяў, ірляндзкая мова выпала з воза гісторыі якраз тады, калі пачала ўзьнікаць і замацоўвацца новая мэнтальнасьць. Таму яе зусім не закранулі гэткія вялікія інтэлектуальныя зрухі як Рэфармацыя, Адраджэньне, Асьветніцтва, рамантызм і віктарыянская мараль, якія мелі значны ўплыў на вялікія эўрапейскія мовы.

Адным з наступстваў гэтага было тое, што захаванае ў ірляндзкай мове стаўленьне да чалавечага цела застаецца надзвычай адкрытым і пазбаўленым сарамяжлівасьці. Па-ірляндзку амаль немагчыма быць "вульгарным" або "непрыстойным". Цела, з усімі яго адтулінамі й выдзяленьнямі, разглядаецца бязь лішняга маралізатарства і ўспрымаецца як "an nádúir", нешта прыроднае й натуральнае. Яно – хутчэй крыніца незьлічоных сьмешкаў і жартаў, чым нешта такое, чаго трэба саромецца. Так, старыя бабулькі беззаганнае й бездакорнае маральнасьці зь вялікім густам і дасьціпнасьцю могуць апавядаць нават самыя "непрыстойныя" гісторыі. І праўда што, ці ёсьць у ірляндзкай мове слова "сэкс"! А ці ёсьць у эскімоскай мове слова "сьнег"?

Я правяла ўжо цэлыя гады свайго жыцьця, корпаючыся ў старых рукапісах Аддзела Фальклёру Універсытэцкага Коледжа ў Дубліне, і ўсё роўна бываюць такія дні, калі я бяру нейкі незнаёмы рукапіс і ў мяне пачынаюць ад хваляваньня дрыжаць рукі. Зноў жа, гэтыя тэксты дзеяць на мяне на двух узроўнях. Першы – калі я смакую нейкі добра завернуты сказ або адценьне значэньня або выкопваю слова, якое даўно ўжо выйшла з ужытку. Гартаць старонкі гэтых рукапісаў – як слухаць галасы маіх суседзяў і сваякоў, нібы зноў вяртаюцца да жыцьця бацькі й бацькі бацькоў. Другое зацікаўленьне – тэматычнае. Увесь гэты матэрыял сапраўды непараўнальны ні з чым, што толькі ёсьць на зямлі.

Вось, у каталёгу ёсьць шуфляда з загалоўкам «Neacha neamhbeo agus nithe nach bhuil ann» («Нежывыя йстоты й рэчы, якія не існуюць»). Я зусім не найбольшы ў сьвеце матэрыяліст, але гэты загаловак зьбіў з тропу нават мяне. Або яны існуюць, або не існуюць. Але калі яны не існуюць, чаму ж у шуфлядзе стос картак даўжынёю з маю руку? Вось у гэтым уся сутнасьць гэтых тэкстаў, уся іхная неадольная прывабнасьць. Ці гэтыя йстоты існуюць? І так, і не. Рэч у тым, што гэта йстоты з "an saol eile", зь "іншасьвету", які ў ірляндзкай мове ўяўляе сабою тэрмін такой бездакорнай інтэлектуальнай дакладнасьці й рэальнасьці, што яго практычна немагчыма перакласьці на ангельскую мову, дзе ён імгненна ператвараецца ў нешта надуманае й фальшывае, як "фсі ў дальнім канцы саду".

Паслухаўшы, як гэтак званыя глыбінныя псыхолягі гавораць сёньня пра падсьвядомасьць, можна падумаць, што яны самі яе прыдумалі, або як найменей выпадкова натыкнуліся на прывідны й жудасны кантынэнт, дзе ніколі дагэтуль не ступала нага чалавека. Нават вулічныя сабакі ў Заходнім Кэры ведаюць, што "іншасьвет" існуе і што ў любы момант увайсьці туды або выйсьці адтуль – самая звычайная ў сьвеце рэч.

Гэтае заўсёднае напружаньне паміж рэальнасьцю й фантазіяй, на думку Джэфры Ганца, перакладчыка «Старажытнаірляндзкіх мітаў і сагаў», уласьцівае ўсяму кельцкаму мастацтву, але асабліва выразна выяўляецца ў літаратуры Ірляндыі. На думку сп. Ганца, гэта не выкладковая зьява, выкліканая асабліваснямі літаратурнае перадачы, а хутчэй прыродныя характарыстыка, тыпова кельцкая рыса. Гэта значыць, што "іншасьвет" – гэта ня проста радаснае прадчуваньне жыцьця пасьля сьмерці; гэта таксама – і нават перадусім – альтэрнатыва рэальнасьці.

Гэтае лёгкае ўзаемадзеяньне з уяўным значыць, што каб трапіць у "іншасьвет", вам зусім не абавязкова перажываць гвалтоўны псыхічны разлад. Глыбока схаванае ў мове адчуваньне, што існуе нешта па-за ego-абгорткай, прыемнае й суцяшальнае, разам з тым гэта невычэрпная крыніца моўна-вобразнай гульлівасьці, нават калі гаворка йдзе пра самыя звычайныя й банальныя рэчы.

Скажам, неяк увечары я вырашыла пагрукацца ў дзьверы да сваёй цёткі ў Заходнім Кэры. Яна чуе, як я падыйшла. Яна ведае, што гэта я, бо пазнала мае крокі на каменнай сьцежцы. І аднак, калі я ціхенька грукаю ў дзьверы, яна пытаецца: "An de bheoaibh nó de mhairbh thu?" ("З жывых ты або зь мёртвых?") Бо йснуе магчымасьць, што ты можаш быць або тым або тым, і залежна ад таго, да якой катэгорыі ты належыш, уся дзея будзе адбывацца паводле зусім адрознага пратаколу. Усё гэта, відома, жарт, але жарт гэты стаўся магчымы дзякуючы вобразнаму багацьцю самой мовы.

⁂

Я не зьбіраюся тут весьці спрэчкі аб сутнасьцях, і аднак я лічу, што дзякуючы розным абставінам, пераважна гістарычнага характару, сіла й слабасьць ірляндзкай мовы зусім не такія, як у ангельскай. З гледзішча паэзіі адным з найбольш моцных бакоў ірляндзкае можна лічыць яе вобразныя магчымасьці. Аднак тое самае, мабыць, можна сказаць, напрыклад, і пра бэнгальскую. Вось што найбольш мяне ўразіла ў нобэлеўскай прамове Ісака Башэвіса Сінгера, які піша на ідыш. Сінгер сказаў, што калі ў яго часта пыталіся, чаму ён піша на мёртвай мове, яму так і карцела адказаць, што ён піша пераважна аб прывідах, а прывіды якраз і гавораць на мёртвай мове.

... занядбаны стан мовы – ня толькі ірляндзкая праблема. Мовы этнічных меншасьцяў у сфэры ўплываў ангельскай мовы стаяць перад 90%-най пагрозай зьнікненьня на працягу бліжэйшых дзесяцігодзьдзяў...

Сінгераў адказ закрануў вельмі глыбокую струну ў душы яго ірляндзкіх чытачоў. Гэта прыгадала мне, што занядбаны стан мовы – ня толькі ірляндзкая праблема. Паводле меркаваньня моваведа Майкла Краўзэ з часапісу *Language,* мовы этнічных меншасьцяў у сфэры ўплываў ангельскай мовы стаяць перад 90%-най пагрозай зьнікненьня на працягу бліжэйшых дзесяцігодзьдзяў. Таму сёньня, калі найбольшаю праблемай сталася пашырэньне першапачаткова англа-амэрыканскай, а цяпер ужо сапраўды глябальнай поп-монакультуры, якая зводзіць усё да ўзроўню нясьцерпнае нудоты, я думаю, што захаваньне моваў меншасьцяў, як прыкладам ірляндзкай, зь іх унікальным і непаўторным бачаньнем сьвету, было б ня менш важнае для чалавецтва, чым захаваньне трапічных лясоў для біялягічнае разнастайнасьці.

Нядаўна, падчас майго кароткага падарожжа ў Кэры з трыма маімі дачкамі, я спынілася ў свайго брата й ягонай жонкі ў старым доме, які ён адбудоўвае на ўсходнім канцы паўвостраву Дынгл, пад навіслым брывом форту на мысе Кайр Хонры. Брат сказаў, што хоча паказаць нам нешта асаблівае, і вось аднаго дня мы ўсёю гурмой палезьлі ўгору на Дэрымор Глен. І хоць цяпер уся гэтая мясцовасьць абсалютна пазбаўленая ўсіх формаў расьліннасьці, апрача імхоў і лішаёў, самы назоў выдаваў старадаўнюю, даўно памерлую таямніцу: Дэрымор, ад ірляндзкага "Doire Mór", значыць "Вялікая Дуброва".

Цяжка ўявіць сабе больш пустэльнае месца, аднак на паўдарозе да глену, у выгіне лагчыны, дзівосна закручаны й перакрыўлены, падобны на нейкі гіганцкі бансай, стаяў адзіны ацалелы воін, апошні самотны дуб. Толькі на верхніх галінках яшчэ расло лісьце, відавочна, ён дажываў свае апошнія гады, а было яму два або тры стагодзьдзі. Як ён здолеў перажыць масавае чалавечае й жывёльнае спусташэньне гэтага краю за ўвесь гэты час, я ня ведаю, аднак неяк перажыў.

Гэта было самае сапраўднае "bile", сьвятое дрэва, шанаванае кельтамі. Казачнае дрэва. Чароўнае дрэва. Усіх нас гэта вельмі кранула. Мы стаялі моўчкі пад ціхай імжою. Нарэшце 10-гадовая Айшэ сказала: "Можна ўявіць сабе, што тут было, калі гэта й сапраўды была "Doire Mór", уся зарослая дубамі". Я заўважыла, што называю «Cill Cais» – славуты лямант па вялікіх ірляндзкіх лясох і па велічы гэйльскага ладу, які яны сымбалізавалі:

Cad a dhéanfaimid feasta gan adhmad?
Tá deireadh na gcoillte ar lár.
Nil tracht ar Chill Cais ná a theaghlach
is ni chlingfear a chling go brách.

Што рабіць нам цяпер безь лясоў
Калі апошняе з дрэваў звалена.
Не чуваць пра Кіл Каш, ні пра ягоны род,
І не зьвінець ягоным званам ніколі.

Праз тыдзень, калі я вярнулася ў Дублін, пытаньне гэтае ўсё яшчэ гучала ў мяне ўвушшу. Я чакаю каб забраць дзяцей з школы й пішу свой дзёньнік па-ірляндзку ў сучасным гандлёвым цэнтры ў адным з дублінскіх прадмесьцяў. Ніводнага ірляндзкага слова навокал, ніводнае шыльды або аб'явы, ніводнага гуку не злавіць вухам. Вакол мяне – добра апранутыя жанчыны зь бездакорнай ангельшчынай. Мяне інтрыгуюць урыўкі жывое гутаркі, і аднак мяне гняце невыноснае адчуваньне страты. Я згадваю пра самотны пагорак, пра Айшэ. Вось адказ на пытаньне зь песьні. Вось што мы будзем рабіць бязь лесу.

У нечым гэта выглядае быццам бы й няблага. Людзям цёпла, яны не галодныя. Яны бязь цяжкасьцяў выказваюць свае пачуцьці й думкі па-ангельску. Здаецца, яны шчасьлівыя. Я захлопваю дзёньнік і адыходжу, ахопленая тым раптоўным прыступам адчаю, які заўсёды хаваецца ў шораз большых дзірах на лінгвістычным палатне моваў меншасьці. Магчыма, мая маці кажа праўду. Пісаць па-ірляндзку – гэта вар'яцтва. Ангельская мова цудоўная, яна мае яшчэ й дадатковую перавагу ў тым, што вельмі карысная для таго каб на стале быў хлеб і да хлеба. Перамены ў гэтым сьвеце непазьбежныя, і можа натуральным ходам рэчаў наканавана, каб адныя мовы зьнікалі, а іншыя займалі іхнае месца.І ўсё ж, і ўсё ж... Я ведаю, што гэта будзе гучаць да сьмешнага рамантычна й сэнтымэнтальна. І ўсё ж, ня хлебам адзіным... Мы ўзьнялі вочы да пагоркаў... Мы кідаем наш хлеб на воды. Ёсьць мітычныя прэцэдэнты. Вазьміце, для прыкладу, Майсееву маці, падумайце пра яе безвыходную сытуацыю. У яе быў выбар: аддаць свайго сына эгіпэцкім жаўнерам, каб яны ў яе на вачах расьсеклі яго напалам, або пусьціць яго ў кошыку па Ніле на смачнае сьняданьне крокадзілам. Яна выбрала тое, што пры тых акалічнасьцях павінна было здавацца нечым накшталт "rogha an dá dhiogha" ("меншым з двух ліхаў"), а ўсё астатняе апісана ў Кнізе Выхаду і ў аналах гэбрайскае гісторыі, якія сталіся непасрэдным выпікам таго ўчынку, які яшчэ й цяпер, калі я пішу гэтыя радкі, працягваецца непрадказальным ланцужком падзеяў, наканаваных няўмольным лёсам. Я ведаю, што малыя рэчы нельга параўноўваць зь вялікімі, аднак маім канчатковым адказам на пытаньне, чаму я пішу па-ірляндзку, будзе вось гэты верш:

Ceist na Teangan

Cuirim mo dhóchas ar snámh
i mbáidín teangan
faoi mar a leagfá naíonán
i gcliabhán
a bheadh fite fuaite
de dhuilleoga feileastraim
is bitiúman agus pic
bheith cuimilte lena thóin

ansan é a leagadh sios
i measc na ngioleach
is coigeal na mban si
le taobh na habhann,
féachaint n'fheadaráis
cá dtabharfaidh an sruth é,
féachaint, dála Mhaoise,
an bhfóirfidh inion Fharoinn?

Моўнае пытаньне

Я пускаю сваю надзею на ваду
у маленькім чоўне мовы
нібы кладу дзіця
у калыску
сплеценую-зьвязаную
зь лістоў аера
з дном абмазаным
бітумам і смалою

тады пакідаю яго
сярод трысьнягу і рагозу
на самым беразе
ня ведаючы
куды панясуць яго воды
а можа, як Майсея,
уратуе Фараонава дачка?

The New York Times Book Review

Пераклад БКЗ

Зялёны нататнік

Божая кароўка зь Пятае авэню

Уладзімер Арлоў

Як пасьля крышталёвага келіху іскрыстай італьянскай лямбрускі з эратычным букетам захочацца раптам набурболіць кантовую шклянку старадаўскае "саматканкі", як пасьля печаных мідыяў і салаты з амараў у таемных глыбінях падсьвядомасьці народзіцца востpae жаданьне ўкусіць салёнага гурка з прысталым парэчкавым лістом, як пасьля чорнага з шыпшынавым падбоем тому Борхеса ні з пушчы ні з поля заманецца пагартаць празаіка А.Федарэнку, так пасьля прэтэнзіёзных дыярыюшаў, нецьвяроза-гульлівых зацемак на тэатральных праграмках ды розных іншых вычварэнстваў можа бліснуць здаровая ідэя – угрунтаваўшыся за пісьмовым сталом, сварыць нарэшце нешта і зьместам і формаю нацыянальна непахіснае. Праўда, ты ня будзеш, насьледуючы клясыку, лезьці ў ванну й апранаць белую адпрасаваную кашулю, а, насьледуючы самому сабе, купіш дзьве (а леней тры) пляшкі чырвонага балгарскага віна «Рубін», агідным пісклявым голасам нахабна адкажаш на тэлефонны званок, што цябе няма дома, разгорнеш свой зялёны нататнік, нальеш у нябіткую шклянку ад фірмы «Luval» першую дозу і, непрыемна ўражаны спалучэньнем чырвонага й зялёнага колераў, парушыш брыдкую несуладнасьць некалькімі добрымі глыткамі, а прывёўшы колькасьць паўтарэньняў гэтага манэўру ў строгую адпаведнасьць з колькасьцю дзён тваёй вандроўкі, заўважыш, што ў цябе сапраўды атрымаўся замшэла-традыцыйны падарожны дзёньнік.

15.06. Калі на першым курсе ўнівэрсытэту мы былі "на бульбе" пад Койданавам, я жыў у глухога дзеда-бабыля. Першай адметнаю дэталлю інтэр'еру ягонае хаты была этажэрка з адной-аднюткаю кніжкай – «Как закалялась сталь». Другой – рэпрадуктар часоў Малянкова й Кагановіча. Дзедава радыёкропка балабоніла й сьпявала ад ранішняга гімну да паўночнага, прычым заўсёды на максымальнай гучнасьці. Аднаго разу я, ня вытрымаўшы дуэту гаспадаровага храпу й ненавіснай чорнай талеркі, падкраўся да яе й падкруціў рэгулятар. Храненьне імгненна абарвалася, і дзед зусім нясонным голасам растлумачыў мне, што за "радзіву" ён плоціць на ўсю катушку, а таму й гаварыць яна мусіць бесьперапынна. "Ня хочаш спаць, чытай кніжку!" – сказаў дзед і зноў захроп. Змагаючыся з узгадаванай у школе і ў камсамоле, далікатна кажучы, непрыязнасьцю да праграмнай савецкай літаратуры, я ўзяў з этажэркі знакаміты твор М.Астроўскага. Пад абцёрханай вокладкай аказалася Эвангельле.

Пашпартны кантроль у Нью-Ёрскім аэрапорце Кенэдзі зноў змушае ўспомніць хату койданаўскага эвангеліста; над скураной абгорткаю з «Пагоняй» амэрыканскі памежнік знаходзіць тую самую "краснокожую паспортину", але, у адрозьненьне ад свайго калегі зь лёнданскага аэрапорту Хітроў усё ж не выпраўляе ў маёй анкеце "Belarussian" на "Russian".

Першае пытаньне, якое я чую з вуснаў заакіянскіх беларусаў: ці праўда, што нехта восем начэй запар уздымаў над Маладэчанскім гарсаветам бел-чырвона-белы сьцяг?

16.06. У царкве сьвятога Кірылы Тураўскага ў Рычманд-Гіле, Нью-Ёрк, заместа малітвы ўвечары зьнячэўку паплылі менскія "кадры" з Домам ураду да й пасьля рэфэрэндуму. Калі й вы захочаце пракруціць гэтую "хроніку", дык пераканаецеся, што наш сьцяг сапраўды *лунаў*. Гэта было *ягонае* неба, у якое ён імкнуўся, зь якім суладна зьліваўся, нагадваючы бусла, якога за выкапанымі Лукашэнкам намежнымі слупамі ўжо амаль не сустрэнеш. А паспрабуйце ўявіць, каб *лунаў* сьцяг "усенароднапрэзыдэнцкі". Ну што пра яго скажаш? Вісіць, трымціць, трапечацца... Прадчувае свой лёс.

Перад срабрыста-зялёным паралелепіпэдам ААН над Іст-Рывэр на флагштоку пакуль што кожную раніцу ўздымаюць сьцяг, надзелены здатнасьцю лунаць. Яго маленькія бел-чырвона-белыя копіі можна набыць у аанаўскай сувэнірнай крамцы ў выглядзе настольных сьцяжкоў, значкаў і брыжыкаў.

Выбіраючы сабе тавар, па вачох мурына-гандляра заўважаю, што ён яўна чуў нешта пра нашае "лукашэньнічаства". Ці застаюцца гэтыя сьцяжкі нацыянальнымі? – занепакоена пытаецца мурын. Пытаньне сфармуляванае так удала, што я магу, не пазычаючы ні ў кога вачэй, запэўніць візаві, што застаюцца, а каб адказ прагучаў больш важка, прашу яшчэ дзясятак "падрыўных" брыжыкаў.

У касманалітычным Нью-Ёрку (у глыбінцы любая традыцыя трыкроць мацнейшая) на кожным кроку сустракаесься з культам амэрыканскага сьцягу. Дагледжаныя зорна-паласатыя палотны зьвешваюцца з падваконьняў, аздабляюць дахі, вітрыны і ўваходы ў офісы. Каб у Менску ці ў Полацку я ўбачыў столькі чырвона-зялёнай тканіны, дык заставалася б адно намыліць вяроўку. Аднак гэткая сьмерць мне не пагражае. Ці здольныя вы ўявіць здаровага грамадзяніна Рэспублікі Беларусі, які на досьвітку ўрачыста ўздымае прэзыдэнцкі сьцяг каля свайго дому, а ўвечары ня менш урачыста спускае яго ў промнях нізкага сонца?

Між тым другую цырымонію я зноў і зноў назіраю з аўтамабілю, за рулём якога – мой даўні знаёмец, жыхар штату Пэнсільванія Васіль Мельяновіч. У зеленаватай смузе адплываюць назад падобныя да зробленай Гулівэрам выцінанкі сілуэты манхэтанскіх хмарачосаў. Мы едзем да Васіля ў амэрыканскі Гановэр. Сёе-тое пра адносіны майго кіроўцы да Беларусі могуць сказаць драбніцы: два цыфэрбляты на гадзіньніку, стрэлкі якіх паказваюць час з разьбежкаю на сем гадзінаў...

Калі хтосьці мяркуе, што самая кансэрватыўная ў заходнім сьвеце краіна – гэта Вялікабрытанія, дык паездка па амэрыканскіх аўтастрадах моцна пахісьне гэтую упэўненасьць. У адрозьненьне ад уладаньняў яе вялікасьці каралевы, тут вы нідзе не сустрэнеце ні дарожных паказальнікаў з кіламэтрамі – суцэльныя мілі (а на гольфавых плацоўках – ярды й інчы), ні бэнзазаправак з коштамі за літар. Як вам ня проста ўцяміць, што такое галён, так ня кожнаму тубыльцу ўтлумачыш, што такое кіляграм. Пра тэмпэратурную шкалу Цэльсія ён нешта чуў, але карыстаецца выключна градусамі паводле Фарэнгейта, збольшага знаёмымі нам дзякуючы раману Рэя Брэдбэры, што, як мне памятаецца, некалі зьбіраўся пасьля пяцідзесяці гадоў канчаць жыцьцё самагубствам, бо лічыў, што за гэтай мяжою жыць мужчыну ўжо проста нявартa, але вось пасьпяхова жыве далей, маючы магчымасьць гэтаксама, як і мы, са смакам павячэраць на мяжы штатаў Дэлявэр і Мэрыленд, і выпіць кубачак кавы на мяжы Мэрыленду з Пэнсільваніяй.



Амстэрдам

Працяг в старонкі 19

Калі ты ведаеш Менск лепей за астатнія гарады сьвету, дык я скажу так: Амстэрдам падобны да Траецкага Прадмесьця. А розьніца толькі ў тым, што калі ты набудзеш дыямэнт у Траецкім Прадмесьці, дык не атрымаеш ніякага дакумэнта. На прас, на вэнтылятар, на магнітафон і на электрычную брытву выдадуць пашпарт, а на дыямэнт – толькі чэк. І калі па вяртаньні з Галяндыі я зайшоў у «Антыкварную лаўку», што на вуліцы Максіма Багдановіча, я спытаў, ці сапраўдныя на вітрыне дыямэнты, а гандлярка сказала, што, вядома, сапраўдныя, а я запытаўся, ці ёсьць на камяні дакумэнты, а гандлярка азьлілася й сказала, што яна ні разу ў жыцьці ня бачыла, каб да каштоўных камянёў прыкладаўся нейкі там пашпарт. Тады я сказаў у атынкаваны танажам і пудраю твар, што яна, у такім разе, ніколі ў жыцьці ня бачыла сапраўдныя каштоўнасьці. Ня верыш? Можаш спытацца ў майго брата, я ніколі ня хлушу. Думаю, што й гандлярка з Траецкага Прадмесьця не падманвала, яна сапраўды ведаць ня ведала пра пашпарты на дыямэнты.

Зрэшты, я й сам быў у музэі дыямэнтаў толькі адзін раз, але гэта зусім не азначае, што не хачу туды трапіць паўторна. Тое-сёе ў дыямэнтавым бляску для мяне засталося таямніцаю і пасьля наведаньня музэя, бо кола ведаў павялічылася й адпаведна ўзрасла колькасьць кропак судакрананьня зь невядомым. Празь невядомае, дарэчы, лягчэй прабірацца з павадыром. Быў у Амстэрдаме ў мяне павадыр-экскурсавод-перакладчык-армянін-таўстун-пустаслоў-Андранік. Ён нагаварыў цэлую гурбу розных лухты, вычытанай у танных геаграфічных даведніках. Зь яго сыпаліся лічбы й назовы, як соль зь дзіравага меха. Ён выціраў сіні нос брудnай хустачкай і скардзіўся на падатковую інспэкцыю, якая можа арыштаваць грамадзяніна Нідэрляндаў нават на аўстралійскім пляжы, і той не пасьпее схаваць дакумэнты. Андранік вельмі хутка надакучыў, але давялося трываць, грошы ж заплочаны.

Нарэшце армянін прывёз мяне з братам у музэй дыямэнтаў. Калі ты думаеш: там палац у сто дзьвярэй, дык памыляесься. Чатыры чатырохпавярховыя дамкі, але ў гэтых дамках на дыямэнты я нагледзеўся.

І куды толькі глядзяць розныя рабаўнікі? Праўда, Андранік расказаў нам пра аднаго амстэрдамскага злодзея. Той, абрабаваўшы краму, трапіў на мушку паліцыянткі, але не разгубіўся, забраў зброю й навешаў паліцыянтцы кухталёў, забіваць ня стаў, адно памясіў кулакамі, дзеля навукі. Пасьля сеў у машыну і ўцякаў, але яго злавілі і, дзеля навукі ўсім астатнім непаслухмяным крымінальнікам, увагналі ў сьмяротнае цела васямнаццаць куляў. Журналісты паспрабавалі разгарнуць кампанію пра парушэньне правоў чалавека, але з такіх памкненьняў нідзе нічога не выгарае. У апавяданьні армяніна мяне зьдзівіла ня колькасьць куляў у рабаўніковым целе, а пазыцыя апавядальніка. Андранік заўсёды заставаўся на баку дэмакратычнага друку. Напэўна ўсе народжаныя на берагах СССР ня любяць міліцыянтаў, паліцыянтаў, цэнтурыёнаў і ніколі не займаюць іх бок, нават у тых выпадках, калі паліцыянт – жанчына. І яно мне зразумела. А паглядзеў бы я на таго ж армяніна, калі б ён меў уласны музэй дыямэнтаў. Які б бок ён займаў?.. Вось і я пра тое думаў, заходзячы ў музэй.

На першым паверсе стаяў станок па апрацоўцы каштоўных камянёў узору сямнаццатага стагодзьдзя. Высокі лысаваты блясдын з марскімі галяндзкімі вачыма сказаў, што станок каштуе столькі, колькі машына «фэрары» апошняй мадэлі. Я ня ведаю, колькі каштуе «фэрары», але, думаю, шмат, калі гэтым хочуць зьдзівіць наведніка музэя каштоўнасьцяў. Станок быў відавочна стары й цёмны, як лёс прыгоннага беларуса. А выглядаў ён, як непрыстасаваная да жыцьця ў цывілізаваным сьвеце пачварная жывёліна. Станок мяне крануў. На гэта й быў тонкі галяндзкі разьлік, я паверыў у сапраўднасьць убачанага. Побач з старажытным станком гулі восем сучасных, за адным зь якіх сядзеў зусім сівы майстар і апрацоўваў камень. Сучасныя станкі ніякай эстэтычнай каштоўнасьці не ўяўлялі, таму вельмі хутка я апынуўся на другім паверсе, за доўгім шкляным сталом з празрыстымі кубачкамі ласкава прананаванай гарбаты. Сьветлавокі амстэрдамец маляваў на вялікім белым аркушы розныя формы дыямэнтаў, а потым даставаў з скрыначкі капэрты, а з блакітных капэртаў выкочваў дыямэнты й раскладаў іх пінцэтам на малюнках. На тупаватае пытаньне "А колькі каштуе самы вялікі, самы блакітны, самы чысты дыямэнт з тых, што ляжаць на аркушы?" я пачуў даволі важкую лічбу – дваццаць пяць тысячаў гульдэнаў. Праўда, ня самы найлепшы, а зусім жоўты камень, каштаваў яшчэ на пяць тысячаў даражэй. Я склаў у думках коштy раскладзеных на стале каменьчыкаў, і атрымалася чвэрць мільёна ў гульдэнах, а ў беларускіх рублях яшчэ ў сем тысячаў разоў болей. За жыцьцё не патраціш, калі ня будзеш таўчы ў ступе й сыпаць вострыя аскепкі ў стравы ворагаў.

Жаданьня схапіць камяні і ўцячы не ўзьнікала. Розум вельмі ясна падказваў: схапіць можна, уцячы нельга. Пэўна адсюль і прарасло памкненьне пагаварыць пра набыцьцё каменя. Крый Бог, я не пачаў з прапановы - давайце я набуду жоўты дыямэнт. Я ціхенька, па-жыдоўску спытаў: "А хто набывае такія каштоўныя й дарагія камяні?" "Японцы!" Можна было й здагадацца.

У Амстэрдаме куды ні пойдзеш, паўсюль японцы. У іх маленькія выспы, мала месца і няма дзе захоўваць грошы, а тут раз і мільён гульдэнаў у адной скураной пудэлцы. Кампактна, па-японску і па-нідэрляндзку, дарэчы. У нідэрляндцаў і японцаў ёсьць агульны вораг – мора, і яны стагодзьдзе за стагодзьдзем змагаюцца зь ім. На першы погляд, у беларусаў ні зь японцамі, ні зь нідэрляндцамі ніякіх агульных рысаў няма, бо ў нас няма мора. Але, калі прыгледзецца, дык і ўбачыш. І японцы, і нідэрляндцы, і беларусы занепакоеныя станам, статусам, чысьцінёю роднай мовы, якую ўвесь час трэба ахоўваць ад хваляў суседніх моўных стыхіяў. У названых народаў нацыянальнае пытаньне абавязкова ўвязваецца з станам мовы. Таму і армяне і гэбрэі, якія пасяліліся ў Амстэрдаме, першае, што робяць пры сустрэчы з былымі суайчыньнікамі, гэта заводзяць гутарку пра складанасьці ў вывучэньні тамтэйшых словаў, і пра ўласныя посьпехі ў гэтай нялёгкай справе. Не раўнуючы менскія армяне й гэбрэі, што спрабуюць вучыць беларускую мову, якая ўпарціцца, не дасцца, трансфармуецца з адной граматыкі ў другую. І як яе такую неакрэсьленую вывучыш? А так як і японскую зь нідэрляндзкай, паціху-патроху. Экскурсавод Андранік, да прыкладу, склаў нідэрляндзка-армянскі слоўнік і атрымаў званьне доктара, пра што паведамляў усім па тры разы, нават у музэі дыямэнтаў уставіў некалькі сказаў пра слоўнік. А пакуль ён пахваляўся слоўнікам, я сасьпеў, каб набыць дыямэнт.

Сапраўды, калі я ў Амстэрдаме – сталіцы дыямэнтаў, калі столькі ведаю пра камяні, калі... Толькі, я цябе папярэджваю, не гавары пра гэта маёй маме. Прыйдзе час, і я сам усё раскажу.

"Я хацеў бы набыць два дыямэнты на тры тысячы гульдэнаў!" – сказаў я гандляру з марскімі вочкамі. Ён узрадаваўся. А вось Андранік папярхнуўся гарбатаю. "Ты што, сапраўды будзеш купляць дыямэнты на тры тысячы?" "А чаму б і не? Я ж у Амстэрдаме, у сталіцы каштоўных камянёў". Вядома, можаш не паверыць, што так проста вырашаецца набыцьцё дыямэнтаў. Можаш засумнявацца. Тады спытай у майго брата, які адразу прыняў прапанову, без усялякіх ваганьняў. Сапраўды, нашто тут вагацца, калі на белым аркушы паклалі два ясныя дыямэнты. Застаецца толькі дастаць грошы. Але ў Нідэрляндах прынята патаргавацца. "Таргуйцеся!" – засіпеў армянін і так выразна вырачыўся, што ў мяне мову адняло. Ну як я буду таргавацца? А галяндзец нахвальваў

17.06. Вынікі падарожжа па заснаваным землякамі Гётэ й Шылера ўтульна-двухпавярховым Гановэры падводзяцца ў швэдзкай рэстарацыі: 8$ за ўваход, і маеш права, нічога больш ня плоцячы, не выходзіць, пакуль ня зробіцца млосна. Мяркуючы па аб'ёмах добрай паловы наведнікаў, менавіта такім чынам яны й звыклі бавіць свой вольны час.

Едучы па спадзістых, як у нас на Наваградчыне, зялёных пэнсільванскіх узгорках, гаворачы з спадарожнікам па-беларуску, слухаючы касэтку з запісамі фальклёрнага гурта «Янка», сустрэтага спадаром Васілём у падземным пераходзе каля Камароўкі, ловіш сябе на тым, што ты ўжо неўпрыкмет прыняў існаваньне гэтае ідэальнае Беларусі з кандыцыянэрамі ў машынах (на вуліцы 90° паводле Фарэнгейта) і «Макдональдсамі» на ўзбочынах як рэальнасьць і пасьпеў досыць выгодна ўладкавацца ў ёй.

У доме ў Мельяновіча ілюзія адно мацнее: беларуская бібліятэка, калекцыя ручнікоў, абразы, беларуская мова ў тэлефоннай слухаўцы... Апрача ўсяго іншага з пошты прывозяць пульхную капэрту беларускае пэрыёдыкі. Як у дзіцячай гульні, наўздагад выцягваеш адтуль 4-ты нумар менскага часопісу «Беларуская думка», наўздагад разгортваеш яго, і на зьмену ілюзійнай Беларусі прыходзіць рэальная, што прамаўляе да мяне голасам паэта Б.Спрынчана:

Что ему хулители? Ничто!
Он в сознанье поколений врос,
И в своем простреленном пальто
На ветрах маячит, как Христос.

Узгадаўшы лёзьненьскі інцыдэнт з замахам на кандыдата ў народныя прэзыдэнты, можна падумаць, што гэта пра Аляксандра Рыгоравіча. Аж не, пакуль што пра Леніна. Цалкам здаволены першым творам Апалён ужо ня кліча творцу да новай сьвятой ахвяры, але паэт не дазваляе сабе палёгкі й спрабуе яшчэ раз авалодаць музаю. Тая бароніцца, колькі змогі, словы разьбягаюцца з радкоў, быццам прусакі, аднак задыханы, распалены высокім грамадзянскім пачуцьцём творца ўсё ж дамагаецца свайго.

Тем, что вижу, наполняю строки;
В Смиловичах, Лельчицах, Ушачах
Вкалывает каменщик на стройке,
Тракторист на пахоте ишачит.
А у водоемов Беларуси
Хищники гнездятся хорошенько.
Кто они? – дознаться не берусь я,
Если не поможет Лукашенко.

Браво, товарищ стихотворец! Колькі сапраўднай выпакутаванай паэзіі ўжо ў адных толькі "водоемах Беларуси"!

18.06. Ваколіцы Вашынгтону нагадваюць краявіды, што плывуць за вакном цягніка, калі пад'яжджаеш да Вільні з боку Новае Вялейкі: зялёныя асмужаныя горы, яры й нават гатычныя сьпічакі.

Пасьля Нью-Ёрку горад выдае правінцыйным – не раўнуючы, як пасьля Менску Слуцак. Беларускае пасольства на вуліцы Нью Гэмпшыр, 1619. Праз пару кварталаў вуліца перакрытая паліцыяй: дэманстрацыя сэксуальных меншасьцяў. Наперадзе гурма жыцьцярадасных гомасэксуалістаў зь вясёлым гіканьнем цягне зладжанага з блакітных і бэзавых паветраных шарыкаў даўжэзнага, ярдаў на пятнаццаць, цмока. Шчыльнымі шыхтамі праходзяць стройныя хлопцы ў жаночых сукенках. Газуюць у бок Белага Дому актыўныя лесьбіянкі на зіхоткіх «Ямахах» і «Хондах». Прагарцавала тройка мазахістак, запрэжаных у каляскі са сваімі садысткамі. Туга падперазаўшыся навюткім калючым дротам, засяроджана прадэманстравалі мужчыны-мазахісты ў сталёвых аброжках з кольцамі для ланцугоў. На ўзьбярэжжы гэтай бясконцай ракі гетэрасэксуальны глядач трапляе ў абладу непрытульнага адчуваньня, што сэксуальная меншасьць – гэта не дэманстранты, а ён сам. Каб пазбыцца дыскамфорту, публіка пачынае адпускаць зьняважлівыя рэплікі наконт таго, што вашынгтонская працэсія – гэта дрымучая самадзейнасьць. Маўляў, сапраўднае сьвята "блакітных" будзе сёньня ў Нью-Ёрку: там і алімпійскі чэмпіён у скачках у ваду Грэг Луганіс, і таварыства садамазахістаў імя Уленшпігеля, і нацыянальныя калёны гасьцей з усіх куткоў сьвету.

(Вечаровыя тэлепраграмы цалкам пацьвердзілі прагнозы. Сьвята набыло такое разгарненьне, што газэта «Новое Русское Слово» пісала: "Городские власти дали голубым потачку и позволили им маршировать мимо собора Св.Патрика, где от демонстрантов ожидали выходок типа прошлогодних и заготовили поэтому охапки пластиковых наручников и стопки желтых одеял для немеденного покрытия оголившихся. Когда мы подошли к собору, там было столько полиции, как будто приехал папа римский или Клинтон; если бы у Зимнего было столько ментов в октябре 17-го, всем нам не пришлось бы мучиться на чужбине".)

Нягледзячы на тое, што ў гады студэнцтва мне давялося ўдзельнічаць у крутой разборцы з мурынамі, я так і не зрабіўся перакананым расістам. Таму маё сьведчаньне будзе каштоўнейшае, чым у якога-небудзь ку-клукс-кланаўца: калі вы раптам заўважыце, што вакол брудна, што ходнікі густа запляваныя, а з будынкаў абсыпаецца тынк, што жанчын не прапускаюць наперад, а на другім пляне кагосьці прыціскаюць да сьцяны – ведайце, што трапілі ў чорныя кварталы. Там белыя не жывуць і бяз скрайняй патрэбы стараюцца не зьяўляцца.

Вяртаючыся з Вашынгтону, зварочваем з аўтастрады ў Балтымор, дзе на паркінгу каля затокі машына з мурынамі, ігнаруючы доўгую чаргу, сходу заяжджае на вольнае месца, і тэма дачыненьняў чорных і белых атрымлівае працяг. У прыватнасьці, я даведваюся пра існаваньне ў Балтыморы раёну пад назовам Little Italy (Маленькая Італія), які тутэйшыя мурыны абыходзяць за мілю, бо апрача звычайнай паліцыі сваю службу бясьпекі мае там і Коза Ностра.

19.06. Ці былі ў малых цялятак з саўгасу «Гарадзец» Шклоўскага раёну, дзе кіраваў да свайго прэзыдэнства А.Р.Лукашэнка, вось такія індывідуальныя буданчыкі? Але ж і жартаўнік вы, спадар Мельяновіч!

Ну а калі вы цалкам паважна зьбіраецеся падкінуць экс-дырэктару ідэю адправіць усіх беларускіх дэпутатаў, што галасуюць супраць прыватнай уласнасьці на зямлю, на пару тыдняў у ЗША, дык я гэтаксама паважна прапаную вам неадкладна патэлефанаваць з гэтае нагоды ў Вярхоўную Рэзыдэнцыю ў Менск. Што з гэтага атрымаецца, вам распавядзе беларускі пісьменьнік з Таронта Кастусь Акула, які спрабаваў тактоўна пацікавіцца, чаму прэзыдэнт не павіншаваў з Днём Перамогі беларусаў, што ваявалі з фашызмам у войсках хаўрусьнікаў і жывуць цяпер у Заходнім паўшар'і.

Тэлефанаваць мы, напэўна, возьмемся ўвечары, а пакуль едзем на тутэйшы аўкцыён. У будынку былой станцыі з масіўнымі бэлькамі і пацямнелай ад часу й колькасьці разьлітага віскі стойкаю бара, дэманструючы даўнія беларуска-амэрыканскія культурныя сувязі, самі сабою вынырваюць з памяці героі полацкага фальклёру часоў майго дзяцінства – трое неразлучных каўбояў, якія невылазна сядзелі ў салуне ў аднавокага Гары. Працяг вы, магчыма, таксама памятаеце:

Вдруг заходят туда
Человек восемнадцать
И ковбоям они
Предлагают убраться.

Мы сьпявалі пад гітарны акампанэмэнт майго сябра Вовы Цымермана, і нашыя кулакі наліваліся мужнасьцю, рыхтуючыся да новых сутычак з нашымі заклятымі ворагамі з Задзьвіньня, дзе густа стаялі вайсковыя часткі і рэй вялі афіцэрскія сынкі, якія называлі моркву "морковью", а адвечных дзьвінскіх курмялёў "пескарями".

Аўкцыённая публіка ўражвае сваёй стракатасьцю ня менш за выстаўлены тавар: шыкоўныя кандэлябры з Расеі часоў Аляксандра II і блізка знаёмыя з мольлю старасьвецкія капялюшыкі, недабітае кухоннае начыньне й антычная манэта, стракатыя пэнсільванскія посьцілкі зь нямецкім радаводам і замытыя мужчынскія майткі з расьцягнутымі гумкамі, якія ў нас у Полацку называюць проста "сямейнымі".

Я разгортваю на каленях 6-ты нумар часопісу «Вестник». З гэтага балтыморскага выданьня вы ўведаеце безьліч карыснага: вось кароль азартных гульняў Дональд Трамп абвяшчае пра цяжарнасьць роднае жонкі; вось тэкст вашынгтонца Міхаіла Гольдэнбэрга пра тое, як К.Бальмонт з І.Севяранінам на эміграцыі выпрошвалі грошы ў Сяргея Рахманінава; вось інтэрвію зь літаратарам Ю.Дружнікавым, што здабыў сла-

Працяг на старонцы 26



камяні. Яны й чыстыя, яны й іскрыстыя й каштуюць зусім танна, усяго толькі тры тысячы і васемсот гульдэнаў, і залатыя пярсьцёнкі дадаюцца бясплатна. Ёсьць, ёсьць у Амстэрдаме крама, дзе золата даюць бясплатна! Нездарма Галяндыя з сваім багацьцем была ў эўрапейцаў правобразам раю зямнога. Золата бясплатна! Ня можа быць? Можа! "І яшчэ, калі вы вернецеся ў музэй дыямэнтаў, дык заўсёды можаце вярнуць камень, ці здаць, даплаціўшы, атрымаць лепшы, бо ўкладаньне грошай у дыямэнты ёсьць адна з найлепшых формаў інвэставаньня".

– Я, вядома, ня супраць такіх інвэстыцыяў, нават за, але ў мяне толькі тры тысячы і ні цэнта болей. А яшчэ я хацеў бы, каб дыямэнты замацавалі не ў жаночыя пярсьцёнкі, а ў гузікі, якія можна прышыць на ўрачыстую кашулю.

Амстэрдамец саступіў васемсот гульдэнаў і замовіў залатую аправу ў выглядзе круглых гузікаў. Беларус не саступіў бы столькі, бо яшчэ ня ведае, як будаваць гандлёвыя пасткі, а галяндзец ведае. Ён ня проста прадаў дыямэнты, а прадаў іх на экспарт, а таму й дзешавей, бо падаткі меншыя.

Праўда, давялося пасылаць з гатэля ксэракопіі білетаў «Амстэрдам-Менск» і плаціць за паслугу два гульдэны, ну ды Бог зь імі, бо гузікі з дыямэнтамі ляжалі ў нашых кішэнях. І можна было лічыць, што ўсе справы зробленыя, бо грошы сплылі. А няма грошай, і праблемаў няма.

Ідзеш сабе па вуліцы Молен, і ўсё табе – нішто. І хай розныя мурыны прапаноўваюць какаін і крычаць: "Італьяно кока!" А пачуўшы "ноў", кінуць усьлед "албано". Яны, наіўныя, думаюць, што абразілі, абазваўшы албанцам. Ці ня дзіўна, нэгар зьневажае славяніна, называючы албанцам. Ды хоць жыдам ці латышом называй, не пакрыўджуся. Я – беларус і маю трывалы імунітэт да нацыянальных зьнявагаў. І калі заклікальнік на ганку стрыптыз-тэатру закрычаў: "Рускі! Горпочофф! Епля! Пэрэстроіка!", – я засьмяяўся і падумаў: праз тыдзень-другі гэты сыты заклікальнік пачне крычаць да беларусаў: "Рускі! Ельцын! Чэчня! Біг банан! Захоці-і!"

У Амстэрдаме зь мяне вельмі хутка выцяклі нацыяналістычныя, панславянскія і расісцкія настроі. Не скажу, што ў Менску я зацяты расіст. Зусім не. Але, каб ня быць расістам, трэба хоць бы зрэдзь часу сутыкацца з прадстаўнікамі іншых расаў. А то раз на год праедзеш з нэграм у трамваі, вось і ўсе міжрасавыя адносіны. А ў Амстэрдаме зусім ня так, бо на кожным другім кроку, у кожнай другой вітрыне пабачыш іншую ад сябе расу.

У сталіцы Нідэрляндаў ёсьць цэлы раён, дзе ў шкляных вітрынах выстаўляюцца жанчыны. Яны сядзяць на тонканогіх крэслах, яны стаяць на высокіх абцасах, яны прытанцоўваюць і аблізваюць языком паўадкрытыя вусны, яны падміргваюць і заклікаюць займацца просьценькім задавальненьнем. Вітрыны асьвятляюцца чырвонымі й фіялетавымі лямпамі. Таму раён называецца «Квартал чырвоных ліхтароў». Таму белая бялізна там выглядае як смарагдавая. Таму на целе не відаць ні сінякоў, ні драпінаў, ні кровападцёкаў. Усё нерэальнае, як у тэатры, як на тэлеэкране, як у пекле. І можна гадзінамі хадзіць па вузкіх вулках паўз каналы й разглядаць жанчын. І кожны наступны ліхтар будзе здавацца прывабнейшым. А калі наважысься спыніцца на якой з жанчын, дык не пасьпееш і вокам міргнуць, як цябе апярэдзіць які-небудзь спрытны мурын. Але ён ня выкліча хвалі расісцкіх перажываньняў, бо кожная трэцяя прастытутка ў амстэрдамскіх вітрынах належыць да жоўтай расы, а кожная другая – да чорнай. Таму ты пойдзеш далей і панясеш сваё гарачае, па-юначы моцнае хваляваньне ад вітрыны да вітрыны, ажно пакуль не спахопісься й не зірнеш на гадзіньнік і ня ўбачыш, што распачаліся новыя суткі, і варта спыняцца на любой жанчыне, або вяртацца ў гатэль «Краснапольскі». А каб зьдзіўляць показкамі сяброў, ты выбераш мажную, на сем пудоў нэгрыцянку. Яна пагодзіцца маркітавацца за дваццаць пяць гульдэнаў і завядзе цябе ў маленечкі пакойчык з ложкам, за якім на ўсю сьцяну будзе глыбока цямнець люстэрка. Цябе зьдзівяць жалезныя скрыні з навяснымі замкамі, там, пэўна ж, пахаваныя каштоўныя рэчы цёмнакрылых начных матылёў. Ты аддасі ружовую грашовую паперку й скінеш нагавіцы з майткамі. Ты ня будзеш гаварыць. Нашто? Ты падыйдзеш да рукамыйніка, паслухаўшыся запрашальнага жэсту мажнай нэгрыцянкі. Яна памые твой прыўзьняты чэлес цёплай вадой, абатрэ яго папяровай сурвэткаю й нацягне кандом. На імгненьне ты адчуеш халодны водар адэкалёну, табе здасца, што навокал цырульня, у якой перагарэла верхняе сьвятло. Такая будзе будзённасьць, што нават ня зьдзівяць паводзіны цёплай мурынкі, якая ляжа на сьпіну, распахне сьцёгны, але ня скіне стракатыя пантофлі. Вядома, у Амстэрдаме чыстыя вуліцы, таму можна класьціся ў ложак, не скідаючы пантофляў. Паразважаўшы, я, праўда, ня стаў абувацца і лёг на мурынку без чаравікаў. У

Працяг на старонцы 26

Божая кароўка зь Пятае авэню

Працяг з старонкі 25

ву як аўтар кніжкі "Вознесение Павлика Морозова" (самыя цікавыя мясьціны інтэрвію – прызнаньне, што "по национальности я интеллигент" і цытата з К.Чапека, дзе крытык кажа пісьменьніку: "Вы павінны пісаць так, як пісаў бы я, каб умеў").

Чакайце-чакайце, а гэта што?! БНФ, Сяргей Антончык, Зянон Пазьняк, "который в чем-то очень похож на Гамсахурдия, Дудаева и Жириновского вместе взятых"... Гэта Іосіф Калюта (Менск) і Уладзімер Левін (Нью-Ёрк) знаёмяць навакольную расейскамоўную публіку з А.Лукашэнкам і нашымі палітычнымі заварушкамі. Дзякуючы адначасоваму погляду з розных бакоў акіяну сытуацыя набывае вусьцішную стэрэаскапічнасьць, і беларускага чытача чакаюць адкрыцьці, якіх ніяк ня зробіш, невылазна седзячы на айчынных кухнях. Мы чулі, напрыклад, толькі пра аднаго дэпутата Навумчыка, а на ўсходнім узьбярэжжы Атлянтыкі, высьвятляецца, што іх – двое: "Координатор парламентской оппозиции Белорусского народного фронта Сергей Наумчик не устает повторять, что БНФ политику первого президента не приемлет. Другой депутат – бывший идеологический секретарь Витебского обкома партии Иосиф Наумчик – хочет помочь президенту. Два Наумчика, два депутата, стоящие по разные стороны политических баррикад – отец и сын. Помните, мы еще песню такую пели вдохновенно: "И нельзя сыновьям отставать от отцов хоть на малость, потому что идут по дороге отцов сыновья". – "Не идут!" – скрушліва канстатуе «Вестник». Але ўсе дробныя выдаткі такога кшталту блякнуць у параўнаньні з загалоўкам артыкулу: «Лука Мудищев – резидент российской разведки». Як кажа ў хвіліны натхненьня мой знаёмы пісьменьнік Вінцэсь Мудроў: "Ну, кенты, трымайце мяне..."

20.06. Хоць уначы, далібог, нічога такога ня сьнілася, чамусьці прачынаюся з захраслымі ў памяці словамі Калігулы: "Вы ніяк не зразумееце, што я чалавек просты".

Пасьля гарбаты й бліцоў з кляновым сіропам я адлятаю з Балтымору ў Кліўленд. Па дарозе ў аэрапорт спыняемся ля катэджу з шыльдачкай: Leon Kavalov. Барадаты й дабрадушны, у шортах і футболцы, беларускі старавер Лёва вядзе нас у акуратны да стэрыльнасьці садок, дзе пад адцьвілаю лінай стаіць стол з двума крэсламі. Краявід аздабляюць амаль дэкаратыўныя грады з памідорамі, бурачкамі, рэдзькай і пасакам валошак.

Увечары я ўжо буду сядзець над лінаю ў Стронгсвіле пад Кліўлендам, штат Агаё. Мае гаспадары зь беларускага культурнага цэнтру «Полацак» успомняць, як спачатку хацелі назваць свой цэнтар «Палесьсем», бо, на іх думку, самай дзейснай часткаю беларускае эміграцыі заўсёды былі палешукі, а я, пацягваючы ледзяное піва, раскажу, як у той час, калі яны будавалі тут храмы і вучылі дзяцей у беларускай школе, у нас, у беларускім Полацку, прыежджая набрыдзь гадавала ў запядбаным Крыжаўзьвіжанскім саборы сьвіньняў, а беларускую мову ў маёй клясе вывучала восем чалавек з трыццаць двух. Пад нагамі будуць дасьпяваць суніцы. Над азярынаю мякка расьсьцелецца туманец. З высокай травы, наставіўшы рудавата-шэрыя вушы, да размовы будзе прыслухоўвацца тутэйшы нацыяналістычна настроены трусік. Вавёркі, як і належыць жанчынам, будуць цікавіцца палітыкаю значна менш. А яшчэ менш зацікаўленьня выявіць нейкі падобны да хамяка дробны зьвер, які будзе тупа глядзець на нас, нагадваючы прадстаўніка той часткі электарату, што год таму дружна галасавала за таную гарэлку і тэлевізар зь лядоўняю за кошт індэксацыі ўкладаў, а потым вуснамі майго вечна п'янога серабранкаўскага суседа Каміntэрна пасьля імгненнага падаражаньня яго самага запаведнага прадукту харчаваньня казала мне "Пікаму, Воўка, няльзя верыць, пікаму", і верыла далей, і цягнулася 14 траўня 1995 году на выбарчыя ўчасткі раней за ўсіх – пахмяліцца й аддаць свае галасы, каб мы хутчэй дасягнулі таго жыцьця, якое ў нас ужо было.

21.06. У кліўлендзкай царкве Жыровіцкай Божай Маці вісіць сьпіс з 128 прозьвішчамі дарослых прыхаджанаў. Сцэну прыцаркоўнае залі некалі размалявала ў духу французскага мытніка Анры Русо беларуская дзяўчынка Ліда Лазар. Зубры, бярозавы гай, палоска жыта, маці зь дзіцём на каленях. У руках у малога сьцяжок накшталт таго, што на футбольным матчы Беларусь-Галяндыя пасьля рэфэрэндуму адабраў у майго малодшага сына менскі міліцыянт з «Пагоняю» на кукардзе. Найбольшай праблемаю было намаляваць хаты, бо юная мастачка нарадзілася ўжо ў эміграцыі. Хаты атрымаліся адметныя: гібрыды ўкраінскіх мазанак і таіцянскіх бунгала з палотнаў Гагена.

Кліўленд вылучаецца ці не найбольшай у ЗША колькасьцю жыхароў-перасяленцаў з Усходняе Эўропы. У гэтым яшчэ раз пераконваесься ў гарадзкой публічнай бібліятэцы, дзе існуюць прыстойныя зборы кніжак на польскай, літоўскай, харвацкай, украінскай ды тузіну іншых моваў. Высокі стэлаж з сотнямі беларускіх кніжак. Незабымная ўкраінка ў вышыванцы, адрываючыся ад кампутару, тлумачыць, што набыцьцё кожных 60 беларускіх выданьняў робіцца падставаю для выпуску інфармацыйнага бюлетэню. Затрымліваюся каля кніжак кліўлендца Аўгена Калубовіча.

Ягоны апошні зімны прыстанак я знаходжу на мясцовых могілках сярод іншых надмагільляў зь беларускімі прозьвішчамі. Карніловіч, Лук'янчык, Дурэйка, Гасьцееў. На помніку пісьменьніку – выява крыжа сьвятой Еўфрасіньні. Пад датамі жыцьця можна прачытаць: "Wife Inna 1906 – ". "Wife Inna" – гэта ўдава Іна Каханоўская (яна ж – пісьменьніца Аляксандра Саковіч).

Спадарыня Іна ставіць на стол яблыкі й памаранчы. Невялікая розьніца ў гадох усё ж дазволіла нам трапіць у адну часавую "капсулю". Мы абое былі знаёмыя з гісторыкам Міколам Улашчыкам, а ў яе родных Ярэмічах я вудзіў рыбу, калі плыў зь сябрамі ад вытокаў Нёману да Балтыкі. Мы з гаспадыняю вучыліся на адным факультэце БДУ; праўда, яна – у Пітэты й Доўнар-Запольскага, а я – у Абэцэдарскага. Што там у Менску? Апошнія падзеі, вядомыя з ранішняга званка дахаты, – забарона канцэрту беларускіх рок-гуртоў, ладжанага з нагоды Купальля ды ўгодкаў разгону радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная».

Пад'яжджаючы да яшчэ аднаго кліўлендзкага беларускага дому – сакратара часопісу «Полацак» Міхася Белемука й ягонай жонкі вядаўняй мянчанкі Тамары (сёньня яна якраз атрымала зялёную імігрыйную картку і з гэтае нагоды нас чакае ружовае каліфарнійскае шампанскае) – знаёмлюся з узорам мясцовага беларускага гумару. Шараговы жыхар Кліўленду Міхась Рагуля пасьля грунтоўнага наведваньня бару сядае за руль і выпраўляецца дахаты. "І ты, Міхась, у такім выглядзе едзеш?" – спыніўшы яго, дакорліва пытаецца тутэйшы палісмэн, таксама беларус. "А ты, Пятро, хочаш, каб я ў такім выглядзе ішоў?" – адказвае наведнік бару.

22.06. Афіцыйная сустрэча з "палачанамі". Прысутнічае дваццаць пяць чалавек плюс пара вавёрак плюс камарочка. Чытаю сваё напісанае ў 1990-ым эсэ «Незалежнасьць – гэта...», якому, відаць, з кожным годам цікавана рабіцца ўсё актуальнейшым. Колішніх гадаванцаў кліўлендзкай беларускай школы Віктара і Джо піва цікавіць відавочна больш за нашу палітыку. Пягледзячы на даволі прыстойную беларускую мову, іхняя радзіма – Амэрыка.

Яшчэ адзін званок у Менск. З нагоды заявак на правядзеньне грунвальдзкіх урачыстасьцяў абласныя прэзыдэнцкія вэртыкальшчыкі ліхаманкавана высьвятляюць, ці не расейцаў разьбілі пад Грунвальдам нашыя продкі. Пасьля гэткае навіны неапэтытныя калізіі позьняга фільму жахаў успрыймаюцца зь нейкім асаблівым настроем і ператвараюцца, так бы мовіць, у алюзіі: група рэанімаваных сатанінскаю сілай таварышаў, перапрашаю, – мерцьвякоў захопліве гарадзкі крэматорый і заместа спаленьня трупаў запускае іх пасьля аднаведнае апрацоўкі назад да жывых.

23.06. Усе сны былі апанаваныя мерцьвякамі ў розных знаёмых абліччах. Перакульваючы недаравальна лёгкія надмагільныя помнікі, яны прутка выскоквалі з трунаў, атрасалі з дыхтоўных гарнітураў зямлю й пачыналі выступаць з дакладамі, сустракацца з працоўнымі, уздымаць сьцягі, езьдзіць зь мігалкамі, лавіць для сваіх досьледаў прыгожых дзяўчатак і загадваць немерцьвякам пісаць заявы з указаньнем таго, хто на якой мове хоча гаварыць...

Адмыць сьвядомасьць ад тагасьветнага мярзоцьця, напэўна, здолее толькі Ніягарскі вадаспад, куды вязе мяне на сваім "траку" прэзыдэнт «Полацку» Янка (ён жа – Джон) Ханенка. Як на амэрыканскія сумеры, дык падарожжа з разраду недалёкіх – нейкія 600 міляў ці трохі болей, бо заедзем яшчэ на полудзень да Натальлі Арсеньневай у Рочэстар.

У адзін цудоўны дзень 1974 году марак савецкага гандлёвага флёту Іван Ханенка ў кампаніі

Амстэрдам

Працяг з старонкі 25

цёмным люстэрку адбіваліся: праадэкалёнены пакой, шырокі ложак, засланы цёмнай посьцілкаю, шурпатая падушка, гарачая жанчына і цямрэча, у якой я, сьветлы й чысты, торгаўся, рухаўся, варушыўся, зьнішчаючы расавую цнатлівасьць. Раней ніколі не даводзілася маркітавацца з нэгрыцянкамі. І калі па вяртаньні ў Менск адна ружовашчокая бляндыначка сказала мне, што ў нэгрыцянак благія фігуры: шырокія плечы й вузкія сьцёгны з маленькімі сухаватымі клубамі, дык я шчыра прызнаўся, што й такая фігура прыдатная для сэксу наогул і мінэту ў прыватнасьці. Бляндыначка сказала: "Фу-у-у... І ўсё адно я не люблю нэгрыцянак". А я паспачуваў ёй, бо яна ня зьнішчыла ў сабе расізм, ясная справа – не было магчымасьці пераштурхнуцца з мурынам. А я вось выціснуў у мурынскую, чарнаскурую похву порцыю сьветлага славянскага насеньня, і супакоіўся.

Пакуль я апранаўся, прастытутка зусім бессаромна набрала ў місу вады, падмылася, а потым гучна й дзынкна памачылася. Калі яна апаласквала ў чарупіне місу, у цемры ярка сьвяцілася яе ўсьмешка, поўная вялікіх зубоў.

Дарэчы, я заўважыў, калі выходзіш ад прастытуткі, дык вельмі рэзка паляпшаецца настрой. Выйшаў, забыў былое, уздыхнуў на поўныя грудзі підэрляндзкага паветра, закінуў галаву, зірнуў у чорнае неба, і настрой паляпшаецца ў сто адзінаццаць і адну дзясятую разоў, і хочацца засьпяваць песьню: "Гары яно гарам, такое каханьне!" Але крычаць я ня стаў. У Амстэрдаме вар'ятаў і так хапае. Я ціха пайшоў на начоўку ў свой «Краспольскі».

Не пасьпеў я зайсьці ў нумар і запарыць кубачак гарбаты, як начную цішу падзёрла на шматкі аўтаматычная чарга стрэлаў. Я адчыніў вакно й высунуўся. Усё ж Амстэрдам, а не Тбілісі ці Грозны, і можна высоўвацца з вакна, пачуўшы аўтаматны трэск. "Можа, нейкі рабаўнік зноў забраў у паліцыянткі зброю, і помсьлівыя калегі ўганяюць у рабаўнікова цела сьмертаносны сьвінец?" І тут у чарноцьце ўварвалася імклівая зьнічка пэтарды, якая заскакала па пляцы, зазіхцела, растрасаючы бліскавічныя пырскі, закруцілася й сыпнула ў неба аўтаматную чаргу. "Ясна, нэгры балдзеюць!" Чаму падумалася на мурынаў, ня ведаю. Але падумалася, і я злавіў сябе на такой думцы якраз тады, калі з-за фаласападобнага манумэнту выскачыў лысы вар'ят і трасучы над галавою кулакамі, паскакаў у завулак. Вось быў і доказ: вар'ятаў і крыкуноў у краінах БэНіЛюкс хапае безь мяне. І добра, бо менавіта вар'яты складаюць адметнасьць краін.

Ну хіба можна ў Менску ўбачыць чалавека ў высознай цялесна-ружовай шапцы, пашытай у форме чэлеса? А ў Амстэрдаме – калі ласка. Ідзе сабе чалавек у белым палатняным строі, а замест галавы – здаравенны мужчынскі ворган з бліскучай галоўкай. А чалавек ідзе й спакойна размаўляе зь сябрамі, вельмі цывільнымі спадарамі ў добрых дарагіх палітонах. Вось і адметнасьць, вось і жывы экспанат з музэя эратыкі.

Ёсьць у сталіцы Нідэрляндаў і такая ўстанова – музэй сэксу. Зрэшты, ён расчараваў. Чакалася большага, думаў, пабачу каштоўныя творы мастацтва на зададзеную тэму, а сутыкнуўся з кепска зробленымі муляжамі. Ну хіба можа ўразіць пластмасавая дупа, якая вісіць на сьцяне й імітуе гук выпушчэньня газаў? Ці каго зьдзівіць гадкі манэкен старой прастытуткі, які выскачыць на цябе зь цёмнага кутка? Вялікія, блага зробленыя цацкі, і больш нічога. Чым уразіць чучала Мэрылін Манро, што прыціскае да сьцёгнаў падхоплены ветрам прыпол; ці пудзіла Маты Хары ў час расстрэлу; ці ўкленчаная мінэтчыца з пластмасавым чэлесам каля пластмасавых вуснаў? Парад разбэшчаных лялек. Збор пратэзаў. А вось на гледачоў цікава глянуць, асабліва ў залях з фотакарткамі, якія рабіліся аматарамі эратыкі выключна дзеля заробку. Амаль усе гледачы інстынктыўна папраўляюць рукамі свае полавыя ворганы, прыкладна так, як дэпутаты папраўляюць галыштукі перад выхадам на трыбуну. Ну, калі ты ў Амстэрдаме, дык можна й паправіць напяты чэлес. Нашто трываць? Нашто каб муляла? Нашто рабіць выгляд, што ў цябе няма воргана, калі ворган ёсьць? А так адвярнуўся, паправіў, уздыхнуў і выйшаў з музэя эратыкі, хаваючы ў кішэню калоду парнаграфічных картаў.

А далей пашыбаваў у які-небудзь зацішны рэстаранчык-кабачок на два столікі, шэсьць месцаў. А там замовіў порцыю смажанай камбалы. І рудабровы кухар-гаспадар падемажыць рыбіну найлепшым чынам і ўсьміхнецца, а ты пабачыш шырозны сьвішч паміж пярэднімі верхнімі зубамі. Такі шырокі, што празь яго можа праплысьці ня толькі камбала, але й каравэла, а за ёй і ўся гішпанская армада, якую так люта ненавідзяць галяндцы. О, гэтая сьвятая вайна за незалежнасьць! О, гэтая праклятая Богам каляніяльная вайна! Гішпанцы захапілі Амстэрдам і амаль усё шаснаццатае стагодзьдзе рабавалі і ўціскалі вось такіх рудабровых прадаўцоў камбалы. Але сьвет плыве, сьвет мяняецца. Імпэрыі руйнуюцца. Пясок сочыцца праз пальцы. Вада точыць камень. Нідэрляндзкія партызаны – гёзы – вызвалілі родны Амстэрдам ад гішпанскае навалы і вярнуліся ў свае крамкі гандляваць смажанай рыбаю. І калі сумна, а ты ў Галяндыі, дык пашукай у дамках, падобных да кухонных буфэтаў, маленькую рэстарацыю, зьеш сакаўны кавалак залатой камбалы, і стане ўтульней у гэтым сьвеце. Пад'еўшы, яно заўсёды спакайней.

Можна зноў прагуляцца вакол каралеўскага палаца, у які так і не завітала каралева. Яна любіць жыць у нейкай Гаазе. Вокны палаца цёмныя, як люстэркі за ложкамі прастытутак. Усё ж нельга надоўга пакідаць каралеўскія палацы.

Хай даруе Яе Каралеўская Вялікасьць усіх Нідэрляндаў, але *трэба дома бываць часьцей, трэба дома бываць ня госьцем, каб ня страціць* павагу й любоў уласнага народу. Вось такое нахабнае пажаданьне выказалася нідэрляндзкай каралеве ў музэі мадам Цюсо. Ясна, калі ты ў музэі спадарыні Цюсо, дык каралева не сапраўдная, а цацачная. Ну й што?

Я й сам ведаю, што леней было пайсьці ў дом-музэй найвялікшага з галяндзкіх жывапісцаў, чым да Цюсо. Але дом Рэмбранта, як высьветлілася, адчыняюць толькі ў нядзелю. Пацалуй прабой і кіруй дамоў. Але ты далёка ад Менску, ты ў Амстэрдаме, ідзеш на пляц Дам і цябе ветліва запрашаюць у музэй бабулі Цюсо. Ідзеш.

"Русіш?" І атрымліваеш паперку з тэкстам, якую чытаеш у хуткасным ліфце, які імчыць на самы верх вялізнага будынка. Зь ліфта пакіроўваесься ў цёмны, кепска асьветлены пакой. І тут успыхваюць пражэктары, у конусах промняў на цябе насоўваецца са столі вялікая чатырохмэтровая фігура Клааса Янсзоона, які нагадвае Якуба Коласа з аднайменнага менскага пляца, пераапранутага ў строй залатога для Галяндыі сямнаццатага стагодзьдзя. Амстэрдамскі калос пачынае расказваць пра васьмідзесяцігадовую вайну за незалежнасьць. Леваруч ад яго высьвеціцца дыярама бітвы. Сапраўдная гармата стрэліць сапраўдным колцам дыму, якое паляціць над табою нібыта ядро. А ты ўспомніш бронзавага партызана Дзеда Талаша з унукам, які цягне скрыню з патронамі. Раней у праекце недалёка ад скрыні з патронамі каля колясаўскага чаравіка ляжаў вялізны капялюш, але бронза – рэч каштоўная, выратылі эканоміць і не адліваць капялюш. Народны пясьняр цяпер сядзіць на пляцы без галаў-

двух таварышаў зайшоў у праклятy капіталістычны супэрмаркет і ў хуткім часе выйшаў адтуль, каб заявіць паліцыі, што вырашыў застацца ў Амэрыцы. У нью-ёрскім аэрапорце яго сустрэне прадстаўнік Талстоўскага цэнтру князь Галіцын, які па шляху ў сваю сядзібу, да Талстых і Радзянкаў, пачастуе Янку абедам у шыкарным рэстаране і ня выявіць аніякага захапленьня, калі на пытаньне пра нацыянальнасьць марак упэўнена адкажа: беларус. (Прыйдзе дзень, калі сярод іншае карэспандэнцыі Хавенка атрымае й рахунак за той абед.)

"Цела тут, а душа там, у Беларусі", – пасьля доўгае пярэрвы гаворыць наогул далёкі ад сэнтымэнтальнасьці Янка.

Мы ўжо круцімся па вуліцах Рочэстару, дзе з сынам Уладзімерам, унучкаю й двума сабакамі жыве легенда нашай паэзіі Натальля Арсеньнева.

Стол сабраны ў садзе пад чарэшняй.

Спадарыня Натальля лічыць, што паэтаў у беларускай літаратуры сёньня меней, чым дваццаць гадоў таму. Прамовіўшы колькі слоў, яна замаўкае, засяроджваецца на нечым сваім, і тады здаецца, што ў 92 гады чалавек і павінен углядацца ў іншыя сфэры, а не шчыраваць з гасьцямі. Аднак зьнячэўку гаспадыня падымае сваю шклянку з содавай (але й з глытком віскі) і кажа саркастычны тост з палітычнай падкладкай.

У 40-м годзе яна ішла з Танкам, Машарам і Айзікам Кучарам па Менску; Танк загаварыў, і напалоханы Кучар кінуўся да яго: "Цішэй, цішэй! У нас у Менску так гучна гаварыць па-беларуску не прынята!"

Арсеньнева доўга глядзіць нам усьлед.

А ў штаце Нью-Ёрк, як і ў беларускіх вёсках пад Полацкам і Вільняй, цьвіла бульба. Усьцяж дарогі гандлявалі сухаватымі нясмачнымі трускалкамі, а з узбочыны сумнымі жаночымі вачыма глядзелі на нас тры казулі.

Па-над кіпеньню вадаспаду пахла шыпшынавай квеценьню. Каля парэнчаў беспардонна ціскаў белую жанчыну чалавек, у якога белымі былі адно штаны. Жанчыне гэта яўна падабалася. Унізе стаяў параходзік, які неўзабаве, няўзнак завярнуўшы на канадыйскую акваторыю, павязе нас пад самую выгбу ніягарскай вясёлкі, дзе ў срэбным воблаку вадзянога пылу мне нарэшце ўдасца канчаткова загнаць зграю начных мерцьвякоў у віварый і зачыніць іх там на замок разам з усімі іхнімі чорнымі членавозамі і рэзыдэнцыямі, у навакольлі якіх жывым людзям раяць не падыходзіць бязь пільнае патрэбы да вокнаў і не рабіць на іх тле ніякіх рэзкіх рухаў.

24.06. Каб зірнуць, як жэніць сына Колю доктар Ала Орса-Рамана, мне даводзіцца пераадолець уначы яшчэ 400 міляў і тры штаты. Зь беларускае калёніі ў Нью-Брансьвіку дабіраюся да Нью-Ёрку ў машыне з эмігрантамі зь Беласточчыны. І старыя, і маладыя моцна трымаюцца беларушчыны. "Ці Майкл драйвуе карам?" – цікавіцца адзін з маладых. "Драйвуе, драйвуе", – з адметным акцэнтам адгукаецца з задняга сядзеньня жвавая бабуленцыя з-пад Гайнаўкі.

Вянчаньне ў вядомым сваёй талерантнасьцю ўнівэрсытэцкім езуіцкім касьцёле. Служаць па чарзе каталіцкі патэр і праваслаўны бацюшка. Як зазвычай бывае падчас супольных набажэнстваў і ў Беларусі, сьвятары распачынаюць спаборніцтва. Дзякуючы беларускаму хору зь яўнай перавагаю верх бярэ айцец Васіль. Нявеста паходзіць з ужо цалкам амэрыканізаваных італійцаў, а таму беларускі бок (сваты, «Лявоніха», вясельны каравай etc.) упэўнена перамагае й на бяседзе.

Рэстаран уладкаваўся над самай Іст-Рывэр, паміж двума мастамі з гірляндамі блакітных лямпачак, якія глядзеліся неяк правінцыйна і нараджалі ў нецьвярозай душы тугу па Бацькаўшчыне.

Я выцягнуў з кішэні зялёны нататнік і помсьліва запісаў ключавую фразу гэтага дня – "Майкл драйвуе карам".

25.06. Кожны беларускі асяродак у Амэрыцы наймацней лучаць з Бацькаўшчынай дзьве рэчы – царква й могілкі.

У Саўт-Рывэры, штат Нью-Джэрсі, гэта царква сьвятой Еўфрасіньні Полацкай. (Пасьля набажэнства да мяне падыходзіць паціснуць руку малады эмігрант былы (?) беларускі кампазытар Зьміцер Яўтуховіч.) А на мясцовых беларускіх кладах можна вывучаць і гісторыю Беларусі XX ст., і яе этнаграфічныя межы. Магіла слуцкага паўстанца Івана Навумчыка. Манумэнальны помнік прафэсару Радаславу Астроўскаму. (Мае праважатыя ўзгадваюць, як аднойчы ў 1944-м у Баранавічах ён перапудзіў нямецкіх афіцэраў, заявіўшы: няхай партызаны дакажуць, што змагаюцца за вольную й незалежную Беларусь, і я першы пайду зь імі.) Кампазытар і рэгент Дзьмітры Верасаў нарадзіўся пад Смаленскам. Як сам расказваў, прозьвішча было Верас, ды бальшавіцкія пісары падставілі "ов". Помнікі Палюховічам. Гэтыя родам зь вёскі Сэрнікі з-пад Каменя-Кашырскага, якую пасьля апошняй вайны Сталін "прырэзаў" Украіне.

Юрка Віцьбіч (Стукаліч) прыйшоў на сьвет таксама на беларускай Смаленшчыне, у Вяліжы.

У халадку царкоўнага архіву сакратар парахвіяльнага камітэту Міхась Сенька нарэшце прыносіць мне ўвасабленьне ці не галоўнай мэты маёй заакіянскай вандроўкі – вялізны пакунак дакумэнтаў пад №28 – «Матар'ялы Віцябскае навуковае экспэдыцыі 1939 г. Здымкі цэркваў, касьцёлаў і г.д. з апісаньнем гіст.» Дзясяткі зьнішчаных помнікаў. Гістарычныя сьведчаньні з дамешкам мясцовых паданьняў. Цьвёрды, з націскам і надзіва чытэльны почырк кіраўніка экспэдыцыі Юркі Віцьбіча. Знаёмае па-ранейшых ягоных тэкстах ігнараваньне добрай чвэрці "правідловых" косак. Мова – расейская.

"Полоцк. Вал Валовьего озера. Известно, что здесь на берегу когда-то находилось в священных рощах капище Перуну... Известно, что в 1563 году в период Ливонской войны Иван Грозный лично топил в проруби этого озера ксендзов-бернардинов"...

"Екимань. Георгиевская церковь"...

"Черея. Белая церковь"...

"Смоляны. Развалины замка королевы Боны. Так или иначе, но народ по сегодняшний день говорит о существовании подземного хода, по котрому когда-то Бона ездила на тройке в костел... 3 августа 1708 года, во время Северной войны, замок за исключением угловой башни был разрушен русскими"...

"Витебск. Губернаторский дворец. С 16 июля по 1 августа 1812 года в здании жил Наполеон. Войдя в приготовленные для него на третьем этаже комнаты от отстегнул шпагу и бросив ее на стол, покрытый картами России, сказал неаполитанскому королю Мюрату: "Я здесь остановлюсь, соединю корпуса моей армии, дам ей отдохнуть и устрою Польшу. Военные действия кампании 1812 года окончены: 1813 год увидит меня в Москве, 1814 – в Петербурге"...

У бары Саўт-Рывэрскага беларускага цэнтру я сяджу насупраць былога паліцэйскага Вовы. Вова дапівае свой скотч, а я сярод Сьцюартаў, Стрыкераў, Струеўскіх, Стралкоўскіх і Ступелаў знаходжу ў гарадзкім тэлефонным даведніку нумар Ганны Стукаліч.

Юрка Віцьбіч зьявіўся ў гэтым сьвеце ў 1905 годзе, ягоная ўдава – на пяць гадоў раней. Кожны з гэтых 95 гадоў пакінуў ня толькі сваё кольца на старых дрэвах за вакном, але й сваю фіялетавую жылку на руках спадарожніцы пісьменьніка, што напісаў лірычны маніфэст эміграцыі – "Мы дойдзем!".

Кладу на стол толькі што факсымільна перавыдадзеную «Мастацкай літаратурай» найлепшую, на маю думку, Віцьбічаву кнігу «Плыве з-пад Сьвятое Гары Нёман». Колер вокладкі акурат такі, як жоўтая гаспадыніна сукенка з дробнымі ружачкамі. Рукі ў фіялетавых жылках пачынаюць дробна трэсьціся. Што пішуць апошнім часам пра яе мужа ў "нашых" газэтах, я не расказваю.

26.06. Прачынаюся ў доме спадара Лёвы Высоцкага. Лёву далёка за 80. Вы скажаце, у нас асобныя індывіды таксама дажываюць. Магчыма. Ня ведаю толькі, што яны робяць, калі нагорнецца сумота. Мой гаспадар у такім разе сядае ў машыну й гоніць у найбліжэйшае казіно ў Атлянтык-Сіты (сто міляў).

Сёньня ў вакно да спадара Лёвы зноў заляцеў вецер вандраваньняў, а таму мне засьвяціла паездка на беларускі курорт «Менск». "Нейкія дзьве-тры гадзіны, затое якая дарога: горы, а ў нізе – рака", – спакушае аматар рулеткі. Рака завецца знаёма – Дэлявэр.

Высокія горы пачынаюцца не адразу. Пакуль тое, справа й зьлева застаюцца: штаб кватэра фірмы «Джонсан і Джонсан»; перакуплены ў сьвятых айцоў кляштар, дзе цяпер спыняецца з гарэмам кароль Марока; былая рэзыдэнцыя місіс Анасіс-Кенэдзі й лес, дзе міліянэры палююць на гаротных лісіцаў.

Працяг на старонцы 28

нога ўбору. А ягоны стрыечны брат Клаас хоць і ў памяшканьні, але пры капелюшы. Вядома, Клаас у Амстэрдаме, а Колас у Менску, і хай яны абодва калосы, але Бог ня роўна дзеліць.

Кожная няроўнасьць вельмі добра вымалёўваецца на геаграфічных мапах. Вось у музэі Цюсо ёсьць мапа Нідэрляндаў, падзеленая на правінцыі: Гелдэрлянд, Утрэхт, Паўночная Галяндыя, Галяндыя, Паўднёвая Галяндыя, Зэляндыя... І правільна, дарэчы, зрабіла, што падзялілася, што не йснуе адзінага й непадзельнага саюзу, няма адзінай партыі, якая са зброяю ў руках будзе змагацца за нейкае ўяўнае адзінства. Саюзу няма, а Нідэрлянды ёсьць, як і краіны БэНіЛюкс ёсьць, як ёсьць і дабраахвотна аб'яднаная Эўропа.

І хай праклянуць мяне дробныя беларускія нацыяналісты, але ня бачу нічога кепскага ў палескім культурным сэпаратызме. Хай акрэсьліваюцца, хай вылучаюцца, хай Пінскі раён стане Палескім раёнам. Хай зьмяняюцца межы вобласьцяў Рэспублікі Беларусь. Хай усё дзеліцца й множыцца, асабіста я за жывы й мірны працэс зьмены межаў, бо ніколі не ўціскаў геапалітычнае паняцьце сваёй Беларусі й Радзімы ў рамкі, акрэсьленыя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай ці Рэспублікай Беларусь. Мяжа – умоўнасьць, а зь яе зрабілі паласу съмерці. Дык хай паадсыхаюць тыя рукі, што на геаграфічнай мапе малююць палітычныя межы. Вось так, я ня толькі касмапаліт, а яшчэ й інтэрнацыяналіст, праўда, апрануты ў нацыянальны мундзір.

Аднойчы, мая жанчына Тамара сказала: "Глёбус, ты заўсёды зашпілены на ўсе гузікі". Вельмі эратычнае назіранье, праўда? Згадалася цалкам ідыёцкая Тамарына манера падыходзіць і падкрадацца ззаду. Яна любіла падыйсьці крадком на дыбачках і напалохаць: крыкнуць што-небудзь гучнае ў самае вуха, ці пляснуць чым-небудзь, ці яшчэ горш – ударыць. Аднаго разу на маю галаву абрынулася паўлітровая бутэлька. Тамара ўдарыла мяне бутэлькай па цемені. Зразумела, я пакрыўдзіў яе, усе людзі сварацца. Бывае. І мы пасварыліся з-за нейкай там фігні, з-за цюбіка з фарбаю. Рыштаваньні былі вузкія. Тома расклала фарбы на дошках, а я йшоў і наступіў, і зь цюбіка выскачыла ўся сіняя сінеча й паляцела з рыштаваньняў на падлогу. Тамара засталася безь нябеснае фарбы і сказала, што я няўклюдны і яшчэ нагаварыла рознага бруднага. Мне давялося ўзяць яе за ногі і сашторхнуць з рыштаваньняў. Яна вісела ўніз галавою на вышыні трэцяга паверху. Унізе была каменная падлога. Твар Тамары зрабіўся бурачковы, але яна не зьбіралася прасіць прабачэньня. І я зразумеў, што можна Тамару забіць, але прабачэньня я ўжо не атрымаю ніколі. Я ўсьцягнуў яе на рыштаваньні і пакінуў. Хай сабе робіць копію. Тамара капіявала фрэску «Сустрэча Марыі і Лізаветы». Вельмі кранальны сюжэт. Выгляд цяжарных жанчын зачароўвае. На жываце ў цяжарнай Марыі было маленечкае сонца са знакам Госпада Ісуса Хрыста. На фрэсцы, дарэчы, амаль не было нябеснага колеру. Я сеў у кутку касьцёла, на хорах і думаў пра цяжарную Марыю, пра яе велічны жэст. Рука Марыі была ўзьнятая, яна вітала Лізавету. А тым часам узьняла сваю мужную руку Тамара. Яна шарахнула бутэлькай мне па галаве і ўцякла. Я ня стаў яе даганяць. Падумалася, калі інтымныя ўзаемаадносіны будуць разгортвацца ў ваенным накірунку, адзін з нас загіне. І не было ніякіх перавагаў на маю карысьць. Наадварот, сьвядомасьць замуцілася й мяне званітавала. Страсеньне мазгоў я атрымаў. Страсьці напаляліся, але рэшткі рацыянальнага не далі загінуць ні мне, ні Тамары. Мы памірыліся ў той жа вечар. І расшпілілі ўсе нашы гузікі. Нам было добра. Павер мне.

Мяжы паміж праўдаю й хлусьнёю няма, як паміж вераю й сумневам. Вось ты йдзеш па музэі бабулі Цюсо, а навокал людзі й лялькі, рэчы й адбіткі ў люстэрках, цені й плямы сьвятла. Вось жанчына падмятае брук, гэта лялька. А вось японец фатаграфуе жанчыну-ляльку, што падмятае брук. А вось мой брат, які назірае, як турыст-японец фатаграфуе ляльку зь венікам. А вось я, той самы Адам Глёбус, які бачыць усю вялікую карціну ў люстэрку. А вось ты, што слухаеш мой раман пра дзіва. А вось і ён, дарагі сябра чытач, які схіліўся над тэкстам. Ці істотная, у такім разе, неадухоўленасьць лялькі, якую зрабілі ў выглядзе падмятальшчыцы па-за-па-замінулага стагодзьдзя? Лялька вельмі добра затрымлівае на сабе промні сьвятла. Калі сфатаграфавацца побач зь ёю, дык на картачцы лёгка пераблытаць, дзе жывы чалавек, а дзе рукатворная цацка. Вось так з-за слабой здатнасьці адрозьніваць адно ад другога ты ня можаш выбрацца зь люстраных лябірынтаў. І ты натыкаесься на люстэркі, як экскурсант японец з фотакамэраю. Ён усьміхаецца, у яго мэханічная ўсьмешка. Японец так выхаваны: атрымаў удар – усьміхніся, а толькі потым, паправіўшы акуляры, рэагуй – ці то ўдарам ці то прабачэньнямі.

Раптоўны жах, ты робісься сьведкам забойства братоў дэ Вітаў. Адзін зь іх, Ёхан, быў правіцелем Галяндыі на працягу дзевятнаццаці гадоў. Але ягоныя посьпехі выклікалі чорную зайздрасьць у колах супраціўнікаў, якія здолелі справакаваць натоўп на гвалт і самасуд. Пакутнікаў Ёхана і Карнэліса ты пабачыш прывязанымі да бязьлістага дрэва. З разьдзёртых жыватоў будуць зьвісаць вантробы: сьлізкія, бэзавыя й гарачыя. Ты жахнесься, падумаеш пра чалавечыя цёплыя кішкі, пра незваротнасьць учыненага – вантробы сямнаццатага стагодзьдзя нельга запіхаць назад, як сёй-той з філёзафаў меркаваў. Ты адхісьнесься ад пачварных лялек і пабачыш шкло, за якім застанецца сцэна гвалту. На шкле варухнецца адбітак майго брата Міраслава. З-за Міраслававага пляча будзе паглядаць белы твар вучонага гэбрэя.

Лялечны гэбрэй апусьціў вочы, ён ня хоча глядзець на паталягічную сцэну. Пэўна, таксама апускаў вей й вучоны Сьпіноза, калі забілі ягонага паплечніка Ёхана дэ Віта ў тысяча шэсьцьсот семдзесят другім годзе. Пабачыўшы разяўлены жывот сябра, цяжка адстойваць пастулят, што трэба разглядаць чалавечыя дзеяньні й памкненьні так, як разглядаеш лініі, паверхні й геамэтрычныя целы. Каб абараніць такую тэзу, трэба апусьціць вочы, разгарнуць кнігу, дзе замест закладкі ляжыць найдаражэйшая нідэрляндзкая купюра коштам у тысячу гульдэнаў, а на ёй, на глянцавай паверхні тонкімі лініямі намалёваны твар сумнавокага матэрыяліста Сьпінозы.

Доўгі, сплецены з смарагдавай павуты, твар філёзафа я абмяняю на каштоўную рэч – дыямэнт. І калі, седзячы за сталом у ювэлірнай краме, я буду круціць перад вачыма пярсьцёнак з матавага золата й любавацца колкімі жарынкамі марознага дыямэнтавага бляску, згадаеца сэнтэнцыя Сьпінозы: той, хто ў рэшце рэшт выходзіць у пераможцы, болей ганарыцца тым, што ён нашкодзіў іншаму, чым тым, што прынёс дабро сабе. Ці можна, растрыбушыўшы чалавечае цела, атрымаць задавальненьне? Няўжо натоўп, які зьнявечыў дэ Віта, меў палёгку? Мяркую, меў! Вось у чым жах. Я ціха апускаю вочы, раскрываю нататнік і вялікімі літарамі запісваю: "Вайна – грамадзкая шызафрэнія, суцэльнае вар'яцтва. Вайна – вельмі заразная, інфэкцыйная хвароба. Салёны водар крыві распальвае апэтыт..."

У мяне зьнікае жаданьне хадзіць у пераможцах, а тым больш залічыцца ў ахвяры. Хочацца цішыні, спакою... Рай падобны да

Працяг на старонцы 28

Божая кароўка зь Пятае авэню

Працяг з старонкі 27

Нарэшце на далягляндзе зьяўляюцца горы. Пры дарозе, на беразе возера, стаіць дом індзейскага правадыра, якога завуць Гром. Каб ніхто з бледнатварых братоў, крый божа, не памыліўся, аб гэтым нагадвае жоўты шчыт намерам з бульдозэр.

Беларускі курорт падобны да нашых саўмінаўскіх пансіянатаў. Ёсьць усяго парачка неістотных адрозьненьняў – тутэйшым паспалітым людзям накуль што не прыйшло ў голаў заасфальтаваць лясныя сьцежкі й зладзіць побач з бабрынымі хаткамі пляж.

27.06. У доме мастачкі Галіны Русак найперш уражвае калекцыя індзейскае керамікі. Творы спадарыні Галіны я ўжо бачыў і ў Менску, і ў Полацку. Цяпер мне зразумела, адкуль у яе абразах гэтыя нязвычныя эўрапейскаму воку дэкаратыўныя матывы. Маючы ахвоту, іх нескладана знайсьці і ў яе вобразе сьвятой Еўфрасіньні. Урэшце, калі ўзгадаць, што юная Прадслава ведала пра купальлі, русальлі ды каляды зусім ня з кніжак і, у адрозьненьне ад некаторых расейскіх сьвятых, ніколі не займалася перасьледам нехрысьціянаў, ніякай ерасьсю тут і ня пахне.

З кубкам кавы пераглядаю загалоўкі раніцішх газэтаў: «Расейскія генэралы апраўдваюць дзеяньні спэцназу ў Будзёнаўску»; «Іосіфу Кабзону адмовіліся даць візу ў ЗША» (за цёплыя сувязі з мафіяй); «Стэнаграму сакрэтнай сустрэчы дэмакратаў знайшлі ў віннай краме»; «Паўтара мільёна расейцаў – наркаманы»... Гаспадар рэстарацыі Дзіна Таніэль злавіў карпа вагою 95 фунтаў, а загадчык катэдры афра-амэрыканскіх дасьледаваньняў Нью-Ёркскага гарадзкога ўнівэрсытэту Леанард Джэфрыс пазбаўлены пасады за размовы пра тое, што італьянцы ды гэбрэі імкнуцца зьнішчыць мурынаў як расу, дзеля чаго некалі фінансавалі гандаль рабамі, а цяпер кантралююць Галівуд. Відаць, шмат чаго кантралявала і ўсьмешлівая гэбрэйка Рыма Данілаўна Чаркаская (адразу на пяці здымках), з нагоды заўчаснае сьмерці якой разам з «Новым Русским Словом» смуткуюць, заняўшы цэлую газэтую паласу, жыхары Нью-Ёрку, Кіева, Таронта, Бярдзянску, Тэль-Авіва і Бабруйску.

Падчас вечаровага выступу ў мастацкай бібліятэцы заснаванага яшчэ ў каляніяльны пэрыяд Раттгерскага ўнівэрсытэту (тут пачынаў сваю навуковую кар'еру біяхімік беларус Аўген Вярбіцкі, спэцыяліст у захаваньні ежы, які быў адказны за харчы першай касьмічнай экспэдыцыі на Месяц) уважліва паглядаю на ўключаны адным нядаўнім эмігрантам зь Беларусі дыктафон. Гэта гальванізаваная апошнімі палітычнымі падзеямі спадумлівасьць чалавека, якому дзядзька ў цывільным аднойчы гадоў дваццаць таму паказаў у службовым габінэце напісаную суседам па інтэрнатаўскаму ложку рэляцыю пад непрэтэнцыёзным назовам «О некоторых высказываниях студента исторического факультета БГУ В.Орлова».

Адолець непамысныя рэмінісцэнцыі дапамагае чырвонае каліфарнійскае. Гэта, вядома, не лямбруска з Эмілії, але й не айчынны «Крыжачок» з-пад Вялейкі.

28.06. Дырэктар Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку Вітаўт Кіпель нарадзіўся ў 1927 годзе ў Менску й добра памятае, як двое дзядзькоў Міколаў вучылі яго на беразе рэчкі сьпяваць беларускія песьні. Дзеля таго, што йшлі 30-ыя гады, а дзядзькі гэтыя былі географ Азбукін ды гісторык Улашчык, рэчка, каля якой адбываліся рэпэтыцыі, шанцаў называцца Сьвіслаччу ўжо ня мела, а звалася Вояй і плыла сярод вяцкіх лясоў. Тэрмін высылкі арыштаванага па справе «Саюзу вызваленьня Беларусі» Яўхіма Кіпеля скончыўся ў 1935-ым, а праз тры месяцы былы асьпірант БДУ атрымаў ужоўскую "дабаўку" – пяць гадоў тагачаснага БАМу. Вітаўт з маці жыў у Арле. Аднаго разу маці выклікаў дырэктар школы, дзе яна выкладала расейскую мову. "Мария Васильевна, мы будем давать вам паспорт. Там есть национальность. Мы вам напишем русская, ведь русская или белоруска – это все равно". – "Ну если все равно, – адказала жонка "ворага народу", – то напишите: белоруска".

Дзед спадара Вітаўта меў хату каля Вайсковых могілак і трыццаць гадоў зарабляў на хлеб у шатні менскага гарадзкога, а потым Беларускага дзяржаўнага тэатру. На пытаньне, дзе працуе, ён любіў з гонарам адказаць: "у ціатрах".

З Кіпелем-унукам мы гаворым за сталом, на якім ляжыць карэкта ангельска-беларускага слоўніка на сорак зь лішнім тысячаў слоў, які праз год БІНіМ мае падараваць Беларусі. Размова працягваецца ў кітайскім рэстарачыку. Да гарбаты вузкавокі афіцыянт падае нешта накшталт салодкіх каўдунцоў, але заміж начынкі знаходжу ў сваім цыдулку зь дзьнюма кітайскімі фізіяноміямі і ўсходняй прымаўкаю: разумны ведае ўсё, а хітры – усіх.

Напэўна, я хітры, бо ведаю, што найленшы праваднік па Нью-Ёрку – спадар Антон Шукялойць, зь якім мы ўжо дамовіліся заўтра ад самае раніцы рушыць па манхэтанскіх авэню й стрытах.

29.06. Старшыня Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня Антон Шукялойць з сваімі шыкоўнымі падкручанымі вусамі выдае тыповым беларускім шляхцічам канца XIX ст. Трохі дзіўна, што гэты "шляхціц" захапляецца паэзіяй Алеся Разанава.

На скрыжаваньні Брадвэю й вядомай сваімі ювэлірнымі крамамі й ружавашчокімі пэйсатымі гэбрэямі ў капелюшах 47-й вуліцы мой праважаты кажа: крыж сьвятой Еўфрасіньні трэба шукаць у Маскве.

Тут, у ценю хмарачосаў, я ня пэўны, што спадар Антось ня йдзе ў гэты самы момант па вуліцах Гаруна або Ігнатоўскага, як за нямецкай акупацыяй звалiся сёньняшнія Камсамольская й Чырвонаармейская.

На сьценах параклееныя абвесткі па-нямецку й па-беларуску. Шукялойцю дваццаць пяць гадоў, ён – дырэктар Менскага гістарычна-мастацкага музэю. Немцаў ён любіць гэтаксама моцна, як і бальшавікоў, хоць першыя вынесьцілі яго з турмы, куды пасадзілі другія. Брунатны фашызм прыйшоў на зьмену чырвонаму. Усьлед за зьнікненьнем знаёмых гэбрэяў з дырэктарскага кабінэту нядаўна прапаў Пэнаў «Гадзіньнікар» – немцы загадалі зьняць усе творы "недачалавекаў". А перад вайной у неваграць ад'ехалі ў варанках менскія выканаўцы праектаў дзівам ацалелага ў Маскве архітэкта-

Амстэрдам

Працяг з старонкі 27

бібліятэкі зь ненапісаным каталёгам. Рай падобны да музэя, дзе чалавечае сэрца можа быць гарачым толькі ва ўяўленьні, ну і, вядома, у жывых грудзях.

Ты калі-небудзь дакранаўся да музэйных масянжовых твараў? О, які сьмяротны холад працінае пальцы!

А ў музэі Цюсо я не чапаў лялек. Нашто? Я разглядаў у спэцыяльнай залі анатомію экспанатаў: вока без павека, галава без валасоў, ружовыя дзясны са счэпленымі зубамі. Нецікава. Не зьдзіўляе. "Захапленьне мэханікай засталося для мяне ў дзесяцігадовым узросьце і ў васямнаццатым стагодзьдзі", – я так падумаў, абмінаючы фігуру сьмерці з касою.

Зрэнты, канструяваньне – адна з найцікавейшых забавак. І ня буду гэтага адмаўляць.

Я іншоў праз шэрагі лялек, зробленых у выглядзе знакамітасьцяў: Мэрылін Манро – сэкс-сымбаль дваццатага стагодзьдзя, Майкл Джэксан – чалавек-танец, які паспрабаваў зьмяніць расу й разбурыў твар, ператварыўшы ў маску з праваленым носам, Ленін – мумія, пастаўленая вэртыкальна, Гарбачоў – прэзыдэнт СССР, краіны, дзе я парадзіўся... Чаплін, Нідэрляндзкі кароль на кані, Эйнштэйн, Шварцэнэгер, Мадона – тая, што безь дзіцяці й Лізаветы, Ціна Тэрнэр, Рэмбрант, Вэрмэер, гандлярка, пакупнік, чарга пакупнікоў, ахоўнік з рацыяй і пісталетам... Мы не ў музэі мадам Цюсо, а ў вялікай шматпавярховай краме.

Выхад з музэя вядзе ў краму. Трэба, калі ты ў Амстэрдаме, памятаць: "Гандаль – душа Галяндыі!" І пяць параў шкарпэтак каштуюць таньней, калі іх набыць оптам. Толькі нашто пяць параў адналькавых шкарпэтак? Ну хіба што падараваць брату, сыну, бацьку, дзядзьку і адну пару пакінуць сабе. Можа так і трэба абыходзіцца з шкарпэткамі, якія заўсёды губляюцца па адной. Адна ёсьць, а дзе другая? На небе? Там зьбіраюцца ўсе шкарпэткі, пакрыўджаныя гаспадарамі. Мільёны, мільёны, мільёны аднаасобных сувэрэнных шкарпэтак, чысьценькіх, адпрасаваных, зацыраваных. І столькі ж, калі ня больш, пальчатак. Калі зьнікла твая шкарпэтка, ведай – яна пайшла да твоёй згубленай пальчаткі.

А я з музэя мадам Цюсо выйшаў праз краму на пляц Дам і пайшоў, пайшоў, пайшоў перакусіць у «Макдональд».

Такая лёгкая закуска: бутэрброд з катлетай і запіўка гарбатай. Усе замаўляюць кока-колу, а я гарбату. У чужых гарадах я п'ю выключна гарбатку, каб трымаць страўнік у тонусе. А то набухаесься кавы і захочаш у прыбіральню, а гэтае хаценьне стварае дадатковыя складанасьці. Асабліва калі ты ў амстэрдамскім «Кварталe чырвоных ліхтароў», калі з-за шкляных дзьвярэй на цябе пазіраюць зманлівыя вочы прастытутак, а пругкія языкі млява падрыгваюць паміж растуленых вуснаў, а пальцы прыспускаюць станік, каб на цябе зірнулі насьцярожаныя музкі. А ты ўзяў і нажлукціўся кавы, зь яе сікуновагонным эфэктам. І што тады, заходзіць да жанчыны й мачыцца ў рукамыйнік? Ці ў місу для падмываньня? Ці спытаць, як прайсьці ў ватэрклязэт? Ці апрастацца ў аметэрдамскі канал? Усё не падыходзіць. Застаецца адзін варыянт: вярнуцца ў гатэль, вызваліцца, і болей ня піць кавы.

Па дарозе ў «Краснапольскі» можна заскочыць у кавярню пад шыльдай, на якой намаляваная канапля ў выглядзе пальмы, гэта ўмоўны знак, сыгнал: тут можна набыць марыхуану. Зайшоў і прыдбаў. Заплаціў грошы й забраў пакецік з кайфам, і цябе ня схопіць за руку паліцыянт. Вольнаму воля, калі ты ў Амстэрдаме. Хочаш паліць дур? Купляй і куры. Толькі я кінуў паліць. Сабраў волю ў кулак і не куру наўтары гады. А брат паліць. Я старэйшы, ён малодшы, і яму не прыйшоў час кідаць курыва. Таму ён і купіў пакецік анапы, а я толькі стаяў побач. Я прывык. Усе курыць, а я прысутнічаю, усе п'юць віно, ром, віскі, каньяк, самагонку, гарэлку, лікёр і нават каву, а я стаю побач, і мне ня хочацца курыць і піць разам з усімі. Калі страшна закарціць выпіць ці закурыць, дык на адзіноце, гэта як складаць вершы, як пісаць літаратуру, як закахацца. І таму або гэта, або тое. Слушна спадар Гётэ заўважыў: паленьне й творчасьць несумяшчальныя рэчы. І як ты іх сумясьціш, калі выпаліш цыгарэтку з марыхуанай?

Вось і прыклад... Вярнуліся мы ў гатэль. Я сеў за шкляны стол, запаліў лямпу й пачаў апісваць аметэрдамскія дзівосы. А брат Міраслаў, які любіць пакурыць, дастаў пачак тытуню «Друм», які мае салодкі водар чарнасьліва, перамяшаў тытунь з накрышанай анашою, якая пахне прахалодным палынам, і зацягнуўся, і запоўніў гатэльны пакой блакітнай смугою. І не пасьпеў я напісаць тры радкі, як мой дарагі брат, выцягнуўшыся, ляжаў на ложку й глядзеў у столь. Якая тут творчасьць? Хіба што канцэптуальная, хіба што амэрыканская, як у Кэна Кізі пасьля дозы ЛСД. Толькі я – эўрапеец з малой літары, як і трэба па правілах граматыкі. А таму, напісаўшы старонку на цьвярозую галаву, я вярнуўся ў «Квартал чырвоных ліхтароў».

Я доўга блукаў паміж вітрынамі й разглядаў розныя экзатычныя паставы. Мне спадабалася белая жанчына з плацінавымі кудзерамі, з важкім бюстам і з крутымі клубамі. Мне спадабалася жанчына, а да яе заскочыў віхляты юнак. Усьмешлівая парачка схавалася за бурачковай занавескаю, пакінуўшы мяне любавацца пустым высокім белым крэслам. Давялося пайсьці далей і разглядаць штучны тавар. Заапарк у чырвоным, пурпуровым, бэзавым, лілёвым сьвятле. Людзі – жывёлы. Жывёлы – людзі. Усе жанчыны на адзін афраэўраазіяцкі твар. Ні даўжыня ног, ні ўзрост, ні колер вачэй, ні колер скуры, нішто ня мае аніякага значэньня.

Незаўважна для сябе я апынуўся ў нізкім пакойчыку зусім маленечкай мурынкі. Яна ўсьміхалася, яна хіхікала – съмех пырскаў зь яе, як сок з апэльсына. Яна вельмі спрытна схавала гульдэны над коўдру і, скінуўшы майткі, уселася на падушку. Малпаватая ручка ўзяла з паліцы ўпакоўку кандомаў. Мурынка пачала абмахваць твар бліскучай упакоўкаю нібыта вэерам. Боты нэгрыцянка ня зьняла і станік ня скінула. А я ня зьняў кашулю. Прастытутка яўна не зьбіралася мыць мой чэлес. Давялося самому правесьці водную працэдуру. Яна толькі выцерла маё пахавіньне мяккай сурвэткай, якую тут жа скатала ў шарык і шпурнула ў вядро. Усе нэгры народжаныя баскетбалістамі. У вядры было поўна сурвэтачных шарыкаў.

Валасы на мурынскай похве аказаліся пругкія, не раўнуючы капронавыя. Прастытутка апранула мой напяты чэлес у тонкую гумку. Нават мінэт рабіўся праз кандом. *"Беражонага Бог беражэ!" – сказаў француз Бэранжэ.* Я забаўляўся з нэгрыцянкай, а яна ўсьміхалася, уздыхала й зазірала мне ў вочы. І ўсё ж, за жывасьцю выразна прамацвалася ненатуральнасьць і лялькавасьць. Не я, а француз Лямэтры прыдумаў разглядаць чалавека як мэханізм, як машыну, як рэч. А мне давялося адчуць матэрыяльнасьць гэткае думкі.

Мурынка стаяла на каленях і локцях, калі зь мяне выцякала жаданьне знаходзіцца ў жанчыне, яно выцекла ў гумовы мяшэчак і было загорнута ў папяровую сурвэтку, скатана ў шарык і кунута ў вядро. Маё жаданьне апісала вельмі прыгожую дугу ў цёмным паветры й трапіла ў лузу са съмецьцем.

Каму трэба зьдзейсьненыя жаданьні? Нікому. Вось хацелася нечага да вар'яцтва, да самазабыцьця, да самагубства, да самазьнішчэньня, і раптам дасягнулася, зрабілася, зьдзейсьнілася запаветнае жаданьне – спустошанасьць, разгубленасьць, расчараваньне. Было й няма. І як сорамна за мізэрнасьць жаданьняў?! Таксама прыкра бывае глядзець тэлевізар, ляжаць і зырыць на ідыётаў з панамаджанымі тварамі і ўстаўнымі думкамі. На інвалідаў глядзець сорамна. Ім трэба спачуваньне й спагада. Згодны. Але назіраць за калекамі не хачу. Лепей заглыбіцца ў сон. "О, каб глядзець сны па замове!" – усклікне ідыёт. Ён жа ня ведае, што гэта будзе ня сон, а прагэ сну, муляж. Ды фіг зь імі. Бог дапаможа ўбогім. А я буду спаць. Гэтак, заплюшчыўшы вочы, патану ў плынях невядомасьці, у хвалях бязьмежнасьці, у дыханьні вечнасьці. Патану і адчую няроўнасьць часавае плыні. Вось адчуваньне, што час марудна паўзе, як сьлімак, а вось ён зусім спыніўся, як сьлімак на попеле, а вось імкліва паляцеў кажаном улукаткі.

Мы – праявы часу, маруднага ці імклівага, рэдзенькага, як крынічная вада, і густога, як наварыты булён зь сьвініны. І якімі ж цацачнымі здаюцца гадзіньнікі. Яны ня маюць амаль ніякага дачыненьня да сапраўднага, жывога, плянэтарнага, касьмічнага часу, таксама як лялька ня мае непарыўнай сувязі з правобразам. Час съціскаецца, загусае, разьвейваецца, скручваецца ў зьмяіныя колцы й працінае прастору войстрым прутком. Ён жывы. Ягоная магутнасьць асабліва моцна праяўляецца ў снах, дзе час уладарыць бязьмежна. У такія сны я правальваюся вокамгненна, лячу ў мігатлівай цішыні, накуль не прагучыць выбух: і шолахі, шоргаты, шэпты, крыкі, галасы, мэлёды запоўняць прастору. Гукавая хваля можа й выкінуць са сну ў рэальнасьць, асабліва калі ператомлены, перасычаны ўражаньнямі, перапоўнены зьдзіўленьнямі. Як у амстэрдамскім гатэлі «Краснапольскі», напрыклад. Толькі ня трэба нэрвавацца. Бяссоньне ня горшая з хваробаў, і яго можна ператварыць у нірвану, асабліва калі ляжыш у шыкоўным ложку й назіраеш за гульнёю аметэрдамскіх сьветлаценяў на высознай столі.

Чалавек – назіральнік гульні ценяў і сьвятла. А што яшчэ трэба? Гульня сьветлацені забаўляе. Назіраю. Баўлю час. Жыву. Сапраўднасьць надакучвае. Выратоўвае захапленьне друкаванымі тэкстамі.

Лісты Ван Гога. "Мне здаецца, калі я знайду яшчэ аднаго мастака, які захоча распрацоўваць тэму поўдня (а ў нашым варыянце Амстэрдама) і, так як і я, захопіцца працаю і пагодзіцца на жыцьцё манаха, раз

ра Лангбарда, аўтара будынкаў Дома Ураду й Опэрнага тэатру, якімі захапляўся малады Шукялойць. Ня ўсе сьледчыя НКВД шукалі новазэляндзкіх шпіёнаў і праектантаў тунэляў з Варонежу ў Бамбей. Трапляліся й такія, што ў гмаху менскага опэрнага разгледзелі цытату з рымскага Калізэю, дзе апрача іншых вясёлых забаваў публіка з задавальненьнем назірала, як аддавалі на разарваньне львам першых хрысьціянаў. У гэтым быў угледжаны намёк на стараньні "перадавога атраду партыі".

Зь Беларускага гістарычна-мастацкага музэю мы трапляем у мадэрновую бэтонна-шкляную сьпіраль музэю Гугэнхайма на 5-ай авэню. Сталую экспазыцыю пачынаюць скульптурныя коні Эдгара Дэга й працягваюць Тулюз-Лятрэк, чорна-сінія, але цёплыя жанчыны Пікаса, і другая вэрсія імправізацыі №28 Васіля Кандзінскага. Сустрэўшы позірк зеленавокага жоўтага ката з чалавечым тварам (М.Шагал. «Парыж з вакна»), даю зарок убачыць Эйфэлеву вежу з вакна раней, чым за свае грахі павінен буду вярнуцца на гэтую зямлю ў іпастасі ката.

А побач з маім улюбёным «Зялёным скрыпачом» здараецца штосьці трансцэндэнтнае – на рукаво маёй тэпіскі апускаецца і ўпэўнена залазіць у кішэню кароўка-багоўка.

Кім жа была ў сваім мінулым увасабленьні ты? Па залях Мэтраполітэн-музэю зь ягоным цалкам перанесеным праз акіян эгіпэцкім храмам мы падарожнічаем ужо ўдваіх.

У бруднаватым і цесным нью-ёрскім сабвэі я даю сваёй кішанёвай спадарожніцы беларускае імя, а выбраўшыся на вольнае паветра, паказваю ёй лёгкія самалёцікі, што цягаюць па небу рэкляму з нанізаных на тросікі літараў. Можа, яна хоча палётаць разам зь імі? Не, яна хоча разам са мной на вячэру да Юлі Андрусішынай, маці сьпевака Данчыка, які цяпер ходзіць па праскім бруку Старамескага пляцу або п'е каву на тэрасе зь відам на Карлаў мост, дзе мае рэальныя шанцы сустрэцца з маёй зданьню.

Незаплянаваны прыпынак: насупраць мяне на пляскатым даху прысадзістага дому стаіць помнік Уладзімеру Ільлічу Леніну. Балючы ўшчык ніякіх істотных зьменаў у краявідзе не выклікае. Ільліч па-ранейшаму стаіць, хоць і паказвае не на віна-гарэлачную краму, як зазвычай бывае ў нас, а на падазроныя вітрыны з голымі прыгажунямі. Спадар Шукялойць тлумачыць: з прычыны дзікае настальгіі помнік прывезьлі і ўсьцягнулі на дах кучаравыя савецкія эмігранты. У гэты момант мяне наведвае яснае разуменьне, што я – ня тая расьліна, якая зможа прыняцца на гэтай зямлі, нават калі перавезьці сюды ўсе беларускія помнікі правадыру і на кожны ўсьцягнуць па бусьлянцы. Пасадзіўшы багоўку на далонь, я паўтараю ёй усё гэта ўголас. Мая вандроўніца сур'ёзна выслухоўвае й супакоена раскрывае крылцы.

30.06. У славяна-балтыйскі аддзел Нью-Ёрскае публічнае бібліятэкі, дзе працуе Зора Кіпель (сярод безьлічы іншых клопатаў яна выдала ў сваім ангельскім перакладзе беларускую «Аповесьць пра Трышчана»), варта наведацца хаця б дзеля таго, каб спраўдзіць словы менскага калегі, які сьцьвярджаў, што колькі гадоў таму кампутар выдаў яму тут даведку з дадзенымі жыцьцяпісу, бібліяграфіяй і паведамленьнем пра тое, што ў яго, калегі, "няма вершаў пра партыю". Тым, каго хвалююць такія рэзюмэ заакіянскіх дасьледчыкаў, магу з поўнай адказнасьцю сказаць: складалі вы вершы гэткага кшталту ці Бог літаваў – кампутар дасьць вам адно даведку пра наяўнасьць вашых кніжак у бібліятэках ЗША й ні слова болей. Таму супакойцеся й знайдзіце па турыстычнай мапе «The Museum of Modern Art».

Мастацкім эпіграфам да ўсёй гісторыі XX ст. успрыймаецца там датаваная 1913 годам карціна нямецкага экспрэсіяніста Франца Марка «Карова»: велічэзная чырвоная жывёліна, у чэраве якой пасецца на поплаве пакуль яшчэ ружовы бычок, які неўзабаве народзіцца й зальє сьвет крывёю. Крывавая аўра твору настолькі моцная, што вы з палёгкаю ўдыхнеце сьвежасьці, якой цягне ад шагалаўскіх сумётаў са старым гэбрэем над зімовым Віцебскам. (Як выказаўся некалі адзін савецкі мастацтвазнаўца: "евреи, да еще и летают – такое искусство нам не нужно".) На музэйным подпісе будзе пазначана: «French, born Belarus», што наўрад спадабалася б паэту А.Вазьнясенскаму, які, гаворачы пра Шагала, любіць згадаць "древний российский Витебск".

Каля палотнаў і аб'ёмных кампазыцыяў Далі хочацца па-дылетанцку паразважаць над вэрсіяй, паводле якой пасьля фізычнае сьмерці мастак трапляе ў сьвет вобразаў, створаных ім у зямным жыцьці. Калі гэта сапраўды так, дык той сьвет абстракцыяніста Джэксана Полака (як і беларуса зь Дзьвінску Марка Роткі) будзе суладны, але досыць правінцыйны: ні вялікіх мастурбатараў, ні Нарцысавых мэтамарфозаў, ні дасканалых жаночых формаў, няхай сабе й напоўненых канцылярскімі шуфлядкамі. Напэўна, на тое, каб трапіць ў сьвет сваіх вобразаў, заслугоўваюць і літаратары. Я думаю, што, напрыклад, Адаму Глёбусу будзе карысна бліжэй пазнаёміцца з героямі «Дамавікамэрону». А якія сустрэчы могуць надарыцца ў Смілавічах, Лельчыцах і Ушачах у паэта Б.Спрынчана! Калявадаёмныя "хищники", чалавек у прастрэленым палітоне, першы прэзыдэнт РБ...

Спадар Шукялойць запрашае мяне ў стары ірляндзкі рэстаранчык «McSorley's Old Ale House» на 7-й вуліцы. Мілосьнікі тутэйшага элю нядаўна адсьвяткавалі 125-годзьдзе ягонае хмельнае таямніцы. Самой карчомцы два разы па семдзесят. Пры ўваходзе наведніка сустракае паведамленьне, якое ў вольным перакладзе можа прагучаць так: цябе яшчэ не было на сьвеце, а мы тут ужо добра сядзелі. Дамінанты інтэр'еру – разьмешчаная пасярод залі вялізная печ кшталту буржуйкі і аўтэнтычныя аб'явы аб пошуку забойцы Аўраама Лінкальна (1865 год) з прызавым фондам 50 000 $.

За кепска пагабляваным сталом вы мусіце выпіць прынамсі два кухлі бясспрэчна цудоўнага элю. Найпапулярнейшая закусь – ружовая настружаная ялавічына з адваранай бульбай, добра ўтушанай капустаю й кавалкам масла. Гарнір прымушае ўспомніць частыя цяпер у беларускім асяродзьдзі параўнаньні зь Ірляндыяй. "Бульбяныя" аналёгіі, што праўда, выглядаюць больш пераканаўча за палітычныя. Гэта падкрэсьлівае й партрэт першага прэзы-

Працяг на старонцы 30

у два тыдні наведае бардэль, а ў астатнія дні будзе неадрыўна працаваць і не губляць часу ўпустую, тады ўсё складзецца выдатна..."

А ў мяне ўсё й так выдатна, і магу табе паабяцаць: я не адрэжу вуха, як Ван Гог пасьля сваркі з працавітым сябрам Гагенам, які так шчыра запрашаўся на поўдзень Францыі ў Арль.

А я запрашаю ў іншае месца, на поўнач Нідэрляндаў, у цёмную Вэнэцыю, у найвялікшы музэй Ван Гога. Пэўна ж, павінна і ў невялічкай Галяндыі быць нешта найвялікшае, хоць бы сховішча з найкаштоўнейшымі палотнамі першага экспрэсіяніста, найбуйнейшага постімпрэсіяніста, які ўзяў рэвальвэр і застрэліўся ў жытнім полі. Ван Гог прастрэліў уласную скронь. У музэі спадарыні Цюсо постаць Ван Гога самая агідная. Ня можа вялікі мастак усіх часоў і народаў быць ніжэйшы за ідыёта-турыста. Я разумею: вернасьць ідэалам рэалістычнай школы і ўсё астатняе з дакумэнтамі і фотаздымкамі, з выкананым чэрапам бязь ніжняй сківіцы, з дадзенымі ў мілімэтрах і дэцымэтрах зь мікронамі. Але хіба ня можна паставіць Ван Гога на подыюм? Хто-хто, а дзядзька Вінцэнт таго заслужыў. І справа ня ў кулі, выпушчанай у галаву, і ня ў стрэле, які спудзіў зграю груганоў. Ісьціна ў іншым. І ты ня думай, што палотны вар'ята добрыя, бо каштуюць даражэй за золата, і не спадзявайся, што людзі павар'яцелі, калі выкладаюць за вангогаўскія карціны шалёныя грошы. Усё ня так. Таямніца ў фокусе, у антычным эфэкце, у пераламленьні промняў сьвятла, у гульні сьветлаценяў. Ты йдзеш уздоўж сьценаў, завешаных палотнамі маладога дзядзькі Вінцэнта. Ткач тчэ палатно. Сяляне ядуць бульбу. Жанчына йдзе па восеньскай алеі. А ты йдзеш па музэйнай гладзенькай падлозе. Ідзеш і думаеш. А чаму Ван Гог вялікі? Чаму яму пабудавалі музэй? Ты падыходзіш да палатна з сланечнікамі, да знакамітай карціны, да шэдэўра, да сутнасьці. Табе робіцца добра. Як? Чаму? У якое імгненьне? Ня ўловіш.

Ты згадаеш, як у дзяцінстве засушыў сланечнік, і як сухі сланечнік праз усю зіму пах мёдам. Ён стаў цёмны, скурчаны, касьцяны, але пах мядовым летам, ён захаваў ліпеньскае паветра, ён дыхаў лёгкай сьпёкаю.

Ван Гог застрэліўся летам. І можаш уявіць, як каркалі над ім груганы, як кружлялі, мітусіліся, віравалі ва ўльтрамарынавым густым небе. Ад карканьня, шолаху, ляманту падлаедных птушак можна звар'яцець, як і ад глядзеньня на карціны Вінцэнта Ван Гога. Такі зрух у розуме здарыўся з адным маім аднакурсьнікам у мастацкай вучэльні.

Ён днямі й начамі разглядаў альбомы з малюнкамі вялікага экспрэсіяноляга, ён капіяваў вангогаўскія палотны да страты прытомнасьці. Ён езьдзіў у Эрмітаж і ад раніцы да закрыцьця прастойваў перад творамі самазабойцы. І ён стаў Ван Гогам. На яго так і казалі: "Вось пайшоў Ван Гог". "Дзе там Ван Гог?" "Ты Вінцэнта ня бачыў?" Ён не крыўдаваў, калі называлі Вінцэнтам. Ён успрымаў гэта з удзячнасьцю. А на сваіх накідах, малюнках, эцюдах ён ставіў у кутку вангогаўскі аўтограф. Зьдзіўляў мяне толькі адзін момант: эцюды, малюнкі, накіды былі зусім не падобныя да твораў вялікага экспрэсіяніста. "А яны не павінны паходзіць на кампазыцыі Вінцэнта Ван Гога, – цьвяроза разважаў аднакурсьнік, – Ван Гог жыў у дзевятнаццатым стагодзьдзі, а я жыву ў дваццатым. І калі б ён жыў цяпер, дык маляваў бы так, як я!" Пярэчаньні ў дадзеным варыянце недарэчныя. Я нават не пытаўся, чаму Ван Гог, жывучы ў нашым стагодзьдзі, не падпісвае свае палотны прозьвішчам Руневіч. На такія патаемныя тэмы з аднакурсьнікам гаварыў доктар ў псыхіятрычнай лякарні. І ён пераканаў Руневіча не пісаць на малюнках прозьвішча Ван Гога. І Руневіч не пісаў. Ён адно ўсьміхаўся. Ён распаўнеў, шчокі ягоныя заружавелі, голас зрабіўся лагодны. І ніхто ня бачыў ультрамарыну, які загусаў і цямнеў над руневічавай чорнай кучаравай галавою. А можа ніхто не хацеў гэтага разумець і бачыць?

Тым часам скончыўся наш тэрмін навучаньня. Усе разьехаліся з вучэльні, хто куды. Усе забыліся пра Вінцэнта Вангогавіча Руневіча. А ён ціхенька ўладкаваўся ў Дзяржаўны Мастацкі музэй простым рабочым – перастаўляць скульптуры і перавешваць творы старых майстроў. Ён ціхенька перастаўляў і перавешваў карціны і таксама ціхенька набыў каля крамы «Філятэліст», што якраз насупраць музэя, маленькі шасьцінабойны пісталет. Вінцэнт Вангогавіч Руневіч-Менскі выехаў за горад на электрычцы, зайшоў у жытняе поле і стрэлам напалохаў груганоў. Вось так. Груганы каркалі й шархацелі ў пачарнелым ультрамарыне. Майго аднакурсьніка знайшлі з прастрэленай скроняй. А чалавек, які прадаў шасьцінабойны пісталет, сказаў: "Я й думаць ня думаў пра самазабойства!" Прадавец, вядома, падманваў. Усе гандляры – падманшчыкі.

Любы прадавец какаіну скажа, што ён ня думаў, прадаючы наркотык, што непаўналетні пакупнік будзе той парашок нюхаць. Так мы з табой і паверылі. Набыў наркотык, каб высыпаць ва ўнітаз, каб зьнішчыць зло, каб зрабіць сьвет дабрэйшым, каб запанавалі свабода, роўнасьць і нірвана. А мне, дарэчы, ня трэба наркотык, мне й так добра ляжаць на ложку й глядзець у сьветлую столь і думаць пра Амстэрдам і пра шолах вугальных крылаў, пра малады экспрэсіянізм, пра мадэрн, пра белыя крылы, пра палёт, пра Тамару...

Я пазнаёміўся з Тамарай на бульбяным полі. Не, мы ведалі адно аднаго, але пазнаёміліся, зьбіраючы бульбу. У той верасень мяне залічылі ў інстытут. Як кожны савецкі студэнт, я павінен быў дапамагчы калгасьнікам сабраць ураджай. І я прыехаў на вёску. Мяне пасялілі ў старой кабеты разам з разьбяром Віктарам, які зрабіў кішэнны арбалет і ганарыўся ім, і мог паўночы расказваць, як робяцца арбалеты. Віця быў волатам з выгляду й падлеткам па разумовым разьвіцьці, таму зь Віцем было нецікава. Мне хацелася не страляць з арбалету па катах і прабіваць іх наскрозь зробленымі зь цьвікоў сталёвымі стрэламі, а жадалася знаёмства зь цёплымі, як коткі, жанчынамі. Менавіта з-за цяпла, з-за холаду, з-за тэмпэратурнае розьніцы я й пазнаёміўся з Тамарай. Яна сядзела па кукішках і выбірала зь зямлі бульбу. Тамара кідала бульбіны ў вядро. А я стаяў і глядзеў на яе сьпіну ў паласатым швэдры. На Тамары былі швэдар, джынсы й гумовыя боты. У джынсах не было паса. Яны адставалі ад сьпіны. Швэдар крыху задраўся. У Томы была блакітная скура. Значна пазьней яна так і напісала ў лісьце: "Сягоньня парэзала пальчык. Высьветлілася, што кроў у мяне чырвоная, як і ва ўсіх, а я была перакананая, што у маіх жылах цячэ блакітная вадкасьць". Я глядзеў на паласу блакітнае скуры, што сьвятлела паміж цёмна-сінім джутам і шэрай воўнаю. Пазіраў і думаў: пра знаёмства, пра словы, якія варта сказаць, пра дождж, які пачаў сыпацца на палоску аголенага цела, пра холад і цяпло. Я сказаў глупства: "Давай паднясу вядро да трактара". Тамара адрэзала: "Ай, ня трэба, я сама". Мы пазнаёміліся.

У дзяцінстве я прачынаўся рэзка, лёгка і з добрым настроем. У Амстэрдаме я проста выскокваў з сноў, і бег прымаць душ, і шпурляў на падлогу ручнік, і галіўся, і распырскваў адэкалён «Кальвін Кляін», і спускаўся на ліфце зь люстранымі сьценамі ў рэстарацыю зь дзесяцімэтровай стольлю. Такая высозная столь проста зьдзіўляе ў лялечнай Галяндыі, дзе ўсё вымяраецца прапорцыямі буфэта. Толькі да большай прасторы прывыкаеш хутчэй, чым да каменнага меху. А сплеценыя з лазы крэслы нагадваюць пра хатнюю варэльную ўтульнасьць. І ты можаш хадзіць па шахматнай падлозе як кароль, і прыносіць на свой стол любую з трохсот трыццаці трох страў. Асабіста я сьнедаў наступным чынам... Аўсяныя мусьлі зь вяршкамі еліся пасьля салаты са сьвежае гародніны, розныя агуркі, памідоры, крышку цыбулі, зусім крышку, каб ня пахнуць. Цыбуля вельмі добра дапаўняла смажаны бэкон з амлетам. Да бэкону варта дадаваць скрылік лімону, выціснуць дзьве-тры кроплі на ружаватае, крышку падсушанае мяса. Я ж не француз, каб запіваць сьняданак шампанскім, таму наліваліся семдзесят грамаў грэйпфрутавага соку. Мне падабаліся стограмовыя гладкасьценныя шкляначкі для соку. Выпіў і наліў яшчэ. Бэкон у галяндцаў чэрстваваты, перасушаны, занадта хрумсткі, а таму піўся грэйпфрутавы сок, а не апэльсынавы, таму і кропля лімоннае кіслаты не зашкодзіць страўленьню, і цыбуля, і гурок. Пасьля бэкону добра пакаштаваць якую-небудзь грунтоўную салату, лепей мясную ці курыную, тунца ці іншую рыбу лепш не чапаць. Рыба кепска паводзіць сябе ў малацэ. Калі ўзяў крабавыя палачкі, дык забудзься пра вяршкі з мусьлямі. Раніцай я рыбу ня ем. Рыба ня любіць вяршкі. А я люблю. Яшчэ дыня вяршкі ня любіць. Толькі амстэрдамскае дыні я ня бачыў. І таму мой страўнік пазьбегнуў спакусы. Я шкадую страўнік. Раней не шкадаваў, а цяпер шкадую, і каву п'ю толькі на працы.

У Амстэрдаме чорная моцная кава была без патрэбы. І я піў крыштальна-бурштынавую гарбату і еў ківі. Я вельмі зграбна магу абабраць ківі. Беларус добра абірае ківі. Кожны беларус зь дзяцінства прывучаны абіраць бульбу, гэта нацыянальнае, гэта ў крыві, гэта вышэй за асобу. А таму нават тупаватым нажом я зграбна зрэжу варсістую скурку. Галяндцы таксама спрытна распраўляюцца з ківі. У іх таксама абіраньне бульбы – старажытны нацыянальны спорт. І менавіта ў Амстэрдаме вісіць самая беларуская з усіх сусьветных карцін «Ядакі бульбы» Вінцэнта Станіслававіча Іван Гога. Такая цёмная-цёмная-цёмная карціна. Такая смачная-смачная-смачная па́ра сыходзіць ад сопкай бульбы. Што можа быць смачнейшае за добра звараную, пасоленую шчопцямі бульбіну? Ну хіба што смарагдавы скрылік ківі з срэбнага двухдзюбага відэльца. Дэсэрт заўсёды выклікаў у маёй

Працяг на старонцы 30

Божая кароўка зь Пятае авэню

Працяг з старонкі 29

дэнта незалежнай Ірляндыі, які вісіць тут з часу яго абраньня. Вы можаце ўявіць, што ў 2000 нейкім годзе дзе-небудзь у менскім ці давыд-гарадоцкім шынку сьцяну будзе ўпрыгожваць партрэт першага прэзыдэнта Беларусі? Немагчыма ўявіць і тое, каб эміграцыя ў выніку страты незалежнасьці набыла ў нас калі-небудзь такія сумеры, як у Ірляндыі, насельніцтва якой паводле перапісу 1821 году складала 6 мільёнаў 800 тысячаў, а ў 1970 – 2,9 мільёны. Аднак ня трэба лішне драматызаваць і нашае становішча. Дасьведчаныя людзі сьцьвярджаюць, што па-ірляндзку ў Рэспубліцы Эйрэ гавораць у лепшым разе ў дзесяць разоў меней грамадзянаў, чым у сёньняшняй Беларусі па-беларуску. Калі гэта можа нас суцешыць, дык мы не самотныя...

Але да вядомай Багушэвічавай формулы гэтую мэтафізыку не зьвядзеш. Мо ўдакладніць: шмат было такіх народаў, што найперш страцілі дзяржаўнасьць сваю?.. Напрыклад, шатляндцы. Побач зь іхняй нашая моўная сытуацыя дык наогул выглядае бліскуча. Апрача таго, ніякі, нават папяровы сувэрэнітэт ім у бліжэйшыя дзьвесьце-трыста гадоў не пагражае. Карацей, бяз новага кухлю элю тут не разьбяромся.

На бэльцы над намі прышпіленая добрая сотня значкаў зь дзяржаўнымі сьцяжкамі. Беларускага няма. Няўжо па дарозе ў прыбіральню яго зьняў які-небудзь заблукалы сюды "вэртыкальшчык"? Афіцыянт-ірляндзец мае іншае тлумачэньне: нашы значкі часта крадуць людзі з разьвітым эстэтычным пачуцьцём. Значыцца, у героя нашае вэрсіі поўнае алібі.

Калі ўстанове 140 гадоў, тут мае гісторыю нават прыбіральня. Рэч у тым, што да самага канца 70-ых гадоў (нашага стагодзьдзя) «McSorley's» разам зь яшчэ дзьвума нью-ёркскімі піўнушкамі быў адчынены выключна для мужчынаў. Фэмініскі вялі зацятую барацьбу за свае правы, і нарэшце новы лібэральны мэр гораду здолеў пратараніць кругавую абарону: у «McSorley's» урачыстым маршам увайшоў першы аддзел заўзятых аматарак добрага старога элю. Пасьля парачкі выпітых пераможцамі кухляў згуртаваныя вакол гаспадара заўсёднікі-мужчыны злаўрадна назіралі амаль панічнае адступленьне трыумфатарак на зыходныя пазыцыі: жаночай прыбіральні ў рэстаране не йснавала. Прычым яе ня проста не было: з парады адвакатаў гаспадар накіраваў у мэрыю складзеную ў вытанчаным стылі паперу, што, маўляў, дзеля поўнага забесьпячэньня роўных правоў прадстаўніцы цудоўнай паловы чалавецтва могуць наведваць ня толькі агульную з мужчынамі рэстарацыю але й яе агульную прыбіральню. Змаганьне ўвайшло ў новую фазу. Пра зьмест лёзунгаў здагадацца даволі лёгка.

Суайчыньніц, якім, магчыма, заманіцца сюды трапіць, хачу папярэдзіць: не хвалюйцеся – сёньня дыскрымінацыя паводле полавай прыкметы ў «McSorley's» канчаткова перамагла.

1.07. Разьвітальны шпацыр па Манхэтане пачынаецца ад аздобленага мэмарыяльнай дошкаю сучаснага будынку 20 на Broad Street. Тут стаяў дом, дзе ў 1659 годзе эмігрант зь Вялікага Княства Літоўскага Аляксандар Куртыус заснаваў першую каталіцкую школу Новага Амстэрдаму. Як высьветліў Вітаўт Кіпель, да свайго прыезду ў калёніі доктар Куртыус меў беларускае прозьвішча Карчэўскі й настаўнічаў у Полацку й Вільні. У Нью-Амстэрдаме ён выкладаў так званую "рускую" мову сваёй радзімы й чытаў курс лаціны.

Паблізу знаходзіцца іншая славутасьць – старадаўні рэстаран з Доўгай Заляй («The Long Room»), што была сьведкаю разьвітальнага банкету Джорджа Вашынгтона й ягоных афіцэраў пасьля здабыцьця незалежнасьці. Каля гэтых сталоў зь печаным індыком і зялёнымі ды белымі графінамі непазьбежна задумаесься: калі, дзе й зь якімі дзейнымі асобамі адбудзецца такі банкет у нас? І зь якой нагоды: канчатковай заваёвы незалежнасьці ці яе канчатковае здачы?

У суседніх залях наведнік знаёміцца з мастацкім адлюстраваньнем шляху Злучаных Штатаў да свабоды. Сярод батальных палотнаў бачым Вашынгтона з жыхаркаю Філядэльфіі Бэтсі Рос, што пашыла сваёй незалежнай дзяржаве першы сьцяг. Тамсама, у Філядэльфіі, дзе захоўваецца дамок патрыёткі-руказдольніцы, кангрэс маладой дзяржавы ледзьве не прыняў пастанову, паводле якой дзяржаўнай моваю ЗША магла стаць не ангельская, а нямецкая (германафілам не хапіла, кажуць, усяго двух галасоў).

У гэткім музэі аналёгіі атакуюць, як авадні, і ты ўвачавідкі бачыш вобразы й назвы палотнаў, над якімі, магчыма, ужо натхнёна працуюць айчынныя жывапісцы: «Старшыня Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі загадвае выключыць шастой мікрафон у заднім праходзе»,

Амстэрдам

Працяг з старонкі 29

душы хвалю лагоды. Пасьля сьняданьня чалавек дабрэйшы ўтрая.

Выгляд старых расеек, што панабіралі па тры бананы кожная, мяне пасьля сьняданьня не раздражняе. Наогул, расейцы ў Амстэрдаме – гэта букет сюрпрызаў. Расейцаў, савеціка, русаў, рускіх відаць здалёк. І не скажу, што вельмі прыемна зь імі сустракацца. Ня ведаю як ім са мною, а мне ня ў кайф. Ну хто гэта на сьняданак з трохсот трыццаці трох страў выбера тры бананы? Толькі руская жанчына, яе подзьвіг можа паўтарыць украінка. Беларуска ня зможа, два бананы яшчэ сяк-так зьесьць, а трэці не агорае. А расейкі лёгка зьелі па тры. І ў «Квартале чырвоных ліхтароў» гэтыя дзьве кабеты ў андатравых мужчынскіх шапках-вушанках мяне вельмі зьдзівілі. Яны хадзілі ўздоўж вітрын з прастытуткамі й гучна абураліся праявамі тамтэйшай этыкі. Яны шпацыравалі й голасна перагаворваліся, а за імі цягнуўся шлейф дурнога водару. Ад іх патыхала танным сьмярдзючым мацаваным вінцом. Дзе яны знайшлі пладоваягаднае віно ў Нідэрляндах? Таямніца. Ну хіба з сабою прытарабанілі з роднай тартараніі. Прыцягнулі, нажлукціліся й насьмярдзелі на ўвесь Амстэрдам, на ўсю Галяндыю, на ўсе Нідэрлянды надыхалі перагарам, як цмокі Гарынавічы. Толькі рускія могуць напусьціць такога духу. Толькі рускі можа выйсьці ад прастытуткі, а потым вярнуцца й моцна ўзасос пацалаваццца, і толькі пасьля, адмілаваўшыся, пусьціць сьлязу й зашпіліць порткі. Ды Бог зь ёй, зь незашпіленай прарэхаю, абы чалавек быў добры. А рускі трапіўся добры. Ён пачуў наш сьмех і не пакрыўдзіўся. Ён падыйшоў і сказаў майму брату Міраславу: "Рэкамэндую! Выдатная цётка! Проста кляса!" А потым павярнуўся да прастытуткі й паабяцаў, што абавязкова заўтра зойдзе. А як толькі дзявуля прычыніла празрыстыя дзьверы, сказаў, што буйныя грошы лепей прасталыткам не паказваць, а даваць драбязу і за кожную дадатковую паслугу накідваць асобна. Рускі раптам плаксіва скрывіўся й паскардзіўся: "На гэтую суку сплыло сто гульдэнаў!" А за сотню ён намерваўся "атадраць" як мінімум дваіх дзевак. Вось такія добрыя парады даў нам рускамоўны дарадца. Зрэшты, гэта ня самае кепскае, што ён мог зрабіць. Мог пайсьці наймітам у войска й зьнішчаць каўказцаў, а ён ціха-мірна трахаўся зь белатварай дзяўчынай. Ён мог бы на сто гульдэнаў накупіць патронаў і паслаць іх у горную Ічкерыю. Мог да сотні гульдэнаў дакласьці яшчэ сотню і набыць агнястрэльную зброю, выправіцца ў Грозны й не набаяцца, што на аднаго забітага чачэнскага баявіка прыпадае сотня забітых рускіх салдацікаў. Але ён так не зрабіў. Ён адно паабяцаў, што заўтра зноўку прыйдзе маркітавацца. І я яму веру. Бо рускіх у «Квартале чырвоных ліхтароў» бадзяецца шмат. Таму запрашальнік са стрып-бару, пабачыўшы славяніна, радуецца й крычыць: "Рускі! Епля! Перэстройка! Горпочофф! Хашыш! Кайф!" І ты праходзіш паўз запрашальніка й ціха гаворыш: "Рускі, рускі!"

Ты йдзеш у чорную ноч Амстэрдама, ты крочыш насустрач невядомым кайфам, і табе да ліхтара, да чырвонага ліхтара ўсе расавыя й нацыянальныя канфлікты. Ты больш ня хочаш ведаць ні пра землятрус у Японіі, ні пра вайну індзейцаў за незалежнасьць у Мэксыцы, ні пра эпідэмію пранцоў у сталіцы роднай Рэспублікі Беларусі. Ты плывеш насустрач жаноцкай прывабнасьці. І ўспамінаеш чарнаскурую жанчыну ў высокіх ботах. І хочацца кантрасту, жадаецца зьмены ўсіх каштоўнасьцяў на сто адзін працэнт. Трэба шукаць белую жанчыну. І жаданае знайшлося хутка. Высокі рост. Белыя валасы. Напампаваныя сыліконам цыцкі. Шырокі крыж. Крутыя клубы. Праўда, кошт запрошваўся адпаведны – шэсьцьдзесят гульдэнаў. За выкананьне жаданьняў неабходна трэсьці машною. І я заплаціў у вялікім дагледжаным пакоі, які, у адрозьненьне ад мурынскіх апартамэнтаў, не нагадваў вэтэрынарню. Шырокі ложак пакрывала па-афрыканску яркая посьцілка. Яе геамэтрычным арнамэнтам можна было палюбавацца ў цёмна-сінім люстэрку. Сваю скураную куртку я акуратна разьвесіў на плечыках. У таемнай кішэні маёй выдатнай італьянскай зімовай марынаркі ляжаў куплёны за паўтары тысячы гульдэнаў залаты гузік з дыямэнтам. І хоць кішэня была прыхаваная і зашпільвалася на тугую мэталёвую маланку, усё адно ледзяны скразьнячок сполаху прайшоўся ўздоўж хрыбетніка.

"Хо-о-оладна! Быр-р-р!" Напудраны нос наблізіўся да мяне й чыркануў па шчацэ. Я панакідаў апранахі на куртку, нібыта гэта выратоўвала каштоўны гузік. Якога чорта не пакінуў камень у гатэлі? Чаму я не аддаў дыямэнт брату, які пацягнуўся ў шматпавярховую краму выбіраць сабе ў падарунак чарговую кашулю? Становішча малапрыемнае. Выйсьце напрошвалася само сабою – хуценька зраблю заплянаванае й зноў надзену марынарку. Чамусьці такія паводзіны здаліся найразумнейшымі.

Я лёг на посьцілку з афрыканскімі малюнкамі. Лёг на сьпіну. Зрабіў так, каб не засталося варыянтаў, акрамя пазыцыі "конна". Сапраўды, за выплачаныя гульдэны можна крышку й разнастаіць пачатак.

Кандом шчыльна абхапіў чэлес. У Амстэрдаме ўвесь час мне траплялiся прэзэрватывы малых памераў. Зрэшты, не такіх малых, каб стварыць вялікія праблемы. Проста я ня вельмі люблю сэкс праз гумку, але з прастытуткай раманіцца без кандома – тое самае, што адпачываць у халерным бараку. Наступствы непрадказальныя. Таму гумовыя сродкі перасьцярогі ўплываюць толькі на даўжыню акту, без кандома фінал значна бліжэйшы да пачатку.

Ёсьць у мяне яшчэ адно сэксуальнае захапленьне: люблю хутка мяняць пазыцыі. Але, ня ведаючы нідэрляндзкае мовы, рабіць гэта было складана. Толькі, памятаеш, жэст быў раней за слова? І спачатку было ня Божае слова Бог. Спачатку быў Жэст. І Жэст быў у Бога. І Бог быў Жэстам. А потым – было слова, і далей па тэксту...

Абыходзячыся бяз слоў, я гуляў з чужым целам, нібыта зь лялькаю, і, мяняючы пазыцыю, натрапіў рукою на чэлес. Я намацаў пэніс, і нічога дзіўнага ў гэтым не было. Я зусім не зьдзівіўся, пакуль не ўсьвядоміў, што сьціскаю ў руцэ чужы мужчынскі полавы ворган. Знайшоў тое, чаго не шукаў. Атрымаў бясплатны дадатак да аплочанага дзеяньня. Сюрпрыз. Сюр-прыз. Прыз сюррэалістычны. Надрэальны твор. Агаламшальная рэч. Узрушанасьць. Выбух пачуцьцяў.

Вось ён – гермафрадыт, сымбаль і ўвасабленьне Эўропы, яе культуры, яе цывілізаванасьці, пачуцьцёвасьці й рацыянальнага канструяваньня. Невялікі, ледзь узбуджаны чэлес у маёй скамянелай руцэ. Сьвет перакуліўся, нібыта лебедзь у люстраной вадзе. Так перакульваецца сьвядомасьць, трапляючы зь сьвету рэлігіі ў сьвет эротыкі. Толькі вяртаньне ў зыходны стан вельмі хуткае. Чырвоныя ліхтары адбіваюцца й множацца ў нафтавым тлушчы амстэрдамскіх каналаў. Вечнасьць пязьменная.

Я прымусіў сябе ўявіць: у маёй руцэ зацісnуты мой чэлес. Маленькі юначы стручок, які я насіў дваццаць пяць гадоў назад. Нічога страшнага не адбываецца.

Гермафрадыт вельмі спрытна крутнуў клубамі. Маленькі пэніс высьлізнуў зь няспрытнай рукі, а мой чэлес застаўся ў гермафрадыце. Варта захапляцца эратычным майстэрствам Эўропы. Варта вучыцца сэксуальнай разьняволенасьці.

Вялікі жоўты Кітай падзяліў сьвет на "інь" і "ян", дрыбок "інь" увайшоў у цела "ян", а кропля "ян" не размылася ў "інь". Эўропа раструшчыла ўсе кантрасты, зруйнавала ўсе аўтарытэты з аўтарытарызмамі. На эўрапейскай канапе паўляжыць самавіты гермафрадыт. Ён усьміхаецца й напудраным носам кранае мочку твайго чырвонага вуха. Ён прапануе каханьне, а ў цябе ня хопіць сілы адмовіцца.

Гермафрадыт, вядома, ня краў мой залаты дыямэнтавы гузік.

Я выйшаў у дождж з рашэньнем нікому ніколі не расказваць пра здарэньне. Ідучы ўздоўж канала, я задумаў апісаць кароткі раман з гермафрадытам. Мне рупіла напісаць пра зьдзіўленьне, пра экзатычны сэкс, а не пра смаленьне вепрука ў чужой бацькаўшчыне.

Вось так, у маленькі чырвоны нататнік запісалася наступнае... *Дыямэнт, набыты ў Амстэрдаме, не выклікае сумневу.*

Схаваўшы нататнік, я пайшоў, знайшоў брата, які набыў чарговую кашулю. У кожнага свае прыбамбасы: адзін купляе пяцьдзесят тры пары лякіраваных чаравікаў, а другі ва ўсе свае нагавіцы й кашулі прышывае аднолькавыя гузікі. Кожны забаўляецца

«Прэзыдэнт Лукашэнка разьвітваецца са сваімі дэпутатамі» (або «Свае дэпутаты разьвітваюцца са сваім прэзыдэнтам»), «Іван Ціцянкоў з болем у сэрцы здымае бел-чырвона-белы сьцяг»...

У палоне мілых вобразаў роднага краю хуткасны элевэйтар узносіць мяне на 110-ты паверх найвышэйшага ў сёньняшнім Нью-Ёрку будынку, званага «The World Trade Center». Далёка ўнізе лётаюць экскурсійныя гелікоптэры. У тых, хто захоча паляцець усьлед за імі, нічога не атрымаецца: пляцоўка агляду нагадвае вартаўнічую вежу пасярод турэмнага двара з усімі адпаведнымі атрыбутамі. Газэты пішуць, што тут, на хмарачосах, пачалі гнездавацца арлы й сокалы. Пакуль яны высочваюць сабе ахвяраў недзе над Гудзонам, на парэнчы апускаецца мая кароўка-багоўка. "Якраз пасьпела, – расчулена кажу я сяброўцы, асьцярожна адпраўляючы яе ў кішэню. – Зараз паедзем у Нью-Ёрскі ўнівэрсытэт да прафэсара Томаса Бэрда, а ўвечары будзем выступаць з табой у Фундацыі Пётры Крэчэўскага".

У кабінэце прафэсара вісіць абвестка, чый зьмест, мабыць, навеяны паездкамі яе аўтара ў Беларусь: "У сувязі зь няпэўным эканамічным становішчам сьвятло ў канцы тунэлю будзе выключана да адпаведнай інструкцыі".

На вечарыне ў Фундацыі Крэчэўскага бачу ў залі аднаго з найарыгінальнейшых літаратараў нашай сучаснай эміграцыі Янку Юхнаўца, кніга якога адкрыла летась сэрыю «Галасы беларускага замежжа» ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Кніга называецца «Сны на чужыне».

А што сьніцца новым эмігрантам? Журналістам Алесі Сёмусе й яе мужу Юрку Васілеўскаму, літаратуразнаўцу Лявону Юрэвічу, Дзіму Лявіту, чыю калярытную постаць пры стосах падпольнае літаратуры яшчэ не забылі ўдзельнікі першых бэнээфаўскіх мітынгаў? Ратонда на сьвіслацкай набярэжнай? Вогнішча на дзьвінскім беразе пад Друяй? Слынны Брайтан-Біч, дзе можна ўбачыць шыльду «Пельменная», а жыхары пішуць у мэрыі скаргі, што паліцыя ня ведае расейскае мовы?

Кастусь Мярляк, аўтар кнігі мэмуараў пад адмысловаю назвай «Дзейнасьць Кастуся Мерляка на эміграцыі», дорыць мне талерку са статуяй Свабоды. Маладыя эмігранты дамаўляюцца, як будуць бавіць уікэнд. У кутку, разгарнуўшы на каленях прывезеную мною газэту з падчэпленай пад'ёмным кранам дзяржаўнай «Пагоняй», ціха плача незнаёмы стары беларус.

2.07. Сын доктара Алы Орсы Паўлік, студэнт мэдыцыны, гаворыць па-беларуску не зусім дасканала, але ня горш за народнага пісьменьніка І.Чыгрынава. Матчыну мову Паўліку не займае і ў халаднаватых хвалях Атлянтыкі. (Я нарэшце зьдзяйсьняю сваё рытуальнае купаньне).

Увесь гэты час мая кароўка-багоўка аддана чакае мяне ў кішэні. Відаць зґаладаўшыся, яна зьяўляецца на людзі ў грэцкім рэстаране. Запрыкмеціўшы маю сяброўку, спадарыня Ала апавядае, што апошнім часам у Амэрыцы за пару далераў можна набыць пушачку з божымі кароўкамі, якіх потым выпускаюць у садзе ці ў гародзе, каб яны елі шкоднікаў. Я выказваю далікатны сумнеў у тым, што багоўкі дакладна ведаюць межы ўладаньняў сваіх гаспадароў. Ці не палятуць яны, шчасьліва выбавіўшыся зь няволі, на гісторычную радзіму? Якраз так яны і робяць, пагаджаецца суразмоўніца.

Пачуўшы гэта, мая багоўка падымаецца ў рэстараннае неба.

Праз тры гадзіны адлятаю на гістарычную радзіму і я.

У прыбіральні аэрапорту Кенэдзі грала нягучная музыка й пахла добрым дэзадарантам. У прыбіральні аэрапорту Менск-2 не было туалетнае паперы.

Па дарозе з Варшавы ў Менск сьцюардэса прапанавала пасажырам сьвежы нумар рэспэктабэльнага выданьня пад назовам «Gazeta Swiąteczna». Чакаючы багаж, шукаю ў ёй паведамленьні зь Беларусі. Адзіная знойдзеная навіна: надрыхтаваны ўказ аб стварэньні ў раёнах, якія мяжуюць з Польшчай, Украінай і балтыйскімі дзяржавамі, добраахвотных дружынаў дапамогі памежнікам. На нататку зьвяртае ўвагу й мой сусед-паляк. Чаму такіх дружынаў ня будзе на расейскай мяжы? – пытаецца ён і чуе загадкавы адказ: каб у нашых прыбіральнях ніколі не было туалетнай паперы.

Чэрвень-ліпень 1995.

Седзячы на пластыкавым крэсьле ў аэрапорце, я нудзіўся й пазіраў на акуратны зялёны пакунак, што стаяў пад суседнім крэслам. Пакунак быў невялікі, але й немалы – дзьве пляшкі віскі грамаў па сямсот маглі зьмясьціцца у гэткім аб'ёме, а магла быць... Але ж я не ў Маскве, я ў Нідэрляндах. Сяджу, сумую й паглядаю на чортаў пакет. Нуджуся й нікога не чапаю, а мог бы чапіць, дарэчы. Вядома, мог бы, каб не паліцыя. Да мяне падыйшоў паліцыянт у блакітнай кашулі з чорнымі пагонамі. Ён задаў пытаньне на чыстай нідэрляндзкай мове. Ён спытаўся й пальцам паказаў на пакет. А я паказаў на пакунак і заматляў галавою – не разумею. Дзіўна – паліцыянт зусім не пакрыўдзіўся. Ён толькі ціхенька нагаварыў нешта ў рацыю на саёй роднай, паліцыянцкай мове. Вакол мяне выросла яшчэ двое служыцеляў парадку. Яны пачалі хадзіць і поўзаць вакол пакунка, быццам бы ў ім бомба, а не алькаголь, як я маракаваў. Вось табе, Адам Глёбус, і Амстэрдам, зараз разьдзярэ цябе выбухам на шматкі, і акрамя выразнага радка ў нэкралёгу "Загінуў у Амстэрдаме" нічога добрага ня будзе. Вось яна, зьвярыная пыса тэрору. Адна справа змагацца за незалежнасьць уласнай Радзімы й зусім іншая – загінуць ад бомбы ў якасьці ахвяры дзеля статыстыкі. Ну чаму я мушу гінуць? Чаму мяне павінна раскідаць у розныя бакі, і ня ў выглядзе літаратурных твораў, а ў форме костак, мяса і храсткоў? Няўжо нельга было падсунуць бомбу пад іншае крэсла й зьнішчыць не славянскага пісьменьніка з касмапалітычным псэўданімам, а якога гэбрэя з славянскім прозьвішчам, ці якога кітайца, ці мурына. Адным словам, усё роўна каго, абы толькі не мяне. Бамбізм – выдатны занятак, калі асабіста цябе не датычыцца. А то раз, і цябе няма. Раз, і ўспышка на тэлеэкране, паведамленьне па радыё й расплываньне ў вечнасьці. А яна такая халодная, такая бясконцая. А я маю форму і хачу пакуль што яе захаваць. "Бог мой, пачуй атэіста! Пачуй, даруй і ператвары бомбу ў кнігу". Такая магла б скласьціся малітва. Толькі я ня стаў турбаваць Бога з-за нейкай там асабістай драбязы. Я мужна думаў пра вечнасьць і бясконцасьць. Моўчкі я сачыў, як паліцыянт акуратна падымае пакунак і зносіць з маіх вачэй. Паведамленьне ў газэце пра бомбу калі й выйдзе, дык без майго прозьвішча. Я не сумую і не шкадую, што не застаўся назаўсёды ў Амстэрдаме, горадзе найсьвятлейшых дыямэнтаў і найчасьцейшых вокнаў.

За некаторымі з амстэрдамскіх вокнаў ты мог бы пабачыць у свой час і мяне, апранутага ва ўсё чорнае. Верхні, залаты гузік маёй шаўковай кашулі зіхцеў дыямэнтам. І гэта ня жарт. Вер мне, як маленькі хлопчык у аэрапорце паверыў у Дзеда Мароза. Хлопчык паказаў пальцам на пераапранутага артыста й сур'ёзна сказаў: "Мама, паглядзі на жывога Дзеда Мароза!"

як можа. Брат любіць кашулі недарагія, шаранькія, у дробны малюнак, свабодныя й няношаныя. Каб у яго было шмат-шмат гульдэнаў, ён бы праз кожныя паўгадзіны надзяваў новую кашулю. А так ён купляе кашулю толькі раз на два тыдні.

Зь ненадзяванай кашуляю ў кардоннай каробцы мы зайшлі ў італьянскі рэстаранчык, маленечкую піцэрыю. Але печка там стаяла сапраўдная, белая й вялікая. Я любаваўся печкаю й думаў пра белавалосага гермафрадыта з маленькім дзіцячым чэлесам. Я думаў пра ягонае дзіўна сканструяванае прыродаю цела. А брат Міраслаў тым часам замаўляў вячэру. Сабе ён папрасіў бутэльку чырвонага. Віно прынесьлі хутка, і брат піў. А я ўсё ня мог ня думаць пра Эўропу й яе чароўнага прадстаўніка з раёну эратычных ліхтароў. Піцу я зьеў без апэтыту, безь віна, без увагі, абыякава парэзаў нажом і відэльцам перанёс з талеркі ў рот. Зжаваў і незаўважыў, і ўздыхнуў з палёгкай. А брат сказаў, што яшчэ будуць грыбы. Ну й выдатна, маленечкі гаршчэчак з грыбамі – вельмі па-галяндзку, вельмі апэтытна. Толькі ў Шлярафіі, краіне, дзе ўсё для ўсіх было, ёсьць і будзе, атрымалася ня так. Брат замовіў грыбы, а іх падалі разам зь вялізным смажаным кавалкам мяса й залацістай гурбай бульбы-фры. Брат замовіў яшчэ віна і зьеў наступную другую страву. І я зьеў мяса з грыбамі, бульбу ня змог. Мне заўсёды сорамна робіцца за пераяданьне. Дарослы чалавек, ня піў, не курыў і... аб'еўся. Прыкра, ну крыўдна, ну млосна, але два пальцы ў рот я не засунуў і не званітаваў грыбамі. Я азьліўся на сябе й расказаў брату пра гермафрадыта. А ён не паверыў. Мне мой брат Міраслаў не паверыў. Гэта ж трэба! Каб у мяне быў старэйшы брат, і ён расказаў пра гермафрадыта, я б адразу паверыў. Але ў мяне толькі малодшы брат. І я на яго пакрыўдзіўся. Я ня стаў настойваць, маўляў – пайшлі, пакажу, пераканаесься. Экзотыка не загана і не вычварэньне. Кожны зарабляе, як хоча. Я пакрыўдзіўся ціха, надзьмуўся, нашаторыўся, зацяўся й схаваў крыўду ў далёкую патаемную кішэню, туды – да залатога гузіка з дыямэнтам.

Пра крыўду можаш спытацца ў брата. Але, я цябе прашу, не хадзі ў бібліятэку да нашай мамы і не распытвай пра Амстэрдам. Яна ў Галяндыі ніколі не была.

Я вярнуўся ў гатэль, лёг і глядзеў дваццаты тэлеканал, па якім круглыя суткі круцяцца порна-сюжэты. Усе пары, тройкі, чацьвёркі й гурты маркітаваліся чамусьці пад дзяржаўнымі сьцягамі. Порна-патрыятызм! Я так вызначыў гэты накірунак у тэлемастацтве. Наглядзеўшыся да чорцікаў уваччу, я пастаяў пад душам і вырашыў зноўку прайсьціся па сэксуальным квартале. Дыямэнт я выклаў з патаемнай кішэні й дэманстратыўна паклаў на шкляны стол. Хай крадуць – такі быў настрой – хай задушацца сваімі каштоўнымі камянямі. А я нарадзіўся дзеля лёгкага шпацыру, дзеля зіхценьня й ліючасьці. Я не зьбіраюся быць ахвяраю, я не намерваюся рабіцца героем, паэтам, мастаком, беларусам, мінаком, кліентам, рызыкантам. Я – праява часу. Чалавек – праява часу. Не жыцьцё вымяраецца часам, а час вымяраецца чалавечымі жыцьцямі, пакаленьнямі, плямёнамі, народамі, нацыямі, культурамі, цывілізацыямі і далей па тэксту...Час не памераеш забойствамі, сьмярцямі й войнамі. Усё, вядома, руйнуецца, рухаецца, цячэ, зьмяняецца, і нельга два разы ўвайсьці ў адзін і той самы амстэрдамскі канал. А ў адзін і той самы квартал зайсьці лёгка.

Тры гадзіны назад у вузкай вітрыне сябе прапаноўваў гермафрадыт, а цяпер ягонае пачэснае месца займае маленькая азіятка ў жоўтым станіку. Яе востры язык дакранаецца да кончыка ўласнага, пляскатага, малазійскага носу. Такі доўгі-доўгі язык. Азіятка паказвае язык, зубы й маленькую цыцку. Яе складзеная чаўночкам далонь запрашальна чэрпае паветра, перанасычанае водарам сэксуальнасьці. І трэба было пайсьці да маленькай прадстаўніцы вялікай залатой расы, прадстаўніцы магутнай сонечнай імпэрыі драконаў і ядомых чарвякоў. Варта было паспытаць гладка выгаленую похву, паказаную мне толькі на імгненьне. Але я прайшоў міма. Каб я ўбачыў у знаёмай вітрыне паўмужчынажанчыну, дык можа й трахнуўся б. А кітаянка праляцела, не атрымала ад мяне ні цэнта. Калі першы прэзыдэнт Беларусі лічыць Пэкін вялікай вёскай, дык і мне ня сьлед квапіцца на першую кітайскую похву, нават калі яе чысьцюткa пагалілі.

Усё цячэ й мяняецца, асабліва хутка зьмяняецца настрой. Быў кепскі, а стаў добры й вясёлы. І я засунуў рукі ў кішэні, усім усьміхаюся, падміргваю, паказваю язык, фігі й сярэдні палец правай рукі. "Дзявулі, няма праблемаў!" Мяне не раздражняе ліпучае прыставаньне гандляроў какаінам, мяне забаўляе настойлівасьць вулічных п'яных прастытутак. Я гуляю па казачным горадзе і ў мяне адпаведна чарадзейны настрой. Так бывае. Зь лёгкім сэрцам прынялася прапанова зайсьці пад чырвоны ліхтар. І я радаваўся, калі меў трэцюю мурынку, і думаў пра неаспрэчную наяўнасць кандома на ўласным чэлесе.

Гумовыя контрацэптывы – найвялікшае вынаходніцтва чалавека. Варта адшукаць у аналах гісторыі вынаходніка кандомаў і напісаць пра яго кнігу пад кічовым загалоўкам «Вялікі вынаходнік з плянэты Сэкс». І трэба вылепіць, сканструяваць гэтага мудрага вынаходніка з воску й пластыка для музэя спадарыні Цюсо. Я нават уявіў, як ляплю партрэт.

Стогны нанятай жанчыны разбурылі мае скульптурныя эцюды, бо пальцы занадта моцна съціснулі смуглявыя клубы.

Сьвежае паветра было жаданае, як заўсёды.

Прызнаюся шчыра: было сумна разьвітвацца з амстэрдамскім паветрам.

Інтэрнацкая хроніка

Працяг з старонкі 10

Заходзіць "афганец". Эдуард Анатолевіч асаджвае хлопца, калі той залічвае сябе па ільготах да И.О.В. Хлопец губляецца, кажа, што быў ужо тут два месяцы таму, на што Эдуард Анатолевіч яму шчыра заўляе, што памятае толькі жанчын...

Зноў званок Камушэнку. "Петр Никифорович! Петр Никифорович!.." – толькі й запомнілася мне з тэлефоннае размовы нашага бездапаможнага Эдуарда Анатолевіча з упэўненым у сваёй уладзе Пятром Нікіфаравічам. Се ля ві. Вярхі хацелі б, ды ня могуць кіраваць па-старому, нізы ўжо ня хочуць, але ж жывуць...

У суботу прыйшла позва ў суд на панядзелак для Колі й Ларысы. Сказалі: вымятацца адсюль да пятніцы.

Сабраліся ўсе разьвядзёнкі ды махнулі зноў да знаёмага Эдуарда Анатолевіча. (Уначы я з адчаю напісала й перадала зь імі ліст на радыё «Свабода». Вядома ж, як топіцься – за брытву хопіцься). Ён сапраўды памятаў жанчын і паклікаў іх першых без чаргі. Галя казала, што купіла кветкі... Я стрэла яе пасьля на лесьвіцы вясёлую, поўную клопату. У іх усё было добра.

Вечарам таго ж дня я стрэла на лесьвіцы і Колю. Ён – зусім бязвольны. Хадзіў да Камушэнкі. Той быў надта ж лагодны, хоць ты яго да раны прыкладай. Абяцаў даць машыну, брызэнт – усяго на два мільёны – да Гоцка. "Я б мог прывезьці сюды дзяцей, але ж прыйдуць ламаць дзьверы, дзеці напужаюцца. Каб людзі паддзяржалі..." – сыпаліся змрочнай восеньскай імжою ягоныя словы на маю сьцюдзёную душу. Ці значыла гэта, што мне ўжо нікуды ня трэба было бегчы, уставаць сярод ночы, пісаць, гаварыць, вышукваць, выплаўляць з душы нейкія патрэбныя акурат на гэты момант словы, каб толькі не зачапілі нас чужыцы, каб не кранулі, каб не растанталі мы самі ў сабе нешта кволае, але адначасна й моцнае, словам – бараніць жыцьцё? А калі гэтае жыцьцё само адмаўлялася жыць? Ці маю я права вяртаць яго да жыцьця?.. І хто я такая? А тут яшчэ мае сямейнікі ўсё сьмялей сталі заганяць мяне ў кут, адказваючы на тое пытаньне, што я задавала сабе ў пачатку: "Ты ня можаш адна разьбіць муры. Тады чаго ж ты гойсаеш, як апантаная?" У кожнай зьяве, у кожнай істоце, у кожным слове й думцы я шукала нейкае рады на гэтую ліхую скулу й ня ведала, як яе ўнаравіць. "Куды ж ісьці і што рабіць?" – скажы, Максім.

На другі дзень ішоў дождж. Я забегла да Колі й папрасіла яго не сыняцца з выездам, маўляў, "на вуліцы мокра"... Сама ж рушыла ў Койданаўскі "белы дом". Не адразу я знайшла там Сакалоўскага. Ён запрасіў мяне ў свой кабінэт. І толькі я назвала пароль: Камушэнка, інтэрнат на Пратасава – ён згодна хітнуў галавой і пачаў шукаць нейкія паперы, кажучы, што трэба патэлефанаваць да Марыновіча. Я спыніла яго, назваўшы імя Макаеда. Ягоны твар зчужынеў, хоць часам з вуснаў і падалі ў добрым вымаўленьні нашыя словы. Гэтыя словы былі ні аб чым...

Мае ногі здолелі вынесьці мяне з гэтага сапраўды непрыступнага муру, да якога ні просьбаю, ні грозьбаю не падступіцься. Заплаканая, я сутыкнулася ў дзьвярах з Галяй Куксік, якая зьзяла ад свайго шчасьця. Вось яно што! Яна чакала, пакуль я выйду, каб зайсьці ёй. Намагаючыся прагнаць з твару сваю радасьць, яна папыталася аб прычыне маіх сьлёз. "Мне шкода Колі", – прашантала я. Ейныя разважаньні пра тое, што калі Макаед будзе ўпарціцца, ягоныя рэчы завязуць на склад, а яго самога – у вар'ятню, былі для маёй змучанай душы бальней за ўсё на сьвеце. Каюся, у гэтым месцы я хацела ўзнагародзіць Галю ёмкім эпітэтам.

Я сьцішылася, змоўкла, ні да каго больш не чаплялася з сваімі авантурамі. Знайшоўся, нарэшце й час, каб адказаць на старыя Людзіны лісты. У Людзе я цаню ненадзіманасьць, неамбітнасьць. Вось абазвала яе "адэптам без інтэлекту", а яна мне за тое грошай прыслала, калі я галадала. Люда па маёй просьбе стала вывучаць свой радавод і адшукала родзіча, забітага партызанамі за тое, што быў багаты, а значыць, незалежны. Я падвяла рысу: цяпер ты ня будзеш з чужой падачы захапляцца «Партызанскай мадоннай». Паказвала ёй адрозьненьні паэзіі Максіма Танка ад паэзіі Максіма Багдановіча. Яшчэ я прасіла выслаць для мяне Новы запавет і Псалтыр у перакладзе Васіля Сёмухі. Шлях да незалежнасьці Беларусі пралягае цераз людзкія душы...

Неяк зайшла да Барташэвіча, а ён стаў выпытваць у мяне пра нашыя інтэрнацкія справы. "Усё добра", – кажу.

– А што, ужо не высяляюць?

– Высяляюць.

– А чаму ж тады добра?

– Добра таму, што я цяпер ведаю, што мне трэба рабіць.

– Ну й што трэба рабіць?

– А вот пайду да Нікалаеўны.

Нікалаеўна – гэта старая жанчына, мая былая супрацоўніца, расейка. Муж у яе быў прафэсійны вайсковец з тутэйшых мясьцінаў, ужо нябожчык. У пару нядаўняй адлігі яна заахвочвала мяне гаварыць па-беларуску. Цяперака я не працую, яна ж усё яшчэ цягне свой воз, хоць і далёка адыйшлася ад пэнсійнае мяжы. Да Нікалаеўны я хадзіла на споведзь. Усё ж яна была разумнай жанчынай, а галоўнае, верыла ў Бога. Яна адшукала Камушэнкаў хатні тэлефон, і я пазваніла ягонай жонцы... О, не, яна хворая, слабая жанчына, яна нічога ня можа... Мяне ўзяў сорам, мне й цяпер соромна. Чаму я розных людзей мераю на свой капыл?

Нечакана зусім проста й лёгка я выдаліла зь сябе ліхую скулу. Высьвеціліся Галубовічавы словы: Алесь – ты геній, – бо знайшла я ўсё ў Разанава.

"Зьмест свабоды дзейсьніцца й выяўляецца ў кантэксьце вялікай мэтазгоднасьці... кантэкст якой ахоплівае зямлю і неба... і якая ніколі ня зводзіцца да сваволі (сваёй волі). Мэтазгоднасьць поўная зваротным рухам – рэхам, і калі ты сонца... то тваё прызначэньне... слухацца зваротнага руху, які табе некалі ціхім голасам скажа, што тваё палымянае зьзяньне з аб'ектыўнай карысьці перарастае ў аб'ектыўную шкоду, і што трава, якая спачатку радавалася табе і цягнулася да цябе – вяне, сохне і просіць, каб ты схаваўся за хмары".

Я выпусьціла з рук лейцы. Коні пайшлі самі.

P.S. У жыцьці я зусім не такая сьмелая, як гэта, мабыць, выглядае. Хутчэй наадварот. Сто разоў я перадумала, перш чым выправіць Вам ліст. Гісторыя і ўсе прозьвішчы – нявыдуманыя. Нікога ня можна судзіць, кожны чалавек варты свайго назову – Чалавек. Хай выбачаюць мне тыя людзі, каго я закранула, можа, балюча, сама таго не жадаючы... Мною рухаў толькі востры жаль да тых, што жывуць са мною побач.

Койданава

2 кастрычніка 1995 г.

РЭДАКЦЫЙНАЯ ПОШТА

Дарагая Рэдакцыя! Нашу газэту чытаю ад загалоўку да прозьвішча рэдактара. Пішу нашу, бо яна наская, чыстамоўная і наскрозь беларуская. Калі рэнэгат Лукашэнка надалей застанецца пры ўладзе, дык у "незалежнай" Рэспубліцы ня будзе ніводнай дэмакратычнай публікацыі, і таму вялікая надзея на «Нашу Ніву». Апошнія выбары і рэфэрэндум страшна мяне прыгнобілі. Няважна колькі выбаршчыкаў галасавала, факт астаецца фактам, што пераважная бальшыня не пазбылася паклоньніцтва і рабскай псыхікі. Відаць, патрэбная кроў, каб замацаваць дзяржаўную незалежнасьць, а масы бядуюць пра недахоп каўбасы. "Біце ў сэрцы іх, біце мячамі"... *Міхась Лужынскі (Аўстралія)*

↙

Славаміру Адамовічу. Так, мы ведаем мову нашага ворага, але пераможам мы яго толькі тады, калі ён будзе ведаць нашую мову. Гэта й будзе нашая перамога.

Віталь П. зь Вялейкі

ПРЫВАТНЫЯ АБ'ЯВЫ

Кніга поштай. Маю для продажу кнігу Адама Глёбуса «Дамавікамэрон». Кніга выдадзеная ў Польшчы і ў Беларусі не прадавалася, хоць пра яе ў нас пісалі. Выдатная паліграфія, ілюстрацыі аўтара, несавецкі правапіс. Гэта 66 фантастычных, жартоўных, эратычных гісторый з героямі беларускай міталёгіі. Каб атрымаць кнігу, трэба 30 тыс. руб. перавесьці на адрас Загурскі Аляксандар Пятровіч. 220108 Менск, а/с 4. Не забудзьцеся ўказаць адрас!

«Канцэрт віншаваньняў». Шаноўнае спадарства! Беларуская Рэдакцыя Польскага Радыё з прыемнасьцю паведамляе, што, ідучы насустрач прапановам многіх слухачоў, увяла новую перадачу «Канцэрт віншаваньняў». Праз нашую праграму вы можаце перадаць зычэньні вашым блізкім ды знаёмым. І гэта ўсё – бясплатна. Заяўкі прысылайце на адрас: Беларуская Рэдакцыя Польскага Радыё, 00-977 Warszawa, P.O.Box 46, Polska. Наш «Канцэрт віншаваньняў» гучыць кожную нядзелю ў перадачы а 16.30 ды ў панядзелак у перадачы а 19.00 на кароткіх хвалях 41 і 49 мэтраў. Чакаем вашых заявак!

Курсы эспэранто. Літоўскі саюз эспэрантыстаў і Віленскі гарадзкі аддзел у справах асьветы й моладзі абвяшчаюць месяцовыя штодзённыя спэцыяльныя бясплатныя курсы мовы эспэранто. Чарговыя групы будуць фармавацца ў залежнасьці ад колькасьці ахвотных. Пачатак курсаў 6 лістапада а 14, 16 і 18 гадзінах. Вядзе курсы прафэсійны выкладчык з Бразіліі Aristophio ANDRADE ALVES FILHO. Месца заняткаў – Віленская вышэйшая тэхнічная школа (Olandų, 16). Дадатковая інфармацыя і папярэдняя рэгістрацыя па тэлефоне ў Вільні: 736738. Запрашаем!

LIETUVOS ESPERANTININKU SAJUNGA
LITOVA ESPERANTO ASOCIO

ФУНДАТАРЫ «НН»

Рэдакцыя «Нашай Нівы» шчыра дзякуе нашым фундатарам:

Моніцы Банкоўскі-Цюліг з Швэйцарыі, **Кону Ворфу** з ЗША, **Мацьвею Смаршчку** з ЗША, **Раісе Жук-Грышкевіч** з Канады, **Міхасю Баяроўскаму** з Англіі, **Міхасю Лужынскаму** з Аўстраліі, **Кастусю Акулу** з Канады, **Зоі Жалязоўскай** з Бэльгіі, **Міхасю Махначу** з Бэльгіі.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Андрэю К. з Горадні. Можна колькі заўгодна шукаць прычыну гістарычнай несьвядомасьці й рускамоўнасьці нашага народу ў самой гісторыі й мове, але гэта нічога не дае й ня дасьць. Бо такі пошук – гэта справа ўжо гістарычна сьвядомага й беларускамоўнага чалавека, і толькі яму такі пошук зразумелы й неабходны. Што да народу, то ягоную сьвядомасьць фармуюць сёньня шэсьць каналаў расейскае тэлевізіі, школа, сыстэма дзяржаўных сьвятаў і г.д. Побач з усёй гэтай індустрыяй усе высілкі нашай самотужнай "навукова-папулярнай рэвалюцыі" абяртаюцца яе, "рэвалюцыі", унутранай справай. Так беларускае адраджэньне сьвядома ператвараецца ўладамі ў прадпрыемства закрытага тыпу, рэч у сабе, а нашыя пошукі ў галіне інтэрпрэтацыі гісторыі пачынаюць нагадваць самакапальніцтва. Мы ўжо не ствараем, а пагразаем у бясконцых развагах пра тое, што ёсьць творчасьць і як трэба ствараць. Мы ўжо шукаем ня выхаду на шырокую публіку, а патрабуем "карэнных зломаў у нашай псыхіцы й складзе думак". А трэба, фігуральна кажучы, адно – выявіць волю: калі цябе загінаюць у сябе, насупор гэтаму разгарнуцца да іншых... Напішыце нам што-небудзь *жывое*.

Сяргею К. з Жодзіна. Пішыце імпрэсіі, яны Вам удаюцца. У дасланым апавяданьні задуманая "не свая" тэма скоўвае Вас, прымушае шмат чаго тлумачыць. Вы спрабуеце "апрануцца" ў героя прачытаных кніжак, але герой застаецца толькі "вопраткай". Бо ў такіх выпадках ня трэба ні ў кога апранацца, а трэба пісаць ад сябе, сваё. Тады атрымаецца праўда – хоць бы й пра 18-ты год, хоць бы й пра эмігранта. Так, як на апошняй старонцы.

Вадзіму К. з Барысава. Напішыце нам, што "аб лукашэнкаўскім гербе" думаюць у войску. Што кажуць афіцэры? Што цяпер клеюць у дэмбельскі альбом?

Міхасю С. зь Менску. Ну, "экстрапалявалі" Вы "безвыходную бяду" – і што атрымалі? Сьледам, дарэчы, за Валошыным і Гіпіюс. Катарсіс? Не. "Народ" такія экстрапаляцыі ўсё адно не чытае й імі не праймаецца. А інтэлігенцыя... У расейскай традыцыі было шмат паэтаў, якія ўмелі па-майстэрску заклясьці свой народ. "Народ, безумствуя, убил свою свободу". Колькі пачуцьця, колькі ўдзячнага паэтычнага надрыву ў такіх радках! Але няхай яны ўсё ж будуць пра расейскую рэвалюцыю, а не пра беларускі рэфэрэндум. Бо мы ведаем прычыны. І ведаем, што ў іншых абставінах усё магло быць і наадварот. Наш народ – адзінакроўны прыродны арганізм – быў бессаромна й каварна выкарыстаны дзеля папулісцкіх мэтаў, "праверaны на лаяльнасьць". Гэта як бы запалка пыталася ў пушчы: ты "за" мой агонь ці "супраць"?.. Нашы людзі "за Расею", бо ім ніколі нічога апроч Расеі не паказвалі, ім дзяўблі бясконца, што яны і самі – Расея. Вось яны й выказаліся. І вось што ў Вашым допісе вельмі істотнае. Яны выказаліся, за што іх свая ж інтэлігенцыя (якой, нібыта, дадзена бачыць шырэй) і закляймiла. Пры гэтым не заўважыла, што зрабіла гэта зусім па-расейску. "Экстрапалюючы"... Дык хто ж тут першы "сьляпы, быццам крот"?

Сымону В. з Бабруйску. Вершы моцна перагружаныя словамі накшталт: зьмяшчальнасьць, істотнасьць, непахіснасьць, за імі прападае таемства слова, і тэкст выходзіць абагульнены й неарыгінальны. Памятаецца, падобнымі словамі пачынаўся верш аднаго пачаткоўца: "Зацемненасьць прасьветленасьці"... У вершы пра паэтаў ухвальныя характарыстыкі можна перастаўляць месцамі, сэнс ня зьменіцца.

Уладзімеру З. з Магілёву. Напэўна, пра Законы Сусьвету Вы маеце рацыю, але без канкрэтных прыкладаў гэта гучыць непераканаўча. Што да схемы "нацыяналізм – гэта калі чалавек дзеіць сродкамі культуры, якая для яго родная, а інтэрнацыяналізм – калі чалавек яшчэ й карыстаецца здабыткамі іншых культур", то тут увогуле няма сэнсу. Бо што такое культура? і як яе разьдзяліць на родную й "іншую"? Калі з мовай і бюджэтам яшчэ можна разабрацца, то як падзяліць мэтафізыку? Падобна, што Вы маеце на ўвазе *шырыню* кругагляду, а нацыянальнае-інтэрнацыянальнае – гэта пра *глыбіню* сьветапогляду.

НАША НІВА 7-8 (37-38) Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Рэдактар Сяргей Дубавец. Заснавальнік і выдавец Павал Жук.
Адрасы для допісаў: 220123 Менск, а/с 71. альбо 2041 Вільня, а/с 2082. Падпісны індэкс 63125, Steigimo liudijimas Nr.1178.
Алег Дзярновіч (адк. сакратар), Сяргей Харэўскі (маст. рэдактар), Андрэй Антонаў (набор); пры ўдзеле Сяргея Шупы.
Афсэтныдрук. Фармат А3. Наклад 7 тыс. Кошт дамоўны.
Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку» (220041 Менск, пр. Скарыны, 79).
Падпісана ў друк 25.X.95 Замова 5472